Б. А. Рыбакоў.

РАДЗІМІЧЫ.

Радзімічы з усіх ускодня-славянскіх пляменьняў найбольш цяжка паддаюцца вывучэньню на падставе адных толькі пісьмовых помнікаў; летапісцам у сваю хроніку занесены два-тры факты, перамешаныя з легендай.

Пазьнейшых дасьледчыкаў радзімічы* вабілі толькі рамантыкай свайго польскага паходжаньня і толькі з гэтага боку імі цікавіліся, аб іх пісалі, разводзячы фантастыку на таму аб ваяўнічасьці племені, якое прабілася на чале з правадыром Радзімам на Сож. Тым часам, гэта племя зьяўляецца вельмі цікавым об'ектам нагляданьняў: яго геаграфічны стан унутры славянскай тэрыторыі дазваляе вызначыць адносную вагу такога арганізму, як племя ў лепшых умовах, чым на паўзьмежжы з чужымі культурамі. Палітычная залежнасьць радзімічаў ад Кіева і Чарнігава ставіць цікавую проблему племя-колёніі.

Опэруючы аднымі пісьмовымі крыніцамі, рускія гісторыкі дагэтуль ня ставілі проблемы гісторыі асобнага племя; тым часам іменна дэталёвае вывучэньне гаспадарчай і палітычнай будовы тых параўнаўча невялікіх абласьцей, якія летапіс называе племеннымі імёнамі, зможа даць уяўленьне эпохі зараджэньня фэўдалізму, уяўленьне не агульна-абстрактнае, а конкрэтызаванае для кожнага раёну ўсходняга славянства.

Сынтэз монографій аб паасобных ускодня-славянскіх пляменьнях, магчыма, крыху інакш паставіць цэлы рад пытаньняў, якія вырашаліся раней ў маштабе ўсёй Усходняй Эўропы бяз уліку індывідуальных асаблівасьцяй кожнага раёну. Прарабіць такую працу мажліва толькі пры дапамозе цэлага шэрагу навук, у першую чаргу — археолёгіі. Культурная гісторыя многіх пляменьняў археолёгічнымі данымі ўскрываецца часта больш поўна, чым данымі пісьмовых крыніц.

У адносінах да радзімічаў мінуўся ўжо той час, калі іх край ня мог зацікавіць нават энтузыястаў-археолёгаў накшталт А. Чарнацкага (Хадакоўскага), які быў пасланы Акадэміяй для досьледу радзіміцкага краю і які пісаў з Гомелю: „Тут, над Сожам, амаль, усё глуха для мяне“ (241).

Цяпер мы маем матар'ял, дастатковы для таго, каб даць (можа быць эскізны) нарыс гэтага племені.

Мал. 1.

Гэта праца, зьяўляючыся першай спробай падагульненьня пытаньняў, зьвязаных з племем радзімічаў, ні ў якім разе не прэтэндуе на вычарпальную паўнату. У большасьці выпадкаў яна дае толькі пастаноўку проблемы, а не вырашэньне; шмат якія пытаньні закрануты ў артыкуле конспэктыўна.

Адным з фактараў, якія абумовілі значную непаўнату данага артыкулу, зьявілася немажлівасьць выкарыстаць як матар'ялы музэяў БССР, так і вынікі раскопак апошніх гадоў (нават надрукаваныя ў гэтым томе). Фактычнай базай данага артыкулу зьяўляюцца археолёгічныя колекцыі Дзяржаўнага Гістарычнага Музэю ў Маскве і апублікаваныя ў друку справаздачы. На некаторых прыватных пытаньнях былі выкарыстаны заўвагі А. В. Арцыхоўскага, В. А. Гарадцова, А. Н. Ляўданскага, П. С. Рыкава і А. А. Сьпіцына, якім прыношу сваю шчырую падзяку.

Адзначаная абмежаванасьць крыніц абумовіла выпадзеньне такой істотнай катэгорыі помнікаў матар'яльнай культуры, як радзіміцкія гарадзішчы і селішчы, бяз уліку якіх лічыць працу скончанай нельга.

Ніжэй друкуецца ўвесь запас гістарычных вестак аб радзімічах, які мае сучасная навука.
Правапіс падаю паводле Шахматава (258).
Буйным шрыфтам адзначаны месцы з збору 1039 г.

Повѣсть временныхъ лѣтъ (258).

Радимичи же и вятичи отъ ляховъ. Бяста бо дъва брата въ лясѣхъ, Радимъ, а другыи Вятко и прешьдъша, сѣдоста: Радимъ на Съжю, и прозъвашася радимичи...

И живяху въ мирѣ поляне и древляне и сѣверъ и радимичи и вятичи и хървати.

А радимичи и вятичи и сѣверъ одинъ обячаи имѣяху: живяху въ лѣсѣ, якоже вьякыи звѣрь, ядуще вьсе нечисто, и срамословие въ нихъ предъ отьци и предъ снъхами, и браци не бываху въ нихъ, нъ игрища межю селы, и съхожахуся на игрища, на плясания и на вься бѣсовьскыя пѣсни, и ту умыкаху жены собѣ, съ неюже къ то съвѣщавъся; имѣяху же по дъвѣ и по три жены.

И аще къто умьряше, творяху тризну надъ нимъ, и посемь сътворяху краду велику, и възложаху на краду мьртвьца, и съжьжаху; и посемь, събьравъше кости, въложаху въ судину малу, и поставляху на стълпѣ на путьхъ, еже творять вятичи и нынѣ.

Въ лѣто 6393. Посъла Ольгъ къ радимичемъ, река: „кому дань даете?" Они же рѣша: „Козаромъ". И рече имъ Ольгъ: „не даите козаромъ, нъ мънѣ даите". И въдаша Ольгови по шьлягу, якоже и козаром даяху. И бѣ обладая Ольгъ поляны и древляны и сѣверъмь и радимичи...

Въ лѣто 6415 иде Ольгъ на грькы... поя же мъножьство варягъ и словѣнъ и чюдь и кривичѣ и мерю и поляны и сѣверъ и древляны и радимичѣ...

Въ лѣто 6492. Иде Володимеръ на радимичѣ. И бѣ у него воевода Вълчии Хвость, и посъла предъ собою Володимеръ Вълчия Хвоста; и сърѣте радимичѣ на рѣцѣ Пѣсьчанѣ; и побѣди Вълчии Хвость радимичѣ. Тѣмь и Русь коряться радимичемъ глаголюще: „Пѣсьчаньци Вълчия Хвоста бѣгають".

Быша же радимичи отъ рода ляховъ; прешьдъше, ту ся въселиша, и платять дань Руси, повозъ везуть и до сего дьне.

Ипатьевский список летописи.

Въ лѣто 6677... Андреевичь же перемета мостъ на Горинѣ и не пусти его къ собе, а онъ уворотяся на радимичѣ, к Андрееви Суждалю.

РАЗЬДЗЕЛ I.

Курганы.

Перад аглядам археолёгічных об'ектаў лічу патрэбным прывесьці сьпіс тых месцаў, дзе знаходзяцца вядомыя мне курганныя групы, так ці іначай дасьледваныя.

Павінен агаварыцца, што шмат якія з гэтых пунктаў сыстэматычна не дасьледваліся—аб іх ёсьць толькі паасобныя весткі (гл. карту).

Абрамаўка (181), Азьдзелін (181), Антонаўка (75), Батураўка (75), Бялееўка (181), Бервенаўка (181), Бердыж (472), Бяседавічы (242), Баравое Балота (181), Узмутнае (242), Вір (4), Вішчын (242), Улазовічы (75), Унукавічы (75), Вараб'ёўка (181), Варонеж (1), Высокае (75), Гадзілавічы (242), Гетманская Буда (75), Глыбоцкае (181), Галубоўка (75), Гарадок (242), Гочава (185, 191), Грамыкі (181), Гразівец (180), Гілеўка (75), Гукава (46), Давыдаўка (181), Дзем'янкі (181), Дзерабуж (130), Доброша (181), Дабуж (72), Дуброўка (181), Дубейкава (179), Дзятлавічы (181), Елянец (179), Елізавеціна (242), Жгунь, Займішча (46), Залесьсе (181), Запольле (46), Іванаўка (72), Іванск (242), Івольск (181), Іпалітава (72, 199), Існоды (199), Казарычы (75), Каменка (180), Кархаўка (75), Карпаўка (181), Князеўка (242), Калобаўка (181), Кардон (180), Коржаўка (75), Карма (179), Карма-Пайка (242), Карма-Доўгая (242), Касьцюковічы (242), Красная Слабада (242; 199), Крычаў (242), Куклічы (181), Курознава (75), Левінка (188), Лізагубава (46), Лабанаўка (75), Лігоўскае (46), Лучын (180), Лучыцы (242), Любны (267), Людкава (75), Лялічы (75), Макееўка (181), Манюкі (75), Мядведаўка (75), Мярынаўка (188), Мазыкі (242), Немкі Вялікія і Малыя (181), Нісімкавічы (179), Нова-Быхаў (180; 72), Нова-Навіцкая (75), Насовічы (181), Абідавічы (72; 231), Аднапольле (4), Асавок (181), Парфенаўка (46), Пекліна (253), р. Перагонка (72), Пятроўск (179), р. Пешчань (72), Падлужнае (72), Покаць (181), Папова Гара (75), Папоўка (75), Прыборы (181), Прыбыткі (181), Праскурня (180), Радугі (4; 179), Разрытае (46), Раідаўка (181), Рэчкі (181), Рагачоў (72; 216), Рогі (181), Раманавічы (Пахом'еў манастыр, (181), Рудзенец (181), Рудня (181), Сапрыкі (72), Сачкавічы (75), Селішча (242), Сьмялічы (75), Салоная Будзішча (181), Салонае (180), Соф'еўка (242), Старая Рудня (179), Старае Сяло, Стаўбун (181), Стракайлы (242), Студзянец (205), р. Студзёнка (181), Цераxаўка (181), Цярухі (181), Ціманава (242), Цімошкін Перавоз (75), Ціхінічы (181), Топаль (75), Туравічы (4), Уваравічы (181), Ухава (181), р. Ухлясьць (72), Хізава (219), Хізы (181), Хмелянец (242), Ходунь (242), Халеевічы (75), Хомінка (181), Хоцімск (242), Чабатовічы (4), Чартовічы (75), Чашуйка (46), Шапатовіцкае (72), В. Шчарбінічы (75).

Кароткае апісаньне помнікаў культуры радзімічаў пачнем з курганоў, якія ёсьць у іх краі ў вельмі вялікай колькасьці. Невялічкі матар'ял аб іншых археолёгічных об'ектах, якія ёсьць у мяне, будзе разгледжаны у сувязі з той тэмай, да якой ён належыць.

Раскопкі курганоў з навуковымі мэтамі пачаліся яшчэ ў 1810 г. Нарбутам (216) і затым працягваліся цэлым радам дасьледчыкаў. На жаль, як самыя мэтоды дасьледваньня, так і фіксаваньне розных момантаў раскопак і знойдзеных рэчаў вельмі часта стаяць не на належнай вышыні. Багата курганоў для навукі загінула канчаткова з прычыны адсутнасьці справаздач, але нават і тыя справаздачы аб раскопках, якія ёсьць, у большасьці выпадкаў носяць агульны і ня зусім выразны характар, што прымушае карыстацца імі з значнай асьцярогай.

З апублікаваных справаздач кіруючае значэньне маюць працы Раманава (178—182), Фурсава (242), Ерэменкі (75). Але недастатковасьць дакладных вымераў, невыпрацаванасьць агульнай



Табл. 1.

тэрмінолёгіі, а таксама поўная адсутнасьць малюнкаў або фотографій, у пэўнай меры зьнішчаюць каштоўнасьць нават гэтых лепшых з публікацый.

Радзіміцкія курганы, як і наогул славянскія, разьмяшчаюцца звычайна групамі, прычым колькасьць насыпаў у групе зьмяняецца ад 20 да 100. Ёсьць адхіленьньні як у той, так і ў другі бок. Сустракаюцца групы, якія налічваюць да 200—225 курганоў.

Знадворная форма курганоў розная — сустракаюцца і сфэрычныя і адсечана-конічныя; велічыня таксама зьмяняецца; найбольш часта сустракаецца вышыня ў 1-2 м., але ёсьць і курганы, якія дасягаюць 4 і нават як-быццам 6,5 м. Звычайны дыямэтар 6,5—10 м., але ёсьць і 13—16 м.

Пахавальны абрад радзімічаў, эволюцыянуючы ў агульных рысах аднолькава з усім усходня-славянскім абрадам, адзначаецца ў драбніцах значнай рознастайнасьцю. Можна вызначыць толькі два асноўныя тыпы пахаваньня нябожчыка — трупаспаленьне і звычайнае пахаваньне. Абодва тыпы маюць шэраг падпадзелаў, напр., пахаваньне можа быць на грунце, вышэй грунту на асобным насыпе, або, нарэшце, у яме. Тыполёгія курганоў ускладняецца таксама наяўнасьцю дадатковых элемэнтаў пахавальнага абраду — труны, калоды, зрубы і г. д. (табл. 1).

Паміж курганамі, якія дайшлі да нас, і старадаўным абрадам пахаваньня, зафіксаваным для радзімічаў летапісцам, адчуваецца некаторая прагаліна. Калі ў севяранскіх курганох (знаць, больш даўніх, чым радзіміцкія) мы бачым пахавальную урну, праўда, пастаўленую не на слупе, а ў насыпе, дык у радзімічаў пахавальных урнаў у курганох ужо няма. Вывучэньне радзіміцкіх курганоў даводзіцца пачынаць з звычайнага трупаспаленьня.

Умоўна трупаспаленьне можна падзяляць на поўнае і няпоўнае. Прынцыповай розьніцы тут няма, бо і ў тым, і ў другім выпадку нябожчык спальваўся на вогнішчы; розьніца толькі ў ступені

дэформацыі касьцяка ад дзейства агню — косьці або абгаралі настолькі, што і пазнаць іх нельга было, або захоўвалі абрысы касьцяка і толькі мелі сьляды абпалу. А. А. Сьпіцын (208) дапускае, што ў другім выпадку мела месца абсыпаньне нябожчыка гарачымі вуглямі з наступным засыпаньнем зямлёю. Згадзіцца з гэтым ніяк нельга: паводле даных Г. Бартэля, каб спаліць труп, патрэбна тэмпэратура каля 1100°С. Калі нават прыняць пад увагу, што косьці не заўсёды згараюць, а толькі абвугляюцца, дык і то неабходная для гэтага тэмпэратура значна перавышае тую, якую маглі даць гарачыя вуглі. Як відаць, нават няпоўнае трупаспаленьне рабілася на вогнішчы, але крыху меншых памераў.

Поўнае трупаспаленьне ў радзімічаў большаю часткаю дае малюнак насыпаньня кургану непасрэдна над пахавальным вогнішчам: попел, вуглі і перамешаныя з імі апаленыя рэшткі касьцей. Часам перад засыпаньнем зямлёю вогнішча згортвалася ў адну кучу. Паколькі для зьнішчэньня трупу патрэбна было шмат дрэўнага апалу, косьці і недагарэлыя вуглі знаходзяцца крыху вышэй горызонту — пад імі пласт попелу, які ўтварыўся ад згараньня „крады вялікай". Масыўнасьць вогнішча часам дасягае 1 м. (Соф'еўка). Іншы раз назіраецца згортваньне вогнішча не ў адну, а ў дзьве кучы, але косьці нябожчыка заўсёды ляжаць у аднэй з іх, не падзяляючыся на часткі. У насыпе курганаў назіраюцца рэшткі пахавальнай трызны-стравы, чарапкі пасуды, косьці жывёл. Часам нябожчыку ставілі пасуд (як формаваны на кружале, так і леплены ад рукі).

Знахадкі рэчаў, зразумела, вельмі нязначны — мядзяныя зьлiткі, адзін раз — ножык і адзін раз — пярсьцёнак.

У курганных групах поўныя трупаспаленьні складаюць паасобныя выпадкі, — звычайна па аднаму — па два курганы на групу.

У межах былой радзіміцкай зямлі поўнае трупаспаленьне адзначана ў наступных пунктах — Карма Доўгая, Соф'еўка, Вішчын, Любны, Старая Рудня, Хоцімск, Бяседавічы, Батураўка, Падлужнае. Дапушчэньне Гот'е (59), што найбольш даўнія радзіміцкія курганы згрупаваны каля Дняпра, — дапушчэньне, якое даводзіцца ім пры дапамозе дыргэму VIII ст., знойдзенага ў кургане, які толькі з нацяжкай можа называцца радзіміцкім — крыху парушаецца пададзеным сьпісам.

Пытаньне аб пахаваньнях з няпоўным трупаспаленьнем зьяўляецца больш складаным, калі ў кургане ёсьць не паасобныя косьці, а абвуглены касьцяк. Тут дасьледчыку лягчэй зблытаць, з чым ён мае справу — з няпоўным трупаспаленьнем ці проста з касьцяком, засыпаным вуглямі. Маючы на ўвазе мажлівасьць такой памылкі, разгледзім курганы з няпоўным, дакладней, нясконччаным спальваньнем нябожчыка.

У даным выпадку не заўсёды можна сьцьвярджаць, што спаленьне адбывалася на тым месцы, дзе затым быў насыпаны курган: так часам вугальны пласт ляжыць толькі над касьцяком, а не пад ім, што можа быць растлумачана толькі тым, што нябожчыка палілі ў іншым месцы, а затым, пераносячы на месца будучага кургана, абвуглены труп засыпалі рэшткамі вогнішча.

Часьцей усё-ж сьляды пахавальнага вогнішча выяўляюцца ў кургане. У большасьці выпадкаў шкілет знаходзіцца ў абкружэньні апалу — вуглі з попелам і зьнізу, і з боку, і зьверху; як відаць у гэтых курганох насып рабіўся непасрэдна над вогнішчам.

У тым выпадку, калі трупаспаленьне адбывалася на старане, рэшткі часам зьмяшчалі ў зруб (Папова Гара) або абкружалі дубовымі плашкамі, прычым апошнія абвуглены ня былі.

У некаторых выпадках захаваліся паложаныя з нябожчыкам рэчы (доказ ня вельмі высокай тэмпэратуры); так, у Карме-Пайцы, курган № 20, выяўлена сякера, ножык і панцыр, праўда, папсутыя агнём.

Побач з касьцякамі сустракаюцца кэрамічныя вырабы. Выпадкі больш-менш бясспрэчнага трупаспаленьня паказанага тыпу вядомы ў Краснай Слабадзе, Гразіўцы, Карме-Пайцы, Князёўцы, Нова-Быхаве, Вішчыне, Хоцімску, Паповай Гары. Таксама як і поўныя трупаспаленьні, яны нешматлікія і ў курганных групах складаюць нязначны процант.

Пачаўшы тыполёгічны рад радзіміцкіх пахавальных абрадаў поўным трупаспаленьнем і перайшоўшы да спаленьня нясконччанага, мы павінны будзем перайсьці да наступнага спосабу пахаваньня, генэтычна зьвязанага з першымі — да звычайнага пахаваньня з захаваньнем агню, як аднаго з элемэнтаў абраду.

За выключэньнем стану самога шкілету, увесь астатні малюнак раскапанага кургану з такім пахаваньнем зусім аналёгічны з папярэднім — тое-ж вогнішча, на якім ляжыць нябожчык, але вогнішча ня толькі знаходзіцца пад касьцяком, але і над ім. Як відаць, у даным выпадку мы маем імітацыю трупаспаленьня — нябожчыка клалі на вогнішчы, яго зьверху закідалі вугальлем і галавешкамі, але самы труп не палілі, а засыпалі, вогнішча зямлёю. Можа быць нават клалі нябожчыка толькі на загаслае вогнішча і засыпалі толькі халодным вугальлем, — гэтыя пытаньні археолёгія далёка не заўсёды можа вырашыць. Мажліва, і тое і другое мела месца ў радзімічаў, зьяўляючыся толькі двума этапамі пераходу ад спаленьня да звычайнага пахаваньня. Адносна вельмі многіх курганоў можна сьцьвярджаць, што нябожчыкі клаліся на загаслае вогнішча, бо рэчы, якія захаваліся, ня маюць сьлядоў датыканьня з агнём.

Курганы з пахаваньнем, імітуючым трупаспаленьнем (з перажыткамі апошняга ў радзімічаў) даволі шматлікія і маюць найбольшую колькасьць адменьнікаў. Асноўнымі элемэнтамі трэба лічыць вугаль, попель і земляны насып, дзякуючы якому нябожчык ляжаў ня проста на зямлі, а на пэўным узвышшы, на якое пазьней ужо насыпалі курган. Комбінацыі гэтых элемэнтаў і ствараюць разнастайнасьць тыпаў пахаваньня. Найбольш падрабязны разбор гэтых комбінацый у сураскіх курганох належыць А. А. Сьпіцыну (208).

Вельмі часта попел (з вугальлем і без яго) залягае ў аснове кургана, часта бывае і пад ім і над касьцяком, але асабліва цікавы выпадкі, калі попел ляжыць толькі над шкілетам і часам нават у некалькі пластоў (у апошнім факце Сьпіцын бачыць паўторную прысыпку кургану).

У ва ўсіх гэтых выпадках Сьпіцын хоча бачыць сьляды спаленага вогнішча на месцы пахаваньня, але ён-жа сам падае факты, якія гавораць супроць яго дапушчэньня — масыўнасьць і чыстата попельнага пласту ня могуць быць дасягнуты спаленьнем вогнішча, бо няроўнае згараньне розных частак няўхільна дало-б паўны процант вугальля. Дапушчэньне, што спальвалася „крыху спарахнелае дрэва" ня мае падмацаваньня, бо для пахаваньня звычайна браліся найбольш цьвёрдыя пароды — дуб, бяроза. А тая акалічнасьць, што часам нябожчык клаўся непасрэдна на дзёран, а попел насыпаўся толькі зьверху, канчаткова пераконвае ў тым, што далёка не заўсёды вогнішчы паліліся на месцы будучага кургану. Попел мог быць прынесены з іншага месца.

Гэтыя курганы з перажыткамі трупаспаленьня сустракаюцца амаль ува ўсіх раёнах радзіміцкай тэрыторыі і ў адносінах да керамікі, рэчаў і тых дадатковых элемэнтаў, якія Завітневіч (80) называў „пахавальным комфортам" (зрубы, дамавіны) ніякіх асаблівасьцяй не ўяўляюць, чаму і будуць таксама разгледжаны.

Наступнай тыполёгічнай ступеньню будуць курганы з звычайным пахаваньнем без адзнак агню ў абрадзе.

Гэты тып, які, паводле свайго пашырэньня конкуруе з папярэднім, мае тры адменьнікі: 1) пахаваньне на гэрызонце, 2) вышэй горызонту на асобным насыпе (радзей чым 1-ы) і 3) у яме.

Першыя два, зьяўляючыся толькі спрашчэньнем папярэдняга абраду, нічога асабліва складанага не ўяўляюць; значна цікавей узбагачэньне радзіміцкага пахавальнага абраду такой зьявай, як капаньне ямы для нябожчыка. Ямы звычайна няглыбокія (35-50 см), рэдка дасягаюць 1 м. Як правіла, у пахаваньнях у яме знаходзяць вельмі мала рэчаў, і толькі адзін раз у Радузе ў яме былі знойдзены сяміпраменныя вісочныя колцы і інш. Форма іх звычайна простакутная, часам з гладжанымі кутамі. Крыжападобныя і ўступкаватыя ямы знойдзены толькі ў суседзтве з радзімічамі (Мазыкі) і належаць, як відаць, крывічом.

Картаграфаваньне пахаваньняў у яме ніякіх асаблівых раёнаў не вылучае, хаця наогул трэба адзначыць параўнаўчую рэдкасьць іх у радзімічаў. Ні трупаспаленьне, ні яго перажыткі ў ямах ня былі знойдзены ні разу.

Палажэньне касьцякоў у радзіміцкіх курганох у большасьці выпадкаў падобна да агульнаславянскага — накіраваньне галавы на захад, але сустракаецца і адхіленьне, лічыць якое выпадковым нельга: значная частка мужчынскіх касьцякоў ляжыць галавою на ўсход. Сьпіцын лічыць, што кольказьць накіраваных на ўсход раўняецца 50 проц. усіх мужчынскіх пахаваньняў, але гэту лічбу трэба лічыць крыху пераўвялічананай. Характэрна, што гэта асаблівасьць тычыцца толькі мужчынскіх пахаваньняў,— нават у тых выпадках, калі курган мае парнае пахаваньне, два касьцякі, якія ляжаць побач, бываюць накіраваны галовамі ў процілеглыя бакі (напр. Елізавеціна, № 28). Парныя пахаваньні ў радзімічаў нярэдкі, і большаю часткаю гэта мужчынскія і жаночыя, радзей жаночыя і дзіцячыя. Ніякіх іншых асаблівасьцяй у пахаваньні мужчын і жанчын, апрача накіраваньня, угледзець нельга.

Што тычыцца пахавальных пабудоў і дапаможных элемэнтаў пахаваньня, дык тут для трупаспаленьня поўнага, зразумела, цяжка адзначыць, ці быў нябожчык спалены ў труне ці без яе: можна толькі ў некаторых выпадках вызначыць характар пахавальнага вогнішча.

Калі даваць веры апісаньням Раманава (180), дык мы атрымаем наступны малюнак „крады" (паводле раскопак у Гразіўцы): на зямлю клалі рад або некалькі радоў тоўстых бярвеньняў, затым на іх клалі нябожчыка, паралельна апошняму пласту бярвеньняў, а ў галаве і ў нагах яго, пэрпэндыкулярна яму, клалі два бервяны, на якіх ізноў ладзілі пабудаваны з бярвеньняў пакот. Калі ўся гэта будова згарала настолькі, наколькі гэтага патрабаваў звычай, яе засыпалі зямлёю. Як відаць, спаленьне не магло быць поўным, калі захаваліся ня толькі бярвеньні і шкілет, але і іх узаемнае палажэньне.

Пры няпоўным трупаспаленьні пачынаюць зьяўляцца такія дадатковыя зьявы, як укладаньне з бакоў абвугленага касьцяка дубовых плашак.

Пры зьніканьні абраду спаленьня самога трупу і замене яго папярэднімі вогнішчамі і засыпаньнем вугалем і попелам, гэтыя дадатковыя элемэнты пачынаюць набываць усё большае значэньне.

Найбольш частым (апрача двух бярвеньняў па баках) трэба прызнаць абмежаваньне касьцяка чатырма бярвеньнямі або паколатымі плашкамі. Гэта будова часам набывае выгляд зрубу ў адзін вянец, часам-жа мае выгляд скрыні бяз дна. Абрысы большаю часткаю простакутныя, але ёсьць і трапэзападобныя з шырокай асновай каля галавы.

Некалькі радзей сустракаецца дошка пад шкілетам і яшчэ радзей накрыцьцё касьцяка дошкай зьверху. У жаночых пахаваньнях назіраецца дошка (дубовая) пад галавою.

Усе пералічаныя пабудовы ніякім чынам не прыстасаваны для транспартаваньня нябожчыка, усе яны зьяўляюцца вынікам клопатаў сваякоў аб яго становішчы ўжо на месцы пахаваньня. Нажаль, характар справаздач не дае магчымасьці высьветліць ці рабіліся радзімічамі „дамавіны" для нябожчыкаў, падобныя адкрытым у валынян і дрэгавічоў, бо глухія паказаньні на наяўнасьць зрубу нічога не высьвятляюць. Вярней за ўсё, што ў даным выпадку пад зрубам разумеецца іменна той адзін вянец, які адзначаны вышэй.

Да пералічаных тыпаў пахавальных пабудоў трэба дадаць яшчэ дамавіны і выдзяўбаныя калоды. Ніводзін дасьледчык ня даў дакладнага апісаньня радзіміцкай труны і ня вытлумачыў, што ён

разумее пад гэтым словам. Пад кароткім запісам у справаздачы „сьляды труны“ можа хавацца значная колькасьць розных драўляных пабудоў. Вядома толькі тое, што часам для прыгатаваньня дамавін ужываліся жалезныя цьвікі.

Нарэшце, трэба яшчэ адзначыць наяўнасьць выдзяўбаных калод, часамі накрытых дошкай або другой перакуленай калодай.

Два апошнія тыпы памяшканьняў для нябожчыка маглі служыць і для перавозкі яго на могілкі.

Важнай дэтальлю славянскага пахавальнага абраду зьяўляецца тое, што нябожчыкам кладуць рэчы і страву. Радзімічы ў гэтых адносінах не зьяўляліся выключэньнем, і ўжо ў трупаспаленьнях назіраюцца медныя зьліткі, якія сьведчаць аб спаленых рэчах. Найбольшая колькасьць рэчаў прыпадае на пахаваньне на грунце (або вышэй). Ямы амаль не даюць пахвальнага інвэнтару.

Вельмі часта побач з нябожчыкам або ў нагах (радзей каля галавы) ставіліся гаршкі, у большай частцы якіх знаходзяць арганічныя рэшткі, тлустую чорную зямлю і радзей вуглі. Як відаць, назначэньне пасуды было не заўсёды аднолькавае: калі звычайна яна ўжывалася з мэтай забесьпячэньня нябожчыка стравай „на тым сьвеце“, дык часам у ёй прыносіўся, мажліва, з хатняга ачагу агонь. Шмат якія з курганоў, апрача такіх рэчаў, якія спэцыяльна клаліся нябожчыку, маюць у сабе рэчы, якія трапілі больш-менш выпадкова, але ўсё-ж якія зьўляюлца каштоўным паказаньнем на абрад. Я кажу аб рэштках пахавальнай трызны, называць якую, як высьветліў Сабалеўскі трэба ня трызнай, а стравай. Косьці жывёл і птушак, вугальле, бітыя чарапкі пасуды вельмі часта знаходзяць каля вяршыны кургану; ува ўсіх гэтых выпадковых і разрозьненых рэчах магчыма бачыць рэшткі трызны, якая адбылася на вяршыне кургану.

Часам пасьля трызны (можа быць пры паўторных памінках) курган яшчэ падсыпалі ў адзнаку пашаны да нябожчыка.

Стары абрад пахаваньня спаленых рэштак у урне, якая зьмяшчалася на слупе, выціснуты курганамі, на радзіміцкім матар'яле, на жаль, прасочаны быць ня можа. Але што гэта ня выдумка кіеўскага манаха, сьведчаць знахадкі на тэрыторыях, якія непасрэдна мяжуюць з радзіміцкай.

В. З. Завітневічу (82) удалося адшукаць паміж Дняпром і Прыпяцьцю каля даўняга горада Брагіна ў курганным магільніку, што пры сяле Пажаркі, два курганы, у якіх былі знойдзены прастастаўна ўкопаныя слупы, на вяршынях якіх знаходзіліся урны з касьцямі. Слупы і урны былі засыпаны зямлёю і такім чынам былі ўключаны ў склад кургана.

Гэты раён можна лічыць у пэўнай ступені севяранскім.

Мелькам акрэсьліўшы тыпы радзіміцкіх пахаваньняў, пяройдзем да разгляду курганнага інвэнтару. Тут ізноў трэба рабіць агаворкі адносна няпоўнасьці справаздач, нязначнай колькасьці апублікаваных зарысовак і рознастайнасьці ўжыванай дасьледчыкамі тэрміналёгіі. У аснову працы над інвэнтаром радзіміцкіх курганаў пакладзены колекцыі з раскопак Ерэменкі (75), Сізова (198, 199), Чарапанава (219) і інш. Астатні матар'ял прыцягваўся пастольні, паколькі выразнасьць справаздачы дазваляла гэта.

Як і ва ўсіх старажытна-славянскіх курганох, у радзімічаў выразна адрозьніваюцца пахаваньні мужчынскія і жаночыя: першыя звычайна сустракаюцца бяз рэчаў, і толькі зрэдзь у іх трапляецца крэсіва, ножык або яшчэ якая-небудзь рэч; жаночыя пахаваньні, наадварот, у большасьці выпадкаў бываюць насычаны рознымі рэчамі, пераважна аздобамі.

Толькі тры катэгорыі рэчаў не залежаць ад гэтага падзелу: ножыкі, пражкі і кераміка. Радзіміцкая курганная *кераміка*, зьяўляючыся ўжывальнай прыналежнасьцю пахавальнага абраду, сустракаецца ва ўсіх тыпах пахаваньняў, прыблізна ў рознай колькасьці: спаленьне—7 разоў, пережыткі спаленьня—11 разоў, пахаваньне на грунце—11 разоў, у насыпе—3 разы, у ямах—3 разы. Павялічэньне колькасьці для другога і трэцяга тыпаў пахаваньня адпавядае большай колькасьці курганаў з такім абрадам.

Паводле палажэньня ў кургане знахадкі керамікі распадаюцца так: каля ног—19 разоў, збоку (каля правай рукі)—6, каля галавы—3, над шкілетам—3, астатнія нявысьветлены. Тры разы гаршкі былі знойдзены пры пахаваньні галавою на ўсход.

Мяркуючы па апісаньнях, гаршкі мелі звычайную для славянскіх пахаваньняў форму і орнамэнт. Некаторыя мелі клеймы на днішчах. Адхіленьні ад звычайнай формы рэдкія—адзін раз была знойдзена гліняная місачка (Ціманава), два разы гарлач з ручкай (Цярухі і Ўваравічы). У вырабе керамікі назіраецца дзьве тэхнікі: часам судзіны робяцца з грубай гліны ад рукі і мае дрэннае абпаліва; у другіх-жа выпадках гаршкі вырабляюцца з лепш вымешанай і адкаламучанай гліны, фармуюцца на ганчарным крузе і маюць абпаліва лепшай якасьці.

Першая, больш грубая тэхніка часьцей сустракаецца ў трупаспаленьнях, другая—у іншых тыпах пахаваньня, але адзін раз (Соф'еўка, 26) былі знодзены ў адным пахаваньні з трупаспаленьнем два гаршкі, як з першай, так і з другой тэхнікай.

Інвэнтар мужчынскіх пахаваньняў, як ужо было адзначана, вельмі нескладаны, аздобы амаль адсутнічаюць, затое ёсьць вельмі каштоўныя для нас прылады вытворчасьці і зброя.

На першае месца па значэньню трэба паставіць *сякеры*. Трэба сказаць, што ў параўнаньні з суседнімі плямёньнямі (напр., крывічамі) тэрыторыя радзімічаў вельмі бедная на знахадкі сякер; апошнія знойдзены ўсяго толькі тры разы: Стракайлы, курган № 46, Карма-Пайка, кург. № 20 і

Івольск на Ўзе [1]). Больш сякер будзе на прымежжы—Левінка пад Старадубам і курганы па Дняпры ад Рэчыцы да Лоева.

Адзначыць, паводле справаздач, якія сякеры баявыя і якія рабочыя, не зьяўляецца магчымым, толькі для Кармы можна дапускаць згодна характару курганаў, што там сякера-зброя, а не сякера-прылада.

Далей трэба паставіць *цуглі* (табл. II). Радзіміцкія цуглі жалезныя, звычайныя. Знойдзены чатыры разы—Казарычы, 57, Людкава, 81, Рондаўка і р. Студзёнка.

Значна больш сустракаецца дробных рэчаў накшталт ножыкаў, брускоў, красалаў з крамянчыкамі. Гэтыя рэчы, як відаць, насіліся на паясе і зьяўляюцца найбольш звычайным інвэнтаром мужчынскіх славянскіх курганоў.

Ножыкі (II, 3) знойдзены: Стракайлы, 46, Гразівец, 2, Карма-Пайка, 20 (у похве), Цімошкін Перавоз, 102, Гулеўка, 45, Нова-Быхаў, 3 (у похве), Соф'еўка. Частка гэтых ножыкаў магла мець характар штодзеннай партатыўнай прылады, некаторыя-ж маглі быць зброяй.

Брускі (II, 6) знойдзены: Каменка, Нова-Быхаў, 3, Ісподы (каля Крычава), у апошнім выпадку лупняковы („сланец").

Красалы (II, 4), мяркуючы па знаходцы ў Вялікіх Шчарбінічах, былі калачападобнага тыпу. Гэты тып, маючы вельмі вялікую тэрыторыю пашырэньня, існаваў на працягу некалькіх стагодзьдзяў (паасобнікі такіх красалаў знойдзены ў Тушынскім стане XVII ст.). Звычайна красала разам з крамнем і губкай насіліся ў скураным мяшэчку (у беларусаў „каліта"), каля паясу. Месцы знахадак: Вялікія Шчарбінічы, 58, Гулеўка, 45 (у каліце), Гетманская Буда, Шыпы.



Табл. II.

Аднымі з заўсёдных знахадак мужчынскіх пахаваньнъў зьяўляюцца *пражкі* і *паясныя колцы*, (табл. III). Радзіміцкія пражкі можна падзяліць на два аддзелы—звычайныя, якія сустракаюцца з аднаго абадка і ў якіх язычок прымацоўваецца да таго-ж боку, што і рамень, і складаныя, якія маюць дзьве часткі—адна для прымацаваньня рэменя, а другая для язычка. Аддзелы маюць наступныя тыпы. Звычайныя: 1) овальны, III, 1 (Гулеука, 41); 2) драцяны фігурны, III—2 (Цімошкін Перавоз, 105) і 3)—драцяны звычайны (там-жа). Складаныя: 1) лірападобны; 2) простакутны; III—6; 3) драцяны, III, 7; 4) пласткаваты, III, 8.

Ліраподобныя пражкі, зьяўляючыся аднэй з характэрных адзнак славян, сустракаюцца а ўсёй Усходняй Эўропе, спускаючыся нават на Балканы (славянскія пахаваньні ў Абабэ-Пліске).



Табл. III.

У радзімічаў яны знойдзены: Нова-Быхаў, 3, Касьцюковічы, Шыпы, Карма-Пайка, 20, Елізавеціна, 30, Праскурня, 1, Каменка, 5, Улазовічы, 35 і 39, Цімошкін Перавоз, 105, Нісімкавічы.

Простакутны тып, які сустракаецца і ў іншых славян, у радзімічаў знойдзены адзін раз у Казарычах, 45.

Драцяны тып знойдзены ў Цімошкіным Перавозе, 102.

Тып пласткаваты адрозьніваецца ад папярэдніх спосабам змацаваньня з рэменем: для

[1]) У далейшым нумарацыя курганаў будзе непасрэдна ісьці за назвай курганнай групы, напр. Казарычы, 63. Уво ўсіх выпадках нумарацыя захавана, як у справаздачах.

гэтай мэты пражка мае пласток з трыма дзірачкамі, у якія павінны былі ўваходзіць цьвікі; знойдзена адзін раз ва Ўлазавічах, 30, прычым зьяўляецца крыху спрэчным пол пахаванага.

Усе пражкі зроблены з медзі, але амаль заўсёды язычок і вось, да якой апошні прымацаваны, рабіліся з жалеза.

Да паяснога набору трэба, як відаль, аднесьці і медныя колцы (III, 9), якія звычайна знаходзяцца ў сярэдняй частцы тулава. Часам знаходзяць па 2—3 колцы на касьцяку. Дыямэтар іх у сярэднім каля 3 см., папярочнае сячэньне дае іншы раз круг, часам-жа фігуру ў выглядзе літары „с". Знойдзены ў Касьцюковічах, Нова-Быхаве, 3, Праскурні, 1 і 2, Улазовічах, 36 і 39, Казарычах, 45 (3 шт.), Цімошкіным Перавозе, 93, 101 і 105.

Адзін раз колца было знойдзена не каля поясу, а каля калена (Цімошкін Перавоз, 92); магчыма, што ў даным выпадку мы маем справу не з пaясным колцам, а з колцам для замацаваньня рэменя, які абмотваў анучы. Этнографічныя аналёгіі гэтаму ёсьць.

Сьпіс звычайных для мужчынскіх пахаваньняў рэчаў вычарпаны. Застаецца пералічыць нятыповыя знахадкі. Да такіх можа належыць *панцыр*, знойдзены ў Карме-Пайцы, 20, *грыўня* кручаная (Казарычы, 57) і *пярсьцёнкі* (Каменка).

Больш шматлікі інвэнтар жаночых пахаваньняў патрабуе і больш падрабязнай клясыфікацыі. Падзелім усе рэчы груба на дзьве часткі: у першую ўвойдуць прылады вытворчасьці і рэчы быту, а ў другую—часткі адзеньня і аздобы.

З прылад вытворчасьці на першае месца трэба паставіць *сярпы*. Форма іх невядомая, але можна думаць, што яна не адхіляецца ад звычайнай славянскай. Сярпы знойдзены ў Касьцюковічах, у Новым-Быхаве, Цярухах і на р. Студзёнцы. Часам сустракаюцца косы, трэба думаць косы-гарбушы (Цярухі і р. Студзёнка).

Аднэй з частых знахадак трэба прызнаць шыферныя *прасьліцы* (II, 5), якія маюць звычайную форму двух усечаных конусаў, датыкальных асновамі. Яны часам знаходзяцца ў адным пахаваньні па 5 паасобнікаў. Месцы знахадак: Красная Слабада, Хізава (5 шт.), Казарычы, 54, Людкава, 84, Прыборы, р. Студзёнка, Ракіціна (Баравое Балота).

Тры разы ў жаночых пахаваньнях былі знойдзены *іголкі* з ніткамі, уваткнутыя, як відаць, у вопратку нябожчыцы на грудзёх: Карма, 17, Нісімкавічы, 13 і 14. У радзіміцкіх курганох знойдзены вёдры. Захаваліся ў адным выпадку 3 мэталёвыя абручы (Цімошкін Перавоз) і ў другім — жалезная дужка ад вядра (Туравічы).

Аналёгіі гэтай зьяве ёсьць у валынскіх, дрэгавіцкіх і крывіцкіх курганох.

Таксама, як і ў мужчын, у радзіміцкіх жанчын былі *ножыкі*. У жаночых пахаваньнях жалезныя ножыкі знойдзены: Цімошкін Перавоз, 105, Гэтманская Буда, Гулеўка, 41, Касьцюковічы, Шыпы. Два разы былі знойдзены жалезныя лапатачкі з прыпаднятымі ручкамі — Дубейкава і Хізава.

Часам у жаночых пахаваньнях знаходзяць кавалкі крэменя, а ў Нісімкавічах, кург. № 14, была знойдзена нават крамянёвая страла, якая мела, як відаць, ахоўнае значэньне.

У адным з курганоў (Улазовічы) было знойдзена тэракотавае яйка-пісанка, аздобленае паліваным узорам (II, 7).

Пераходзячы да жаночых аздоб радзімічаў, трэба зрабіць агаворку аб немагчымасьці ў большасьці выпадкаў паказаць матар'ял.

Антановіч (4), робячы кароткае паведамленьне аб сваіх раскопках каля Гомелю і Чачэрску, адзначыў, што 90 проц. знойдзеных рэчаў былі зроблены з серабра, але, бязумоўна, пакладацца па гэту лічбу нельга, бо бронза пры 26 проц. цыны з вонкавага выгляду амаль не адрозьніваецца ад серабра. Азначэньні матар'ялу іншымі дасьледчыкамі таксама рабіліся на вока, з прычыны чаго даваць веры ім магчыма толькі ў некаторай ступені. Будучыя хэмічныя аналізы могуць даць багата цікавага ў справе высьвятленьня тэхнікі радзіміцкіх ювэліраў. Покуль абмяжуемся паказаньнем на тое, што асноўнымі компонэнтамі сплаваў зьяўляліся медзь, серабро і волава. У чыстым выглядзе яны наўрад ці сустракаюцца.

Апісаньне рэчаў пачнем ў тым парадку, у якім звычайна расчышчаецца касьцяк пры раскопках, г. зн. з галавы. Лічу патрэбным агаварыцца, што зробленая клясыфікацыя можа лічыцца толькі орыентовачнай, бо на большае матар'ял, які ёсьць, не ўпаўнаважвае.

Скроневыя колцы ў радзімічаў можна падзяліць на тры аддзелы: драцяныя, сяміпраменныя, пацеркавыя. Драцяныя скроневыя колцы ў тым або іншым выглядзе ёсьць ва ўсіх славянскіх племеньняў. Некаторыя адменьнікі іх змаглі нават зрабіцца племяннымі спэцыфікумамі; так, брасьлетападобныя характэрны для крывічоў, а маленькія колцы, закручаныя ў паўтара абарота, можна да некаторай ступені лічыць прыналежнасьцю дрэгавічоў. У тэрміналёгіі даных скроневых колцаў я прымаю тэрміны, выпрацаваныя А. В. Арцыхоўскім (18).

Брасьлетападобныя самкнутыя (IV, 1) скроневыя колцы, сустракаючыся часьцей на прымежжы радзімічаў, унутры іх тэрыторыі знойдзены толькі ў адным месцы — Улазовічы, курганы №№ 26, 34, 36 і 42. Насілі іх на раменчыку каля скроняй. У спосабе насіць ёсьць некаторая розьніца з іншымі племеньнямі, якія насілі іх каля патыліцы.

Пярсьцёнкападобныя самкнутыя (IV, 3) рабіліся з больш тонкага дроту. Насілі іх таксама, як і брасьлетападобныя. Наогул ад гэтых апошніх яны адрозьніваюцца толькі памерамі. На тэрыторыі радзімічаў гэта найбольш часты тып скроневых колцаў, але характэрным для іх лічыцца ня можа, бо знахадкі іх у іншых племеньняў таксама нярэдкі. Месцы знахадак: Дубейкава, Селішча, 54, Красная Слабада, Туравічы, 1, Іпалітаўка, 1, Лялічы, 8, 9, 11, 12 і 14, Улазовічы, 19, 25, 27, 28, 29, 34, 36, 41, 42 і 43, Казарычы, 48 і 63, Гулеўка, 38, 40 і 45, Унукавічы, 88, Манюкі,

Людкава, 77, 83 і выпадковыя знахадкі—Кархаўка, 70, Лабанаўка, 20, Ціманавічы, 3, Гэтманская Буда, 50, В. Шчарбінічы, 59.

Часам пярсьцёнкападобныя праз зьмену аднаго з канцоў набываюць форму: загнутаканцовыя (Улазовічы, 30 і 43) і эсаканцовыя (табл. IV, 2; Дубейкава, Вішчык, 1, Праскурня, 1, Каменка, 5, Казарычы, 46 і 48). Межы пашырэньня апошняга тыпу супадаюць з расьсяленьнем славян.

Сяміпраменныя вісочныя колцы (IV, 5, 6, 10 і 14) з усіх радзіміцкіх курганных рэчаў зьяўляюцца найбольш цікавымі, бо паводле іх, галоўным чынам, і азначаецца прыналежнасьць да радзіміцкага племя. Яны выраблялiся з сярэбраных (значна радзей з медных) сплаваў шляхам адліўкі



Табл. IV.

ў ліцейных формах. У адным пахаваньні знойдзены ў колькасьці ад 2-х да 6-ці. Насілі іх таксама на раменчыку каля віскоў, часам разам з пярсьцёнкападобнымі. Орнамэнт (выліваны) сустракаецца вельмі рэдка.

Па радзіміцкай тэрыторыі яны пашыраюцца больш-менш роўнамерна, але па-за ёй знахадкі апісаных вісочных колцаў—адзінкавыя.

Месцы знахадак: Стракайлы, 45, Елізавеціна, 28, Туравічы, 2, Радуга, 11 і 12, Абідавічы, 1, Праскурня, 1 (на двух касьцяках), Каменка, 5, Улазовічы, 25, 31 і 33, Казарычы, 63, Гулеўка, 40, Людкава, 77, 85 і выпадковыя знахадкі—Жгунь, Цімошкін Перавоз, 105, В. Шчарбінічы, 59, Цярухі, р. Студзёнка. Апрача таго, іх не раз знаходзілі ў тых раскопках, пасьля якіх не заставалася поўных апублікаваных справаздач (напр., раскопкі Антановіча).

Апрача таго, радзіміцкія сяміпраменныя вісочныя колцы былі знойдзены: С. Студзёнкі, Рыльскага пав.; Гочава, Абаянскага пав. (IV, 14 і 15); Няжылавічы, Радамыскага пав.; с. Ліплява, Заланоскага пав.; г. Палтава; с. Кубаева (IV, 6), Юр'еўскага пав.; м. Варонеж, Глухаўскага пав. (?). Ёсьць нявыверанныя і няпэўныя весткі аб знахадках у Елецкім павеце.

За выключэньнем с. Студзёнкі і Гочава, адносна якіх можна сьцьвярджаць, што яны—колёніі радзімічаў (гэта пацьвярджаецца і іншымі рэчамі), у астатніх пунктах мы маем адзінкавыя і выпадковыя знахадкі.

Бліжэйшыя аналёгіі сяміпраменных мы маем у Жалезьніцкім скарбе, дзе ёсьць у неславянскім акружэньні сямі- і пяціпраменныя вісочныя колцы, якія адрозьніваюцца ад радзіміцкіх толькі большай дэкорацыйнасьцю і некаторымі дэталямі. Значнае падабенства сяміпраменных радзіміцкіх і сямілопасных вяціцкіх было заўважана і адзначана даўно. Паколькі вяціцкія ў асноўнай масе больш позьнія (а найбольш раньнія ў той час і найбольш блізкія да радзімічаў), можна думаць, што і тыя і другія паходзяць ад аднаго першаўзору. У пошуках гэтага тыпу былі створаны дзьве тэорыі. Паводле аднэй з іх, якая належыць Н. П. Кандакову (230), паказаныя вісочныя колцы паходзяць ад колтаў. Вельмі грунтоўныя пярэчаньні А. В. Арцыхоўскага (18), паўтараць якія ня буду. Другая

тэорыя, аўтарам якой зьяўляецца В. І. Сізоў (200), выводзіць тып, які нас цікавіць, ад арабскіх узораў. Аўтар „Курганаў вяцічаў" (Арцыхоўскі) да яе далучаецца. Такая пастаноўка пытаньня мае найбольшую праўдападобнасьць.

Аснова данай формы — шчыток з дужкай і сем адросткаў — вельмі даўняя і распаўсюджана вельмі шырока. Бачыць ва ўсіх яе адменьніках разьвіцьцё аднаго першаўзору, зразумела, нельга, бо шмат якія тыпы могуць зьявіцца вынікамі конвэргэнцыі.

Не закранаючы рэчаў з лятэнскай культуры, якія маглі быць прыцягнуты для вытлумачэньня для эпохі VI—VIII ст., зьвярну ўвагу на матар'ял, пададзены ў артыкуле Ruxerówn (183). Раён — Міжземнамор'е. У большасьці выпадкаў мы тут маем справу з формамі, вынікам якіх на славянскай тэрыторыі зьявіліся колты — паўмесяцападобныя шчыткі з адросткамі, якія большаю часткаю шчыльна прылягаюць да цела шчытка. З гэтых форм разьвіцца сяміпраменнай даволі цяжка.

Значна цікавейшымі зьяўляюцца рэчы не міжземнаморскага, а арабскага кругу. Готэнротам (57) пададзены яўрэйскія і арабскія завушніцы „галаўныя аздобы" і „вушныя падвескі" (табл. IV, 7 і 8). У іх мы маем усе элемэнты сяміпраменных — шчыток, дужку і сем (або дзевяць) дадаткаў. Не закранаючы орнамэнтальнага боку, адзначу, што істотная розьніца заключаецца ў тым, што замест сямі адросткаў, якія выліты разам з шчытком і якія становяць з ім адно цэлае, на арабскіх узорах мы маем сем ланцужкоў, якія канчаюцца падвескамі.

Зьвяном паміж арабскімі і радзіміцка-вяляцкімі экзэмплярамі служыць апублікаванае Сізовым (200) вісочнае колца з Смаленскага музэю (табл. IV, 9), дзе падвеска і шчыток ужо складаюць адно цэлае, рухавасьць ужо страчана, але орнамэнт імітуе яшчэ ланцужок. Першаўзор смаленскага колца, як відаць, меў на цэнтральным ланцужку падвешаную маленькую луньніцу. Мотыў шчытка з падвескамі мае вельмі шырокае распаўсюджаньне, будучы вядомы і чорнаморскім колёніям грэкаў і балгарам і маскоўскім ювэлірам XVII ст. Але гаворачы аб радзімічах, адзіным шляхам праніканьня трэба лічыць шлях ад арабаў праз Ітыль(?) на паўночны-захад.

На табліцы IV намечана магчымая эволюцыя данага тыпу на славянскай тэрыторыі. Мал. 11—13 паказваюць вяціцкія вісочныя колцы (пачатковую стадыю іх разьвіцьця — пазьнейшая вельмі добра намечана Арцыхоўскім). Мал. 14 і 15 паказваюць, што радзіміцкія вісочныя колцы мелі дакладна такі-ж нахіл разьвіцьця — ад праменьняў да лопасьцяй.

Выводзіць радзіміцкія сяміпраменныя ад так званых „мурамскіх" падвесак, вядомых фінам Окскага вадазбору, няма грунтоўных падстаў, бо падабенства паміж імі вельмі далёкае і пераход аднаго тыпу ў другі невытлумачальны. Крыху больш падабенства ў мурамскіх падвесках з вяціцкімі, але трэба мець на ўвазе, што вяціцкія вісочныя колцы набылі гэта падабенства толькі дзякуючы таму, што адышлі ад свайго першаўзору.

Таксама нельга ўстанавіць генэтычную сувязь паміж сяміпраменнымі і некаторымі падвескамі анцкай культуры — для апошніх мы маем у радзіміцкім інвэнтары іншага патомка — падвескі да маністаў (VI, 28). Цікава адзначыць, што сяміпраменныя знойдзены ва ўсіх тыпах пахаваньня ад няпоўнага трупаспаленьня да ям уключна.

Пацеркавыя вісочныя колцы ў радзімічаў вельмі абмежаваны ў ліку і знойдзены толькі ў двух пунктах — у Гочаве (трохпацеркавыя вузлаватыя) і ва Ўлазовічах, 39 (2 шт. аднапацеркавых з паставымі пацеркамі) і там-жа кург. № 34 (1 колца з насаджанымі на яго трыма рознымі пацеркамі). Дзьве апошнія знахадкі маюць характар выпадковага комбінаваньня пацерак з маністаў і звычайнага пярсьцёнкападобнага колца, комбінацыі, прыдуманай, мажліва, самой уласьніцай (IV, 4).

Трохпацеркавых вісочных колцаў больш багатага тыпу ў радзімічаў няма і толькі ў прымежных чужых курганох (Мазыкі, Кардон, Салонае) сустракаюцца трохпацеркавыя буйназярністыя. Два апошнія пункты можна аднесьці да дрэгавічоў, першы — да крывічоў.

Грыўні (табл. V). Радзіміцкія грыўні, зьяўляючыся аднэй з улюбёных жаночых аздоб, адрозьніваюцца ад грыўняў іншых пляменьняў дзьвюма рысамі, незалежнымі ад пабудовы асноўнай часткі: 1) канцы іх заходзяць адзін за другі і 2) кожны канец мае прылітаваную галоўку. Насіліся яны на шыі такім чынам, што канцы з галоўкамі прыпадалі на грудзі; процілеглая частка грыўні, якая прыпадае на задні бок шыі, часам акругляецца. Сярод радзіміцкіх грыўняў можна вылучыць тры тыпы: пласткаватыя, кручаныя і чатырохкантовыя. За аснову падзелу прымаецца будова цела грыўні.

Пласткаватыя грыўні (V, 2) — тэрмін умоўны, бо толькі на тэрыторыі вяцічаў былі знойдзены грыўні, зробленыя з пластка ўдоўж пад тупым кутам, а ў радзімічаў папярочнае сячэньне іх дае роўнаплечны трыкутнік з шырокай асновай. Але дзякуючы вялікаму куту двох верхніх бакоў, яны мала адрозьніваюцца ад пласткаватых, ды і тэрмін гэты за імі ўмацаваўся.

Галоўкі на канцох пласткаватых грыўняў бываюць вельмі рознастайнай формы ад нескладанага многагранньніка да прыгожых розэтак (V, 3-6). Для таго, каб выгодна было насіць, у тыльнай частцы грыўні рабілася акругленьне.

Амаль заўсёды абедзьве пакатасьці грыўні маюць на сабе выбіты орнамэнт, які складаецца з радоў трыкутнікаў, разьмешчаных „воўчымі зубамі", г. зн. ніжні рад трыкутнікаў зьвернуты вяршынямі ўгору, а верхні рад — вяршынямі ўніз, прычым апошнія ляжаць у прамежках паміж ніжнімі трыкутнікамі. Унутры гэтых уціснутых трыкутнікаў адлегласьць запоўнена паўкуляватымі выпуклінамі, звычайна ў колькасьці шасьці і радзей трох (V, 7 і 8).

Падобна таму, як з вісочных колцаў найбольш цікавымі для нас зьяўляюцца сяміпраменныя, так і з грыўняў найбольш цікавымі зьяўляюцца пласткаватыя. З усіх славянскіх пляменьняў яны знойдзены, у якасьці пашыранай аздобы, у адных радзімічаў.

Месцы знахадак: Туравічы, 2, Крычаў, Улазовічы, 25, 26, 29 і 41. Апрача таго яны знойдзены ў раскопках Сізова і Антановіча.

Па-за асноўнай тэрыторыяй знойдзены пры раскопках Сьперанскага ў Студзянцы і ў Гочаве. Іх значэньне пляменнай адзнакі вымагае больш падрабязнага разгляду іх генэтыкі.

Найбольш блізкай іх аналёгіяй зьяўляюцца пласткаватыя грыўні вяцічаў, вядомыя з матар'ялаў Дзяржаўнага Гістарычнага музэю ў Маскве і Разанскага музэю.

У Разанскім музэі ёсьць грыўні, знойдзеныя з сямілопаснымі і кручанымі бранзалетамі 8×3 (XIV ст.). Яны зьяўляюцца поўнай аналёгіяй радзіміцкім — папярочнае сячэньне дае таксама трыкутнік, канцы заходзяць і маюць сьляды прымацаваных некалі галовак. Толькі орнамэнт больш дробны. У такім-жа вяціцкім позьнім антуражы знойдзены грыўні ў Сьнедаўскіх курганах Зарайскага



Табл. V.

раёну, але тут яны маюць крыху іншы характар. Грыўні падобныя да Сьнедаўскіх, апісаны Арцыхоўскім (18).

Цікава тое, што адзіночныя знахадкі такіх грыўняў вяцічаў ёсьць ува ўсіх трох стадыях іх курганнай культуры.

Таксама як у адносінах сяміпраменных і сямілопасных, можна паставіць пытаньне і аб пахаджэньні ад нейкага аднаго першаўзору і радзіміцкіх і вяціцкіх грыўняў.

У неславянскіх старажытнасьцях Усходняй Эўропы даная форма грыўняў сустракаецца часта. Зьвярну ўвагу на досьлед Ефіменко (77) аб разанскіх магільніках, дзе ў Кузьмінскім магільніку быў знойдзены падобны на серп тып грыўні ў стадыі Ст, і ўжо ў стадыі ДІ быў ускладнёны падвескамі прымацаванымі да ніжняй пакатасьці. Даты: стадыі А-СІ—III-V ст.ст.; стадыі СІ-Д—VI-VII — пачатак VIII ст.

Падобныя формы даюць Лядзінскі і Томнікаўскі магільнікі (271).

Другім раёнам, насычаным гэткімі грыўнямі, зьяўляецца Прыбалтыка. Там, у Люцыне (177) Ронэбургу (23), Аўленбэргу (23), Гочаве (23), Цэмальдэне (23) і шэрагу іншых магільнікаў был знойдзены грыўны з дзьвюма пакатасьцямі, часам узбагачаныя падвескамі, часам бяз іх.

Ідучы далей на поўнач, мы знойдзем іх у Прыладажжы, дзе яны знойдзены Брандэнбургам (30) (дата—X ст.). Орнамэнт на прыладаскіх грыўнях зусім такі самы, як і на радзіміцкіх. Брандэнбург, тлумачачы гэтыя знахадкі, зьвяртае ўвагу на ўсходняе паходжаньне орнамэнту, але адзначае наступныя межы пашырэньня: Урал, Фінляндыя, Ліфляндыя, Данія, Борнгольм. Дадам, што ён даволі звычайны і для паўночнай паловы славянства, сустракаючыся на бранзалетах і пярсьцёнках. Кандакоў (230) па поваду тамбоўскіх грыўняў (Лядзінскі і Томнікаўскі магільнікі) выказаў думку, што яны зьяўляюцца копіяй візантыйскага меніску. Зусім разумеючы жаданьне візантыніста тлумачыць усё ўплывам культуры, якую ён вывучае, дазволю сабе ізноў выказаць думку аб конвэргенцыі. Досьледы Ефіменко (77) гэта пацьвярджаюць.

Вытокі радзіміцкіх грыўняў трэба шукаць недзе ў балтыцка-фінскім крузе. З першым нават больш падабенства.

Кручаныя грыўні рабіліся з трох дротаў, якія скручваліся жгутам. Канцы гэтак сама заходзяць адзін за другога і аздоблены галоўкамі.

Месцы знахадак: Праскурня, 1, Улазовічы, 25, 26, 27 і 39, Казарычы, 48, 63, 57, р. Студзёнка і Рудзянец. Цікава геаграфічнае пашырэньне данага тыпу і пласткаватага: кручаныя грыўні займаюць поўдзень радзіміцкай тэрыторыі, а пласткаватыя—поўнач, пераходзячы на поўначы нават за мяжу пашырэньня.

Чатырохгранныя (V, 8). Знойдзены адзін раз у Казарычах, 63; у папярочным сячэньні даюць ромб, сьценкі аздоблены выбітым орнамэнтам. Аналёгіі ёсьць у Прыладажжы. Адзін раз быў знойдзены (Абідавічы, 1) адменьнік—чатырохкантовай—кручаная грыўня.

Наступнай катэгорыяй будуць *падвескі* да маністаў, якія можна падзяліць на наступныя аддзелы: монэтападобныя, праразныя, фігурныя, луньніцы, крыжыкі, бразгушкі, розныя.

Яны насіліся нанізанымі на нітку, рытмічна падзяляючы пацеркі.

Монэтападобныя (VI, 1-4). Даны аддзел называецца так таму, што нярэдка падвескамі былі монэты або імітацыя іх, а ў іншых выпадках падвескі, захоўваючы агульныя абрысы монэты, зьмяняюць толькі орнамэнт.

На тыпы можна падзяляць па орнамэнту, бо тут ён зьяўляецца істотнаю часткаю, паколькі прызначэньне самой рэчы дэкорацыйнае.

Ня буду пералічаць усе тыпы, бо выразьней яны відаць на табліцы і нічога спэцыфічнага для радзімічаў не ўяўляюць; адзначу толькі знойдзеныя ва Ўлазовічах падвескі з малюнкам галавы быка.



Табл. VI.

Нідзе, апрача радзімічаў, гэты тып не сустракаўся. Некаторыя аналёгіі могуць даць уладзімірскія курганы, але, па-першае, там не падвеска, а па-другое, трактоўка сюжэту там значна грубейшая.

Праразныя падвескі даюць некалькі тыпаў: луньнічна-праразны (VI, 5, 6), дзе прарэз мае форму звычайнай луньніцы; паверхня мае на сабе выліванае псэўда-зерне. Аналёгічныя рэчы знойдзены ў Гнёздаве (197), Уладзімірскіх курганох (213) і Скандынавіі. У радзімічаў знойдзен ва Ўлазовічах, 27 і Казарычах, 48.

Некаторую цікавасьць мае тып падвескі з крыжам, уштукаваным у круг (Хізава). Падобныя падвескі вядомы з дрэгавіцкіх курганоў у Кардоне (пагранічча з радзімічамі).

Астатнія тыпы адзінічныя і няцікавыя (VI, 8).

Пераходзячы да аддзелу фігурных, павінен агаварыцца, што іх не заўсёды можна лічыць падвескамі да маністаў, бо часта яны сустракаюцца цэлымі комплексамі, якія носяцца, як відаць, іначай. Тыпы можна вызначыць наступныя: канёчкі, грабенчыкі, лыжкі, ключы, рыбы, качачкі.

Канёчкі (VI, 10) (часам іх называюць сабачкамі, але і тое і другое ўмоўна, бо ступень стылізацыі не дазваляе быць больш дакладным) вядомы значнай частцы славянства, за выключэньнем найбольш паўднёвых плямёньняў. У радзімічаў знойдзены два разы: Улазовічы, 34 і другі раз таксама ў Сураскім раёне (дакладней невядома). У другім выпадку канёчак быў падвешаны на ланцужку да падковападобнага пластка разам з іншымі рэчамі. Ва Ўлазовічах таксама ён быў знойдзены разам з іншымі фігурнымі падвескамі.

Грабенчыкі (VI, 11, 12) мэталёвыя, з дзьвюма стылізаванымі галоўкамі наверсе знойдзены ў колькасьці 2-х экзэмпляраў у Ўлазовічах, 34.

Межы пашырэньня тыя-ж, што і для падвесак-канёчкаў. У гэтым-жа кургане была знойдзена *лыжачка* (VI, 32) з дзіркай для падвешваньня. У памянёным невядомым кургане Сураскага раёну на чатырох ланцужкох вісяць, апрача канёчка, мініятурны *ножык, ключ* і *рыбка* (табл. VI, 31).

Рыбка аналёгічна знахадцы ў зямлі Наўгародзкіх славян: паводле думкі Арцыхоўскага (17)—перайманьне з асятровых рыб.

Усе памянёныя падвескі, як відаць, зьяўляліся амулетамі.

Вельмі цікавымі зьяўляюцца знойдзеныя ва Ўлазовічах, 41 і 25 касьцяныя *„качачкі“* (VI 9 тэрмін умоўны). Яны маюць завостранае к хвасту тулава, выгнутую шыю; прасьвідраваны пасярэдзіне для прывязваньня. У першым выпадку знойдзена 5, у другім—4 экзэмпляры. Здаецца, падобныя рэчы знойдзены і ў Нісімкавічах. Аналёгіі гэтым рэчам у другіх славян няма, а зусім падобныя падвескі зьяўляюцца звычайнымі для пермскіх і вяцкіх старажытнасьцяй IX—XII ст. ст. Значная прасторавая прагаліна паміж гэтымі дзьвюма знахадкамі затрудняе тлумачэньне.

Радзіміцкія *луньніцы* даюць звычайны для славянскага інвэнтару малюнак. Ніякіх новых тыпаў неназіраем. Пераважаюць луньніцы з вылітым псэўда-зярнёвым орнамэнтам, сапраўднае зерне ня знойдзена ніводнага разу.

Па клясыфікацыі В. В. Гольмстэна (52) радзіміцкія луньніцы можна падзяліць на тыпы: шырокарогія, крутарогія і язычковыя.

Месцы знахадак: шырокарогія (VI, 13): Крычаў, Туравічы, 1 і 3, Іпалітаўка, 1, Абідавічы, 1 і 2, Улазовічы, 26, 27, 28, 31, 41 і 42, Казарычы, 48 і 53, Людкава, 84; вузкарогія (VI, 15): Казарычы, 63, Цімошкін Перавоз, 99; язычковыя (VI, 17): Улазовічы, 39, Людкава, 85. Без паказаньня тыпу: Красная Слабада, Радуга, 11, р. Студзёнка, Нова-Быхаў, 4, Старая Рудня, Праскурня, 3, Каменка 5.

Крыжы ў радзіміцкім інвэнтары ёсьць, галоўным чынам, аднаго тыпу; іншыя знойдзены ў адзіночных экзэмплярах. Гэты асноўны тып умоўна можна назваць скандынаўскім (VI, 18), бо на гэта паказвае яго паходжаньне (гл. у Арнэ, 13 і 213).

Насіліся ў маністах побач з іншымі падвескамі часам па восем штук. Вырабляліся ў ліцейных формах. Месцы знахадак: Красная Слабада, 1, Улазовічы, 36, 4, Казарычы, 48, Каменка, Грамыкі, Залесьсе. Аналёгіі гэтаму тыпу ў іншых славян вядомы з Уладзімірскіх курганоў (213) і Прыладажжа (30). Адзін раз былі знойдзены маленькія выліваныя крыжыкі з трохлопаснымі канцамі.

У Казарычах, 63, у багатым пахавальніку быў знойдзены залаты эмаляваны крыжык візантыйскага тыпу (VI, 20) і ў с. Лялічах, 14—кварцавы выпілены крыжык, які называецца Кандаковым (230) „корсунскім“ (VI, 21). У раскопках Антановіча (4) быў знойдзен адзін раз крыжык—расьпяцьце, які датуецца XI ст.

Невялікі аддзел падвесак-крыжоў гэтым сьпісам вычарпаны.

Бразгушкі. Аддзел бразгушак можа быць падзелены на тры тыпы: накрыж-праразныя, праразныя (з адным прарэзам) і двустворчастыя. Першыя два тыпы, за выключэньнем прарэзу, маюць вельмі многа супольнага. Размеры іх аднолькавыя—прыблізна звычайны арэх, форма крыху няправільная, унутры часам ёсьць ядзёрка.

Месцы знахадак накрыж-праразных (VI, 22): Дубейкава, Крычаў, Туравічы, 3, Улазовічы, 25 і 41, Казарычы, 49. Просты праразны тып (VI, 23), які лічыцца больш позьнім, знойдзены ўсяго адзін раз у Людкове.

Двустворчастыя (VI, 24) бразгушкі знойдзены выключна ў якасьці падвескі да нітак пацерак. Яны даволі шматлікія—у адным пахаваньні іх знаходзяць па 20—30 штук. Вырабляліся яны з двух вылітых палавін, адна з якіх мела вушка; ніжняя частка орнамэнтавалася рубчыкамі, якія разыходзяцца радыяльна.

Месцы знахадкі на тэрыторыі радзімічаў: Касьцюковічы, Туравічы, 1 і 3, Нова Быхаў, 4, Абідавічы, 2, Праскурня, 1, Улазовічы, 27, 43 і выпадковыя знахадкі—Людкава, 77, Гэтманская Буда, 54, В. Шчарбінічы, 59, Прыборы, Янаўка.

Найбольш пашыраным гэты тып зьяўляецца на тэрыторыі севяран. У іншых пляменьняў (у такой колькасьці на адно пахаваньне) ня знойдзены.

У апошнім аддзеле падвесак пад агульным загалоўкам „розныя“ абʼядналы наступныя тыпы:

1. Біэліпсоідны (VI, 25). Падвеска мае выгляд крыжа, складзенага шляхам пераплятаньня двух эліпсаў. Палоскі, якія ўтвараюць эліпсы, маюць закраіны і пуката-кропачны орнамэнт паміж імі. У больш позьніх пахаваньнях дэталі зьнікаюць, падвеска мае выгляд крыжыка з дзіркамі, а часам бяз іх (VI, 26 і 27).

Знойдзены: Хізава, Улазовічы, 36, Дэрабуж. Па-за тэрыторыяй радзімічаў знойдзены толькі ў Колчыне, які мяжуе з радзімічамі. Гэта дае права бачыць у ёй адну з чыста-радзіміцкіх рэчаў.

Паходжаньне данага тыпу вядзе нас у Прыбалтыку і яшчэ далей у германскія і кельцкія вобласьці. Калі нідзе ня знойдзены такія падвескі, дык знойдзены орнамэнт у выглядзе пераплёту двух эліпсаў, які супадае з нашай падвескай ва ўсіх дэталях. Такі орнамэнт ёсьць на бранзалетах з Ленінградзкіх курганоў (211), на фібулах з Фрысьляндыі (Aberg The anglo-sax in England), у ірляндзкіх мініятурах.

2. Гранкавы (VI, 28). Падвескі гэтага тыпу маюць круглую аснову, орнамэнтаваную пукатымі кропкамі і невялічкія гранкі з псэўда-зернем па баках. Знойдзены ў Хізаве і Туравічах. Таксама як і папярэдні тып, нідзе, апрача радзіміцкай тэрыторыі, ня знойдзен. Як на магчымы першаўзор, можна паказаць на шэраг рэчаў, якія Сьпіцын (218) прыпісвае антам (некаторыя падобныя падвескі выданы Хампэлем, 245). Заўважаецца пэўны заняпад тыпу—ён страціў сваю трохмернасьць, зрабіўся больш плоскім, захоўваючы абрысае падабенства.

3. Язычковы (VI, 29). Гэтыя падвескі маюць форму плоскага язычка, які паступова ўніз звужаецца. Часам знаходзяць у адным пахаваньні ў колькасьці да 25 штук.

Знойдзены ў Касьцюковічах, Елізавецінe, 28, Улазовічах, 29 і 39.

4. Пятлісты (VI, 30). Падвескі данага тыпу складаюцца з мэталёвай палоскі, орнамэнтаванай таксама як і ў біэліпсоідных. Палоска выгінаецца, утвараючы дзьве пятлі. Месцы знахадак: Каменка, 5, Улазовічы, 36, Казарычы, 53, Нісімкавічы, Марынаўка.

Па-за тэрыторыяй радзімічаў не знойдзены.

Усе пералічаныя чатыры тыпы маніставых падвесак могуць лічыцца племеннымі адзнакамі радзімічаў.

Пацеркі (табл. VII). Пры клясыфікацыі радзіміцкіх рэчаў, як і ў іншых культурах, пацеркі зьяўляюцца найбольш складанай катэгорыяй. Значная разнастайнасьць матар'ялу, колеру, формы, малюнку абумовіла гэту складанасьць.

Пацеркі насіліся нанізанымі на ільняныя ніткі (як выключэньне, нанізваліся на дрот). На адным касьцяку знаходзяць некалькі нітак пацерак. Пераважаюць дробныя няяркія пацеркі, якія рытмічна перабіваюць больш буйныя і каляровыя пацеркі або мэталёвыя падвескі. Падзел на групы зроблены паводле матар'ялу, на тыпы, паводле формы.



Табл. VII.

Сердалікавыя біпірамідальныя (VII, 1), якім прысьвечана спэцыяльная праца Арцыхоўскага (16), знойдзены ў радзімічаў некалькі разоў: Красная Слабада, 1, Лялічы, Улазовічы, 19 і 34, Казарычы 62 і 63, Людкава, Ціманавічы, Гэтманская Буда.

Прызматычныя (VII, 2). Радуга, 12, Абідавічы, 2, Улазовічы, 19, Лялічы, Гулеўка, Гэтманская Буда.

Пліткаватыя (VII, 3). Гэты тып у славян сустракаецца значна радзей, чым два папярэдніх (дрэгавічы, Прыладажжа, севяране). Першаўзор яго трэба шукаць у папярэдніх культурах — анцкай, гоцкай і інш. У радзімічаў знойдзены пераважна ў паўднёва-ўсходняй частцы іх тэрыторыі: Лялічы, 12, Кархаўка, 29, В. Шчарбінічы, 58, Лугавец, Казарычы, 63.

Астатнія два тыпы эліпсоідны (VII, 4), Туравічы, 88 і сфэрычны (VII, 5), Гэтманская Буда, 54, адзінічныя і не характэрныя.

Крышталёвыя (табл. VII, 6 і 7) пацеркі знойдзены тры разы. У адным выпадку гэта перайманьне з сэрдолікавых біпірамідальных (Абідавічы, 2), а ў двух другіх многагранная форма, якая адрозьніваецца ад крышталёвых пацерак наўгародзкіх славян сплюшчанасьцю з бакоў (Унукавічы, 88, Цімошкін Перавоз).

Амэтыставыя (VII, 8) ёсьць у радзімічаў аднэй формы — сплюшчанага эліпсоіду. Знойдзены ў Дубейкаве і Улазовічах, 19.

Агатавыя (VII, 17). Знойдзена толькі адна вялікая прызматычнай формы пацерка (Кархаўка, 70).

Бурштынавыя пацеркі адзін раз знойдзены ў форме, падобнай на біпірамідальную сэрдалікавую (Гулеўка, 40); астатнія маюць эліпсоідную форму, падобную да амэтыставых. Месцы знахадак: Селішча, 54, Карма, 17 і 18, Нісімкавічы, 14, Радуга, 12, Улазовічы, 26, Казарычы, 62.

Шкляныя пацеркі адны з найбольш шматлікіх у радзімічаў, як, між іншым, і ўсюды. Іх для зручнасьці разгляду лепш за ўсё падзяліць на тры групы: — пазалочаныя, пасярэбраныя і каляровыя.

Пазалочаныя (VII, 9—12) пацеркі ў радзімічаў ёсьць чатырох тыпаў: бачкаватыя, цыліндрычныя, прызматычныя, вачкаватыя і цыліндрычныя рабрыстыя.

Бачкаваты (VII, 9) тып А. В. Арцыхоўскі (18) лічыць характэрным для крывічоў, але шматлікія знахадкі яго ў радзімічаў дазваляюць пашырыць яго палажэньне. Месцы знахадак: Лялічы, 14, Людкава, Ціманавічы, 2, Гэтманская Буда, 50, В. Шчарбінічы, 58, Кархаўка, 70, Улазовічы, 19, 28 і 39, Дубейкі. Паўсюднасьць пашырэньня не дазваляе аднесьці яго на кошт уплыву крывічоў.

Цыліндрычныя (VII, 10) знойдзены: Цыманавічы, 2, Улазовічы, 19, 26, 29 і 39, Кархаўка, 70, Казырычы, 48, Туравічы, Дубейкі.

Вачкаватыя (VII, 12). Маюць форму кароткай простакутнай прызмы, на чатырох баках якой ёсьць выпукліны, абмежаваныя з двух бакоў складкамі. Найбольш рэдкі тып з пазалочаных пацерак. Знойдзены: Дубейкі, Туравічы, 2, Улазовічы, 29.

Рабрыстыя (VII, 11). У папярочным разрэзе даюць розэтку. Месцы знахадак: Дубейкі, Улазовічы, 29 і 34, Старая Рудня, Людкава, 82, Цімошкін Перавоз, 106.

Пасярэбраныя шкляныя пацеркі па сваёй форме такія-ж самыя як і пазалочаныя, але сустракаюцца значна радзей.

Бачкаватыя (VII, 13) — Улазовічы, 29 і бяз №№.

Цыліндрычныя (VII, 14) — Туравічы, 2, Людкава, 82.

Вачкаватыя (VII, 16) — Улазовічы, 29.

Рабрыстыя (VII, 15) — Туравічы, 2, Улазовічы, 29, Людкава, 82, Цімошкін Перавоз, 106.

Шкляныя каляровыя пацеркі даюць, галоўным чынам, сінія і зялёныя адценьні. У маністах сустракаюцца ў невялікай колькасьці. Тыпы: бітрапэцоідны (VII, 18) — Улазовічы, 36, дыняпадобны (VII, 21) — Улазовічы, 36 (сінія), Цімошкін Перавоз, 106, вінтападобны (VII, 22) (сінія) — Туравічы, 1, Улазовічы, 36, Казарычы, 63, Людкава.

Апошні тып — сінія падвойныя, якія складаюцца з дзьвюх, злучаных разам пацерак круглай формы. Месцы знаходак: Нісімкавічы, 13, Абідавічы, 1 і 2, Казарычы, 48, Гулеўка, 40 і 4.

Шмат радзіміцкіх пацерак зроблена з нейкай штучнай сумесі, якая звычайна называецца пастай. Паставыя пацеркі можна падзяліць на аднакаляровыя і шматкаляровыя.

Аднакаляровыя паставыя падзяляюцца на чатыры тыпы:

1. Карлікавыя (VII, 20). Бываюць розных колераў, але, галоўным чынам, бледных шэра-цынамонавых адценьняў. Складаюць галоўную масу ў радзіміцкіх маністах. Месцы знахадак: Касьцюковічы, Елізавеціна, 38, Праскурня, 1, Улазовічы, 26, 29, 31, 34, 36, 39, 41 і 42, Казарычы, 48 і 63, Людкава, 77.

2. Цыліндрычныя знойдзены толькі адзін раз у Улазовічах, 36.

3. Простакутныя (VII, 23). Форма — простакутная прызма з некалькі акругленымі сьценкамі. Колер зьмяняецца ад шэра-цынамонавага да цёмна-чырвонага. Месцы знахадак — Улазовічы, 31 і 36, Казырычы, 48 і 63, Людкава, 77, В. Шчарбінічы, 59, Касьцюковічы, Туравічы, 1, Абідавічы, 1.

4. Цытрынападобныя (VII, 24). Гэты тып пацерак звычайны ў старажытнасьцях паўночна-ўсходніх фінаў, датуецца там X ст. (даныя А. П. Сьмірнова); мае форму цытрыны („лимона") з двума выступамі па баках. Жоўты колер гэтых пацерак падкрэсьлівае падобнасьць. Знойдзены ў Туравічах, 3, Улазовічах, 36.

Шматкаляровыя паставыя ў радзімічаў прадстаўлены нямногімі паасобнікамі, звычайна па 1-2 на маніста. Тыпы:

1. Беларомбічны (VII, 25). Форма пацерак амаль кубічная, колер сіні; на чатырох сьценках устаўлены белыя ромбы. Знойдзены: Улазовічы, 43, і Гулеўка, 40.

2. Паласаты (VII, 26). Форма набліжаецца да цыліндрычнай, палосы пераразаюць пацерку ўпоперак. Знойдзены: Улазовічы, 36 (жоўтыя палосы на чорным фоне) і Казарычы, 63 (чорныя палосы на белым фоне).

3. Вачкаваты (VII, 27). Гэты тып мае сфэрычную форму, колер фону жоўты або чырвоны і 2-3 круглыя вочкі зялёнага ці жоўтага колеру. Розныя каляровыя адценьні робяць гэты тып асабліва багатым. Знахадкі яго ў культурах неславянскіх часьцей, чым у славянскіх. У радзімічаў знойдзены толькі тры разы: Улазовічы, 39, 41 і 42.

4. Восевы (VII, 28). Пацеркі данага тыпу маюць сфэрычнае, крыху сплюшчанае цела і выступы, якія выходзяць па баках; гэтыя выступы афарбаваны ў другі колер, што стварае ўражаньне нібы пацеркі ўзьведзены на кароткую вось.

Знойдзены ў Лялічах, 12 і Улазовічах, 42.

Апрача пералічаных груп (каменныя, шкляныя, паставыя), радзіміцкія курганы даюць яшчэ мэталёвыя і касьцяныя пацеркі.

Мэталёвыя пацеркі ўсе належаць да тыпу *„буйназярністых*, менскіх" (VII, 29). Па надворнаму выгляду іх часам называюць муфтачкамі. Знойдзены: Красная Слабада, Нісімкавічы, Нова-Быхаў, Вішчын, 1, Праскурня, 2, Кардон, 3, Гэтманская Руда, 50, Пахом'еў манастыр і Цярухі.

Даны тып лічаць аднэй з племенных адзнак дрэгавічоў. Знахадкі на тэрыторыі радзімічаў гэта пацьвярджаюць, бо большасьць іх зроблена на радзіміцка-дрэгавіцкім прымежжы.

Гаворачы аб мэталёвых пацерках, трэба адзначыць, што часам у маністах насілі кавалкі пярсьцёнкаў, як відаць у якасьці пацерак (Улазовічы, 25). Касьцяная пацерка знойдзена адзін раз у Улазовічах, 25. Адзін раз былі знойдзены хрыбеткі рыбы, якія насіліся ў маністах (Радуга, 12).

На жаль, пацеркі, якія знаходзяць у радзімічаў, не дазваляюць вылучыць які-небудзь тып, які мог-бы лічыцца характэрным для данага племені.

Нагрудныя пражкі. Рэчы гэтай катэгорыі служылі для зашпільваньня верхняга адзеньня Падзяляюцца на чатыры тыпы:

1. Падковападобныя (III, 10 і 11) — Касьцюковічы, Абідавічы, 2, Улазовічы, 27, Казарычы, 45, Гулеўка, 41 і 46, Цімошкін Перавоз, 102; 2. Праманістыя (III, 12) — Ст. Рудня, 1, Улазовічы, 27; 3. Колападобныя (III, 13) — Елізавецінa, 30, Улазовічы, 39 і 4. Гранкавыя (III, 14) — Улазовічы, 39.

Усе паказаныя тыпы маюць вельмі шырокае распаўсюджаньне як у літоўска-фінскіх, так і ў паўночна славянскіх культурах.

Нідэрле (145) лічыў праманістыя пражкі тыповымі для радзімічаў і зьвязваў іх з сяміпраменнымі. Але ўжо адзін той факт, што ў радзімічаў яны знойдзены толькі два разы, а па-за радзіміцкай тэрыторыяй дзесяткі разоў, павінен крыху пахіснуць гэта сьцьверджаньне.

Бранзалеты (VIII) у радзімічаў параўнаўча нешматлікія і не ідуць у параўнаньне з бранзалетамі наўгародзкімі і вяціцкімі, якія зьяўляюцца вельмі добрым матар'ялам для датаваньня. Можна намеціць наступныя аддзелы мэталёвых бранзалетаў: гладкія, кручаныя, плеценыя, пласткаватыя, рэльефныя.

Гладкія (VIII, 1) маюць два тыпы: тонкаканцовы і шырокаканцовы. І ў тым, і ў другім выпадку аснова бранзалету зроблена з гладкага дроту, адрозьніваюцца толькі канцы. Шырокія канцы часам аздабляліся насечаным орнамэнтам.

Тонкаканцовыя (VIII. 1) знойдзены: Туравічы, 2, Цярухі, Улазовічы, 25, 27, 41, 42 і 48.
Шыроканцовыя (VIII, 3): Каменка, 5, Людкава, 8, Улазовічы, 39, Казарычы, 57 і 63.
Кручаныя бранзалеты могуць быць падзелены на тры тыпы:

1. Абсечаныя (VIII, 5). Паводле тэрміналёгіі Арцыхоўскага — ложнакручаныя, разамкнутыя. Першая частка гэтага тэрміну, якая разумеецца ў тым сэнсе, што даныя бранзалеты адліваліся ў форме, зробленай з сапраўды кручанага бранзалету, выклікае сумненьне; больш уважлівы разгляд дазваляе лічыць іх кручанымі, але праакованымі настолькі, што першапачатковыя тры драціны, з якіх яны выраблялііся, дэфармаваліся. У радзімічаў знойдзены два разы: у Людкаве, 77 і ў Цярухах.



Табл. VIII.

2. Завязаныя (VIII, 6). Скручваліся з трох драцін (або аднэй складзенай утрое), канцы завязаны. Месцы знахадак: Казарычы, Дубейкі, Крычаў, Праскурня, 1 і ў раскопках Сізова ў Смаленскай губ.

3. Пятлістыя (VIII, 7) рабіліся з аднаго складзенага ўтрое дроту, дзякуючы чаму на канцох атрымоўваліся петлі. Знойдзен толькі адзін раз у Казарычах, 53.

Плеценыя (VIII, 4) бранзалеты рабіліся з некалькіх тонкіх дроцікаў, такім чынам, што аснова бранзалету мела тры рабры. Канцы завязваліся. Знойдзены: Улазовічы, 39, Казарычы, 48, Карма, 18.

Пласткаватыя (VIII, 8—11) могуць быць падзелены на тры тыпы: масыўны-тупаканцовы (Казарычы, 57, Лялічы, 12), *авальнаканцовы* (Красная Слабада) і *круглаканцовы* (Казарычы, 53). У апошнім выпадку кругі на канцох былі аздоблены абразком чалавечай галавы.

Рэльефныя (VIII, 12—15) бранзалеты падзяляюцца на двускатыя (Дубейкі, Туравічы, Пахом'еў манастыр), зьвярынагаловыя (Казарычы, 46, Праскурня, 1, раскопкі Сізова ў Смаленскай губ.), прадоўжна-рабрыстыя (Улазовічы, 39) і ложнаплеценыя (Казарычы).

З гэтых бранзалетаў найбольш цікавымі зьяўляюцца зьвярынагаловыя. Цэнтар іх пашырэньня — Прыбалтыка, дзе яны зьяўляюцца даволі звычайным тыпам (177). На якога зьвера падобны бранзалет — сказаць цяжка; на прыбалтыцкіх паасобніках лёгка вызначаюцца вушы; яны захоўваюцца і на нашых бранзалетах. Часам да іх прыстасоўваюць тэрмін „зьмяінагаловыя". Не бяручы на сябе сьмеласьць сьцьвярджаць існаваньне вушастай зьмяі, пакідаю пытаньне адчыненым.

Яшчэ застаецца ўспамянуць аб шкляных бранзалетах. Гэта група вельмі звычайная для славянскіх гарадзішчаў і рэдкая ў сялянскіх курганах. У радзімічаў шкляныя бранзалеты знойдзены ў Лялічах і Нова-Быхаве.

Пярсьцёнкі (IX). Аднэй з найбольш пашыраных аздоб (ня толькі жаночых, але і мужчынскіх) зьяўляюцца пярсьцёнкі. Іх знаходзяць іншы раз па 10—14 штук у адным пахаваньні (напр., Карма, 18).

Радзіміцкія пярсьцёнкі падзяляюцца на наступныя аддзелы: гладкія, пласткаватыя, рэльефныя, кручаныя, шыракасярэдзінныя, шчытковыя.

Гладкія (IX, 1) робяцца шляхам згінаньня ў колца кавалку дроту. Адрозьніваюцца ад такіх-жа вісочных колцаў толькі тым, што знаходзяцца на касьцяку. Месцы знахадак: Гулеўка, 36, 38, 40

і 46, Красная Слабада, Нісімкавічы, 14, В. Шчарбінічы, 59, 61 і 63, Нова-Быхаў, 2, Абідавічы, 1, Вішчын, 3.

Пласткаватыя (IX, 2—4) маюць, як і гладкія, незьлітаваныя канцы, часам маюць на сабе насечаны орнамэнт. Месцы знахадак: Улазовічы, 25, Казарычы, 49 і выпадковыя знахадкі.

Рэльефныя (IX, 5—10) падзяляюцца на тыпы: 1) двускатныя (Улазовічы, 29, Красная Слабада), падобны да аднайменных грыўняў і бранзалетаў; 2) прадоўжна-рубчатыя, якія мае складку ў сярэдняй частцы (Казарычы, 49 і 53); 3) закраінныя, дзе паверхня пярсьцёнка, часта



Табл. IX.

орнамэнтаваная, абмежавана зьверху і зьнізу двума выступамі, якія ідуць удоўж ўсяго пярсьцёнка (Крычаў, Туравічы, Лялічы, 12, Улазовічы, 25, 28, 29, Казарычы, 46 і 47, Кархаўка, 70).

Кручаныя (табл. IX, 11—14) пярсьцёнкі, або падобныя да іх выліваныя (розьніцу не заўсёды можна ўстанавіць па справаздачах), у большасьці выпадкаў маюць пашыраную сярэдзіну і вузкія нязлучаныя канцы. Звычайныя для славян.

Месцы знахадак: Карма, 18, Пятроўск, 6, Радуга, 11, Лялічы, 8 і 9, Высокае, 7, Улазовічы, 29 і 36, Казарычы, 36, 53 і 54, Малы Топаль, Праскурня, Каменка, 5, Вішчын, 1. Адзін раз (у Гулеўцы, 38) быў знойдзен пярсьцёнак кручаны 1╳3 з пятляватымі канцамі.

Шырокасярэдзінныя маюць два падразьдзелы: „вусатыя" (IX, 15), зробленыя з шырокага пластка са скручанымі ў трубачку і прокованымі канцамі, закручанымі кожны ў адзін абарот. Такім чынам, увесь пярсьцёнак ахапляе палец у тры абароты. Амаль заўсёды орнамэнтаваны выбітым орнамэнтам з трыкутнікаў, зусім такім-жа, як і на грыўнях.

Межы пашырэньня ў паўночнай часьці славянства даволі шырокія. У радзімічаў знойдзены: Крычаў, Улазовічы, 25 і 41, Старая Рудня.

Другі тып шырокасярэдзінных — суцэльныя (IX, 16) — ня маюць зусім канцоў — яны або зьлітаваны, або завязаны. Шырокая частка пластка аздаблялася орнамэнтам. Месца знахадак: Туравічы, Улазовічы, 39, Цімошкін Перавоз, 105.

Шчытковыя (IX, 19) пярсьцёнкі падобны на папярэдні тып, але ў іх пашыраная частка ўтварае шчыток. Часам шчыток прылітоўваўся. Знойдзены ў Гэтманскай Будзе, 50 і ў Цімошкіным Перавозе, 106, Туравічы, 3. У апошнім выпадку овальны шчыток меў надпіс кропкамі (IX, 21).

Апісаўшы конспэкцыйна археолёгічны матар'ял асноўнай тэрыторыі радзімічаў, наколькі мне дазволілі справаздачы і колекцыі, неабходна закрануць два пункты па-за гэтай тэрыторыяй, дзе тым ня менш знойдзены, бязумоўна, радзіміцкія рэчы.

Адзін з гэтых пунктаў — с. Студзёнкі, Рыльскага раёну, дзе раскопкамі Спэранскага (205) былі выяўлены радзіміцкія пахаваньні на гарызонце з сяміпраменнымі вісочнымі колцамі і пласткаватымі грыўнямі.

Другі пункт — вядомы Гочаўскі магільнік на р. Псьле, дасьледваны Д. Я. Самаквасавым (191) і П. С. Рыкавым (185).

Тыпы пахаваньняў і іх эволюцыю мы наглядаем зусім такія-ж, як і ў радзімічаў. Рэчы маюць мяшаны севяранска-радзіміцкі характар з дадаткам стэпавых элемэнтаў. З рэчаў, якія лічацца радзіміцкімі, знойдзены — сяміпраменныя вісочныя колцы і пласткаватыя грыўні.

dubadam

Разьдзел II.

Граніцы і даты.

Азначаць граніцы славянскіх пляменьняў стала магчыма толькі тады, калі ў агульных рысах былі вывучаны ў археолёгічных адносінах усе раёны Ўсходняй Эўропы. Касьцяком для картаграмы зьявіліся даныя летапісу, дэталі-ж былі атрыманы шляхам аналізу археолёгічнага матар'ялу.

На жаль археолёгам пры выкарыстоўваньні помнікаў матар'яльнай культуры для азначэньня граніц пляменьняў зусім немагчыма карыстацца „рычагамі культуры"—прыладамі вытворчасьці. Параўнаўчая аднастайнасьць гаспадарчых умоў і тэхнічных навыкаў усходніх славян у лепшым выпадку дазваляе па прыладах вытворчасьці аддзяліць іх ад фінаў або вандроўнікаў, але на большае, на высьвятленьне ўнутрыславянскіх плямённых падзелаў не дае паказаньняў.

Сучасная этнографія для невялікіх, з аднастайнай гаспадарчай будовай, раёнаў мае дыялектолёгічныя даныя, а таксама даныя матар'яльнай культуры, якая разумеецца ў самым шырокім сэнсе



Карта № 1.

Адзеньне зьяўляецца амаль самай надзейнай адзнакай пры вывучэньні таго або іншага этнографічнага раёну.

Азначэньне племені IX—XI ст. нам давядзецца праводзіць спачатку толькі ў такім этнографічным аспэкце, намячаючы граніцы распаўсюджаньня тых або іншых (этнографічных для XX ст. і археолёгічных для X) адзнак.

За адсутнасьцю пакуль што іншых матар'ялаў асноўнай кіруючай адзнакай славянскіх пляменьняў можна лічыць жаночыя аздобы, з якіх на першае месца трэба паставіць вісочныя колцы. Работамі Сьпіцына (207) можна лічыць даведзеным тэзіс, што амаль кожнае ўсходня-славянскае племя мела свой тып вісочных колцаў.

Выходзячы з тэксту летапісу, які зьмяшчае радзімічаў на Сажы, мы будзем мець для аднаго і прылягаючых раёнаў наступны малюнак: верхняе Прыдняпроўе і вышнявіны Сажа заняты бранслетападобнымі і вісочнымі колцамі, з паўднёвага ўсходу да вадазбору Сажа падыходзяць сьпіральныя вісочныя колцы, з усходу—сямілопасныя і з захаду—малыя паўтараабаротныя. Гэтым ужо намечаны нейкія провінцыі на этнографічнай карце старадаўняй Русі. Кіеўскі летапісец называе кожную краіну асобным імем. У гэтым разьдзеле я ня буду вырашаць пытаньня аб тым, што разумелася пад гэтымі назвамі ці толькі этнографічны раён (погляд Серадоніна, 194), ці таксама і некаторая палітычная аб'яднанасьць, а зраблю спробу азначыць граніцы тэй часткі ўсходняга славянства, якая называлася радзімічамі. Працягваючыназіраньні над арэаламі вісочных колцаў, мы атрымаем для большай часткі басэйну Сажа сяміпраменныя вісочныя колцы. Азначаныя вышэй па вісочных колцах суседзі будуць: крывічы і севяране, вяцічы і дрыгавічы. Сяміпраменныя з пэўнасьцю могуць быць прыпісаны радзімічам

„Сърѣте е на рѣцѣ Пищанѣ и побѣди радимичи“. (Летапіс рэдакцыі 1039 г.) (258).

„...и приедъѣша сѣдоста Радим на Съжю и прозвашася радимичи“. (рэдакцыя пач. XII ст.).

Гэтых двух сьведчаньняў летапісца зусім дастаткова для таго, каб прызнаць, што людзі, якія насілі у X-XI ст. сяміпраменныя і радзімічы, якіх перамагалі палкі Уладзіміра—гэта адно і тое-ж.

Вісочныя колцы былі адзнакай, якая найбольш кідалася ў вочы, і зусім натуральна, што пры больш пільным вывучэньні выявіліся і іншыя. Так, для дрыгавічоў можна назваць буйназярністыя пацеркі, а для вяцічаў Арцыхоўскім вызначаны чатыры адзнакі, апрача вісочных колцаў.

Для радзімічаў такімі іншымі адзнакамі будуць рэчы, знойдзеныя толькі на тэрыторыі сяміпраменных або ў раёнах, якія непасрэдна мяжуюць з ёю. Да іх трэба аднесьці: двускатна-пласткаватыя грыўні, біэліпсоідныя падвескі, падвескі „анцкага“ тыпу, пятляватыя і язычковыя.

Менш надзейнай адзнакай будуць пахавальныя абрады—яны эволюцыянавалі на ўсёй тэрыторыі



Карта № 2.

ўсходняга славянства ў адным напрамку, і зьмены абраду з пляменнымі падзеламі супадаюць далёка не заўсёды. Але як дапаможны матар'ял яны, зразумела, могуць быць выкарыстаны.

З дапамогаю ўсіх гэтых даных, маючы адпраўным пунктам сьведчаньні летапісу і пункты знахадак сяміпраменных, якія з імі супадаюць, паспрабуем акрэсьліць межы расьсяленьня радзімічаў (гл. вышэй карту тэрыторыі радзімічаў).

На захадзе стрыжанем граніцы быў Дняпро, але паселішчы радзімічаў пераходзяць і на правы дрыгавіцкі бераг, роўна як некаторыя курганныя групы на левым беразе можна прыпісаць дрыгавічом.

Пасоўваючыся ад вусьця Сажа ўверх па Дняпры, мы заўважаем, што ў той час, як правы бераг ракі мае густую сетку курганных груп, левы зусім пустынны да вусьця Бярозы. Гэта, напэўна, трэба тлумачыць значнай забалочанасьцю кута паміж Дняпром і Сажом. За межамі гэтых балот ляжаць паселішчы, якія непасрэдна мяжуюць з радзіміцкай тэрыторыяй: Максеўка, Прыборы; паўночней: Бярвенаўка, Салонае, Будзішча, Чабатовічы. Дзьве першыя групы, дасьледваныя вельмі неахайна інжынэрам Філонавым (181), ня маюць нічога, што супярэчыла-б іх далучэньню да радзіміцкіх, хаця характэрных адзнак і няма. Але-ж далёка не заўсёды пляменныя адзнакі сустракаюцца ва ўсіх курганох нават у цэнтральных раёнах. Адносна трох апошніх груп можна з бельшай упэўненасьцю гаварыць аб радзімічах, хаця ўсё-ж адсутнасьць справаздач Антановіча (Салонае, Будзішча) не дазваляе дакладна высьветліць археолёгічны твар данай мясцовасьці.

Адрэзаныя ад пералічаных груп вялікімі балотамі правабярэжныя курганы даюць нам малюнак, незнаёмы для тэрыторыі радзімічаў. Магільнікі каля вусьця Сажа (Сянское, Мохаў) даюць курганы з трупаспаленьнем у урне. Гэты тып трупаспаленьняў добра вядомы з раскопак Самаквасава (188) і Антановіча (5) у раёне ніжняй Дзясны і Сэйму. Змыкаючымі зьвеньнямі зьяўляюцца блізкі севяранскі Любеч і групы Сібераж, Табаеўка і інш.

Севяранскія курганы маюць у гэтым раёне сваю крайнюю паўночна-заходнюю граніцу. Апошнім магільнікам такога тыпу можна лічыць с. Курганьне (82) каля Рэчыцы. Але ўжо блізка Рэчыцы, на тым-жа правым беразе, сустракаюцца курганы, прыпісаць якія севяранам нельга,—у Гарыводах (82) былі знойдзены крывіцкія бранзалетападобныя колцы.

Гаварыць аб радзімічах на гэтым адрэзку Дняпра грунтоўных падстаў няма.

Далей на поўнач на кавалку ад вусьця Бярозы да вусьця Друці мы заўважаем паселішчы ўжо на абодвух берагох: Елянец, Кардон, Старая Рудня на левым і Каменка, Праскурня, Салонае, Лучын-на правым. З левабярэжных прызнаць за радзіміцкія можна курганы каля Старай Рудні, у той час як у Кардоне назіраюцца пахаваньні ў глыбокіх грунтавых ямах (да 2-х мэтраў) і з тыпова дрыгавіцкімі рэчамі—буйназярністымі пацеркамі. Елянец мае курганы з падсыпкам пад касьцяком з каляровага пяску—адзнака, якая паказвае часткова на дрыгавічоў (?). На правым беразе, бязумоўна, радзіміцкія курганныя групы ў Каменцы і Праскурні, дзе знойдзены сяміпраменныя вісочныя колцы, мужчынскія пахаваньні галавою на ўсход і іншыя чыста радзіміцкія элементы. Але ўжо Салонае дае інвэнтар дрыгавіцкі, а Лучын—тыповы для крывічоў набор з шасьці бранзалетападобных вісочных колцаў. Ёсьць некаторыя падставы пасоўваць мяжу радзімічаў крыху далей на захад да р. Ала, дзе раскопаныя Мышанковым (142) курганы даюць злучэньне радзіміцкага абраду (мужчын галавою на ўсход) і дрыгавіцкага інвэнтару—багата зярнёвых пацерак.

Далей на поўнач мяжа пойдзе да Стара-Быхава, блізка якога радзіміцкія пахаваньні знойдзены па р. Ухлясьці і адтуль ужо паварачае на паўночны ўсход—Грэзівец (пакідаючы на поўдні вядомую Пешчань)—Касьцюковічы—Стракайлы. У гэтым раёне, калі пасоўвацца ўверх па Сажы, мы сустрэнем каля Мсьціслава Дубейкава падобнае з радзіміцкімі групамі, а яшчэ далей на поўначы (на мяжы былой Магілеўскай губ.)—Мазыкі, у якіх ні абрад пахаваньня, ні рэчы нельга лічыць радзіміцкімі. Ёсьць бранзалетападобныя вісочныя колцы; так што дакладней за ўсё гаварыць аб крывічох.

Ідучы ўсьлед за радзіміцкімі паселішчамі на ўсход, мы павінны будзем далучыць да іх Асьцёр, Стомяць (Дзерабуж) (130). Адсюль, з раёну Рослаўлю вясьці мяжу далей на ўсход на Дзясну няма падстаў. За Дзясной ужо ідуць суцэльныя крывіцкія і вяціцкія паселішчы на Снопаці і Бюлве. Толькі ў адной групе (Колчына), у аснове сваёй крывіцкай, але прымежнай з вяцічамі, знойдзены радзіміцкія элементы (біялінсоідныя). Паўднёва-ўсходняй канцовасьцю рослаўскага адменьніку радзіміцкай культуры (які характарызуецца некаторымі прамежнымі тыпамі вісочных колцаў паміж радзіміцкімі і вяціцкімі можа зьяўляцца магільнік в. Пекліна на Дзясьне каля вусьця Вяцьмы (253).

Ад гэтых крайніх усходніх пунктаў мяжа радзімічаў ідзе на поўдзень па заходнім баку лясных масываў Дзябранска-Трубеча.

Аб раёне між Судасьцю і Дзясной мы ня маем ніякіх археолёгічных даных, але няма нічога неймавернага ў тым, што ён у той час і ня быў заселены, бо нават на сучаснай карце левы бераг Судасьці і значная паласа на ўсход зусім пазбаўлены якіх-бы то ні было паселішчаў (206). Найбольш усходнія паселішчы радзімічаў у гэтым месцы ляжаць на правых прытоках Судасьці. Можна назваць групы курганоў б. Мглінскага пав. (46): Запольле, Лізагубка, Разрытае. У гэтых месцах непасрэднага злучэньня радзімічаў з іншым племенем ня было: натуральная мяжа была вялікай перашкодай для зьбліжэньня.

Тамака, дзе гэта натуральная мяжа канчаецца, мы бачым шчыльнае датыканьне радзімічаў з суседзямі. Асабліва цікавы раён Стародубу, які ляжыць на поўдзень ад паказаных груп, дзе адчуваюцца радзіміцкія элементы ў Мярынаўцы, але даволі слаба і прытым побач з элементамі крывіцкімі. Атрымліваецца малюнак зусім аналёгічны таму, які наглядаўся ў Колчыне. Але ваколіцы параўнаўча вялікага гораду Стародубу ўсё-ж, ня гледзячы на наяўнасьць радзіміцкіх і крывіцкіх элементаў, належалі, як відаць, севяранам. У суседняй групе ў Левінцы ёсьць старажытныя севяранскія пахаваньні (можна гаварыць ад IX ст.)—трупаспаленьні ў урнах і больш позьнія—зрубы, аналёгічныя седнеўскім.

Больш густыя радзіміцкія паселішчы пачынаюць на захад ад Стародубу, каля вытокаў Снові і ідуць уніз па рацэ да раёну старага гораду Ронску (Курознага, Ціманавічы, Мядзьведаўка) (75), далей мяжа паварачае на захад (Гэтманская Буда, Дуброўка, Глыбоцкае, Цярухі) (75, 181), якая вызначаецца як па сяміпраменных, так і па розьніцы ў пахавальных абрадах—радзіміцкія пахаваньні на гарызонце выразна адрозьніваюцца ад пахаваньня ў глыбокіх і вузкіх ямах, якое панавала ў гэтай часьці севяранскай тэрыторыі. Два апошнія пункты (Глыбоцкія і Цярухі) адгарожаны з поўдня вялізнымі пустыннымі абшарамі з такімі буйнымі балотамі, як Замглай і Пярыстае. па той бок гэтых балот і лясоў у Сіберажы і Табаеўцы будуць ужо не радзімічы, а севяране.

Вусьце р. Цярухі (с. Цярухі і Нова-Дзятлавічы) (181) трэба лічыць крайняй паўднёва-заходняй мяжой асноўнай радзіміцкай тэрыторыі. Адсюль мяжа ідзе да Макееўкі і Прыбораў, з якіх і быў пачаты агляд. Нізавіны Сажа, як відаць, радзімічамі заселены ня былі.

Акрэсьленая тэрыторыя радзіміцкага племені раўняецца прыблізна 30.000 кв. кілёмэтраў.

Гісторыяграфія пытаньня аб межах радзімічаў не багатая досьледамі, і можна будзе спыніцца толькі на некаторых работах.

Барсаў у сваіх „Очерках исторической географии" (25) пры вызначэньні пляменных межаў шырока карыстаўся топографічнай номэнклятурай. Але трэба сказаць, што гэта номэнклятура служыла для яго хутчэй знадворнай, другараднай адзнакай; асабліва гэта даводзіць яго азначэньне радзіміцкіх межаў (карта № 3).

Барсаў зьвязвае з іменем радзімічаў цэлы рад пунктаў, якія маюць корань „рад": Радзегошч на Сэйме, Радзіна, Болхаўсага раёну, Радзімля на Проні, Радзінскае, Бранскага пав., р. Радзіца, прытока Болвы, Радовішча, Бранск. п., Радагошч, цяпер Погар, Радагошч, Дзьмітр. пав., Радамка, Бранск. пав., р. Радосынь, прытока Чарторы, Радубеж на Сэйме, Радугошч, Адаеўскага пав., Радудзічы на Сэйме, Радуль, Рэчыцкага пав., Радушына, Бранск. пав., Радушнае, Адаеўскага пав., Радзееў, Гомельск. пав.

Калі на карце злучыць усе гэтыя пункты лініяй, дык атрыманая тэрыторыя ня толькі цалкам уключыць усю археолёгічную тэрыторыю, але і окупуе цэлы шэраг суседніх крывіцкіх, вяціцкіх



Карта № 3.

і севяранскіх мясцовасьцяў. Барсаў лічыць мажлівым гаварыць аб радзімічах на падставе вельмі няпэўных топонімікаў; як найбольш выразны прыклад бяру Радагошч, адкінуўшы злучальную галосную „а", атрымаем два корані „рад" і „гошч", сэнс якіх вельмі зразумелы і бязумоўна зьвязаны з якім-небудзь кірмашом або торгам, якія былі там у старыя часы.

Аналіз астатніх назваў прыводзіць ня буду, адзначу толькі, што амаль ніводная з іх з радзімічамі зьвязана быць ня можа (параўнай Niderle, 145).

Працягваючы ўсьлед за Барсавым пошукі радзімічаў усюды, дзе ёсьць паселішчы і ўрочышчы, якія пачынаюцца корнем „рад", мы пашырым межы расьсяленьня радзімічаў ня толькі да Ноўгараду і Клязьмы, але да Эльбы на захадзе і Балканскага паўвострава на поўдні, бо гэты корань зьяўляецца агульна-славянскім і вельмі пашыраным (140). Досыць прагледзець альфабэтныя сьпісы населеных мясцовасьцяў па абласьцёх і краёх, каб знайсьці „радзімічаў" усюды.

І калі Барсаў усё-ж застаўся пры азначэньні межаў радзімічаў у пэўных рамках, дык гэта даводзіць толькі тое, што нават для яго самога довады ня былі пераканальнымі, што ён кіраваўся іншымі меркаваньнямі, прыводзячы топонімікі толькі для ілюстрацыі.

Гісторыка-географамі ўпарта выказвалася думка аб севяранскім кліне паміж радзімічамі і вяцічамі па Дзясьне. Так, Барсаў паказвае на р. Северску, левы прыток Масквы, як на крайнюю мяжу севяран, а Серадонін (194) лічыць, што севяране пасоўваліся на Угру, Маскву і Клязьму: „Севяране ўразаліся паміж радзімічамі і вяцічамі і іх роля ў колёнізацыі Растова-Суздальскай зямлі была не апошняй" (194). Археолёгічны матар'ял не дае ніякіх даных для пасоўваньня севяран па Дзясьне, ня кажучы ўжо аб Клязьме і Маскве. Наадварот, назіраецца некаторае ўклінаваньне з поўначы крывічоў.

Акрэсьліць паўднёва-ўсходнюю мяжу радзімічаў спрабаваў Самаквасаў (187), выкарыстоўваючы весткі аб гарадзішчах. Яго погляды, як заўсёды, вельмі орыгінальныя, але пазьнейшымі досьледамі

былі разьбіты канчаткова. Паводле яго думкі, усходняй мяжой радзімічаў была лінія на захад (!) ад Новазыбкава і ўжо пад Суражам пачыналіся паселішчы вяцічаў. На поўначы мяжа радзімічаў ішла каля Паповай Гары.

Пад уладай самаквасаўскіх схэм быў і дасьледчык радзіміцкай тэрыторыі П. М. Ерэменка (75). Ён лічыў, што курганы па р. Снові ўжо северанскія, але розьніца паміж курганамі вадазбораў Іпуці і Снові была настолькі вялікая, а з другога боку, северанскія курганы прылягаючага раёну настолькі адрозьніваліся ад іх, што можна зусім згадзіцца са Сьпіцыным, які пярэчыў Ерэменку.

Пазьней раскопкі Спэранскага (205), Самаквасава (191) і Рыкава (185) значна пашырылі межы вядомай нам радзіміцкай тэрыторыі. Але гэтыя пункты зьяўляюцца ўжо коленіямі і будуць разгледжаны ў другім месцы.

Другой істотнай задачай формальна-архэолёгічнага аналізу зьяўляецца вызначэньне часу, да якога належаць помнікі матар'яльнай культуры. Без вызначэньня хронолёгічных градацый пераходзіць да соцыолёгічных вывадаў нельга.

У разьдзеле аб курганох была намечана тыполёгічная клясыфікацыя пахаваньняў, зараз-жа паспрабуем паставіць гэтыя тыпы ў хронолёгічны эволюцыйны рад (табл. І).

Сьведчаньне летапісу аб трупаспаленьнях, якія да яго часу захавалі толькі вяцічы, дазваляе бачыць у даным абрадзе пахаваньня больш старажытны звычай.

Наяўнасьць імітацыі трупаспаленьня пры звычайным пахаваньні зьяўляецца лепшым доказам адміраньня спаленьня і замены яго трупалажэньнем спачатку на вогнішчы, затым на вуглях, а далей і проста на зямлі.

З другога боку, пахаваньні ў ямах ніколі не даюць ня толькі трупаспаленьняў, але нават перажыткаў яго; у ямах сустракаюцца рэчы, бязумоўна, больш позьнія (напр., іконка богамацеры ў Гочаве XIII—XIV ст.), якія ў іншых тыпах пахаваньняў ня знойдзены.

Напрамак эволюцыі можа быць намечаны з дастатковай дакладнасьцю ад спаленьня праз трупалажэньне на грунце (або вышэй) да ямных пахаваньняў.

Пры пахаваньні няспаленага трупа пераход да ям зусім законамерны, бо з тэй прычыны, што курганны насып паступова зьмяншаў свае памеры, гніцьцё трупаў на могілках прымушала славян шукаць лепшых спосабаў консэрвацыі нябожчыкаў, а гэта лепш усяго дасягалася закопваньнем у зямлю.

Пераход ад спаленьня да звычайнага пахаваньня меў унутраныя, больш глыбокія прычыны, у той час як зьяўленьне ям абумоўлена прычынамі знадворнага, тэхнічнага парадку.

Параўноўваючы пахавальны абрад радзімічаў з агульна-славянскім, мы заўважаем, што першы эволюцыянаваў у асноўным так-жа, як і ва ўсіх славянскіх пляменьнях.

Вызначыўшы асноўныя этапы эволюцыі пахаваньняў, паспрабую ўвесьці іх у рамкі дакладнай хронолёгіі. Пераход да трупапалажэньня для ўсходня-славянскіх курганоў звычайна датуецца XI стагодзьдзем; радзіміцкія помнікі вельмі добра ўвязваюцца з гэтаю датаю. З пахаваньнем на грунце сустракаюцца монэты X-XI ст., прычым усе монэты X стагодзьдзя арабскія і X-XI ст. (980—1015 гг.)—кіеўскія. Можна думаць, што монэты траплялі да радзіміцкіх сялян счакаўшы значны час пасьля іх выбіваньня дзе-небудзь у Самаркандзе ці Багарадзе. Далей, трэба мець на ўвазе, што монэты, пасьля таго як яны, ходзячы па міжнародным рынку, траплялі да радзімічаў, доўгі час маглі служыць у іх у якасьці аздобы—аздобы падвескі, бо да іх нярэдка дарабляліся вушкі.

Гэтыя меркаваньні прымушаюць лічыць, што год выбіты на монэце і год пахаваньня яе ў кургане аддзелены даволі доўгім прамежкам часу.

Большасьць пахаваньняў без адзнак агню ў абрадзе можна лічыць дакладна датаванымі XI стагодзьдзем. Для ямных пахаваньняў, якія пачаліся хутка пасьля зьнікаўньня трупаспаленьня, можна прыняць XI-XII ст. (галоўным чынам XII ст.).

Перажыткі трупаспаленьняў, якія заходзяць у XI ст., можна датаваць X-XI ст. Датаваць поўнае і няпоўнае трупаспаленьне вельмі цяжка, бо інвэнтар, які даходзіць да нас, бывае ў выглядзе нявыразных зьліткаў, але можна думаць, што X ст. было ўжо часам зьнікаўньня гэтага абраду, бо ў канцы гэтага стагодзьдзя ўжо зьяўляюцца пахаваньні нават без перажыткаў спаленьня. Пачатковая дата трупаспаленьняў у курганох можа быць намечана прыблізна XI ст. Той факт, што ў пачатку XII стагодзьдзя ў Кіеве яшчэ помнілі аб „слупох на шляхох" у радзімічаў, не дазваляе лічыць вельмі старой дату пераходу ад слупоў да курганоў. Аднак, гэта пытаньне патрабуе больш дэталёвага досьледу курганоў з трупаспаленьнем і апрача таго, трэба мець на ўвазе мажлівасьць адначасовага існаваньня розных абрадаў.

Найбольшую яснасьць у датаваньні павінна ўнесьці параўнаваньне пахавальнага абраду з тыпамі рэчаў і монэтамі. З гэтай мэтай я прыводжу табліцу, у якой пералічаны амаль усе рэчы радзіміцкіх курганоў, за выключэньнем тых, аб якіх зусім невядома, пры якіх абставінах яны знойдзены („коленії" ня ўключаны).

У графе „абрад пахаваньня" паказваецца колькі разоў даны тып сустракаецца ў такім-то тыпе пахаваньня, прычым поўнае трупаспаленьне выпушчана, бо амаль не дае рэчаў. Пададдзелы гэтай графы: І) перажыткі трупаспаленьня, ІІ) пахаваньні на грунце (або вышэй) без сьлядоў агня ў абрадзе і ІІІ) ямы.

Для параўнаньня з датамі іншых дасьледчыкаў мною ўзяты работы П. С. Рыкава (185) па радзімічах у Гочаве, А. А. Сьпіцына (213) па ўладзімірскіх курганох і Сьпіцына-ж (211) па пецярбурскіх курганох. Тры апошнія графы вылучаны пад тры стадыі вяцкіх курганоў, намечаныя А. В. Арцы-

хоўскім (18), прычым лічбы значаць колькі разоў даны тып знойдзены ў пахаваньнях таго або іншага стагодзьдзя. Датаваньні іншых дасьледчыкаў (Антановіча, Завітневіча, Самаквасава і інш.) ня прыводжу, бо яны ня грунтуюцца на дакладным і мэтодычным вывучэньні матар'ялу.

КУРГАННЫ ІНВЭНТАР	Колькасьць	Абрад пахаваньня I	Абрад пахаваньня II	Абрад пахаваньня III	Манэты ў радзімічаў	Сьпіцын, Рыкаў: Дата	Сьпіцын, Рыкаў: Аўтар	Арцыхоўскі XII	Арцыхоўскі XIII	Арцыхоўскі XIV
Сякеры	3	1	—	1				—	—	—
Сярпы	4	—	1	—				—	—	—
Ножыкі	12	3	—	1	933 г.			1	2	3
Прасьліцы	8	1	1	—				—	—	—
Мёдарэзкі	2	1	—	—				—	—	—
Цуглі	4	1	—	—				—	—	—
Вёдры	2	—	2	—				—	—	—
Іголкі	3	3	—	—				—	—	—
Гаршкі лепленыя	2	2	—	—				—	—	—
„ ганчарныя	33	18	14	3	933 г.			—	—	—
Пражкі ліраподобныя	11	—	3	—				—	—	1
Скроневыя колцы.										
Драцяныя каогул	15	2	—	9				—	—	—
Брасьлетападобныя—злучаныя	4	1	2	—				—	—	—
Брасьлетападобныя—завязаныя	2	—	—	1				3	2	—
Пярсьцёнкападобныя	37	1	8	2	913			9	10	11
„ загнутыя	2	1	1	—				—	—	—
„ эсаканцовыя	7	1	2	—				—	—	—
Сяміпрамянныя	21	4	3	—	913—1015	XI-XII	Рыкаў	—	—	—
Грыўні.										
Пласткаватыя	6	1	2	—		XI—XII	Рыкаў	1	1	1
Кручаныя	10	3	4	—	913			—	—	—
Чатырохкантовыя	1	—	1	—	913—1015			—	—	—
Падвескі.										
Лунькічна-прарэзныя	3	1	1	—		X	Сьпіцын, Влада.	1	—	—
Круга-крыжавыя	1	—	1	—				—	—	—
Лунькіцы шырокарогія	17	2	5	—	913	XI	„	—	—	—
„ вузкарогія	2	—	1	—	913	XII—XIII	Сьпіцын і ПТБ	2	1	—
„ язычковыя	2	1	—	—				—	—	—
Крыжы „скандын."	7	—	4	—		XI—XII	Сьпіцын, ПТБ і Рыкаў	—	1	—
„ эмаліяваныя	1	—	—	—	913			—	—	—
Бразгушкі накрыж прарэзаныя	6	—	—	2	—	XI—XII	Рыкаў	—	2	—
Бразгушкі двайчатыя	14	3	1	—				—	2	—
Біэліпсоідныя	3	—	1	—		XI		—	—	—
Язычковыя	4	—	3	—				—	—	—
Петлявыя	5	—	2	—	913			—	—	—

КУРГАННЫ ІНВЭНТАР	Колькасьць	Абрад пахавання			Манэты ў радзімічаў	Сьпіцын, Рыкаў		Арцыхоўскі		
		I	II	III		Дата	Аўтар	XII	XIII	XIV
Пацеркі.										
Сердалікавыя наогул	10	3	1	1						
„ біпірамідальныя	10	—	3	1	913	XI	Сьпіцын, ПТБ	24	19	13
„ прызматычныя	—	—	1	1		XI	„	4		
Пліткаватыя	5	—	1	—	913			1		
Крышталёвыя	2	—	—	1						
Аметыставыя	2	—	1	—						
Бурштынавыя („янтарные")	7	2	1	1						
Шкляныя залочаныя бачкаватыя	19	1	4	1		XI-XII	„	3	—	—
Шкляныя залочаныя цыліндрычныя	9	1	1	—						
Шкляныя залочаныя	—	—	—	—						
Шкляныя залочаныя рабрыстыя	7	1	—	—		XI-XII	„			
Шкляныя пасярэбраныя бачкаватыя	2	1	—	—				1		
Шкляныя каляровыя бітрапецоідныя	2	—	1	—						
Шкляныя дынепадобныя	2	—	1	—						
„ віктападобныя	4	—	2	—	913				1	1
„ падвойныя	6	—	1	—	980—1015					
Пастаўныя аднакаляровыя.										
Карнінавыя	17	3	8	—						
Цыліндрычныя	1	—	1	—						
Простакутныя	9	—	3	—	913—1015	XII	„			
Цытрынападобныя („лимонообразные")	2	—	1	—						
Пастаўныя шматкаляровыя.										
Белаpомбавыя	2	—	1	—						
Паласатыя	2	—	2	—	913					
Вочкаватыя	3	—	3	—		XI—XII	„			
Восевыя	2	—	1	—						
Буйназоркістыя	8	2	1	—						
Нагрудныя пражкі.										
Падковападобныя	8	1	2	—		XI—XII	„			
Праменістыя („лучевые")	2	1	1	—						
Гранёныя	1	—	1	—		XII	„		1	
Конападобныя	2	—	2	—		XII	„			
Бранзалеты.										
Гладкія тонкаканцовыя	7	1	4	—				11	1	
„ шыракаканцов.	5	—	1	—	913			—		
Кручаныя 1 × 3 абсечан.	2	—	—	—		XII	Сьпіцын, Уладзім.	—	1	1
Кручаныя завязаныя	4	—	2	—			„	—	—	—
„ петляватыя	1	—	1	—				—	23	6
Плеценыя	3	—	2	1		XII	Сьпіцын, ПТБ.	—	1	—
Пласткав. тупаканцовыя	2	—	—	—				4	—	—
„ круглаканцовыя	1	—	1	—			„	—	—	—
Рэльефн. зьвярынагаловыя	3	1	1	—		XI-XII	Сьпіцын, Уладз., ПТБ.			—
Шкляныя	2	1	—	—						1
Пярсьцёнкі.										
Гладкія	12	1	1	3				8	3	3
Пласткаватыя	3	—	3	—				—	—	—
Рэльефныя рубчатыя	2	—	2	—				—	—	—
„ закраінныя	9	—	6	—				—	—	—
Кручаныя вузкаканцовыя	15	2	1	6				5	2	1
Вусатыя	4	—	3	—		XI	Сьпіцын, Уладз.	—	—	1
Шыракасярэдзінныя	3	—	2	—				13	18	12
Шчытковыя	3	—	2	—				—	—	—

Пададзеная табліца, заснаваная на вельмі няпоўным матар'яле, на жаль, дае надта мала даных для статыстычных падлікаў і не дазваляе выразна разьмеркаваць усе рэчы і абрады па стагодзьдзям; мажлівы толькі некаторыя частковыя вывады.

У адносінах рэчаў да абраду пахаваньня заўважаецца наступнае: з першым тыпам пахавальнага абраду знойдзена 33 тыпы рэчаў, з другім 65 і з трэцім 17.

Ёсьць некаторыя ўстойлівыя тыпы рэчаў, якія сустракаюцца ва ўсіх трох графох абраду пахаваньня; да такіх трэба аднесьці ганчарныя гаршкі, пярсьцёнкападобныя вісочныя кольцы, сэрдалікавыя, бурштынавыя і буйназярністыя пацеркі, драцяныя і кручаныя пярсьцёнкі. Рэчаў, якія-б сустракаліся толькі ў аднэй першай графе, вельмі мала,—гэта іголкі, лепленыя гаршкі і шкляныя пасярэбраныя бочкаватыя пацеркі; рэчаў, якія-б сустракаліся толькі ў трэцяй графе, няма зусім, але знойдзеных толькі ў аднэй другой графе—багата. З гэтых апошніх шмат якія датаваны монэтамі X-XI ст.

Пры большай колькасьці матар'ялу маглі-б мецъ значаньне магляданьні над рэчамі, якія сустракаюцца ў першай і другой графе або ў другой і трэцяй. Гэтыя комбінацыі давалі-б адна (I-II графы) больш раньнія, а другая (II-III графы) больш позьнія тыпы.

Часткова гэта пацьвярджаецца тым, што з монэтамі X-XI ст. знойдзены рэчы толькі першай комбінацыі (I-II графы) і ніводнага разу ня знойдзены рэчы другой (II-III графы).

Нязначнасьць матар'ялу не дазваляе зрабіць корэляцыі датаваных монэтамі рэчаў з недатаванымі, што магло-б у значнай ступені высьветліць хронолёгію радзіміцкага інвэнтару.

Асноўны вывад, які можна зрабіць з данай табліцы, не рызыкуючы быць галаслоўным, той, што галоўная маса радзіміцкага інвэнтару знойдзена ў курганох з звычайным пахаваньнем (часьцей на грунце) і належыць да часоў XI стагодзьдзя, прычым, зразумела, адхіленьні і ў X і ў XII ст. няўхільны і зусім законныя.

Намечаныя тры графы прыблізна адпавядаюць: першая—X-XII ст., другая—XI ст., трэцяя XI-XII ст. Датаваньні іншых дасьледчыкаў, зробленыя часткова паводле радзіміцкага, часткова паводле іншых матар'ялаў, у асноўным супадаюць з маімі.

Пытаньне аб старажытнасьцях XIII стагодзьдзя для радзіміцкай тэрыторыі пакуль вырашана быць ня можа; як відаць, да гэтага часу курганныя насыпы зьмяніліся звычайнымі могілкамі бяз рэчаў пры нябожчыках.

Разьдзел III.

Гаспадарка.

Акрэсьліўшы, з дапамогаю археолёгічных даных, географічныя і хронолёгічныя межы, можна перайсьці да выкарыстоўваньня археолёгічнага матар'ялу для атрыманьня вывадаў аб гаспадарцы радзімічаў.

Перш за ўсё трэба агаварыцца, што бяз дасьледваньня бытавых помнікаў—гарадзішч і селішч, пры наяўнасьці галоўным чынам абрадавых комплексаў з курганоў, ставіць пытаньне аб гаспадарцы можна толькі схэматычна. У гісторыі ўсходня-славянскай гаспадаркі ёсьць рад спрэчных палажэньняў, з якіх асноўнымі зьяўляюцца пытаньні аб перавазе паляваньня ці землеробства і аб ролі гандлю; спрэчкі навокал іх ідуць даўно, прымаючы часам характар напрамкаў у навуцы; так, напрыклад, адносна землеробства археолёгія і лінгвістычная палеонтолёгія выступаюць супроць гісторыі (дакладней—супроць некаторых гісторыкаў).

Толькі падрабязнае вывучэньне бытавых рэштак кожнага славянскага племені дасьць вычарпальны адказ на гэтыя проблемы, прычым кожная краіна выявіць свае індустрыяльныя асаблівасьці, якія дыктуюцца як наяўнасьцю прыродных вытворчых сіл, так і блізкасьцю да культурных цэнтраў, гандлёвых шляхоў.

З матар'ялам, які у нас ёсьць, гаспадарку радзімічаў можна разглядаць на невялічкім адрэзку часу—з канца X ст. да пачатку XII ст., так што высьветліць дынаміку цяжка.

Пры азначэньні сыстэмы гаспадаркі адпраўным пунктам будуць служыць знойдзеныя прылады працы, з вытворчасьці якіх і трэба пачаць нарыс радзіміцкай гаспадаркі.

Міжрэчча Дзясны і Дняпра ляжыць у зоне шырокага распаўсюджаньня дзярнавых і балотных жалезных руд; між іншым на гэта можа паказваць адзначанае Філевічам (238) багацьце топонімічных назваў, як Рудня, Рудніца (нават чыста радзіміцкая рэчка Пешчань мае другую назву Рудніца). Шматлікія балоты радзіміцкай зямлі былі дастаўшчыкамі сырцу для выпрацоўкі мэталю. Распрацоўка балотных руд, прасочаная па сучасных сялянскіх промыслах Паляжецкага раёну і Усьцюжны Жалезнапольскай, зьяўляецца найбольш лёгкім і прымітыўным спосабам атрыманьня мэталю. Можна думаць, што славяне X—XII ст. у сваёй асноўнай масе эксплёатавалі іменна гэты від жалезных руд. Канчаткова ўпэўняць у гэтым толькі хэмічныя аналізы.

Выплаўленае ў сырадутным горане жалеза апрацоўвалася таксама, як вырабляюцца розныя рэчы сучаснымі вясковымі каваламі,—гарачым ручным кававаньнем. Вельмі каштоўным зьяўляецца паведамленьне Раманава (180) аб старажытнай кузьні на гарадзішчы каля Праскурні. Блізка гэтага гарадзішча знаходзяцца курганы з выразнымі пляменнымі адзнакамі радзімічаў, што дазваляе прыпісаць радзімічам і гарадзішча. Кузьня знойдзена на невялікай глыбіні каля падножжа валу з надворнага яго боку; апошняе таксама характэрна—кузьню хацелі ізоляваць ад жылых памяшканьняў гарадзішча. Знойдзены два кавадлы, два малаткі, абцугі.

З дапамогаю такіх нескладаных прылад радзіміцкія кавалі абслугоўвалі патрэбы насельніцтва ў прыладах вытворчасьці, рэчах хатняга ўжытку і зброі, выкоўваючы рэчы ад красала ці баявой стралы да сякеры і нарогу.

Курганы наогул даюць вельмі мала прылад, але склад таго, што яны даюць, вельмі характэрны— гэта галоўным чынам сякеры і сярпы (прычым на першым месцы па колькасьці знахадак стаяць сярпы) і ніводнай рэчы, зьвязанай з паляваньнем. Напрашваецца вывад, што продукцыя радзіміцкіх кузьняў была надзвычайна шчыльна зьвязана з земляробствам.

У гадавым цыклі земляробчых работ першай прыладай старадаўняга земляроба была сякера, з дапамогай якой ён расчышчаў ляда, высякаў дрэвы, прызначаныя да спаленьня. Падсечная сытэма земляробства вымагала ад радзімічаў упартай працы, заўсёднай барацьбы з лесам. Аднэй з функцый усходня-славянскіх рабочых сякер было расчышчэньне лесу пад пахаць, што і дазваляе іх часткова лічыць прыладай земляробскай. У пахавальным абрадзе радзімічаў (як і вяцічаў) сякеры сустрака-



Карта № 4.

юцца вельмі рэдка, што, зразумела, нельга тлумачыць адсутнасьцю іх у радзімічаў у быце. Сякеры знойдзены ў наступных месцах: 1) Стракайлы, кург. № 46, 2) Карма, кург. № 20, (баявыя), 3) Івольск на Узэ, 4) Левінка (баявыя) і ў вялікай колькасьці ў Гочаве (каля 16 шт.) як баявыя, так і рабочыя Як відаць, да прылад працы можна аднесьці толькі палову знахадак, бо другая палова—баявыя сякеры—зброя.

Бясспрэчным доказам земляробства зьяўляюцца сярпы, якія знаходзілі ў курганох (Касьцюковічы, Нова-Быхаў, Цярухі, Гочава) і косы-гарбушы, зьвязаныя з уборкай ураджаю ў кулістых, балоцістых месцах і на пахацях з невыкарчаванымі пнямі. Гарбушы знойдзены ў Цярухах, Студзёнцы, Гочаве. Жніўныя прылады заўсёды знаходзяцца ў жаночых пахаваньнях. З земляробствам могуць быць зьвязаны і органічныя (зернавыя) рэшткі ў страўніцах.

Падзольна-пяшчаны характар глеб большай часткі радзіміцкай тэрыторыі, высокі процант лясістасьці і наяўнасьць вялікіх плошчаў балот абцяжарвалі земляробства і прымушалі радзімічаў шукаць землі больш эфэктыўныя. Гэтакай зямлёй зьяўляліся вадазборы Свапы, Усожы, Сэйму, Пслу. Зусім зразумела, што радзімічы, якія мелі ў непасрэдным суседзтве агромныя вольныя плошчы на Проні і паміж верхняй Іпуцьцю і Дзяснoй (на ўсход ад Судасьці) не колёнізавалі іх, бо яны зьяўляліся працягам таго суглініста-пяшчанага масыву, на якім знаходзілася іх аснаўная тэрыторыя.

Колёнізацыйны струмень радзімічаў накіраваўся на паўднёвы ўсход па найкарацейшай лініі ў краіны глеб больш насычаных гумусам, дасягнуўшы сваім канцавым пунктам тлустага чорназему. Варонеж (Глухаўскі пав.), Студзёнку, Гочава можна разглядаць, як этапныя пункты гэтай паступовай земляробчай колёнізацыі. Можа быць ад Студзёнкі аддзялялася колёнізацыйная

галіна на паўночны ўсход уверх па Свапе, у прамежак паміж паўночнай мяжой севяран і паўднёвай мяжой вяцічаў да вытокаў Акі, дзе ёсьць такія гідрографічныя назвы, як Усожа.

Гэта цяга на чорназем для земляробчага народу вельмі характэрна.

Гаворачы аб земляробстве, трэба адзначыць, што засяваліся ня толькі хлебныя, але і тэхнічныя культуры, напр., лён (ільняныя ніткі знойдзены ў маністах).

Усе нашы весткі аб усходнеславянскім земляробстве не дазваляюць падаць гэта земляробства без роўналежнага яму жывёлаводзтва (параўнай два аснаўныя тотэмы славян, якія ўстанаўляюцца яфэтыдолёгамі—жыта і бык, 39). Славянскае рала вымагае моцнай цягавай сілы, якой у радзімічаў, мяркуючы па знойдзеных даных, мог-бы быць конь,—мы маем цэлы рад знахадак цугляў, якія сьведчаць аб існаваньні гадоўлі коняй. Цуглі вельмі простай формы бяз псалій (Казарычы, Людкава, Рандаўка, р. Студзёнка, Гочава).

Але некаторыя меркаваньні прымушаюць паставіць пытаньне аб тым, ці быў конь усюды адзінай жывёлай, пры дапамозе якой аралі, ці ў некаторых месцах яго замяняў вол. Пры адначасовым існа-



Карта № 5.

ваньні каня і вала на адной тэрыторыі, гэта пытаньне набывае іншую форму—ці быў конь сялянскай рабочай жывёлай, ці толькі баявой жывёлай дружыньнікаў. Гэтыя пытаньні могуць быць вырашаны толькі пры дасьледваньні багатага остэолёгічнага матар'ялу гарадзішчаў.

Пакуль-жа адзначу, што ў радзімічаў цуглі знойдзены толькі на ніжняй Іпуці, а далей на поўнач, усход і захад у больш лясістыя раёны не пранікаюць. У Людкаве знахадка цугляў супадае з знахадкай у гэтым-жа магільніку рэчаў, якія належалі імігрантам—севяранам, і якія прыбылі з напоўстэпавага паўднёвага ўсходу.

У крайняй паўночнай знахадцы цугляў у Казарычах паўстае пытаньне аб социяльнай прыналежнасьці ўласьніка—у кургане на мужчынскім касьцяку знойдзена кручаная грыўня; аналёгіі гэтай зьяве ёсьць у гісторыка-літаратурных крыніцах—„Сказании о Борисе и Глебе“ і „Повести Временных Лет“ і ў абодвух выпадках грыўні носяць або блізкі князя, або ўзброеныя госьці. У радзімічаў гэта адзіны выпадак.

На паўднёвы-захад ад зямлі радзімічаў, у непасрэдным суседзтве з ёю (Мікулічы) (82) цуглі знойдзены разам з прыналежнасьцямі купца-разбойніка—вагамі і зброяй. Злучэньне цугляў і зброі мы назіраем і ў Гочаве.

Я ня буду зачапляць фольклёрнага матар'ялу, у якім нярадка сустракаюцца варожыя адносіны да каня, як да ўвасабленьня баярскіх наездаў; паданых археолёгічных фактаў даволі для таго, каб

устрымацца ад прыпісваньня гадоўлі коняй усім соцыяльным групам радзіміцкага насельніцтва да таго часу, пакуль яна ня будзе давездзена новымі знахадкамі.

Існаваньне забойнай жывёлы даводзіцца рэшткамі пахавальных трызнаў—страў, у якіх знаходзяць косьці як хатніх жывёл, так і птушак. Ускосна паказвае на жывёлаводзтва (і іменна на дробнае быдла—авечак і коз) наяўнасьць шарсьцяных шнуроў для падвешваньня амулетаў.

Такія-ж ускосныя доказы ёсьць і для гадоўлі курэй—гэта наяўнасьць у радзіміцкіх курганох тэракотавых пісанак, якія па форме і разьмеру падобны на курыныя яйкі. Касьцёвыя адкіды гарадзішч далуць, мажліва, пэўную колькасьць касьцей сьвіней, бо, паводле арабскіх сьведчаньняў, славяне мелі іх у вялікай колькасьці.

Пасьля земляробства і жывёлагадоўлі продукцыя радзіміцкіх кузьняў падводзіць нас яшчэ да аднэй галіны радзіміцкай гаспадаркі—пчалярства. У некаторых курганох (Хізава, Дубейкава—аналёгічная рэч выдана А. Н. Ляўданскім (129) з курганоў каля с. Бельчыцы пад Полацкам) ёсьць рэчы, азначаныя ў сьпісе як рэчы „невядомага назначэньня"; гэта—маленькія трапезападобныя жалезныя лапатачкі з каленчастай ручкай, якая ўстаўлялася ў дрыўляную асадку. І форма іх і разьмеры зусім аналёгічныя сучасным пчалярскім ножыкам, што дазваляе дапускаць такое-ж назначэньне іх і ў радзімічаў. Значэньне мёду ў жыцьці тагочаснага славяніна было пасьведчана дзесяткі разоў візантыйскімі, арабскімі пісьменьнікамі і рускай летапіснай і навучальнай літаратурай. Шмат якія абрады, зьвязаныя з мёдам, дажылі да сучаснасьці (параўнай у Сяржпутоўскага „Бортніцтва на Беларусі"). Мёд для радзіміча быў ня толькі адзіным насычаным цукрам продуктам, але і плацежным сродкам. Сыстэма пчалярства была ня пасечная, а драпежная бортніцкая, якая патрабавала ад чалавека толькі аховы борцяў ад мядзьведзя і пэрыодычнага зьбіраньня мёду.

У кургане каля Ходуні над нябожчыкам былі паложаны соты. Ёсьць яшчэ адна катэгорыя рэчаў, якія можна паставіць у сувязь з бортніцтвам—гэта вёдры, якія часам знаходзяць у курганох. Ставіць у іх нябожчыку тую страву, якая звычайна ставіцца ў гаршкох—кашу, наўрад ці было мажліва; дапускаць, што ў гэтых вёдрах насілі ваду, цяжка, бо некаторыя экзэмпляры з тэрыторыі дрыгавічоў і крывічоў маюць прыгожую сярэбраную акоўку. Ведаючы на прыкладзе Ходуні, што мёд мог мець рытуальнае значэньне, можна дапусьціць, што ў гэтых невялічкіх і прыгожых дрыўляных вядзёрках з дужкамі і абручамі нябожчыку ставілі якое-небудзь піцьцё, лепшым з якіх у славян быў мёд.

Пераходзячы да пытаньня аб паляваньні, трэба ў першую чаргу канстатаваць поўную адсутнасьць археолёгічных доказаў паляваньня. Аднак, гісторыкі, для якіх археолёгічны матар'ял зьяўляецца часам толькі добрай ілюстрацыяй (ды і то не для ўсіх), але ня базай, ставяць паляваньне краяўгольным каменем усходня-славянскай гаспадаркі, будуючы на ёй свае вывады аб быце славян, прычынах перасяленьня і г. д. „Мы з упэўненасьцю можам сказаць, што заняткі зьвераловствам не дазвалялі рускаму насельніцтву скучвацца ў абмежаваных прасторах" (Любаўскі, 125).

Адносна насычанасьці і скучанасьці даволі паглядзець на карту радзіміцкай тэрыторыі, дзе старыя паселішчы ляжаць адно ад другога на адлегласьці 5—10 вёрст, што пры тагочаснай невялікай колькасьці насельніцтва і падсечнай сыстэме земляробства трэба лічыць дастатковай шчыльнасьцю. Існаваньне цэлых пасёлкаў паляўнічых пры гэтакай гушчыні было-б немажліва (параўнай вылічэньні Левасэра аб тэрыторыі паляўнічых: на 100 кв. кілёмэтраў прыпадае 2-3 чалавекі. Цытую паводле Пакроўскага, 164). Яшчэ адна цытата: „Зьвералоў і гандляр (гутарка ідзе аб усходня-славянскім селяніне) ў пошуках хутровага зьвера адышоў ад чорназему і апынуўся на балацяным глінiстым грунце" (Доўнар-Запольскі, 70). Пры стыканьні з фактамі гэта сьцьвярджэньне абарачаецца ў сваю процілегласьць: не з чорназему ўцякалі радзімічы на суглінак, а наадварот—з Бесядзі і Іпуці пацягнуліся калёністы, і не да агромных лясных масываў Дзябранску і Трубечу, як трэба было-б чакаць ад зьвераловаў, а ад Рыльску і Суджы.

Такая прыхільнасьць рускіх гісторыкаў да паляваньня, як асновы ўсходня-славянскай гаспадаркі, можа часткова тлумачыцца як старой схэмай разьвіцьця грамадзтва (паляваньне—жывёлагадоўля—земляробства), так і наяўнасьцю ў рускіх летапісах сьведчаньняў аб паляваньні і яго продукце—хутравіне.

Што да апісаньня паляваньняў, дык гэта выключна княжацкія прыдворныя паляваньні. На такой-жа падставе можна сьцьвярджаць і аб існаваньні паляўнічай стадыі гаспадаркі ў сучаснай нам Англіі. Кіеўскія і чарнігаўскія экспортэры хутравіны былі палічаны гісторыкамі за асноўнае насельніцтва. Даніна, якую плацілі хутравінай, зноў ткі нічога ня кажа аб перавазе паляваньня—кіеўскія і інш. князі пры вызначэньні складу дані кіраваліся зусім не багацьцем таго або іншага продукту, а толькі попытам міжнароднага рынку. Самыя разьмеры даніны, па аднэй скурцы з дыму ў год, гавораць аб мізэрных разьмерах паляваньня. Контрыбуцыі на земляробчае насельніцтва, якія накладаліся князямі, былі толькі стымулем да разьвіцьця ў яго паляўнічага промыслу (ці не пад уплывам вялікага попыту на хутравіну з боку халіфату і Візантыі, попыту, які днепроўскія госьці і князі імкнуліся як мага хутчэй задаволіць, і адбылася эволюцыя грашовай сыстымы ад грошай—быдла да грошай—хутраў ?).

Зразумела, на падставе аднаго толькі маўчаньня археолёгічных крыніц нельга рабіць вывадаў аб поўнай адсутнасьці паляўніцтва ў радзімічаў; можна толькі паказаць яго месца ў шэрагу іншых спосабаў гаспадараньня. Паляўніцтва існавала побач з земляробствам, жывёлагадоўляй і бортніцтвам, зьяўляючыся дапаможным промыслам. У 1150 г. поўнач радзіміцкай тэрыторыі плаціла дзесяціну смаленскаму епіскапу лісіцамі. Традыцыя выкарыстоўваньня рэчаў паляваньня ў якасьці плацежнага сродку пратрымалася сем стагодзьдзяў пасьля таго, як хазары зьбіралі па беле з дыму—у XVI ста-

годзьдзі мазырскі намесьнік зьбіраў у год: „па насатцы мёду і па лісіцы з кожнага дыму“ (Пэрвольф, 155), і ўсё-ж ніхто не адважыўся гаварыць аб паляўнічай стадыі ў XVI ст.

Пярэчаньні прыхільнікам „паляўнічай“ тэорыі скончу словамі М. Н. Пакроўскага: „Грунтаваць усю іх (славян) гаспадарку на паляваньні было-б неасьцярожна, з прычыны процілеглых вестак з боку як лінгвістыкі, так і арабскіх пісьменьнікаў, якія раней за ўсіх сыстэматызавалі весткі аб нашых продках (стар. 15) (70).

Рыбацтву значна менш пашанцавала ў гісторыі рускай гаспадаркі; яно ня сустрэла такіх гарачых абаронцаў, як паляўніцтва, хаця ёсьць даныя дапускаць, што з дапаможных промыслаў рыбацтва было адным з важных, можа быць нават больш важным, чымся паляўніцтва. Два разы былі знойдзены мэталёвыя рыбалоўчыя кручкі—у Гочаўскім гарадзішчы і ў адным з мужчынскіх курганоў гочаўскага магільніку. Кручкі вялікія і разьлічаны на буйную рыбу. Гарадзішчы даюць звычайна вялікую колькасьць гліняных, каменных і нават алавяных грузілаў. Што радзімічы добра ведалі рыбу, даводзіцца і мастацкімі малюнкамі рыб-амулетаў.

Пераходзячы да рамёстваў у радзімічаў, трэба адзначыць наступныя (апрача апісанага вышэй кавальскага): дрэваапрацовачнае, ткацкае, керамічнае, ювэлірнае. Больш-менш поўны матар'ял мы маем для апошняга і часткова для керамічнага; меркаваць аб ткацтве і апрацоўцы дрэва можна толькі па фрагмэнтарных частках, якія дайшлі да нас.

A priori можна сказаць, што дрэва і вырабы з яго адыгрывалі вельмі вялікую ролю ў гаспадарчым быце радзімічаў. Дрэва ішло на цэлы рад вырабаў—ад дробных хатніх рэчаў, лыжак, збаноў, карыт да пабудовы жыльля і абарончага тыну на гарадзішчы; але дзякуючы таму, што яно дрэнна захоўваецца, да нас дайшло вельмі мала. Дрыўляныя часткі пахавальных пабудоў: дамавіны, калоды, дошкі пад галавою, зрубы — вось тое, чым кіруецца навука пры меркаваньні аб апрацоўцы дрэва. Матар'ялам большаю часткаю зьяўляецца дуб, радзей бяроза і хвоя. Тэхніка апрацоўкі была вельмі нескладаная і можа быць адноўлена на падставе рэштак драўляных рэчаў: асноўнай дрэваапрацоўчай прыладай была сякера, якою зрубаліся бярвеньні, рашчапляліся плашкі. Дошкі, якія былі знойдзены ў пахаваньнях, былі апрацаваны таксама сякерай; піла, як відаць, радзімічамі яшчэ ня ўжывалася.

Сучасныя дасьледчыкі, назіраючы апрацоўку дрэва на Беларусі, лічаць, што „беларус прыроджаны плотнік“ (Н. І. Лебедзева, 117) і адзначаюць вялікую унівэрсальную ролю сякеры. Форма сучаснай беларускай сякеры ў асноўных сваіх частках супадае з формай курганавых сякер IX—XII ст. Другой прыладай зьяўлялася цясло для выдзёўбваньня борцяў, карыт, чаўноў і г. д. Ніводнага пасобніку цёслаў ня было знойдзена, але сьляды іх ужываньня ў радзімічаў можна ўстанавіць па выдзеўбаных калодах—дамавінах.

Крыху больш складанай тэхнікі вымагала бандарная вытворчасьць, аб існаваньні якой можна меркаваць па драўляных вядзёрках. Выраб дрыўлянай клёпкі, днішчаў, акоўваньне вядра абручамі, выраб дужкі—усё гэта вымагала спэцыялізацыі рамяства, чаго нельга сказаць аб пабудове жыльля, вырабе карыт і г. д., якія мог рабіць кожны селянін. Прыклады апошняму мы маем на Беларусі другой паловы XIX ст., калі кожны гаспадар будаваў сабе хату сам. Форму радзіміцкай хаты можна часткова ўгадаць па зрубах, якімі акружалі нябожчыкаў, часам у некалькі вянцоў. Як відаць, і жыльлё жывых будавалася па прынцыпу зрубу, паступовага напластаваньня горызонтальных радоў.

Побач з апрацоўкай дрэва можна паставіць апрацоўку косьці. Сфэра вырабаў з косьці абмежавана ручкамі для ножыкаў і дробнымі бытавымі рэчамі, накшталт грабянёў, якія, аднак, выраблялiся і з дрэва. Выраб грабянёў няўхільна ставіць пытаньне аб існаваньні пілы, бо падзяліць зубцы грэбеню з дапамогаю аднаго ножыка наўрад ці магчыма. Трэба прызнаць, што прынцып пілы быў радзімічам вядомы, але піла ўжывалася толькі для дробных напоўювэлірных прац, але не ў гаспадарцы.

Увесь матар'ял аб ткацтве ў радзімічаў — гэта прасьліцы і абрыўкі тканін, нітак і шнуркоў, якія захаваліся ў курганох. Сяўба лёну і гадоўля авечак давалі сырэц, неабходны для вырабу тканін. Да нас дайшлі галоўным чынам рэшткі шарсьцяных тканін, але заключаць на падставе гэтага аб перавазе шарсьцяных тканін над ільнянымі наўрад ці можна—проста шэрсьць лепш захоўваецца. Ільняныя ніткі знойдзены ў пацерках. Тканіна фарбавалася; часам у багатых пахаваньнях (Левінка) аздаблялася вышываньнем або набойным узорам (характар малюнку нявыразны). Прадзеньне рабілася з дапамогаю верацяна з насаджанымі на яго прасьліцамі. Прасьліцы з шыферу, якія знаходзяць у жаночых пахаваньнях іншы раз па пяць экзэмпляраў, пашыраны на тэрыторыі радзімічаў усюды. Шыцьцё адбывалася мэталёвымі іголкамі, знойдзенымі ў паўночнай палове радзіміцкай тэрыторыі.

Керамічная вытворчасьць радзімічаў дайшла да нас у параўнаўча вялікай колькасьці абрадавых гаршкоў з курганоў і фрагмэнтаў з гарадзішчаў. У большасьці выпадкаў форма гаршкоў звычайная славянская з звычайным-жа хвалістым ці лінейным орнамэнтам. Зьмяняецца толькі ступень выпукленасьці плечыкаў і адагнутасьць берагу. Эпоха курганоў захапляе керамічную вытворчасьць славян у момант зьмены двух тэхнічных прыёмаў—лепкі ад рукі і формаваньня на ручным кружале. Асноўная маса радзіміцкай курганнай пасуды зроблена іменна другім спосабам. Лепленыя ад рукі экзэмпляры трапляюцца ў старажытных курганох з трупаспаленьнем, але і тады, у IX-X ст., пералом у тэхніцы ўжо адзначаўся: у адным з курганоў з трупаспаленьнем ёсьць абодва віды—і леплены і формаваны.

Адхіленьні формы керамікі ад звычайнага славянскага тыпу даволі рэдкія—часам сустракаюцца судзіны падобныя на гаргач, блізкія да салтаўскага тыпу, часам да гаршка прырабляюцца ручкі (Цярухі і Уваравічы з арабскай монэтай 933 г.), што можа гаварыць аб некаторым уплыве кіеўскіх

майстроў. Сустракаюцца гаршкі з закругленым дном (Любны, Гочава—Рыкаў, № 74), адзін раз (Ціманава) знойдзена місачка.

Лепленая кераміка выціскаецца ганчарнай даволі марудна: калі ў IX ст. наглядаецца прысутнасьць пасуды, зробленай на ганчарным крузе, дык лепленая дажывае (праўда ў адзінках) да XI ст. На радзіміцкіх гаршкох даволі часта ёсьць клеймы на днішчах; яны бываюць часам геомэтрычныя—круг, крыж, трыкутнік; часам выяўленчыя, як, напр., ключ, елачка (Гочава), або, што для славянскіх клеймаў, рэдка—конь (там-жа). Пры бэльшым накапленьні матар'ялу вывучэньне клеймаў і пашырэньне кожнага тыпу можна высьветліць раёны, якія абслугоўваліся паасобнымі ганчарнымі майстэрнямі.

Адносна спэцыялізацыі ганчарнага рамяства можна зрабіць дапушчэньне, што ўжо да IX ст. вызначыліся спэцыялісты ганчары, якія ўжывалі мэханізацыю вытворчасьці (ганчарны круг) мелі свае асобныя клеймы (гл. у Арцыхоўскага (229) аб прычынах гэтага), але побач з гэтым існаваў і хатні выраб пасуды бяз усякіх прылад, шляхам звычайнай лепкі ад рукі.

Тэхніка палiваньня керамікі радзімічам, як відаць, яшчэ ня была вядомай, бо рэчы, якія маюць паліву (пісанкі), носяць чужы, кіеўскі характар і зьяўляюцца, напэўна, імпортнымі (13).

Найбольш поўна і разнастайна дайшоў да нас матар'ял па вырабу дробных рэчаў ужытку і аздоб. Да першых можна аднесьці красалы, гузікі, пражкі і г. д., але наогул правесьці ў гэтай галіне дэмаркацыйную лінію паміж чыста практычнымі рэчамі і аздобамі даволі цяжка; так, напрыклад, пражкі могуць разглядацца як з таго, так і з другога пункту погляду: яны маюць і пэўнае службовае значэньне, і ў той-жа час маюць на сабе орнамэнт, самая форма іх ня строга конструкцыйная, а дэкорацыйная.

Пры разглядзе ўсёй масы радзіміцкага курганнага інвэнтару неабходна вылучыць рэчы мясцовыя і прывозныя, што можна будзе зрабіць лёгка толькі для невялікага контынгенту рэчаў. Такім чынам вылучацца з аднаго боку рэчы, якія ўяўляюць з сябе пляменны спэцыфікум—сяміпраменныя вісочныя колцы, язычковыя падвескі, пятлеватыя падвескі, монэтападобныя з бычай галавой, а з другога боку рэчы, чужое паходжаньне якіх не выклікае сумненьня: візантыйскі (кіеўскі?) эмаляваны залаты крыжык, „корсунскі" сэрдалікавы крыж, пярсьцёнак з грэцкім надпісам і г. д. За вылічэньнем гэтых бясспрэчных рэчаў усё-ж застаецца пэўная колькасьць рэчаў, для якіх месца іх вырабу беспамылкова ня можа быць паказана.

Матар'ял, з якога зроблены рэчы, што мы зараз разглядаем, вельмі разнастайны: жалеза, медзь і яе сплавы, серабро і яго сплавы, у выглядзе выключэньня—золата, цына (у сплавах), шкло, напоўкаштоўныя камені: сэрдолік, крышталь, амэтыст, яшма, агат і інш.

Адносна тэхнічных прыёмаў апрацоўкі гэтых матар'ялаў мы наглядаем амаль усе вядомыя фэўдальнай Русі прыёмы—каваньне, адліваньне, выбіваньне, літаваньне, зерць, скань, эмаль, шліхаваньне (каменю), сьвідраваньне, разьбярства, выпілоўваньне, пляценьне; трэба толькі вызначыць ступень знаёмства радзіміцкіх майстроў з кожным з гэтых прыёмаў.

Адносна каваньня ніякіх сумненьняў узьнікнуць ня можа: наяўнасьць радзіміцкіх кузьняў зьяўляецца пераканальным сьведчаньнем знаёмства з каваньнем. Апрача апісаных вышэй кованых прылад працы, як сякеры, сярпы, ёсьць яшчэ і дробныя рэчы, зробленыя кавалямі—красалы (у радзімічаў бытаваў калачападобны тып, які захаваўся амаль да сучаснасьці), паясныя ножыкі, якія сустракаюцца як у мужчын, так і ў жанчын.

Найбольш рэчаў зроблена шляхам адліваньня ў ліцейных формах. Гэтыя ліцейныя формы могуць быць як каменныя (яны часта сустракаюцца ў славян), так і гліняныя, існаваньне якіх можна толькі дапускаць. На тэрыторыі радзімічаў ніводнай формы, на жаль, ня знойдзена. Ліцейныя формы былі большаю часткаю аднабаковыя—г. зн. орнамэнт выразаўся (або адбіваўся) толькі на адным баку, а для атрыманьня адваротнага боку прыкладаўся які-небудзь пласток без усякіх сьлядоў апрацоўкі. Такім чынам выраблялiся сяміпраменныя вісочныя колцы, монэтападобныя падвескі і інш. рэчы, разьлічаныя на паказваньне толькі аднаго боку.

Больш складаным было адліваньне такіх рэчаў, як бразгулькі, для якіх ужываліся двухбаковыя формы. Шляхам адліваньня выраблялiся і некаторыя тыпы бранзалетаў і пярсьцёнкаў, прычым адносна апошніх практыкавалася, як відаць, адліваньне доўгай істужкі, якая затым разразалася на кавалкі, кавалкі згіналіся ў колца, і канцы іх толькі датыкаліся (часам заходзячы адзін за адзін), але не замацоўваліся шчыльна. Праз адліваньне выраблялiся рэчы з сярэбраных і медных сплаваў.

Апрача кованых і літых, існаваў яшчэ адзін від мэталёвых вырабаў—драцяныя. Дрот можа быць атрыманы чатырма спосабамі: плюшчаньнем, валачэньнем, каваньнем і адліваньнем. Для радзіміцкіх (ды і наогул для славянскіх) рэчаў перш за ўсё павінны быць выключаны плюшчаньне і адліваньне, бо першае вынайдзена ў XVIII ст. і нават пры сучаснай тэхніцы ня можа даць дрот танчэй 4 мм, а адліваньне дае вельмі нароўны, кароткі дрот, па сваёй малой пластычнасьці непрыгодны для вырабу рэчаў. Дрот, атрыманы шляхам пракоўваньня, мае таксама свае недахопы—няроўная таўшчыня, вуглаватасьць папярочнага сячэньня, невялікая даўжыня ніткі.

Тым часам у радзімічаў мы наглядаем доўгія і тонкія драцяныя ніткі, з якіх спляталіся бранзалеты, рабіліся вісочныя колцы і г. д. Частка драцяных вырабаў (бранзалеты някручаныя) магла быць атрымана шляхам пракоўваньня, бо там не патрабавалася значная даўжыня дроту; расплюшчанасьць канцоў, няроўная таўшчыня канцоў і сярэдзіны пераконваюць у гэтым. Шляхам пракоўваньня акруглялася і патылічная частка пласткаватых грыўняў.

Большая-ж частка радзіміцкага дроту атрымана праз валачэньне. Маючы невялікі коэфіцыент супраціўленьня, медзь і серабро (а жалезнага дроту ў IX—XII ст. ня знойдзена) дазваляюць рабіць валачэньне пры дапамозе прымітыўнага ручнога варштату.

Выходзячы з нядаўнай практыкі ўкраінскіх саматужнікаў-ювэлíраў, яго можна рэконструяваць так: да лавы вэртыкальна прымацоўваецца валачыла, дошка з дзіркай для працягваньня дроту; прасунуты завостраным канцом дрот бярэцца абцугамі, якія рукамі адцягваюцца назад. Для вялікіх дыямэтраў (напр., дрот у кручаных грыўнях) ручная цяга няпрыгодная, і тады ладзіцца на процілеглым канцы лавы калаўрот, абцугі прывязваюць на вяроўку, якая і накручваецца на барабан калаўроту. Абцугі ў радзімічаў мы ўжо бачылі ў Праскурні, а „вочкам" для валачыла маглі служыць замест сталі, якая цяпер ужываецца, прасьвідраваныя каменьні цьвёрдай пароды, напр., крышталь (залаты дрот і цяпер працягваюць праз мінэральныя вочкі).

Думка Завітневіча аб тым, што дрот прывозіўся з Візантыі (85), а славянскія пляменьні рабілі сабе з яго аздобы кожнае па свайму густу, заснавана толькі на тым, што ў Хэрсонесе знойдзены крывіцкія драцяныяісочныя колцы, якія Завітневіч лічыў візантыйскім экспортным таварам. Дапушчэньне гэта разьбіваецца ня толькі сваёй унутранай супярэчнасьцю, але і тым, што дрот мы бачым у славян усюды, а ўплыў Візантыі абмяжоўваецца паасобнымі знахадкамі ў сялянскіх пахаваньнях.

Таксама, як і адносна ганчарнай справы, у драцяной вытворчасьці мы назіраем зьмену дзьвюх тэхнік — кованага дроту і валачонага. Да XI ст., да якога належыць большасьць рэчаў, валачэньне пануе, але пракоўваньне яшчэ існуе, як перажытак (галоўным чынам крывіцкія брасьлетападобныя). XII—XIV ст. даюць усё большую і большую колькасьць драцяных рэчаў і ўскладненьне ўзору (кручаныя бранзалеты). З абласьці ювэлірнай тэхнікі дрот слаба пранікаў у быт — толькі зрэдка сустракаюцца ручкі ножыкаў, абкручаныя медным дротам.

Уменьне славянскіх майстроў літаваць часам адмаўлялася дасьледчыкамі на падставе знахадак пярсьцёнкаў з незьлітаванымі канцамі. Незьлітаванасьць канцоў можа тлумачыцца імкненьнем захаваць пэўную пругкасьць пярсьцёнку, бо часам сустракаюцца пярсьцёнкі ня толькі зьлітаваныя, але і з прылітаваным шчытком. У радзімічаў гэткі пярсьцёнак знойдзен у Гэтманскай Будзе, кург. № 50. Галоўкі ў грыўняў заўсёды прылітаваныя, а паколькі пласткаватыя грыўні лічыцца аднэй з бясспрэчных адзнак радзімічаў, дык гэтым даведзена і існаваньне ў іх літаваньня.

Для прымацаваньня вушкаў да падвесак радзіміцкімі майстрамі ўжываліся заклёпкі; такое прыклёпанае вушка ёсьць у дыргэме з кургана № 63 у Казарычах.

Тэхніка зерні і скані ў радзімічаў ня была разьвіта, хаця тэхнічныя прадпасылкі для яе і меліся. Буйназярністыя пацеркі, якія ёсьць у заходняй частцы радзіміцкай тэрыторыі, трэба аднесьці за лік прасочваньня драгавіцкага імпорту. У тых выпадках, калі радзіміцкі ювэлір капіраваў які-небудзь усходні ўзор, які меў зерні, ён імітаваў і гэту зерні у ліцейнай форме, г. зн. пры некаторым знадворным падабенстве орыгінал і копія маюць глыбокую тэхнічную розьніцу.

Чужой трэба лічыць і тэхніку перагародчатай эмалі, бо эмаляваныя рэчы—адзінічныя. З тэхнічных прыёмаў радзіміцкіх ювэліраў застаецца яшчэ ўспамянуць халоднае каваньне (расплюшчваньне) тонкіх сярэбраных лісьцікаў для брактэатаў і спосабы орнамэнтацыі мэталёвых рэчаў. Асноўныя—гэта насечка і чаканка (выбіваньне). Насечка пункцірная і лінейная ўжывалася галоўным чынам для запаўненьня шырокіх пласткаватых бранзалетаў. Выбіваньне рабілася мэталёвымі пуансонамі, іншы раз мажліва нават па гарачым мэталю (на пласткаватых грыўнях). Найбольш звычайны для выбіваньня малюнак трыкутніка з шасьцьма выпуклінамі ўнутры. Ён амаль заўсёды бывае на пакатасьцях пласткаватых грыўняў і на паверхні шыракасярэдзінных вусатых пярсьцёнкаў.

Пытаньне аб існаваньні ў радзімічаў мясцовай апрацоўкі каменю вырашыць цяжка. Бязумоўна, выключаюцца, як прывозныя, шыферныя прасьліцы, застаюцца пацеркі, матар'ял найменш надзейны ў сэнсе даласаваньня да таго ці іншага племені. Магчыма, што некаторыя віды—напрыклад, пацеркі з дняпроўскага бурштыну рабіліся самімі радзімічамі. На знойдзеных каменных экзэмплярах назіраюцца: расьпілоўка, шліхаваньне і сьвідраваньне.

Гэтак сама цяжка прызнаць радзіміцкім пры існуючым матар'яле і выраб шкла, якое, як відаць, ішло да іх з вялікіх цэнтраў, накшталт Кіева (249), Чарнігава, Смаленску.

Разгляд рамяства і перш за ўсё наяўнасьць чужых для радзіміцкай тэхнікі рэчаў у іх курганным інвэнтары, падвёў нас шчыльна да пытаньня аб гандлі. Гэта пытаньне распадаецца, па-першае, на высьвятленьне аб'ёму і значэньня замежнага гандлю і, па-другое, на досьлед гандлю ўнутры радзіміцкай тэрыторыі, на прасоўваньне продукту ад вытворцы да спажыўца. Паколькі гутарка ідзе аб племені радзімічаў, дык пад словам „замежны гандаль" разумеецца абмен ня толькі з далёкімі палітычнымі організмамі, як халіфат або Візантыя, а з кожным суседнім славянскім племенем або буйным рамесьніцкім цэнтрам.

Пытаньне аб усходня-славянскім гандлі доўгі час было об'ектам палемічных абгаворваньняў. Шмат якія дасьледчыкі гісторыі гаспадаркі рабілі спробы зрабіць яго галоўным пытаньнем экономікі старажытнай Русі. Вышэй ужо прыводзіліся ўказаньні на тое, што старажытны славянін у інтарэсах гандлю перасяляўся з месца на месца і адыходзіў ад чорназему. Натуральней усяго дапускаць у такім выпадку пасяленьне блізка гандлёвых шляхоў, на вялікіх водных магістралях, і вось Пархоменка лічыць, што паход 984 году зьяўляецца аднэй з падзей кіеўска-радзіміцкай барацьбы за ўладаньне Дняпром, як гандлёвым шляхам. Барацьба ішла таму, што радзімічы разлучалі паўночную і паўднёвую паловы Дняпра і перашкаджалі кіеўлянам гандляваць з поўначчу. Гэтаму дасьледчыку радзімічы ўяўляюцца як племя „ваяўнічае, з нахілам да перасоўваньня і набегаў". „Гэта (радзімічы, вяцічы, северане

і паляне) хутчэй за ўсё — тыя русы, ня чужыя фінска-цюрскім рысам быту, якіх у 922 г. бачыў на Волзе Ібн-Фацлан" (стар. 64) (153).

Продкі гэтых радзімічаў у VIII стагодзьдзі, паводле дапушчэньня Пархоменкі, робяць набегі на Візантыю, плаваюць па Касьпійскім моры ў Прусію, маючы на гэтым моры базу—Іціль.

Другія вучоныя, ня маючы сьмеласьці ўказваць такі тысячавёрстны дыяпазон гандлёвай дзейнасьці радзімічаў, спрабуюць усё-ж надзяліць іх гандлёвай гаваньню, праўда, не на Касьпійскім моры, а на Дняпры — Любечам. Платонаў (159), які выставіў гэта палажэньне, выходзіў з думкі, што кожнае племя павінна было мець свой горад, разумеючы пад горадам склад тавараў (стар. 61). Калі паляне маюць Кіеў, крывічы Смаленск, дык чаму радзімічы ня могуць мець Любеч?

Цікавае асьвятленьне гэтым дапушчэньням гісторыкаў дае археолёгія — Любеч можа лічыцца чыста севяранскім горадам на аснове знахадак там курганоў з урнамі, якія неперарыўным ланцугом цягнуцца аж да Курску. Радзіміцкая гавань на Дняпры адпадае.

Што тычыцца радзіміцкіх паселішчаў на Дняпры, дык яны не падлягаюць ніякаму сумненьню, але асаблівага імкненьня на яго берагі, якое павінна было-б няўхільна узьнікнуць у радзімічаў, калі-б яны былі пераважна гандлярамі, мы не наглядаем — наадварот, шчыльнасьць засяленьня там значна меншая ня толькі чым на Сажы, але і на прытоках яго: на Дняпры, паводле вылічэньняў Раманава (181), адно гарадзішча прыпадае на 15 вёрст, тады як на Сажы толькі на 5, а на Бесядзі на 6 вёрст.

Па Дняпры ў межах радзіміцкай тэрыторыі плавалі смаленскія і чарнігаўскія купцы; першыя мелі там рад „колёній", маленькіх апорных пунктаў, а апошнія працягнулі лінію сваіх паселішчаў ад Любеча да Рэчыцы, перайшоўшы з левага на правы бераг. Левы бераг Дняпра ад Рэчыцы да вусьця Сажа, які можа лічыцца радзіміцкім, не заселены зусім. Гаварыць пры такіх абставінах аб захопе радзімічамі Дняпра, іменна як гандлёвага шляху з варагаў у грэкі, ня зусім асьцярожна. Радзімічы асядалі на берагох Дняпра, зусім ня маючы на ўвазе яго транспортныя мажлівасьці; месцы, найбольш выгодныя ў апошнім сэнсе, былі захоплены іншымі пляменьнямі, якія мелі на сваёй тэрыторыі буйныя гандлёва-рамесьніцкія цэнтры; так, вусьце Друці было занята крывічамі, амаль у вусьці Бярозы разьмясьціліся севяране і тыя-ж крывічы.

Звычайна да пытаньня аб гандлі ў Кіеўскай Русі падыходзяць агулам, не заўважаючы ні соцыяльных, ні географічных адценьняў гандлю і яго ролі. Адсюль вынікае, што натуральная славянская гаспадарка пачынае рабіцца толькі з XII стагодзьдзя, і то толькі дзякуючы крыжовым паходам, а да гэтага панаваў гандлёвы капіталізм (Юшкоў, 266).

Блеск такога міжнароднага гораду як Кіеў засланіў ад дасьледчыкаў асноўную масу славянства, на якую пачалі проектаваць паняцьці, што склаліся пры вывучэньні больш комэрцыйных цэнтраў—...„перад намі ня тыя „прымітыўныя", „раўнінныя" славяне, наадварот, гэта — спрактыкаваныя гандляры, суровыя ваякі, сьмелыя падарожнікі, добрыя майстры" (Сьвятлоўскі, 192, стар. 265). Аўтар, з працы якога падана гэта цытата, пярэчыць супроць капіталізацыі адных толькі вярхоў грамадзтва і гаворыць аб тым, што „грашовыя адносіны пранікаюць у тоўшчу жыцьця, у быт народу" і робіць больш шырокі вывад (пераказваючы Ключэўскага) „згодна патрэб гандлю будуецца ўвесь быт і ўвесь характар усходня-славянскага ладу" (стар. 267).

Археолёгі да нядаўняга прошлага падтрымлівалі такія разважаньні гісторыкаў: „прывознымі (у беларускіх курганох) трэба лічыць: пацеркі, сярэбраныя і бронзавыя бранзалеты, завушніцы, высочныя колцы, пражкі, фібулы, пярсьцёнкі, шпількі, праразныя бляшкі, крыжыкі, нажыкі, сякеры, коп'і, зрэдка мячы" (Анучын, 116). Карацей кажучы, які-небудзь дрыгавіч або радзіміч, абзаводзячыся гаспадаркай і дробнымі рэчамі асабістага ўжытку, зьвяртаўся перш за ўсё да чужаземных комісіянэраў, якія забясьпечвалі яго рэчамі, прывезенымі з Багдату, Хэрсонэсу і г. д.; мажлівасьць уласнага вырабу ня прыходзіла ў галаву. Толькі праца А. В. Арцыхоўскага (вядомая мне, дзякуючы ласкавасьці аўтара, у рукапісе) агромным фактычным матар'ялам абвяргае такое надмернае ўяўленьне аб ролі і разьмерах гандлю.

Паспрабуем на конкрэтным археолёгічным матар'яле з радзіміцкіх курганоў праверыць гэтыя схэмы ўсходня-славянскага гандлю, і ў першую чаргу, замежнага гандлю. A priori, выходзячы з іх індыфэрэнтнасьці да „грэчнікаў" можна ўжо дапускаць пэўную слабасьць замежнага гандлю, ва ўсякім разе яго нельга лічыць адным з заняткаў радзімічаў у цэлым.

Па зусім зразумелых прычынах да нас дайшла толькі пасыўная частка іх гандлёвага балянсу—прывоз. Рэчы, якім можна прысвоіць візантыйскае паходжаньне, налічваюцца адзінкамі — гэта будуць: пярсьцёнак з грэцкім надпісам з Туравіч, нейкая плёмба з грэцкім надпісам і малюнкам галавы ў німбе (Новы Быхаў, 178), якая датуецца Раманавым VIII стагодзьдзем, „корсунскі" выпілены з каменю крыжык (Лялічы) і гэта ўсё. Трэба дадаць, што абставіны знахадкі плёмбы нявыразныя, ды і месца знахадкі — прымежжа радзімічаў і крывічоў.

Бліжэйшымі да радзімічаў знахадкамі візантыйскіх монэт будуць Магілеў, Рэчыца і Чарнігаў, на радзіміцкай-жа тэрыторыі яны пакуль што ня знойдзены. Гэтымі фактамі абвяргаецца думка вучоных аб культурным уплыве Візантыі — „...самыя глухія куткі славяна-рускіх паселішчаў, зразумела праз гандаль, мелі мажлівасьць карыстацца вынікамі візантыйскай культурнасьці" (Завітневіч, 85, стар. 109).

Прывоз рэчаў з арабскага ўсходу быў, знаць, больш значным, ва ўсякім разе праца славянскіх майстроў па арабскіх узорах (сяміпраменныя высочныя колцы, луньніцы, тэхніка зерні і інш.) дапускае, што першаўзоры былі некалі завезены да славян дзякуючы гандлю. Арабскі ўплыў быў больш дэмократычны за візантыйскі, які асядаў у гарадох. Але доказаў гандлю радзімічаў з самімі арабамі

для X-XII ст. у нас няма ніякіх. Аддаленасьць іх зямлі і адсутнасьць у арабаў неабходнасьці зьбірацца ў радзіміцкае Палесьсе, бо ўсе тавары радзімічаў арабы маглі мець у Кіеве або нават у Ітылі, пераконваюць у гэтым. Арабскія рэчы траплялі да радзімічаў пры пасрэдніцтве кіеўскіх і іншых гандляроў.

Найбольш яскравым і бясспрэчным доказам абмену зьяўляюцца монэты, якія знаходзяць або ў выглядзе скарбаў, або ў курганох, дзе яны нярэдка губляюць свой характар усеагульнага эквіваленту і робяцца звычайнай падвескай. Монэтныя скарбы вельмі добра характарызуюць накапленьне, і іх географічнае разьмяшчэньне ва Ўсходняй Эўропе малюе ня толькі сфэры ўплыву арабаў і кірунак гандлёвых шляхоў, але і ступень соцыяльнай дыфэрэнцыяцыі насельніцтва таго ці іншага раёну.

На тэрыторыі радзімічаў скарбы складаюцца галоўным чынам з арабскіх монэт, за выключэньнем знахадкі скуранога мяшка з хазарскімі монэтамі VI стагодзьдзя ў с. Хамічах, на паўднёвай мяжы радзімічаў (там ёсьць і курганы, але яны не дасьледваны).

Гэты скарб нявольна наводзіць на думку аб раньніх узаемаадносінах радзімічаў і хазараў, зафіксаваных пазьней кіеўскім летапісцам.

Арабскія монэты знойдзены ў наступных месцах (134):

1. Гомель	82 шт.	896-943 гг.	Саманідзкія
2. Гомельскі пав., Маркавіцк. вол.	?	892-911 гг.	„
3. Старадуб. пав. с. Мядзьведзева	124 шт.	896-982 гг.	„

Шляхі іх праніканьня ясны — у Гомель па Сажы яны ішлі з Любеча ці Кіева, а ў Старадуб — па Снові з Чарнігава. Скарбы вельмі небагатыя па сваіх разьмерах і ня ідуць ні ў якое параўнаньне з такімі вялізарнымі скарбамі, як, напр., скарбы ў Ноўгарадзе, Кіеве, Чарнігаве, якія ацэньваюцца ў некалькі тысяч рублёў. Паасобныя знахадкі монэт у курганох былі крыху часьцей, але зноў-ткі ў вельмі нязначных разьмерах:

Арабскія монэты:

1. Абідавічы . . .	981 г.	Нух-бэн-Мансура (231)	
2. Казарычы . . .	913 г.	Ахмэда-бэн-Ісмаіла (75)	
3. р. Пешчань . . .	911 г.		(134)
4. Уваравічы . . .	933 г.	Нур-бэн-Ахмэда	(134)
5. Глыбоцкае . . .	IX-X ст.		(134)
6. Курындзіна (Мглінск. п.) .	X ст.	Багдадзкая	(134)

Заходнія монэты:

1. Прапойск . . .	XI ст.	Германскі пфэніг (72)
2. Гочава . . .	XI ст.	(204)

Кіеўскія монэты:

1. Абідавічы . . .	980-1015 гг.	Уладзіміра (234)

Некаторыя знахадкі выкрыты ў прымежнай паласе, але лічыць іх радзіміцкімі няма падстаў. Такавы знахадкі: дыргэм Гаруна-Аль-Рашыда ў Нова-Быхаве (134), Кельнская монэта X ст. ў курганох блізка Салонага (180) (дрэгавічы), скарб арабскіх монэт у Мірапольлі каля Гочава (134) і наяўнасьць насычанага рознымі монэтамі ўчастку Дняпра ад Рэчыцы да вусьця Сажа (82).

У гандлёвай колёніі смаленскіх крывічоў Лучыне, якая ляжыць на Дняпры ў яго радзіміцкай частцы, знойдзены сярэбраныя рублі Кіеўскага пэрыоду і скрынка з сярэбранымі грыўнямі і аздобамі.

Сьляды накапленьня на радзіміцкай тэрыторыі ёсьць, але не заўсёды самі радзімічы прымалі ўдзел у гэтым накапленьні. Апрача яскравага ў гэтых адносінах Лучына, укажу і на вядомы севяранскі ўплыў у раёне Мядзьведаўскага скарбу, дзе мы маем багатыя зброяй пахаваньні ў Левінцы. Найменш спрэчнымі ў сэнсе прыналежнасьці радзімічам зьяўляюцца скарбы ў Гомелі і каля яго; іх супаданьне з „сталіцай радзімічаў" вельмі характэрнае. Наогул-жа колькасьць монэтных знахадак у радзімічаў дазволіла новаму дасьледчыку гандлёвых сувязяў Русі з Захадам зрабіць вывад, што „цэлыя славянскія пляменьні, як драўляне, радзімічы (па Сажы) і значная частка іншых, засталіся па-за гандлёвым рухам" (Любаміраў).

Заходнія монэты наўрад ці адбіваюць германа-радзіміцкія зносіны, хутчэй за ўсё гэта — вынік складанага абмену: па-першае, гандлю Кіева ці Смаленску (апошняе больш праўдападобна) з чужаземцамі і, па-другое, гандлю Смаленску з радзімічамі.

Скончыўшы разгляд замежнага гандлю міжнароднага маштабу, пяройдзем да апісаньня абмену з суседнімі пляменьнямі і буйнымі цэнтрамі. Параўнаўчая географічная блізкасьць да такіх ачагоў культуры, як Кіеў, Смаленск, Чарнігаў, і адміністрацыйная сувязь з двума апошнімі павінны былі-б адбіцца на інвэнтары радзімічаў, калі-б гандаль з імі разьвіўся мацней, але фактаў для гэтага гандлю ня больш, чым для замежнага. Гэта — некаторыя тыпы пацерак, шкляныя бранзалеты (Лялічы), кіеўскія пісанкі (Улазавічы), эмалевы крыжык (Казарычы), можа быць некаторыя тканіны і, зразу-

мела, монэты Ўладзіміра (Абідавічы). Сьпіс па свайму складу і кароткасьці вельмі характэрны — увозіліся адзінічныя экзэмпляры рэчаў ювэлірнай вытворчасьці кіеўскіх майстроў. Можа быць некаторыя экзэмпляры „скандынаўскіх" крыжыкаў траплялі да радзімічаў па Сажы з Смаленшчыны (куды яны ў сваю чаргу маглі трапляць з Прыбалтыкі).

Я не закранаю тут Гочава, у якім радзімічы былі толькі адным з компонэнтаў; там зусім іншыя ўмовы, іншае этнічнае і соцыяльнае асяродзьдзе; там быў прымежны гандаль з аланамі і вандроўнікамі, які, як відаць, перавышаў разьмеры выменьваньня толькі аздоб — гандаль зброяй, быдлам (?), нявольнікамі (?).

Ва ўсякім разе, для радзімічаў, як такіх, гочаўскія матар'ялы выкарыстаны быць ня могуць, бо зьяўляюцца проста процілеглымі таму, што мы маем на асноўнай тэрыторыі.

Дапоўніць весткі аб імпорце можна прасьліцамі з ружовага шыфэру. Колькасна яны правышаюць прывоз кіеўскай ювэлірнай продукцыі; гэта можа быць вытлумачана тым, што на месцы іх вырабу, у краіне драўлян каля Оўручу (148), матар'ял (шыфэр) ёсьць у нявычарпальных запасах, і тым, што вытворчасьць была масавай, разьлічанай на самы шырокі вываз (оўруцкія прасьліцы даходзілі да межаў Волскай Балгарыі і пранікалі да заходніх славян).

Разьвіцьцё радзіміцкай ювэлірнай вытворчасьці патрабавала пэўнай колькасьці медзі, волава, серабра, якіх ні ў радзімічаў, ні ў суседніх славянскіх пляменьняў ня было. Як відаць, каляровы мэталёвы сырэц прывозіўся з якіх-небудзь вялікіх гарадоў.

Міжпляменны гандаль быў вельмі слабы — пры параўнаўча аднастайнай тэхніцы дробных рамесьнікаў у суседніх з радзімічамі пляменьняў ня было сэнсу прывозіць рэчы, якія маглі быць зроблены ўласным майстрам. Выключэньне складае праніканьне буйназярністых дрэгавіцкіх пацерак. Тэхніка іх вырабу радзімічам была невядомай, і мы наглядаем у заходняй палове дыфузію гэтага тыпу ўнутр радзіміцкай тэрыторыі, прыгэтым не адчуваецца аднаго цэнтру, з якога-б гэтыя пацеркі ішлі; яны сустракаюцца па ўсёй радзіміцкай частцы левага берагу Дняпра, паступова радзеючы па меры адыходу ад дрэгавічоў на ўсход. Гандаль можа быць адным з тлумачэньняў праніканьня буйназярністых пацерак да радзімічаў (этнічная дыфузія магчыма, але для гэтага патрэбны больш грунтоўныя довады).

Атрымліваючы з вялікіх гарадоў рэчы раскошы або сырэц для іх вырабу, радзімічы маглі ў якасьці эквівалентаў прапанаваць продукты сваіх лясных промыслаў — мёд, воск, пушніну. Усе крыніцы як рускія, так і ўсходнія і візантыйскія, многа разоў гавораць аб гэтых продуктах славянскага вывазу. Для вывазу мёду і воску радзіміцкае бортніцтва дае салідную базу; што-ж датычыцца паляўніцтва, дык тут мы ня маем матар'ялу, хаця, зразумела, паляваньне на хутровага зьвера (галоўным чынам на лісіц) у радзімічаў было.

Улічваючы экспортныя магчымасьці радзімічаў, нам трэба мець на ўвазе, што ў якасьці абменнага фонду радзімічы мелі толькі тыя рэшткі, якія заставаліся ад розных відаў па-заэкономічнага прысваеньня з боку кіеўскіх, чарнігаўскіх і смаленскіх ваяводаў і епіскапскіх дзесяціньнікаў. „Павозы" і „палюдзьдзі", якія выкачвалі найбольш каштоўную, найбольш таварную частку продукту, бясспрэчна, адмоўна ўплывалі на пакупальную здольнасьць радзімічаў.

Трэцім продуктам вывазу быў лес і поўфабрыкаты з яго. Наяўнасьць вялізных лясных масываў, высокі процант лясістасьці, наяўнасьць добрых сплаўных шляхоў, якія захоўваюць сваё значэньне і да нашых дзён, і ўменьне радзімічаў апрацоўваць дрэва, стварала ўсе падставы для разьвіцьця ляснога промыслу.

Канстантын Багранародны (105) дае такія зьвесткі: „Сляване (якія плацяць дань Русі) на сваіх узвышшах высякаюць у зімовы час аднадрэўкі, наладжваюць іх да часу разводзьдзя і, калі пройдзе лёд, увозяць іх у бліжэйшыя плёсы. Па рэчках, якія ўпадаюць у Дняпро, яны ўваходзяць у гэты апошні і спускаюцца ў Кіеў; цягнуць іх для аснасткі і прадаюць іх Русам"...

Непасрэдна аб радзімічах тут не гаворыцца, але ўжо адзін той факт, што яны сядзяць ня толькі на прытоках, але і на самым Дняпры, дае права ўключаць іх у лік тых славян, аб якіх кажа Канстантын. Выраб гэтых аднадрэвак мае характар не спэцыяльнага рамяства, а сэзоннага промыслу радзіміцкага сялянства, якое займаецца ім у вольны ад земляробчых работ час—узімку. Гэты сплаў плытоў (адсюль, магчыма, першапачатковае значэньне слова „плотнік") і аднадрэвак зьяўляецца адным з відаў зносін радзімічаў з Кіевам.

Што датычыцца такой важнай часткі ўсходня-славянскага вывазу, як чэлядзь, дык ёсьць усе падставы думаць, што радзімічы зьяўляліся ня суб'ектам, а об'ектам гандлю, чаму гэта і будзе разгледжана ў іншай сувязі.

Унутрыпляменны гандаль, які даваў усходня-славянскаму селяніну асноўныя элемэнты земляробчага, лесарубнага і г. д. інвэнтару, можа быць асьветлены вялікай колькасьцю фактаў. Калі з курганавых і гарадзішчанскіх колекцый выкінуць тыя нямногія прывозныя рэчы, якія пералічаны вышэй, дык перад намі будзе продукцыя радзіміцкіх майстроў, якая абслугоўвае самыя рознастайныя патрэбы селяніна ад прыладаў працы да аздоб. Сьцвярджаць рамесьніцкае паходжаньне рэчаў з дрэва, косьці, тканін, часам гліны, далёка не заўсёды магчыма, бо большая частка іх выраблялася хатнім способам самімі сялянамі, але адносна ўсіх мэталёвых рэчаў можна быць упэўненымі, што кожны селянін зрабіць іх ня мог. А калі гэта так, дык трапіць да яго яны маглі толькі праз абмен.

Такі абмен ні ў якім разе не прадбачыць „капіталізацыі" славянства, шырокага разьвіцьця грашовых адносін і ўсіх тых зьяў, якія навязваюцца ўсходня-славянскаму селяніну прыхільнікамі гандлёвага капіталізму ў X—XII ст. (192). Наадварот, абмежаваны невялікай тэрыторыяй, абмен паміж рамесьнікам і земляробам (спачатку па формуле: тавар—тавар) зьяўляецца аднэй з адзнак так зва-

най натуральнай гаспадаркі эпохі фэўдалізму. Пры характарыстыцы гэтага абмену даволі істотным зьяўляецца адзначэньне тэрыторыі, якая абслугоўваецца майстрам. На жаль, прылады працы ня могуць нам дапамагчы ў гэтым, бо, дзякуючы ўмовам ручнога каваньня жалеза, нельга знайсьці двох аднолькавых экзэмпляраў.

У лепшым становішчы знаходзіцца адліваньне з мэталю; тут тоесамасьць дзьвюх рэчаў у большасьці выпадкаў будзе доказам вытворчасьці іх у аднэй ліцейнай форме і, значыць, у аднэй майстэрні (існаваньне вандроўных рамесьнікаў для старажытняй Русі проблематычна). З гэтай мэтай мною былі зроблены досьледы радзіміцкага інвэнтару па матар'ялах Дзяржаўнага Гістарычнага Музэю, прычым, каб пазбавіцца памылак, для досьледу браліся толькі рэчы, якія зьяўляюцца пляменным спэцыфікумам радзімічаў: сяміпраменныя вісочныя колцы, петляватыя падвескі і „антские" і біэліпсоідныя падвескі. Папярэднія вымеры рабіліся цыркулем, а пры супаданьні ўсіх вымераў рабіўся пластэлінавы адбітак аднэй рэчы (ён павінен быў аднавіць выгляд ліцейнай формы) і ў гэты адбітак уклалася другая рэч. Такім чынам, удалося высьветліць, што большаю часткаю рэчы з аднаго пахаваньня адліваліся ў аднэй форме, і, што асабліва важна, удалося адзначыць адну ліцейную форму для рэчаў разьяднаных часам дзесяткамі кілёмэтраў.

Петляватыя падвескі:

Улазавічы, кург. № 36 . . . . 3 шт.
Казарычы, „ № 63 . . . . 3 „

Падвескі „антскаго" тыпу:

Хізава (раскопкі Чарапанава) . . . 7 „
Туравічы („ Сізова) . . . . 8 „

Сяміпраменныя вісочныя колцы *1-ы адменьнік*

Улазавічы, кург. № 25 . . . . 6 шт.
Казарычы, кург. № 53 . . . . 6 „
Гулеўка, кург. № 40 . . . . 1 „

Сяміпраменныя вісочныя колцы *2-гі адменьнік*

Улазавічы, кург. № 31 . . . .
Улазавічы, кург. № 33 . . . . 4 шт.
Людкава . . . . 1 „

Параўнаваньне біэліпсоідных вынікаў не дало. Здабытыя даныя даволі скромныя і адрыўкавыя, але дастатачныя для пастаноўкі пытаньня. Калі прарабіць адпаведную працу ў больш шырокіх маштабах і па ўсіх катэгорыях, яна можа даць рад каштоўных вывадаў. Для радзімічаў стаіць на чарзе вывучэньне выбіванага орнамэнту на пласткаватых грыўнях і клейм на днішчах пасуды.

Картаграфаваньне здабытых вынікаў дае нам перш за ўсё два адасобленыя раёны—гэта з аднаго боку Ўлазавічы і суседнія курганныя групы, а з другога—Хізава і Туравічы. Іх разьяднанасьць падкрэсьліваецца і розьніцай у біэліпсоідных падвесках.

Унутры кожнага раёну пасёлкі аб'яднаны рэчкай—у першым выпадку Іпуцьцю, у другім—Добрыняй. Адлегласьць ад Хізава да Туравіч 22 км, ад Улазавіч да Казарыч—12 км, да Людкава 56 км, да Гулеўкі 44 км. У вадазборы Іпуці найбольш часта ўспамінаюцца Ўлазавічы, якія знаходзяцца ў суседзтве з Суражам—там ёсьць і петляватыя падвескі і вісочныя колцы абодвух адменьнікаў (прычым 2-гі адменьнік знойдзены двойчы ў двух суседніх курганох). Сувязь Улазавіч з Казарычамі намечана дзьвюма катэгорыямі рэчаў—вісочнымі колцамі і падвескамі. Усё гэта дае падставу дапускаць, што ваколіцы Суражу (між іншым вельмі паказальная назва) мелі нейкі невялікі рамесьніцкі цэнтр. Ці быў ён ва Ўлазавічах—сказаць цяжка, але, напэўна, яны, былі бліжэй усяго да яго.

Гэты невялікі рамесьніцкі цэнтр (можа быць усяго толькі адна ювэлірная майстэрня) меў сфэру ўплыву ўніз па Іпуці на 50 км. Цікава яшчэ адна зьява—ваколіцы гэтых рамесьніцкіх цэнтраў былі заснаваны спажыўцамі прывозных тавараў: пярсьцёнак з грэцкім надпісам знойдзены ў Туравічах, эмалевы крыж—у Казарычах, корсунскі крыж і шкляны бранзалет—у Лялічах, якія ляжаць побач з Суражам; як відаць, у гэтых курганных групах мы маем справу з невялікімі незафіксаванымі летапісам гарадкамі або іх прыгарадамі, насельніцтва якіх усё-ж часткова выдзялялася з асноўнай масы.

Формы гандлю маглі быць вельмі разнастайнымі; асабліва гэта тычыцца гандлю замежнага: перш за ўсё, некаторыя рэчы маглі самі радзімічы купляць на месцы, на гандлёвых плошчах Смаленску, Чарнігава, Кіева, прыяжджаючы сюды або за каляровым мэталем, або прывозячы „павсэ", або прыганяючы выдзеўбаныя калоды для лодак.

Другім відам гандлю маглі быць пэрыодычныя кірмашы, якія ладзіліся каля якога-небудзь гораду, прыкладам—Гомелю, якія зьбіралі да сябе ваколічнае насельніцтва. Кірмашовая форма гандлю магла існаваць побач з гандлем розьнічным, калі карабейнікі нясьлі да радзімічаў продукцыю оўруцкіх і кіеўскіх майстроў. Спосабы іх прасоўваньня—або пешая сьцежка па беразе рэчкі, або ў аднадрэўцы па рэчцы. Разьмяшчэньне радзіміцкіх вёсак па рэках аблягчала ім гэту задачу. Для таго гандлю, які

вёўся з радзімічамі—гандлю пярсьцёнкамі, пацеркамі і інш. дробязьзю, гэтакая форма зьяўляецца найбольш праўдападобнай. Існаваньне сталых рынкаў прывозных тавараў зьяўляецца яшчэ немагчымым.

Што датычыцца гандлю ўнутранага, які задавальняў дзьве крайнія патрэбы селяніна—з аднаго боку патрэбу ў рэчах аздобы, а з другога—у найбольш патрэбных прыладах вытворчасьці, як нарог, серп, сякера і г. д.,—дык тут маглі існаваць два віды абмену, якія характарызуюцца тым, што не гандляр ішоў да пакупца, а наадварот; першым відам быў продаж рамесьнікам сваіх вырабаў або ў сваёй майстэрні або на рынку, калі накаплялася багата няпроданага тавару, а другім відам магла быць скупка продукцыі гандлярамі і організацыя рэгулярнага продажу.

Маючы на ўвазе, што сялянамі купляліся рэчы, тэрмін ужытнасьці якіх быў вельмі значны (аздобы і цяпер яшчэ пераходзяць у спадчыну, а сярпы і сякеры служаць некалькі гадоў), цяжка дапусьціць неабходнасьць спэцыяльных скупшчыкаў і асобных сталых месц гандлю. Сталым месцам была кузьня або майстэрня медніка, куды селянін прыходзіў і заказваў тую або іншую рэч. Абменьваліся непасрэдна вытворца і спажывец. Аналёгіі гэтаму мы маем ня толькі ў гісторыі фэўдальнай гаспадаркі, але і ў нядаўным мінулым нашай вёскі, калі вясковы каваль зьяўляўся асноўным дастаўшчыкам прыладаў працы.

Курсаваньне каштоўнага мэталу ў радзімічаў было вельмі слабым; гэта відаць як з таго, што арабскія дыргэмы, трапляючы да іх, гублялі характар грашовага знаку і абарачваліся ў прывескі да маністаў, так і з вельмі нязначнай колькасьці скарбаў і іх каштоўнасьці. Цыркуляваўшая монэта называлася „шчэлягамі“. Цікава, што назва „шчэлягу“ захавалася ў сучасным беларускім сьпеўным матар'яле (параўн. у Сяржпутоўскага, 195).

Арцыбашаў (15) прапануе тлумачыць назву „шчэляг“ ад старанямецкага schinling—скурка. Пры багацьці славянскіх назваў для скур, запазычаньне радзімічамі адзначэньня гэтага паняцьця з нямецкага крыху незразумела. Хутчэй за ўсё, што даным словам азначаліся мэталёвыя грошы ад „шылінг“, але ці плацілі яны даніну хазарам мэталем ці натурай, сказаць цяжка; ва ўсякім разе летапісец у сваім сказе „и въдаша Ольгови по щьлягу якоже казаром даяху“ адбіў хутчэй разуменьні кіеўляніна XII ст. эпохі канчатковага афармленьня Рускай Праўды з яе тарыфікацыяй у мэталёвых грашох, чым радзіміцкую сучаснасьць IX ст.

Тавараабмен і натуральныя падаткі былі, як відаць, пануючымі ў радзімічаў; летапісец XI стагодзьдзя, гаворачы аб радзімічах, не ўспамінае аб грашовай даніне, а гаворыць аб натуральным падатку „павозе“.

Раўняючы гаспадарку радзімічаў з гаспадаркай суседніх славянскіх пляменьняў, мы наглядаем вялікае падабенства ў гаспадарчай будове дрэгавічоў, вяцічаў, часткова драўлян і выразную розьніцу адносна крывічоў і севяран. Для аб'ясьненьня падабенства і розьніцы патрэбен улік даных як фізычнай, так і соцыяльнай географіі. У гэтых адносінах асабліва характэрна параўнаньне радзімічаў з іх паўднёвымі суседзямі, якія разьмясьціліся ў лесастэпе на чарназеме, у сутыканьні з жывёлагадоўчай культурай жыхароў стэпу.

На конкрэтным прыкладзе аднаго славянскага племені радзімічаў мы бачым усю няроўнасьць росту культуры ў Кіеўскай Русі ў X-XI ст., няроўнасьць, якая не паддаецца ніякай нівэліроўцы, якую хочуць зрабіць некаторыя дасьледчыкі. Толькі вучот усіх асаблівасьцяў кожнага паасобнага раёну дазволіць аднавіць гісторыю старажытнай Русі ў яе сапраўдным выглядзе.

Побач з шумнымі гарадамі, вядомымі і паўночным сагам і арабскім „Кнігам каштоўных скарбаў“, існавалі (і часам амаль побач з гэтымі цэнтрамі) раёны, якія зьяўляліся для гарадзкіх дружыньнікаў рэзэрвуарамі высокіх менавых каштоўнасьцяў, як нявольнікі, пушніна, мёд, раёны з пераважаньнем натуральнай гаспадаркі, вельмі мала закранутыя культурнымі ўплывамі, якія былі, паводле выразу М. Н. Пакроўскага, „няпісьменнай глушшу“ (164).

Гаспадарчая эволюцыя гэтых раёнаў ішла бяз рэзкіх хістаньняў то ў бок бліскучага росквіту, то рэгрэсу, які мы назіраем, напр., для Кіева. Адсутнасьць непасрэднай залежнасьці ад сусьветных падзей дазволіла гэтым раёнам паступова і нормальна пераходзіць з аднэй гаспадарчай стадыі ў другую адначасова з нарастаньнем адпаведных падстаў унутры.

Для радзімічаў, тэрыторыя якіх зьяўлялася якраз такім незакранутым павярхоўнай гарадзкой культурай раёнам, час IX—XI ст. зьяўляецца часам пераходу ў другую стадыю, часам узмацненьня такога гаспадарчага фактару, як рамёствы.

Разьдзел IV.

Соцыяльна-палітычны лад.

Разгляд радзіміцкай гаспадаркі значна палягчае задачу ўясьненьня соцыяльнага ладу данага племені; для больш поўнай характарыстыкі патрабуецца толькі прыцягнуць такія матар'ялы, як паселішчы і знаходкі зброі.

У рускай гісторыі проблема вывучэньня грамадзкага быту *аднаго* племені ставіцца амаль упяршыню; адсюль выцякае, што схэма, складзеная для радзімічаў, можа ня супасьці з схэмай грамадзкага разьвіцьця *ўсёй* усходняй часткі славянства на даным хронолёгічным адрэзку. Ужо адна адсутнасьць больш-менш заметных гарадоў да XII ст. дае права дапускаць крыху іншы шлях для радзімічаў, чым, напрыклад, для крывічоў або севяран, якія налічваюць на сваёй тэрыторыі дзесяткі гарадоў розных ступеняў разьвіцьця.

Соцыяльная гісторыя племені патрабуе вырашэньня цэлага раду пытаньняў, як: формы землеўладаньня, ступень маемаснай і соцыяльнай дыфэрэнцыяцыі, захаванасьць радавых адносін і г. д. Гістарычнага матар'ялу для радзімічаў мы амаль ня маем—весткі летапісу вельмі нявыразны і даюць значна менш, чым для іншых пляменьняў; застаюцца зноў-ткі адны помнікі матар'яльнай культуры, якія, зразумела, запоўніць усе прагаліны ня змогуць, хаця і дазволяць зрабіць рад вывадаў. (Трэба яшчэ раз зрабіць агаворку, што без гарадзішчанскіх матар'ялаў спроба рэконструяваньня застанецца нясконччанай).

Інвэнтар радзіміцкіх курганоў дае некаторую неаднароднасьць жаночых аздоб у сэнсе іх каштоўнасьці—побач з пахаваньнямі вельмі беднымі (некалькі пацерак, пярсьцёнак, адно-два звычайных сісочных колцаў, напр., Курознава, Ціманавічы) ёсьць магільнікі з дарагімі прывознымі рэчамі (залатыя, эмалевыя і халцэдонавыя крыжыкі, шкляныя бранзалеты і г. д. Але яны адрозьніваюцца ня толькі наяўнасьцю прывозных рэчаў—набор мясцовых радзіміцкіх рэчаў там таксама багацейшы. Праўда, большаю часткаю гэта розніца толькі колькасная, але яшчэ ня якасная—і там і тут сустракаюцца адны і тыя-ж рэчы, з аднаго і таго-ж матар'ялу, зробленыя, магчыма, аднымі майстрамі; розьніца толькі ў ліку вісочных колцаў, падвесак, нітак пацерак.

Вышэй ужо было адзначана супаданьне рамесьніцкіх раёнаў (Сураскага і Чачэрскага) з месцамі знахадак прывозных рэчаў, цяпер мы дапоўнім гэта супаданьне і тым, што прывозныя рэчы знойдзены ў найбольш багатых наборах аздоб, напр., Казарычы, кург. № 63, дзе з візантыйскім крыжыкам і арабскім дыргэмам знойдзены 2 грыўні, 2 бранзалеты, 8 вісочных колцаў і г. д., або Уладзавічы, кург. № 25, дзе таксама 2 грыўні, 3 бранзалеты, 7 вісочных колцаў і 7 пярсьцёнкаў. Як відаць, у гэтых курганох мы маем справу з жонамі заможных асоб. Пэўная маемасная неаднастайнасьць радзімічаў, як мы бачым, была.

Увесь аналіз радзіміцкай гаспадаркі паставіў перад намі даволі выразна дзьве соцыяльныя групоўкі—гэта, па-першае, сялянскае земляробчае насельніцтва і, па-другое, рамесьнікі (кавалі, меднікі [катляры], ганчары і інш.).

Вызначыць ступень спэцыялізацыі рамяства на больш ці менш прымітыўных стадыях гаспадаркі даволі цяжка. Няма сумненьня ў тым, што пераважная большасьць гападарчых рэчаў—жыльлё, адзеньне, пасуда (не керамічная), абутак і г. д., выраблялася не спэцыялістамі, а самімі сялянамі, але вытворчасьць асноўных прылад працы (вытворчасьць сродкаў вытворчасьці), так сказаць, „цяжкая індустрыя" радзімічаў, як гэта было высьветлена пры разглядзе гаспадаркі, не магла быць унутры кожнага сялянскага двара, не магла выконвацца кожным радзімічам.

Мэталюргія і іменна апрацоўка жалезнай руды зрабілася першым рамяством; каваль быў першым рамесьнікам. Час вылучэньня кавальскага рамяства для нас зусім нявыразны, ва ўсякім разе для пэрыоду, які мы разглядаем, ён быў ужо даўно мінулым. Курганны матар'ял, апрача продукцыі кузьняў, дае нам яшчэ рад рэчаў, якія таксама патрабавалі спэцыялізацыі—гэта рэчы роскашы, аздобы.

Як відаць, павялічэньне вытворчых сіл шляхам спэцыялізацыі вырабу прыладаў працы (вылучэньне кавалёў) пацягнула за сабою павялічэньне дадатковага продукту. Зьявілася мажлівасьць дапамагчы далейшай спэцыялізацыі кавальска-ліцейнага рамяства, адгалінаваўшы ювэлірную вытворчасьць.

У X-XI ст. у Кіеве, Чарнігаве і інш. рамяство, бязумоўна, перарасло рамкі аднэй, калі можна так выразіцца, мэталюргіі—там мы маем і рымароў, і шаўцоў, і муляроў, і цесьляроў,—адным словам, шырока разьвітую сыстэму дыфэрэнцыяваных спэцыяльнасьцяў. На радзіміцкім матар'яле мы можам прасачыць гэта расшырэньне рамяства (і то няпоўнае) толькі ў напрамку керамічнай і можа быць бондарнай вытворчасьці. У выніку для радзімічаў X—XII ст. мы маем наступныя рэчы абсталяваньня: сырадутны горан, кавадла і прылады, неабходныя для таго, каб вырабіць „рольныя жалезы", сякеру, серп і інш., абсталяваньне ліцейнай, ліцейныя прылады, валачыльны варштат, ганчарны круг, абсталяваньне бандарні.

Існаваньне рамесьнікаў, як пэўнай праслойкі, якая стаяла па-за асноўнай земляробчай масай, лічу даведзеным паданым сьпісам.

Пашырыць сфэру рамесьніцкага спосабу вытворчасьці пакуль што нельга за адсутнасьцю даных.

Таксама няма падстаў дапускаць спэцыялізацыю сялянскага насельніцтва на земляробаў, паляўнічых, бортнікаў, лесарубаў і г. д.

Сэзонны характар земляробства рабіў для радзімічаў вольным увесь зімовы час, які і выкарыстоўваўся для пабочных промыслаў: адносна лесазагатовак мы маем дакладнае сьведчаньне Канстантына, што лес секлі зімою. Тады-ж, напэўна, адбывалася і паляваньне, тым больш, што хутровае паляваньне і магчыма, галоўным чынам, узімку, бо зімовая хутравіна каштуе даражэй.

Бортны промысел быў ізноў-ткі сэзонным і прытым вельмі кароткатэрміновым, чаму ён і ня мог стварыць спэцыялістаў-бортнікаў. У гэткім-жа становішчы знаходзіўся і рыбны промысел пры дапамозе „езаў" і „перавесішч".

Усе гэтыя дадатковыя промыслы ні ў якой ступені не парушалі аграрнага характару заняткаў асноўнай масы насельніцтва.

Пры сыстэме ручнога мліва (гл. гарадзішча ў Праскурні), якое было хатнім заняткам, не маглі вылучыцца і млынары-спэцыялісты.

Інакш кажучы, у эпоху, якую мы разглядаем, промыслы ў радзімічаў не раскалолі асноўнай масы насельніцтва; рамёствы толькі проціпаставілі ёй невялікую групу рамесьнікаў-мэталістаў і часткова пачалі вылучаць спэцыялістаў ганчароў і бондараў. Гэтыя рамесьнікі можа быць не

адразу адарваліся ад земляробства і некаторы час працягвалі быць зьвязанымі з сялянскай гаспадаркай, але па аздобах жанок ужо можна заўважыць іх большую матар'яльную забясьпечанасьць у параўнаньні з сялянамі.

Гаворачы аб гандлі, вышэй адзначалася, што пры існаваньні ў радзімічаў невялікага контынгенту рэчаў, якія атрымліваліся шляхам абмену (асноўныя прылады працы і аздобы) і пры абмежаваным размаху гандлёвай дзейнасьці (максымум 40—50 км уніз па рэчцы), патрэбнасьць у пасрэдніках паміж майстрам і пакупцом была зусім нязначнай. Дапускаць існаваньне гандлёвай праслойкі ў радзімічаў няма дастатковых падстаў; карабейнікі, якія прыносілі валынскія прасьліцы, зусім не абавязкова павінны быць радзімічамі.

Трэба мець на ўвазе таксама і параўнаўчую блізасьць такіх гарадоў, як Кіеў, Смаленск, Чарнігаў, куды раз у год увесну з мясцовымі таварамі маглі прыяжджаць радзіміцкія сяляне, прывозячы адтуль тыя нямногія з чужым адбіткам рэчы, аб якіх гаварылася вышэй.

Дагэтуль даводзілася мець справу толькі з жаночымі аздобамі, але і матар'ял мужчынскіх пахаваньняў паказвае некаторыя бакі грамадзкага быту радзімічаў. Знаходка бронзавай грыўні на мужчынскім касьцяку і цугляў у тым-жа пахаваньні можа гаварыць за пэўнае соцыяльнае адрозьніваньне іх уласьніка ад астатніх.

Адзначу яшчэ курган у Левінцы [3] узорнымі тканінамі і баявой сякерай, дзе пахаваньне зроблена з некаторай часткай „пахавальнага комфорту“ (між іншым, лічыць гэта пахаваньне бязумоўна радзіміцкім даволі цяжка, з прычыны наяўнасьці севяранскіх элемэнтаў у гэтым раёне), і курган № 20 у Карме-Пайцы, у якім пахаваны воін у панцыры, з нажом з касьцянымі тронкамі, ў хутараліку і сякерай.

Але найбольш яскравы матар'ял дае Гочава; там мы маем цэлы рад пахаваньняў з баявымі сякеркамі, шаблямі, коп'ямі, стрэламі і г. д. Зброя нярэдка аздоблена орнамэнтам; адначасова з зброяй часта сустракаюцца сярэбраныя бранзалеты і пярсьцёнкі ў мужчын.

Спэцыфічныя ўмовы прымежнага славянскага гарадка на Псле не дазваляюць ставіць яго знаходкі ў адзін рад з астатнімі знаходкамі. У даным выпадку мы, як відаць, маем справу з кондоцьерамі северскіх князёў, аб якіх Усевалад Сьвятаславіч мог гаварыць, што „... мои ти куряни свѣдомы къмети, подъ трубами повити, подъ шеломы възлелѣяны... пути имь вѣдоми, яругы имъ знаеми, луци у нихъ напряжени, тули отворени, сабли изъострени...“

Росквіт вайсковага мастацтва ў Гочаве ня мае сабе аналёгіі на асноўнай тэрыторыі радзімічаў— там ёсьць толькі паасобныя разрозьненыя і менш значныя знаходкі. Але ўсё-ж матар'ял, які ёсьць, дае права зрабіць вывад, што паралельна выдзяленьню спэцыялістаў-рамесьнікаў радзімічы выдзялялі невядомай моцнасьці праслойку спэцыялістаў-ваякаў. Што гэта праслойка ня была значнай, гаворыць беднасьць знаходак, а што гэта былі ўсё-такі ваякі, а ня проста ўзброеныя земляробы, даводзіцца наяўнасьцю сякер, спэцыяльна зробленых для вайсковай справы, і панцыру, які бясспрэчна сьведчыць аб тым, што вайсковая справа для данага суб'екта была не часовай, не выпадковым заняткам, а профэсіяй. Памеры кургана ў Карме (вышыня 4 м) утройчы перавышаюць звычайны, што можа гаварыць за жаданьне адзначыць памяць памершага ваякі больш вялікім насыпам. Існаваньне ў радзімічаў дружыны даводзіцца і апавяданьнем летапісу аб паходзе Алега на грэкаў у 907 годзе, у якім побач з варагамі і рознымі славянскімі пляменьнямі прымалі ўдзел і радзімічы.

Раўнаючы адносную вагу соцыяльных груповак у радзімічаў з іншымі славянскімі пляменьнямі, якія акружаюць іх, можна таксама, як і ў адносінах гаспадаркі, намеціць дзьве катэгорыі: з аднаго боку — вяцічы і дрэгавічы (за выключэньнем Турава) зьяўляюцца ва многім падобнымі да радзімічаў— тыя-ж сялянскія курганы, адсутнасьць вялікіх цэнтраў і параўнаўчая соцыяльная аднастайнасьць насельніцтва; з другога боку — Гнёздава і Чарнігаў даюць нам зусім іншы малюнак — грандыёзнасьць пахавальных пабудаваньняў, багацьце высока-мастацкіх, часта прывозных, вырабаў і дарагой зброі; адным словам, пахаваньні вельмі багатых і магутных людзей. Крывіцкія і севяранскія князі (а такія курганы як „Чорная Магіла“ даюць поўнае права называць пахаваных пад імі князямі) значна выперадзілі сваіх радзіміцкіх колег. Для радзімічаў, паводле археолёгічных даных, можна гаварыць толькі аб правадыры дружыны (або часовага сялянскага ратніцтва), аб „ваяводзе“ ў літаральным сэнсе гэтага слова, але не аб князі са сталай рэзыдэнцыяй, якая цягнула да сябе рамесьнікаў і гандляроў, рэзыдэнцыяй, абнесенай даволі грунтоўнай агарожай. Калі радзімічы і мелі якога-небудзь пляменнага князя, накшталт дрэўлянскага Мала і вяціцкага Хадоты, дык усё-ж ён ня мог раўняцца з Чарнігаўскімі князямі.

Севяране і крывічы даюць ужо вынікі працэсу дыфэрэнцыяцыі насельніцтва, радзімічы-ж даюць толькі пачатак гэтага працэсу. Гаспадарчыя ўмовы, ступень накапленьня дадатковага продукту, якія так адрозьніваюцца ў радзімічаў і севяран (з аднаго боку — суглінак, лясы і балоты, з другога— чарназем і выгодны для жывёлагадоўлі стэп), напэўна, адыгралі сваю ролю.

Грамадзкі быт радзіміцкага сялянства „людзей“ і „сьмердаў“, пераважна радзімічаў, вельмі нявыразны. Некаторае тлумачэньне могуць даць месцы паселішч, але малая дасьледванасьць іх затрудняе карыстаньне імі.

Гісторыяграфія пытаньня аб грамадзкім быце ўсходня-славянскага сялянства перагружана рознымі тэорыямі, якія ўзаемна адна адну выключаюць і разьбіраць якія тут няма месца. Найбольш праўдападобнай зьяўляецца тэорыя дворышчнага быту, якая ўзьнікла дзякуючы дасьледваньням найбольш архаічных частак Поўначы і Палесься (76, 69, 270). „Вялікая сям'я“ (30—40 чал.), якая становіць сабою гаспадарчы колектыў, што вырас з радавых адносін, зьяўлалася асноўнай ячэйкай тагочаснай

грамады (163, 164). Як называлася гэта вялікая сям'я: ці „дворышчам" (як на Палесьсі) ці „агнішчам", „родам", „печышчам" — сказаць цяжка.

Канчатковага вырашэньня пытаньня аб паселішчах радзімічаў і аб формах грамадзкай арганізацыі можна чакаць толькі ў выніку ўважлівага вывучэньня як гарадзішч і селішч, так і зьвязаных з імі курганоў.

Аб'ём курганных магільнікаў пакуль дае нам два тыпы паселішч, якія адрозьніваюцца колькасьцю жыхароў. Пры сярэднім пэрыодзе насыпаньня магільнікаў (ад першага да апошняга пахаваньня) у 150—200 гадоў мы маем рад курганных груп у 20-30 курганоў, што можа зьяўляцца могілкамі аднаго „дворышча", якое жыло самастойным хутарам. Побач з гэтым ёсьць курганныя групы значна большых разьмераў (Нісімкавічы 225 курганоў, Навасёлкі 200 курганоў, Борхава 160, Уваравічы 150 і г. д.).

Такі магільнік мог узьнікнуць толькі ў тым выпадку, калі там хавала не адно дворышча, а некалькі. Аб'яднаньне некалькіх дворышч у якую-небудзь больш буйную арганізацыю („весь", „вервь", „село"?), бязумоўна, даводзіцца існаваньнем агульных могілак.

У пэрыод, які разглядаецца намі, радавы прынцып арганізацыі радзіміцкага паселішча ўступае месца тэрыторыяльнаму. Гэты пераход больш прыметны ў мясцох з больш інтэнсыўнай дыфэрэнцыяцыяй насельніцтва. Так, ва Ўлазавічах у агульным магільніку пахаваны крывічы, у Людкаве— севяране, якія перасяліліся сюды. Улавіць прыток у дворышча „чужынцаў", „прымакоў" з радзімічаў пакуль што немажліва.

Працэс грамадзкага разьвіцьця радзімічаў можна намеціць так: аселыя кроўныя саюзы землерабаў паступова перарастаюць у тэрыторыяльныя (у сувязі з гэтым гарадзішчы канчаткова набываюць характар ня сталага месца жыхарства, а прытулку); роўналежна гэтаму ідзе працэс спэцыялізацыі рамяства як у сэнсе пераходу раду вытворчасьцяў з сфэры хатняй вытворчасьці ў сфэру вытворчасьці рамесьніцкай, так і ў сэнсе ўскладненьня існуючых рамёстваў. Гаспадарка паасобнага дворышча перастае быць чыста натуральнай, у яе ўносяцца некаторыя элемэнты абмену. Адначасова накапляюцца супярэчнасьці ўнутры гаспадарча-радавых груповак, дадатковы продукт разьмяркоўваецца няроўнамерна (пар. падзел сям'і пры няроўнай колькасьці едакоў), у чым адыгрывае ролю разьмеркаваньне як расчышчанай зямлі, так і сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Вынікам гэтых супярэчнасьцяў зьяўляецца зараджэньне к X стагодзьдзю трэцяй клясы—ваякаў. Зародкавы стан гэтага апошняга пласта не дазваляе вырашыць пытаньне аб ступені зьвязанасьці яго з землеўладаньнем, але сувязь гэту можна дапускаць. Такім чынам, хаця к канцу X, пачатку XI стагодзьдзя мы маем у радзімічаў рад элемэнтаў фэўдалізму (праўда, у яго прымітыўнай форме), але ўсё-ж гаварыць аб працэсе фэўдалізацыі радзімічаў даволі цяжка, разумеючы пад апошняй разьвіцьцё фэўдальных інстытутаў — ішоў працэс награмаджэньня прадпасылак фэўдалізму, працэс, які скончыўся толькі к сярэдзіне XII стагодзьдзя.

Тэорыя імпортнага паходжаньня фэўдалізму зусім ігнаруе награмаджэньне прадпасылак унутры славянскіх пляменьняў, спрабуючы зводзіць усё да заваёў, але племенная арыстократыя ўтваралася бяз усякага ўдзелу вараскіх гасьцей. Для такіх пляменьняў, як радзімічы, дзе награмаджэньне адбывалася больш марудным тэмпам (у параўнаньні, напр., з севяранамі), роля кіеўскага князя і яго дружыны была нават адмоўнай — „палюдзьдзе", зьяўляючыся формай эксплёатацыі, якая папярэджвала пазямельную, адбірала дадатковы продукт ад радзімічаў, тым самым паслабляючы мясцовую радзіміцкую арыстократыю.

Вынікі ад продажы ў Візантыю радзіміцкай чэлядзі, скуры і мёду ішлі на ўзбагачэньне не радзіміцкіх ваякаў, а кіеўскай ці чарнігаўскай дружыны (у гэтых адносінах радзіміцкую тэрыторыю можна лічыць колёніяй спачатку Кіева, а далей севяран — фэўдалізм апошніх разьвіваўся часткова за кошт радзімічаў). Да таго часу, пакуль кіеўскія і чарнігаўскія князі грабілі радзімічаў наездам з сваіх гарадоў, не асядаючы на іх зямлі, яны затрымлівалі працэс стварэньня прадпасылак для фэўдалізму. І калі гэтыя прадпасылкі ўсё-ж былі, дык гэта трэба аднесьці за кошт дзейнасьці мясцовых радзіміцкіх Малаў і Хадот.

Арганізацыя ўлады ў радзімічаў ішла, як відаць, па дзьвюх лініях: з аднаго боку — захоўвалі значэньне вечавыя сходкі, а з другога — заўсёды набываў усё большую і большую адносную вагу пласт мясцовых дружыньнікаў, які нарадзіўся з радавых вярхоў, прычым меліся імкненьні да ўстанаўленьня панаваньня гэтага пласта, панаваньня, якое азначалася сілай зброі. Няма патрэбы маляваць ідылічную карціну, што вечу, сходу належала ўлада законадаўчая, а князьку толькі выканаўчая. Радавая арыстократыя, якая набыла вайсковае адценьне, устанаўляла ўзаемаадносіны з насельніцтвам шляхам набегаў, а не пры дапамозе юрыдычных норм.

Супярэчнасьці, якія награмаджваліся няроўнамерна ўнутры дворышч, прыводзілі да няроўнамернага-ж выдзяленьня дружыннай праслойкі; адсюль — паглынаньне адных дворышч другімі не ў гаспадарчых адносінах, а ў сэнсе падданасьці аднэй дружыне. Як далёка зайшоў гэты працэс паглынаньня, ці здолеў ён падначаліць усё племя радзімічаў аднаму старшыні — сказаць цяжка, але можна думаць, што ён спыніўся на папярэдняй стадыі, калі ў межах пэўнага этнічнага масыву (племені) існавала некалькі „політычных" (тэрмін умоўны) груповак, некалькі дробных дружын з дробнымі-ж правадырамі. У выключных выпадках можна дапускаць зьезд правадыроў для выбараў агульнага ваяводы, што магло быць пры набліжэньні ў 984 г. войск Уладзіміра, калі была зроблена спроба даць гэтым войскам арганізаваны адпор на граніцы.

Цяпер мы якраз падыходзім да вырашэньня пытаньня аб тым, што ўяўляла з сябе *племя* радзімічаў. На аснове археолёгічнага матар'ялу яно выступае перад намі перш за ўсё як пэўная этнографічная адзінка, якая адрозьніваецца ад сваіх суседзяў ня сыстэмай гаспадаркі або асаблівасьцямі грамадзкага быту (бо правесьці мяжу паміж радзімiцкімі і крывіцкімі *сялянамі* на гэтай аснове нельга), а некаторымі трэцяступеннымі дэталямі, якімі зьяўляюцца жаночыя аздобы.

Вышэй ужо адзначалася, што пры сучасных этнографічных клясыфікацыях найбольш зручным зьяўляецца іменна такі матар'ял. Сёе-тое даюць і пахавальныя абрады.

Што этнографічныя адзнакі радзімічаў заўважаліся іх сучасьнікамі, даводзіць сказ летапісца аб радзімічах, якія „один обычай имяху“ з вяцічамі і северанамі. Параўнаньне радзімічаў і вяцічаў сустракаецца ў летапісе і яшчэ раз, калі летапісец спрабуе вытлумачыць іх паходжаньне. Там роданачальнікі гэтых пляменьняў проста называюцца братамі. Такое ўяўленьне магло ўзьнікнуць толькі на падставе назіраньня значнага этнографічнага падабенства вяцічаў з радзімічамі (іменна ў жаночых аздобах).

Консэрватыўная прыхільнасьць старажытных пляменьняў да пэўных тыпаў аздоб нават пры цесных зносінах з суседзямі дазваляе бачыць за гэтай зьявай нешта большае, чым толькі ўплыў моды. За вісочнымі колцамі хаваецца самасьвядомасьць, калі ня нацы (аб гэтым, зразумела, ня можа быць і гутаркі), дык ва ўсякім разе аднаго з варыянтаў этнічнага падразьдзелу.

Адзіным палітычным арганізмам радзімічы наўрад ці былі, па крайняй меры, летапісец пералічаючы пляменныя княствы, радзімічаў не ўспамінае.

Згодна ўяўленьням гісторыкаў, у XI стагодзьдзі адбывалася карэнная ломка пляменных груповак, якая скончылася разьмяшчэньнем насельніцтва па зусім новаму прынцыпу. „Старажытны пляменны падзел не супадаў з гарадавым або абласным, які ўтвараўся к палове XI стагодзьдзя“ (Ключэўскі, 101, стар. 159). Не закранаючы тут пераўвялічанага паняцьця аб арганізацыйнай сувязі паміж горадам і ўсёй зямлёй (крывічы прызналі ўладу Алега нібы толькі таму, што ён забраў іх горад Смаленск, а не таму, што ён рабіў узброеныя аб'езды сваёй воласьці), адзначу разыходжаньне гэтай гіпотэзы з фактамі.

Адміністрацыйна-палітычная карта старажытнай Русі XI стагодзьдзя ў асноўных сваіх рысах утварылася на падставе ранейшых пляменных падзелаў (між іншым, слова „ранейшых“ тут не падыходзіць, бо пляменныя падзелы, мяркуючы па нязначных вестках летапісу, існавалі да XII ст.). Найбольш яскравым прыкладам, які пацьвярджае выказанае, зьяўляюцца памянутыя тры пляменьні (радзімічы, вяцічы і северане), адзначаныя летапісцам як этнографічна блізкія, і ў XI ст. у склад Чарнігаўскага княства ўвайшлі: частка северан (северане, як паказаў аналіз археолёгічнага матар'ялу, ня былі аднастайнымі) радзімічы і вяцічы.

Гаворачы аб радзімічах, гісторыкі звычайна лічаць, што яны былі падзелены паміж Чарнігавам і Смаленскам, што да Чарнігаўскага княства адыйшла толькі частка радзімічаў: „Наўрад ці не адзіная іх (радзімічаў) тэрыторыя не паслужыла для азначэньня палітычных граніц“ (Мілюкоў, 138, стар. 48). Правільна тое, што частка радзімічаў адыйшла да Смаленскага княства, але якая частка? З дапамогаю гістарычнага матар'ялу адказаць на гэта пытаньне немажліва, а калі апісваць радзімічаў, якія жылі толькі на Сажы, дык сапраўды мяжа перарэжа гэту рэчку напалам. Адзіным надзейным вырашэньнем будзе налажэньне на карту княстваў археолёгічнай карты (гл. карту 11).

Дзіўная конфігурацыя Чарнігаўскага княства атрымае тады зусім пэўнае асьвятленьне. Мяжа Чарнігаўскага княства з Ноўгарад-Северскім у тэй часьці, дзе яна ідзе па тэрыторыі радзімічаў, з надзвычайнай дакладнасьцю супадае з паўднёва-ўсходняй мяжой асноўнай радзіміцкай тэрыторыі (радзіміцкія колёніі на северанскай тэрыторыі ў разьлік не бяруцца). Заходняя мяжа да Рагачэва ідзе па Дняпры, падзяляючы Чарнігаўскае і Тураўскае (а затым Полацкае) княствы.

Палітычная граніца на паўночным захадзе ідзе крыху ніжэй граніцы этнографічнай, адсякаючы ад радзімічаў на карысьць Смаленскага княства толькі вузкую прымежную паласу. Крыху большая колькасьць радзіміцкай зямлі была занята смаленцамі толькі ў раёне Рослаўлю. Такім чынам, уся зямля радзімічаў была ўключана ў Чарнігаўскае княства проці тэорыі аб прыцяганьні гарадоў.

Агульны выгляд Чарнігаўскага княства на карце гаворыць іменна аб паглынаньні пляменьняў, а не гарадзкіх валасьцей: асноўнае ядро навокал Чарнігава, затым даволі вузкі пярэсмык, які прыпадае на прымежжа северан і радзімічаў (паміж Сноўю і Дняпром), далей граніцы княства пашыраючыся ахапляюць радзімічаў з двох бакоў, затым ізноў пярэсмык на стыку радзімічаў і вяцічаў (на Дзясьне) і зноў пашырэньне, абумоўленае расьсяленьнем вяцічаў.

Дапускаць у радзімічаў які-небудзь значны горад унутры іх тэрыторыі, які мог-бы зьявіцца цэнтралізуючай сілай, няма ніякіх падстаў. З усіх гарадкоў, якія ўспамінае летапіс у міжрэччы Дзясны і Дняпра, толькі тры могуць лічыцца безагаворачна радзіміцкімі—гэта Гомьи, Чичьрьскъ і Прупой. Іншыя-ж, як Зарой, Расьціслаў, Мсьціслаў, Старадуб і г. д. патрабуюць кожны асобнага разгляду.

Зразумела, Гомелем, Чачэрскам і Прапойскам сьпіс радзіміцкіх гарадоў ня вычэрпваецца, бо летапісец адзначаў толькі тыя, якія разьмясьціліся на Сажы і якія служылі шляхам для маршруту Любеч—Смаленск. Калі-б Іпуць у яе сярэднім і ніжнім цячэньні была-б у такім-жа выгадным географічным палажэньні, як Сож, дык мы, мажліва, мелі-б весткі яшчэ аб некалькіх гарадкох, напрыклад, у раёне сучаснага Суражу.

Весткі летапісца тычацца або паказанай воднай магістралі, або ўскраін радзіміцкай зямлі (Чарнігаўска-Смаленскага прымежжа і Падзясеньня). Бязумоўна, калі-б у глыбі радзіміцкай тэры-

торы адбываліся якія-небудзь падзеі, летапісец адзначыў-бы іх; маўчаньне-ж летапісца можна вытлумачыць толькі тым, што воддаль ад вялікіх дарог з стагодзьдзя ў стагодзьдзе „тишина бысть“.

Гарады, якія ўспамінае летапісец, паўстаюць перад намі ня ў якасьці буйных організмаў з самастойнымі функцыямі, а толькі ў якасьці нязначных топографічных точак, з дапамогаю якіх лёгка вызначыць месца падзей. Калі Гомель мог быць рэзыдэнцыяй княжаскага намесьніка, а часова і самога князя, дык Чачэрск, паводле апавяданьня летапісу пад 1168 г., калі Алег частаваў там Расьціслава абедам (121), малюецца зусім у такім-жа выглядзе, як Масква ў 40-х гадох гэтага-ж стагодзьдзя, калі сам летапісец яшчэ канчаткова ня вырашыў ці называюць яе Масквою ці сяльцом Кучкавым. Гэтыя гарады (і падобныя да іх, але пакуль нам невядомыя), апрача некаторага адміністрацыйнага значэньня, былі таксама рамесьніцкімі асяродкамі. Наяўнасьць літых у аднэй форме рэчаў у Туравічах і Хізаве можна тлумачыць суседзтвам з Чачэрскам.

Іменна дзякуючы рамесьнікам і абярнуліся гэтыя пасёлкі ў гарады, бо адміністрацыйнае значэньне (ды і то адноснае) было набыта пазьней. Але, нават такіх невялічкіх рамесьніцкіх гарадоў у радзімічаў было нямнога; да сярэдзіны XII стагодзьдзя летапіс не ўспамінае ніводнага (гэта толькі паказьнік іх нязначнасьці, але адсутнасьці іх яшчэ не даводзіць). Гэтыя гарадкі пачалі ўзьнікаць з гарадзішч тыпу Праскурнінскага, дзе каля падножжа вала была знойдзена кузьня, яшчэ даволі рана; але процэс перарастаньня гарадзішч—прытулкаў у гарадкі рамесьніцкага характару адбываўся ў радзімічаў вельмі марудна і яскравых вынікаў ня даў.

У большасьці радзіміцкіх гарадзішч X-XI ст. можна дапускаць маленькія цытадэлькі „тверды“ (параўн. у Кісялёва, 98), збудаваныя ваколічным сялянствам для адседжваньня там у часе радавых міжусобіц або нападу князёў, якія зьбіралі палюдзьдзе.

Кожнае з гарадзішч, напэўна, мела сваё імя, і пры запісваньні іх у летапіс (калі яны рабіліся месцам сутычкі) цяжка вырашыць, з чым мы маем справу—ці з горадам ва ўласным сэнсе слова, ці з гэтакай маленькай сялянскай цытадэлькай, бо ў вачох летапісца апошняя таксама была „горадам“. Думаю, што некаторыя гарады на прымежжы радзімічаў трэба далучыць іменна да гэтакіх прытулкаў (Росусь або Росуха, Радагошч—Сінін).

Такім чынам, больш ці менш значных гарадоў, якія-б маглі організаваць наўкол сябе паселішча, на тэрыторыі радзімічаў мы не наглядаем; ёсьць гарадзішчы, якія зьяўляюцца сродкам сялянскай земляробчай самаахові (можа быць толькі пазьней выкарыстаныя мясцовай дружынай) і невялікая колькасьць рамесьніцкіх цэнтраў, якія, дзякуючы сваім малым разьмерам, доўга не траплялі пад увагу кіеўскіх летапісцаў.

Каб скончыць нарыс грамадзкага быту радзімічаў, застаецца сказаць аб іх сямейных адносінах. Радзімічы XI-XII ст. маюць гонар мець свайго этнографа, які пакінуў у летапісе такія каштоўныя весткі: „...браци не бываху въ нихъ, но игрища межю селы. Схожахуся на игрища... и ту умыкаху жены собѣ... имяху же по двѣ и по три жены...“.

Організацыя земляробчымі абшчынамі супольных сьвят, якія мелі на мэце шлюбныя саюзы, спосаб атрыманьня жонак і многажэнства даволі яскрава абмаляваны гэтымі сьціслымі сказамі. З археолёгічнага матар'ялу заслугоўваюць увагі падвойныя пахаваньні (большаю часткаю мужчынскае і жаночае, радзей адно з іх замяняецца дзіцячым).

У асьвятленьні арабскіх і візантыйскіх сьведчаньняў аб дабраахвотным самагубстве жонкі пасьля сьмерці мужа яны набываюць асаблівае значэньне. Але наўрад ці дворышча, якому патрэбны былі рабочыя рукі, заахвочвала на такія самагубствы, і цяжка сьцьвярджаць, што падвойныя пахаваньні даводзяць іх—хутчэй тут мы маем пэўны компроміс—трудаву пасьля яе натуральнай сьмерці клалі ў той-жа курган, дзе ляжаў яе мёртвы муж. Аднак, канчатковы адказ залежыць ад будучых падрабязных досьледаў. Многажэнства было, як відаць, прывілеем маемасна магутнага пласта і наўрад ці было даступным усім социяльным групоўкам.

Цікавы таксама адносіны да дзяцей. Наогул, як відаць, над памершымі дзецьмі курган насыпаўся вельмі рэдка, большаю часткаю дзіцячыя касьцякі знаходзяць у курганох, насыпаных над дарослымі, але пэўны клопат аб дзецях відаць у вырабе спэцыяльна дзіцячых аздоб. Характэрна тое, што ступень клапатлівасьці аб дзецях проста пропорцыянальна социяльнай дыфэрэнцыяванасьці насельніцтва—у багатым Гочаве мы бачым і спэцыяльныя дзіцячыя курганы і зробленыя для дзяцей рэчы ў выглядзе мініятурных бранзалетаў і сякерак і тэракотавых бразгушак.

Падзел працы ўнутры сям'і меў прыблізна тыя-ж формы, што і цяпер: мяркуючы па знахадках, жанчыны займаліся ўборкай ураджаю, прадзеньнем, шыцьцём, а мужчыны—рубкай лесу, ворывам.

Разьдзел V.

Рэлігія і мастацтва.

Да вырашэньня пытаньняў, зьвязаных з так званай духоўнай культурай радзімічаў, прыйдзецца падыходзіць менш простымі шляхамі, чым пры досьледзе гаспадаркі, выкарыстоўваючы шэраг дапаможных прыёмаў, укосных доказаў.

Аднэй з галін, якія значна аблягчаюць акрэсьліваньне рэлігійнай сыстэмы старажытных славян, зьяўляецца этнографія XIX-XX ст. Беларусь у гэтых адносінах займае выгаднае палажэньне—этнографічных дасьледваньняў на Беларусі было праведзена многа і зьбіральнікамі фольклёру неаднакраць адзначаўся глыбокі архаізм шмат якіх разуменьняў, што дажылі да XIX ст. Больш

консэрватыўная, чым быт, Ідэолёгія захоўвае пры новых гаспадарчых формах рэшткі разуменьняў, якія ўзьніклі на папярэдняй гаспадарчай стадыі, праносіць іх далей і адкладае ў выглядзе перажыткаў у сучаснасьці.

Дапушчальнасьць проэцыраваньня некаторых перажытачных культавых момантаў Беларусі XIX ст. на гэту-ж тэрыторыю, але ў X-XI ст., можа быць даведзена шматлікімі прыкладамі; бяру адзін: шырока вядома шанаваньне крыніц і калодзежаў, г. з. „прошчаў“, куды нясуць грошы, прыносяць ручнікі, лён і г. д.

Мал, 2.

Зусім такі-ж культ многа разоў засьведчаны ўсходня-славянскай літаратурай для эпохі Кіеўскай Русі: тыя-ж калодзежы, тыя-ж грошы, што кідалі ў іх, тыя-ж ручнікі.

Прасочаная вышэй аднолькавасьць гаспадаркі радзімічаў з гаспадаркай іншых славянскіх пляменьняў і гэтакая самая аднастайнасьць соцыяльнай будовы, дазволяць прыцягнуць для асьвятленьня радзіміцкіх рэлігійных поглядаў радсьведчаньняў, якія непасрэдна самых радзімічаў ня тычацца, а гавораць або аб іншых пляменьнях, або аб славянах наогул. Але галоўным матар'ялам застануцца ўсё-ж археолёгічныя помнікі—у нашым распараджэньні ёсьць каштоўнейшыя абрадавыя будаваньні, якія доўгі час былі мокопольнымі дастаўшчыкамі рэчаў радзіміцкага быту—курганы.

Таксама каштоўны і тыя нямногія зьвесткі, якія мы знаходзім у гістарычных крыніцах, у прыватнасьці ў „Пов. врем. лет“.

Рэлігія радзімічаў ня была аднароднай — яна заключала ў сабе цыкль абрадаў і ўяўленьняў, якія належаць да культаў розных як па паходжаньню, так і па прызначэньню. Аб'яднаць комплекс гэтых культаў у адным слове даволі цяжка. Адны паняцьці ўзьнікалі па прычынах соцыяльнага парадку з умоў радавога быту і ў агульных рысах будуць аднолькавы і ў вандроўнікаў, якія жывуць родамі, і ў аселых земляробаў; другія паняцьці, абумоўленыя гаспадарчымі патрэбамі, могуць быць агульнымі для ўсіх земляробаў — і ў тэократычным Эгіпце, і ў жыхароў прыдняпроўскіх гарадзішч. Да гэтай рознастайнасьці дадаюцца перажытачныя формы больш раньніх культаў.

Такімі перажытачнымі вераваньнямі для IX — XI ст. можна лічыць тотэмізм. Сучаснасьць дае мала фактаў для меркаваньня аб славянскім тотэмізьме. Беларускія „комоедицы“, звычай убірацца казою, вера ў пераваротніцу (147) („ваўкалакі“, Усяслаў Полацкі, які бегаў ваўком у Тмутаракань)—вось тыя факты, якія так ці іначай можна зьвязваць з тотэмізмам. Навейшымі дасьледчыкамі (Быкаўскі, 39) устанаўляюцца ўсходня-славянскія тотэмы — жыта і бык; з апошнім было-б вельмі цікава параўнаць радзіміцкія падвескі з малюнкам бычай галавы (аналёгіі якім ёсьць у антычных, кельцкіх і ўсх.-славянскіх монэтах. Мотыў бычай галавы знаходзім у кульце Радэгаста на Балтыцкім Памор'і).

Калі гэтыя падвескі і маюць якое-небудзь культавое значэньне, дык трэба яшчэ вырашыць пытаньне: ці зьвязаны яны з тотэмізмам ці адбіваюць больш позьнія аграрныя культы быка, як цягавай сілы, якая значна палягчае апрацоўку зямлі, або Тура, загадкавага бога, які меў, як відаць, эротычны характар бога ўрадлівасьці.

Калі наяўнасьць тотэма-быка даводзіцца племеннымі назвамі — „вол-ыняне“ і інш., дык можа быць сюды-ж трэба прыцягнуць такія тапонімікі, як Туравічы, Бабровічы, Мядзьведкавічы і г. д., расьсеяныя ў вялікай колькасьці па тэрыторыі як радзімічаў, так і іншых славян.

Водгукам тотэмічных вераваньняў могуць зьяўляцца і амулеты, зробленыя з зубоў або кіпцёў жывёлы (большаю часткаю дзікай). Для радзімічаў мы маем амулет з зубоў ліса, які насілі ў маністах. Зьмяіны культ лічаць аднэй з адзнак тотэмізму; калі гэта так, дык трэба напомніць аб зьмяінагаловых бранзалетах, якія ёсьць у радзімічаў (100). Цэнтр, з якога пашыраліся бранзалеты такога тыпу (літоўская Прыбалтыка), зьяўляецца ў той-жа час і асяродкам зьмяінага культу. Ці адбівалі гэтыя аздобы ў радзімічаў якія-небудзь культавыя моманты, ці яны былі толькі аздобамі, прынесенымі звонку,—сказаць цяжка.

Хаця сьлядоў тотэмізму тысячу гадоў назад было, напэўна, значна больш, чым дайшло да нас, усё-ж і для радзімічаў ён быў ужо даўно пройдзенай стадыяй. Краяўгольным каменем усходня-славянскай рэлігіі лічаць культ мёртвых, выводзячы з яго ня толькі культ продкаў (тут сувязь бясспрэчная), але і культы прыродных сіл, атмосфэрных зьяў і г. д.

Адказам на пытаньне аб кульце мёртвых зьяўляюцца шматлікія курганы. Анімізм, і прытым анімізм, зьвязаны з матэрыялізацыяй душы, сьведчыцца ўсім пахавальным абрадам радзімічаў. Нябожчыку часам будуюць „дамавіну“, яму заўсёды кладуць дарагія для селяніна рэчы і аздобы—

бронзу, серабро, сэрдолік, візантыйскія эмалі, сякеры, сярпы, адным словам, усю асабістую маемасьць нябожчыка; тыя, якія засталіся ў жывых, рэчаў нябожчыка ня дзеляць паміж сабою, а пакідаюць яе былому ўласьніку. Праўда, XII-XIII стагодзьдзі даюць некаторы заняпад гэтага звычаю — рэчаў кладуць усё менш і менш (адзнака абстрагаваньня паняцьця аб душы).

Нябожчыка забясьпечваюць монэтамі: у курган, амаль як правіла, ставяць страўніцы, гаршкі са стравай. Вялікая пашана да мёртвых відаць з цэлага шэрагу фактаў: для стравы на магіле забіваюцца каштоўныя жывёлы—бык, баран, для пахаваньня выбіраецца прыгожа разьмешчанае месца, дзе-небудзь на ўзвышшы, над рэчкай і, нарэшце, самае насыпаньне кургана патрабавала значных колектыўных натуг сваякоў.

Але і пасьля пахаваньня магіла карысталася ўвагай—наглядаецца паўторная прысыпка кургана, у насыпе сустракаюцца сьляды памінкаў. Цікава, што ў некаторых месцах курганы называюць „Дзяды" (193). На падставе гэтых даных можна заключыць аб тым, што курганы ў радзімічаў зьяўляюцца доказам культу продкаў.

Выклíканае да жыцьця ўмовамі радавога быту ўшанаваньне „дзядоў" не абмяжоўвалася толькі сфэрай курганнага магільніку,—продкі-духі існавалі пры хаце, у сядзібе, усяк дапамагаючы жывым, ахоўваючы маемасьць. Цяпер мы ў большасьці выпадкаў маем аднаго толькі дамавіка, які зьмясьціў у сабе функцыі ўсіх продкаў. Пры сьвяткаваньні „дзядоў" яму адліваюць частку стравы, але ў некаторых месцах Беларусі яшчэ захавалася да пачатку нашага стагодзьдзя цэлая грамада зычлівых сядзібных нячысьцікаў, якія існуюць самастойна. Гэта, бязумоўна, больш старадаўняя форма ўяўленьня аб духах-продках.

Калі ад статычнага разгляду кургаоў мы пяройдзем да эволюцыйнага, дык убачым, што ўся эволюцыя кургаоў—гэта гісторыя паміраньня старажытнага абраду, выцісканьня яго зусім новымі, непадобнымі формамі.

У пачатку XII ст. летапісец па памяці перадае жывую традыцыю „.... и възложатъ на краду мертвѣца и съжигаху и по сем събравше кости вложаху въ ссудъ малъ и поставляху на столпъ на путехъ..."

Але толькі старажытныя вяцічы прытрымоўваліся гэтага абраду ў XII ст., у большасьці-ж племеньняў, у адных раней, у другіх пазьней, але да XI ст. усюды ўстанавіўся абрад не спаленьня, а пахаваньня ў кургане. Як гэта было паказана вышэй, этапы адміраньня абраду такія: спачатку зьнікае „столпъ на путехъ", яго замяняе зямляны насып (асабліва выразна відаць па северанскіх курганох Сейма-Дзясьнянскага раёну), пахавальная урна яшчэ захоўваецца, але яна схавана зямлёю.

У гэтым факце нельга ня бачыць пэўнага заняпаду культу продкаў. Раней урна была відаць, да слупа з урнай маглі прыносіць „адносы", памінальныя прынашэньні, з духам мёртвага продка можна было лягчэй раіцца і задаваляць яго, бачучы матар'яльныя астанкі продка. Усё гэта магло, зразумела, адбывацца і тады, калі прах быў засыпаны зямлёю, але тут ужо рэзрывалася эрокавая сувязь, якая раней існавала. Затым курганы ўсё больш і больш ахапляюць славянства, урна губляе ўсялякае практычнае значэньне (якое яна мела тады, калі прах пакідалі над зямлёю, а не ў зямлі) і зьнікае з абраду,—нябожчыка проста паляць з усімі яго рэчамі.

Наступным, і самым паказальным, этапам, аддзеленым ад замены слупа курганом у радзімічаў якім-небудзь адным стагодзьдзем, зьяўляецца пераход ад спаленьня трупа да звычайнага пахаваньня.

Прымаючы пад увагу надзвычайную жывучасьць большасьці абрадаў (рудымэнты трупаспаленьня ведае сучасная этнографія ў выглядзе вогнішч на могілках), тэмпы замены спаленьня пахаваньнем зьдзіўляюць: яшчэ X ст. дае абвугленыя касьцякі, ўжо ў XI ст. сустракаюцца толькі перажыткі, толькі вуглі і попел, ды і то да канца XI ст. з пахавальнага абраду радзімічаў зьнікаюць.

Дасьледчыкі старажытна-славянскай рэлігіі праходзілі міма гэтага факту, археолёгі-ж не маглі гэтага змаўчаць, але тлумачэньні, якія яны даюць, ня зусім здавальняюць.

„Хрысьціянства і курганы ішлі поруч" (Сьпіцын, 207). Вельмі лёгка тлумачыць гэты рэзкі пералом у рэлігійных поглядах старажытных славян уплывам хрысьціянства—гэта вызваляе ад пошукаў іншых прычын, але хрысьціянства адказу ўсё-ж не дае.

Найбольш пасьлядоўныя хрысьціяне забаранялі будаваць пасьля іх сьмерці над імі „бдыны" (Вольга, Канстантын Мурамскі), лічачы іх, як відаць, зьявай неадпаведнай хрысьціянскаму абраду. Ды і хронолёгія пераконвае ў тым, што зьмена абрадаў адбылася паміма хрысьціянства, да яго. Нават калі браць офіцыйную дату, якая падавалася ў старых падручніках—988 г., або нават паказаньні другога дагавору з грэкамі (945 г.) на існаваньне ў Кіеве царквы Ільлі,—усёроўна хрысьціянства застанецца зьявай другараднай, якая хронолёгічна ідзе пасьля зьмены пахавальнага абраду, зьмены, што пачалася па крайняй меры ў IX ст. (а ў некаторых мясцох і значна раней).

Але, зразумела, гаварыць аб масавай хрысьціянізацыі славян у X ст. ня прыходзіцца.

Культам продкаў, які адбіты пахавальным абрадам, далёка ня вычэрпваюцца рэлігійныя ўяўленьні радзімічаў. Найбольш яскрава і поўна этнографія захавала старажытныя аграрныя культы. Абрадавыя вырабы з хлеба, абсыпаньне зернем, адносіны з пашанай да хлеба сучаснага беларуса (параўн. у Багдановіча, 27 аб селяніне, які ўраніў кавалак хлеба і не пабег тушыць пажару сваёй асеці да таго часу, пакуль ён не падняў хлеба), увесь цыкль паганскіх сьвят, так шчыльна зьвязаных з земляробствам, шматлікія абрадавыя земляробчыя песьні—усё гэта, бязумоўна, сьведчыць аб тым дамінуючым становішчы, якое займалі аграрныя культы ў прымітыўных вераваньнях славян. Культы сонца і зьвязаныя з імі сьвяты ізноў-ткі цесна стыкаюцца з земляробствам. Адным з доказаў паважаньня сонца зьяўляецца орыентаваньне нябожчыкаў, устойлівае і паўсюднае. Усе справаздачы аб раскопках славянскіх кургаоў не адну сотню разоў паўтараюць: „Касьцяк ляжаў галавою на захад"...

як паказалі досьледы Кельсіева (97), орыентавалі не *галавою* на захад, а *тварам* да ўзыходзячага сонца.

Які і трэба было чакаць, выходзячы з характару радзіміцкай гаспадаркі, ніякіх паляўнічых культаў мы ў іх не наглядаем. Радзіміцкі селянін, які мысьліў анімістычна, імкнуўся рознымі магічнымі спосабамі набыць ласку сонца, дажджу, узмацніць вытворчую сілу зямлі, у адносінах да іншых знадворных прыродных сіл ужываў тыя-ж самыя магічныя прыёмы.

„Погляды славян на прыроду“ далёка не заўсёды былі поэтычнымі; калі ўзяць найбольш архаічныя ўяўленьні гуцулаў, дык там мы ўбачым водгукі даанімістычнага мінулага: увесь сьвет, усе жывёлы, дрэвы, рэчы насычаны духамі, якія маюць характэрную назву „страхаў“. Гэтыя духі непадзельны з рэчамі, дрэва можа рухацца, „страхам“ можа аказацца кожная рэч.

Беларусь XIX ст. ужо перашагнула праз гэту стадыю аніматызму і беларускія нячысьцікі аддзяліліся ад рэчаў, зьявіліся духі, якія кіруюць цэлай катэгорыяй рэчаў—лазьнікі, багнікі, аржавеньнікі, вадзянікі, лясуны, пушчавікі і г. д. Аднак, тэрмін духі тут умоўны, бо ўсе яны маюць пэўны і зусім матар'яльны твар—круглы або доўгі, кудлаты, гладкі, без вачэй і г. д.

Радзіміцкага селяніна, жыўшага на беразе рэчкі, вымушанага ўпартай колектыўнай працай адваёўваць у леса прыгодныя для пахаці кавалкі, абкружанага балотамі і пушчамі, у якіх магла загінуць яго жывёла,—прырода зусім ня вабіла сваёй поэтычнасьцю: яна палохала яго, перашкаджала яго гаспадарчай дзейнасьці,—і адсюль узьнікаюць шматлікія культы, якія ня раз успамінаюцца ўсходня-славянскімі царкоўнымі пісьменьнікамі. Бяру тэкст, які адносіцца да дрэгавічоў, племені найбольш блізкага да радзімічаў (ня толькі географічна, але і гаспадарча і соцыяльна) „... уже бо не нарекутся богомъ стихія ни солнце, ни огнь, ни источники, ни древеса...“ (Навучаньні Кірылы Тураўскага). У іншых помніках гаворыцца аб ахвярах.

Паўстае пытаньне: да якога сучаснага варыянту ўзаемаадносін з прыродай бліжэй стаяць уяўленьні славян X—XII ст.—да гуцульскага з перажыткамі аніматызму ці да дэмонолёгічных уяўленьняў беларусаў?

Самая форма выразу гаворыць хутчэй за першае, за абагаўленьне дрэў (параўн. „жруще рощениемъ“) і рэчак, а ня лясуноў і вадзянікаў. Дух яшчэ не адасобіўся, аблічча яго яшчэ не сформавалася.

Вывучэньне гістарычных напластаваньняў у сучасным фольклёры пераконвае, што разьвіцьцё ўяўленьняў аб духах прыроды ішло ад нязьлічонай колькасьці нявыразных духаў-рэчаў („страхаў“) да меншай колькасьці нячысьцікаў, якія існуюць самастойна. Далейшыя зьмены гаспадарчых і галоўным чынам соцыяльных умоў уплывае на дэмонолёгію ў бок аб'яднаньня, контамінацыі духаў, зьліяньня ў адным вобразе цэлага шэрагу дробных.

На гэтай стадыі сядзібныя духі аб'яднаюцца ў адным дамавіку, зьяўляюцца багі вады, багі горлесу, якія пазьней, пры ўзьнікненьні монотэізму, становяцца ў васальныя адносіны да адзінага бога.

Кіеўская Русь дае ўжо нам цэлы шэраг багоў (так званы „пантэон Уладзіміра“), але пры выкарыстоўваньні яго для характарыстыкі рэлігіі радзімічаў або іншага племені трэба быць асьцярожным—звычайна ўсе гэтыя Пяруны, Хорсы і Сімарглы разглядаюцца як продукт творчасьці славянства наогул бяз ніякіх клясавых градацый.

Рэакцыяй на такі агульны разгляд багоў зьяўляецца праца Анічкава (Язычество и древняя Русь, 3). У ёй аўтар стараецца ўсяк адмежаваць кіеўскіх багоў ад славян наогул, даводзіць дружынны характар культу Пяруна і ва Ўладзіміру хоча ўбачыць ледзь не тварца новай рэлігійнай сыстэмы, аб'яднальніка мясцовых племенных культаў. Ражкоў (176) прычыну няўдачы спробы Ўладзіміра бачыць у тым, што яму не ўдалося аб'яднаць *усіх* багоў.

Наўрад ці можна так рэзка ставіць пытаньне аб рэлігійнай рэформацыі зьверху (ды і ніякай няўдачы ня відаць—проста комэрцыйны разрахунак прадыктаваў хрышчэньне).

Проблема соцыяльнай розьніцы ў паганстве пастаўлена правільна; бяз гэтага было-б вельмі цяжка зразумець сутнасьць усходня-славянскай рэлігіі, але занадта перавялічана роля паасобных рэформатараў.

Аб рэлігійнай рэформацыі, аб буйных зрухах у сьветапоглядзе прыдняпроўскага славянства ў IX-X ст. можна гаварыць, але трэба ставіць пытаньне значна шырэй, чым у рамках індывідуальнага дэкрэтаваньня новай рэлігіі.

Процэс богатворчасьці ў розных соцыяльных групоўках працякаў розна: пануючыя клясы хутчэй пэрсоніфікавалі шэраг адных багоў, абыйшоўшы іншых; у асяродзішчы шматлікага земляробскага насельніцтва пэрсоніфікацыя ішла значна марудней, але ўсё-ж ёсьць пераконваючыя доказы таго, што і ў сялянскай масе ў час, які мы разглядаем, пачалося вылучэньне багоў і багоў з асабістымі імёнамі. Быдлячы бог Велес, ня ўключаны ў дружына-княжаскі пантэон, у даны час ужо быў вылучаны нізавымі, інакш імя хрысьціянскага Ўлазія ніколі не змагло-б так хутка замяніць яго. Доля Пяруна, першага бога кіеўскага Алімпу, у асноўнай масе насельніцтва была іншая—там процэс яго пэрсоніфікацыі быў крыху затрыманы, спыніўся на паўдарозе. Аб гэтым кажа ўжываньне слова „пярун“ у сэнсе агульнага, а ня ўласнага імя („Який там перун ляскае“, 145).

Паколькі ў радзімічаў фэўдальныя элемэнты былі вельмі слабыя, нас цікавіць рэлігія соцыяльных нізоў; для яе, падрыхтоўваючы сказанае, мы маем, з аднаго боку, шанаваньне „рощений“, калодзежаў, агню і г. д., а з другога боку—вылучэньне паасобных багоў, якое толькі яшчэ пачалося. У IX-X ст. мы засьцігаем нейкі перелом.

Вось гэты процэс пераходу да новых форм рэлігійных уяўленьняў, супастаўлены з карэннымі зьменамі пахавальнага абраду, процэс, які ахапіў асноўную масу насельніцтва на агромнай тэрыто-

ры ад Лапагі да стэпавага прыгранічча, але які працякаў ня ўсюды адначасова, я і называю рэформацыяй; мяркуючы па курганох, гэты процэс цягнуўся каля двох стагодзьдзяў. Рэформацыя адбывалася без рэформатараў; распаданьне радавых саюзаў, узьнікаваньне дружын і рамесьніцкіх цэнтраў, узмацненьне ўсяго гэтага фэўдалізацыйнага процэсу з IX стагодзьдзя, частковае абтаварываньне гаспадаркі, рад зьмен у тэхніцы — вось той шэраг зьявішч, якія можна паставіць у прычынную сувязь з адзначанымі вышэй зрухамі ў ідэолёгіі.

Матар'яльны бок культу ў радзімічаў нам амаль невядомы. Дапускаць існаваньне паганскіх храмаў ня прыходзіцца: самае большае, на што можна разьлічваць — гэта на абрадавыя гарадзішчы. Курганы захавалі нам культавыя рэчы асабістага ўжытку — амулеты, зубы зьвяроў, канёчкі бронзавыя і канёчкі (ці качачкі) з косьці, агрэгаты бронзавых мініятурных рэчаў, злучаных адным ланчужком — ключы, грабенчыкі, лыжачкі, часам да іх далучаюць малюнак рыбкі.

Такія амулеты і амулетавыя комплексы, сымболіку якіх цяжка адгадаць, не зьяўляюцца спэцыфічна радзіміцкімі: гэта зьява, якая ня мае вузкіх этнічных меж і назіраецца ва ўсёй Заходняй Эўропе.

Апрача такіх бясспрэчных амулетаў ёсьць яшчэ катэгорыя рэчаў, якім надаюць культавое значэньне — гэта пісанкі, зробленыя з тэракоты (але якія захоўваюць форму і разьмер курынага айка), і на якіх ёсьць паліваны каляровы ўзор. Тэхніка вырабу паказвае на керамічныя кіеўскія майстэрні, дзе ёсьць паліваныя кахлі з такім-жа ўзорам. Аналёгічная кераміка ёсьць у Старой Разані.

Тэракотавыя пісанкі ў радзімічаў знойдзены ва Ўлазовічах у акружэньні багатага набору жаночых радзіміцкіх рэчаў і некалькі штук у Гочаве, дзе ўсе яны знаходзіліся ў дзіцячых пахаваньнях, былі прасьвідраваны і мелі ўнутры гарошынку. Па-за радзіміцкай тэрыторыяй яны знойдзены каля Роўны, у Чарнігаўшчыне, на Готландзе (13).

Балсуноўскі (28) і Arne (13) лічаць іх адзнакай паганскага культу, думаючы, што ў магілу яны клаліся як сымболь адраджэньня (résurrection). Мажліва, што часткова яны маюць рацыю, па крайняй меры для большасьці знахадак (роля кур і яек даволі абмалявана літоўска-беларускай этнографіяй), але ўсё-ж з ліку культавых рэчаў прыдзецца выключыць гочаўскія бразгушкі.

Пытаньне аб формах культу і аб існаваньні жрацоў пакуль што ўпэўненага адказу ня мае. Маючы бясспрэчныя сьведчаньні аб чараўнікох для Паўночна-Ўсходняй Русі, пераносіць іх мэханічна на тэрыторыю радзімічаў устрымаюся, бо чым далей на ўсход, у асяродзішча фінскіх народаў, тым часьцей у магільніках, як сынхронных, так і папярэдніх радзіміцкім курганом, трапляюцца прыналежнасьці шаманскіх убраньняў. Разьвітасьць шаманізму ў фінаў бясспрэчная, наяўнасьць яго ў славян пацьвярджаецца толькі некаторымі данымі і можа быць аднесена за кошт фінскага ўплыву, які крыху адчуваўся і ў радзімічаў.

Апісаньне паганскіх маленьняў хрысьціянскімі пісьменьнікамі „а друзии къ кладязѣмъ приходяще молятьса" гаворыць за неорганізаваную, не патрабуючую жрацоў-профэсіяналаў, форму культу. У Беларусі XIX ст. „адносы" лясуну рабіліся часам самімі сялянкамі бяз удзелу „ведзьмака". У шматлікіх абрадах, якія звычайна выконваюцца ўсімі ўдзельнікамі, толькі калі-ні-калі ініцыятыву бярэ на сябе галава сям'і або старэйшы з усіх прысутных. Гадавы цыкль магічных абрадаў адбываўся колектыўна (провады масьляніцы, карагоды, сьпевы абрадавых песьняў і г. д.) і не патрабаваў ніякіх кіраўнікоў, хаця-б часовых.

З гэтага можна зрабіць праўдападобны вывад, што радзіміцкія сяляне IX—XII ст. яшчэ ня вылучылі жрацоў (ва ўласным сэнсе слова); можа быць існавалі нешматлікія „ведзьмакі", знахары, да якіх зьвярталіся ў выключных выпадках, але людзей, маючых спэцыяльнасьцю сталае выконваньне культавых функцый, яшчэ ня было.

Праніканьне да радзімічаў хрысьціянства можа быць намечана толькі вельмі слабымі рысамі. Уласна кажучы, пранікалі толькі некаторыя рэчы хрысьціянскага культу, а не хрысьціянства, як рэлігійная сыстэма, бо славянам, якія знаходзіліся на стадыі політэізму, антропоморфны монотэізм хрысьціянства, адцягненасьць і нелёгічнасьць шмат якіх догматаў (напр. аб адзінічнасьці тройцы) былі зусім незразумелы.

Народная рэлігія, якая моцна каранілася ў бытавых умовах, досыць поўна абслугоўвала няхітрыя патрэбы старажытнага земляроба, дапамагаючы, паводле яго думкі, яго асноўным гаспадарчым актам. Што хрысьціянства зусім ня мела сіл конкураваць з ёю, гавораць шматлікія пісьмовыя помнікі XVI-XVII ст. і сучасная этнографія.

Прынятае кіеўскімі фэўдальнымі вярхамі з комэрцыйна-палітычных меркаваньняў хрысьціянства пашыралася імі з мэтай замацаваньня ўлады агнём і мячом (Дабрыня і Пуцята), аднак яно не закранула народныя масы, да якой можна аднесьці словы Фэдоса Пячэрскага: „Словомъ нарицающеся хрестьяне, но паганьскі живуще". Але радзімічы ў пачатку XII ст., як відаць, нават і не называліся хрысьціянамі, па крайняй меры такі выпад выцякае з антытэзы Нестара: паляне—хрысьціяне і радзімічы—паганцы. Слабасьць фэўдальнай праслойкі, адсутнасьць вялікіх гарадоў, гэтых базавых пунктаў хрысьціянізацыі, часткова тлумачыць такое затрыманьне. У поўнай згодзе з данымі гісторыі знаходзяцца і вынікі археолёгічных раскопак.

З хрысьціянскім сымболем спрабавалі (Балсуноўскі) зьвязваць малюнкі рыбак, якія знаходзілі ў радзімічаў (аналёгічная рыбка вядома з раскопак Арцыхоўскага (17) у краі славян). К гэтаму часу на даны сымболь у Візантыі ўжо забыліся, так што на падставе такіх амулетаў сьцьвярджаць наяўнасьць хрысьціянства (і пры тым у яго архаічнай форме) у славян нельга.

У маністах радзімічкіх сялянак адным з пашыраных тыпаў падвесак зьяўляюцца крыжы. У курганох XI стагодзьдзя яны сустракаюцца як звычайныя падвескі, нанізаныя паміж пацерак у колькасьці 6—8 паасобнікаў. Большасьць гэтых крыжыкаў маюць аналёгіі ў паўночна-славянскіх і скандынаўскіх старажытнасьцях і да хрысьціянства ня маюць ніякіх адносін; наадварот, яны даводзяць, што ў той час крыж, як сымболь, яшчэ ня быў вядомы радзімічам, бо інакш яго не насілі-б, як звычайную аздобу.

У больш багатых пахаваньнях (Казарычы) сустракаюцца крыжыкі не скандынаўскага, а візантыйскага тыпу, зробленыя, напэўна, як хрысьціянскія сымболі, але трапляючы да радзімічаў яны трацілі сымбалічны сэнс і ўжываліся як аздоба, як звычайная крыжападобная падвеска на аднэй нітцы з арабскім дыргэмам.

Толькі ў позьніх магілах Гочава (XIII-м б. XIV ст.) рэчы хрысьціянскага культу (расьпяцьці, абразкі) ужываліся па прызначэньню.

Супастаўленьне ўсіх даных пераконвае ў тым, што XI і палова XII ст. прайшлі на тэрыторыі радзімічаў пад знакам старой рэлігіі, якая вырасла з іх соцыяльна-экономічных умоў. Хрысьціянствам былі часткова закрануты раёны з больш інтэнсыўнай фэўдалізацыяй, якія знаходзіліся пад уплывам такіх цэнтраў, як бацькаўшчына Фэдоса Пячэрскага, Курск (Гочаўскі магільнік).

Маса сьмердаў, прыпісана ў 991 г. да ўтворанай Чарнігаўскай эпархіі (да Смаленскай эпархіі, якая ўзьнікла ў 1137 г., цягнула поўнач радзімічкай тэрыторыі—Мсьціслаў, Рослаў), стыкалася з хрысьціянствам толькі ў асобе эпіскапскіх дзесятнікаў, якія прыяжджалі за ругай?) [1]).

Пераходзячы да другога боку духоўнай культуры радзімічаў—да выяўленчага і орнамэнтальнага мастацтва, нявольна ўспамінаецца пэсымістычная фраза: „Мастацтва паганскіх славян, уласна кажучы, нам амаль невядома" (В. Нікольскі, стар. 39). Да гэтага трэба дадаць, што нават матар'ял, які ёсьць па старажытна-сялянскаму мастацтву, дасьледчыкамі ігнараваўся; займаліся фрэскамі, архітэктурай, мініятурамі, у лепшым выпадку прывознай ювэлірнай продукцыяй, але мясцовы матар'ял з-пад іх увагі ўнікаў.

Выключэньнем зьяўляюцца работы А. С. Гушчына (63),які паставіў цікавую проблему соцыяльнага расчляненьня стыляў, прыкладнага мастацтва. Паводле яго схэмы дружынныя пласты культывавалі візантыйскія ўзоры, сяляне—геомэтрычную орнамэнтыку, тэратолёгічны-ж стыль быў створаны прамежкавай рамесьніцка-гандлёвай праслойкай.

Найбольш слабым месцам гэтай схэмы зьяўляецца тэратолёгічны стыль. Ня маючы мажлівасьці тут вырашыць пытаньне аб паходжаньні яго ў прыдняпроўскіх славян, я дазволю сабе не згадзіцца з тым, што ён раптоўна зьяўляецца ў XI ст., як вынік сынтэзу візантызму і тубыльнага геомэтрычнага малюнку, сынтэзу, зробленага раптоўна-ж узьнікшай клясай рамесьнікаў і дробных гандляроў.

Не гаворачы аб тым, што некаторыя рэчы проста пераймаліся з візантыйскіх узораў, трэба адзначыць даволі моцныя патокі продукцыі з тэратолёгічным і плеценым орнамэнтам, якія ішлі з Скандынавіі і Прыбалтыкі з VIII-IX ст.

Думаю, што фэўдальныя вярхі не здавальняліся толькі хрысьціянскім мастацтвам, а культывавалі і тэратолёгію; думаю таксама, што мастацтва землеробаў ня было толькі геомэтрычным.

Адносна сялянскага мастацтва IX—XI ст. мы ў вельмі дрэнным становішчы. Як на пажарышчы сучаснай вёскі нам не знайсьці ні выразных конікаў, палічнікаў, лыжак, ні размаляваных карабоў, прасьніц, ні вышываных ручнікоў і г. д., так і ў археолёгічным матар'яле мы зможам адшукаць толькі невялічкія адрыўкі мастацтва, захаваныя галоўным чынам на мэталі, радзей на косьці, кераміцы. Цяжкасьць-жа орнамэнтаваньня мэталёвых рэчаў для дробных саматужнікаў прымушае іх спрашчаць, геомэтрызаваць малюнак.

Глыбокі архаізм сучаснай вышыўкі (гл. Гарадцоў, 56), маючай мотывы гэральдычнага і абрадавага характару, мотывы выяўленчыя, а не геомэтрычна-орнамэнтальныя, — дазваляе ставіць пытаньне аб існаваньні такога-ж мастацтва і ў эпоху Кіеўскай Русі.

Мастацтва радзімічаў, паколькі яно адбілася ў рэчах ювэлірнай вытворчасьці, якія зайшлі да нас, рысуецца даволі скромным. У іх няма таго багацьця і рознастайнасьці форм і мотываў, якія мы назіраем, напр., у наўгародзкіх славян, але ў іх няма таксама і тэй соцыяльнай рассластаванасьці, якая яскрава кідаецца ў вочы ў мастацтве суседніх севяран, ня кажучы ўжо аб палянах, меўшых на сваёй тэрыторыі такі міжнародны цэнтр, як Кіеў.

Орнамэнтацыя жаночых мэталёвых аздоб вельмі простая і большаю часткаю настолькі зьвязана з самой рэчу, што адарваць адно ад другога цяжка. Часта орнамэнтыка выцякае з самой тэхнікі—кручаныя і нібы-кручаныя пярсьцёнкі, бранзалеты. Няхітры геомэтрычны малюнак на выліваных рэчах большаю часткаю складаецца з рубчыкаў, пукатых кропак, радзей трыкутнікаў і зубчыкаў.

---

[1]) На гэту схэму можа зрабіць уплыў тое або іншае вырашэньне пытаньня аб нацыянальнасьці вядомага ігумена Данілы-Паломніка, які падарожнічаў у пачатку XII ст. у Ерусалім, і які выпрасіў там у Балдуіна фляндрскага дазвол паставіць „кандзіла" за рускіх князёў. Апісваючы ў сваім „Хаджэньні" Ердан, ён раўняе яго з Сноўю па глыбіні, па лукавістасьці, па берагох (гл. у Галубінскага, 48, т. I, стар. 682). Ведаць рэчку так добра і браць яе для параўнаньня хутчэй за ўсё можа тубылец з тых краёў; верхняя палова Снові населена радзімічамі і, калі з іх асяродзішча мог выйсьці такі буйны хрысьціянскі дзеяч, як Даніла, гэта, зразумела, гаварыла-б аб большым значэньні хрысьціянства ў іх, чым паказваюць іншыя факты. Але асабліва лукавістай Сноў робіцца толькі пасьля ўтоку Туры, г. зн. там, дзе Сноў выходзіць з тэрыторыі радзімічкай і пераходзіць на севяранскую. Думаю, што лягчэй усяго лёкалізаваць бацькаўшчыну Данілы (калі толькі ён тубылец з Снові) у старажытным, вядомым з XI ст. горадзе Сноўску, цяпер Седневе, які зьяўляўся адным з прыгарадаў Чарнігава і які меў, мяркуючы па курганох (Самаквасаў), даволі заможнае, бясспрэчна, севяранскае насельніцтва.

Выбіваньнем наносіліся таксама вельмі простыя комбінацыі кропак, ліній. Рэчы аздабляліся орнамэнтам вельмі экономна па прынцыпу запаўненьня магчыма большай прасторы магчыма меншай колькасьцю найбольш простых элемэнтаў. Найбольш орнамэнтаваліся маніставыя падвескі, вісочныя колцы і пярсьцёнкі. Усе тыпы орнамэнту можна бачыць на адпаведных табліцах.

Да твораў мастацтва са скончаным сюжэтам можна далучыць некалькі рэчаў XI ст., якія ўмоўна называюцца разьбярнымі. Некаторае візантыйска-кіеўскае адценьне мае пярсьцёнак з кургана № 106 каля Цімошкіна Перавоза, на шчытку якога выразана нейкая птушка. Некаторая нявыразнасьць і няўпэўненасьць гравіроўкі можа ўказваць і на мясцовую вытворчасьць, якая, аднак, пераймала з кіеўскіх ювэліраў.

Да рэчаў радзіміцкага вырабу належаць конікі, качачкі, грабенчыкі з дзьвюма галовамі, рыбка, падвеска з бычай галавою, зьмяіна і чалавекагаловыя бранзалеты, малюнак каня на днішчы судзіны. Самы пералік гэтых рэчаў гаворыць ужо за існаваньне ў радзімічаў ня толькі геомэтрычнага мастацтва.

Сустракаюцца такія рэчы ў звычайных курганох XI ст. і ня маюць ніякіх сьлядоў раптоўнага зьяўленьня. Наадварот, такія рэчы, як грабенчыкі, паказваюць, што мы маем справу з распрацоўкай гэральдычнага мотыву дзьвёх жывёл на працягу многіх стагодзьдзяў, якая прывяла ў выніку да такой стылізацыі, што толькі па аналёгіі з фінскім мастацтвам можна дагадвацца аб абліччы першаўзору. Такая-ж стылізацыя відаць і ў зьмяінагаловых бранзалетах.

Найбольш цікавымі зьяўляюцца рэчы, якія не сустракаюцца па-за радзіміцкай тэрыторыяй, напрыклад, бранзалет, аздоблены дзьвюма вельмі схэматычнымі чалавечымі галоўкамі, на якіх усё-ж можна заўважыць наяўнасьць вусоў і барады, і затым прывескі з галавою быка. Самыя падвескі па тэхніцы і орнамэнту не выдзяляюцца з раду іншых, але прыгожае выкананьне рэльефнай галавы з захаваньнем пропорцый, старанная абрысоўкай дэталяў, якія далі ў выніку вельмі рэалістычную і скончаную рэч,—гаворыць ня толькі аб вялікім мастацкім гусьце, але і аб наяўнасьці пэўных формальных дасягненьняў у радзіміцкага скульптара.

На паграніччы з крывічамі курганы ў Лучыцы далі раскошны ўзор скульптуры (які зусім няправільна называецца „скіфам"), але лічыць яго радзіміцкім вырабам цяжка. Адзначаю толькі тэрыторыяльную блізкасьць.

Паданыя факты крыху парушаюць погляд на сялянскае мастацтва прыдняпроўскіх славян, як на чыста геомэтрычнае. Мастацтва радзімічаў стаіць у баку ад тых зьяў, якія мелі вялікае значэньне для рускага мастацтва наогул. Радзіміцкая вёска (а мастацтва праслоек, якія стаяць вышэй, не паддаецца прасочваньню) ня была зачэплена ні візантыйскім, ні больш магутным, але не такім высокастыльным, скандынаўскім уплывам.

Ідэолёгічны бок жыцьця радзімічаў, апрача рэлігіі і выяўленчага мастацтва, можа быць асьветлены толькі ўкосна. Бязумоўна, што рад абрадавых і іншых песень, якія дайшлі да нас, выконваўся і ў IX—XII ст., што „игрища межю селы" дапускалі такое-сякое музычнае і вокальнае справаджэньне, гэта часткова і пацьвярджаецца мініятурай Радзівілаўскага летапісу.

Можа быць з часам і ўдасца з усяго багацьця вуснай літаратуры вылучыць долю, унесеную радзімічамі, але гэта патрабуе спэцыяльных і пільных дасьледваньняў.

Разьдзел VI.

Паходжаньне.

Гісторыяграфія радзімічаў, якая мае дзевяцівяковую даўнасьць, налічвае дзесяткі аўтараў, якія так ці іначай закранялі пытаньне аб гэтым племені, але, на жаль, у большасьці выпадкаў радзімічаў як гэткіх не дасьледвалі, а толькі ўспаміналі або выкарыстоўвалі ў якасьці ілюстрацыі для доказу той ці іншай тэорыі. Так, напрыклад, Нікіцкаму (146), які займаўся вырашэньнем агульнага пытаньня аб радавым быце, радзімічы былі патрэбны для таго, каб угрунтаваць вандраваньне радавых саюзаў і „другараднае значэньне тэрыторыяльнага прынцыпу". Гэтак-жа выкарыстоўваў радзімічаў і Кастамараў (106 і 107) у сваёй працы аб фэдэрацыях пляменьняў—іх вера ў „сьвятога праайца" Радзіма паслужыла яму довадам пляменнага адзінства.

Крыху большай увагай карысталіся радзімічы ў гісторыка-географаў (Барсаў, 25, Серадонін, 194, Любаўскі, 125), вывады якіх былі разгледжаны вышэй пры разборцы пытаньня аб граніцах, але і тут нярэдка тэрыторыя племені азначалася толькі па спосабу выключэньня—спачатку праводзілася граніца суседніх пляменьняў (крывічоў, дрэгавічоў, севяран), а радзімічам вызначалася астатняя прастора.

З усіх вестак летапісу аб радзімічах найбольшым посьпехам карысталася сьведчаньне аб іх паходжаньні.

Гісторыкаў, якія большаю часткаю толькі між іншым закранялі данае племя, заўсёды інтрыгавала легенда аб польскім паходжаньні радзімічаў; яе комэнтавалі, разьвівалі, дапаўнялі, будавалі на падставе яе розныя тэорыі. Спроб крытычнага падыходу вельмі мала. Само па сабе пытаньне аб тым, да ўсходняй ці заходняй галіны славян належалі ў даўнія часы радзімічы, можа быць і не зьяўляецца настолькі актуальным, каб доўга спыняцца на ім, але вывады вучоных, якія захапіліся романтыкай пераходу двох народаў (радзімічаў і вяцічаў) пад кіраўніцтвам сваіх правадыроў з Польшчы ў Сярэднюю Расію, прымушае аднесьціся да яго больш уважліва.

Тое ці іншае вырашэньне гэтага пытаньня неўсёроўна таксама і для ўразуменьня старажытнаславянскай гаспадаркі і грамадзкага быту. Адна справа—мірнае аселае насельніцтва, якое займалася земляробствам і бортніцтвам, і зусім іншая справа—рухавае і, як відаць, ваяўнічае племя з нейкім князьком на чале, якое прабіваецца праз іншыя пляменьні і робіць вялізарныя пераходы праз балоты і вадападзелы толькі для таго, каб на новым месцы абярнуцца ў палаклівых падданых ваяводы кіеўскага князя.

Паданы вышэй сьпіс цытат з летапісу дае зьвесткі аб радзімічах, разьмешчаныя ў парадку адбыцьця падзей; парадак запісу—іншы (як адносна датаваньня розных месц, так і адносна імён аўтараў і рэдактараў тых ці іншых збораў і сьпісаў я буду грунтавацца галоўным чынам на дасьледваньнях акадэміка Шахматава, 256 і 258).

Грунтуючыся на дасьледваньнях, зьяўляецца мажлівым вылучыць месцы больш старыя і пазьнейшыя напластаваньні. Першым сьведчаньнем аб радзімічах трэба лічыць апавяданьне аб пешчаньскім паходзе Воўчага Хваста.

„Въ лѣто 6492(984) иде Володимеръ на радимичи бѣ у него воевода Волъчій Хвостъ и посла и Володимеръ передъ собою Волчья Хвоста сърѣте е на рѣцѣ Пищанѣ и побѣди радимичѣ Волъчій Хвостъ темъ и Русь корятся радимичемъ глаголюще пищаньци волъчья хвоста бѣгають. Быша же радимичи отъ рода ляховъ прешедъше ту ся вселиша и платять дань Руси повозъ везуть и до сего дне“.

Летапісца эпохі Яраслава Мудрага, які запісаў гэту падзею, трэба лічыць першым гісторыкам радзімічаў.

Хаця поўстагодзьдзя, якое мінула з часу пешчаньскай бойкі да складаньня летапісу (1039 год) гэта яшчэ не гісторыя, але паведамленьне аб ляскім паходжаньні гаворыць за выкарыстаньне нейкага матар'ялу (вернага ці не—іншае пытаньне), іменна за гістарычны падыход да зьявы.

Другім гісторыкам, які закранаў між іншым і радзімічаў, быў Нестар Пячэрскі. Шырокі ахоп гістарычных падзей, імкненьне да сыстэматызацыі і тлумачэньня фактаў, выкарыстоўваньне розных крыніц, монагенэтычная (нібы „яфэтычная“) тэорыя паходжаньня славян, вельмі добрае веданьне географіі і этнографіі, устойлівая палітычная канцэпцыя—характэрны для аўтара „Повести временных лет“.

У параўнаньні са зборам 1039 г. „Повесть“ дае шмат новага адносна радзімічаў:

1. Аб'ядная (па паходжаньню) радзімічаў і вяцічаў.
2. Аб'ядная па этнографічных адзнаках („один обычай имяху“) у адну групу з радзімічамі і вяцічаў і северан.
3. Дае ўказаньні на начынальнікаў радоў Радзіма і Вятко, якія былі на чале народнага руху.
4. Паказвае на Алега, як на першага заваёўніка радзімічаў.
5. Удакладняе географічнае палажэньне племені—замест „ту ся веселиша“, больш пэўна—„сѣдоста радимичи на Сжю“.
6. Уключае радзімічаў у агульнаславянскія сьпісы.
7. Дае выключна каштоўны этнографічны нарыс радзімічаў, апісваючы быт, шлюбныя абрады, паганскія пахаваньні і г. д.

Пасьля Нестара летапісцы ўспамінаюць радзімічаў толькі адзін раз (у 1169 г.), але ўжо не ў этнічным, а ў географічным сэнсе, як тэрыторыю радзімічаў. Пасьля гэтай выпадкова зробленай заўвагі аб уцёках Уладзіміра Мсьціславіча праз радзіміцкі край, рускія гісторыкі маўчаць да XVII стагодзьдзя. Племя было забыта, назву яго перапісчыкі блыталі, як гэта відаць па хронографу 151 году (Пагодзінскі сьпіс, 252), дзе стаіць „ратмічы“.

Зусім зразумела, што зьвесткі летапісу аб сваяцтве з палякамі радзімічаў і вяцічаў павінны былі зацікавіць польскіх гісторыкаў. І сапраўды, мы бачым, што ад сярэднявечных канонікаў да сучасных дактароў гісторыі польская гісторыяграфія праяўляе жывую зацікаўленасьць да гэтай проблемы, заўсёды вырашаючы яе ў спрыяючым для Польшчы напрамку.

У эпоху адраджэньня і гуманізму, калі ў Кракаве Казімір Ягелончык адчыніў Акадэмію з катэдрай artes liberales, гісторык Ян Длугаш (1415—1480) (66), так добра імпонаваўшы тагочаснай Польшы „ad morza da morza“, успамінаючы радзімічаў у сваёй грунтоўнай працы Historia Polonica, цьвёрда стаіць на пункце погляду іх польскага паходжаньня і нават ідзе далей з дапамогаю некаторых сугалосьсяў у назвах гарадоў, ён вызначае і месца ў Польшчы, адкуль радзімічы выйшлі.

Гэтай прабацькаўшчынай зьяўляецца р. Сан (дакладней—Радзімін).

Затым трэба ўпамянуць Мацея Стрыйкоўскага (222) (сучасьніка Грознага і Курбскага), які пісаў сваю хроніку ў эпоху абвастрэньня палітычных супярэчнасьцяў у Польшчы, у эпоху зьмены і выбараў каралёў, хваляваньняў шляхты. Яго цікавіла больш палітычная будова старажытнай Русі. Будучы знаёмым і з рускімі летапісамі, і з Длугашам, і з нейкімі іншымі крыніцамі, ён неяк своеасабліва іх вытлумачыў; народу ў яго ня відаць з-за правадыроў (гэта адчувалася, праўда, у меншай ступені яшчэ ў Длугаша).

Ён сабраў усе ўпамінаньні аб эпонімах, сыстэматызаваў іх і замест асобных славянскіх пляменьняў у яго атрымалася фэўдальная іерархічная будова: „Ci xiążęta przedniejsze (Кій, Шчэк і Харыў) rodzoni bracia, mieli drugich xiężat pod swoją mocą nie mało, którzy pospolicie u nich hetmany byvali: z tych był przedniejszy Radzim, od którego są nazwali Radzimczanie, nad rzeką Sassu). Сярод васалаў Кія, Шчэка і Харыва Радзім апынуўся першым сярод роўных (Вятко, Дулеб) (222).

Гэты погляд на Радзіма як на „знатнейшага гэтмана“ быў прыняты і ўкраінскай гісторыяграфіяй XVII ст. Сынопсіс Інокенція Гізэля (1674 г.) (201), продукт славяна-грэка-лацінскай Ака-

дзміі, цалкам перакладвае Стрыйкоўскага. Гэтакі-ж пераказ (толькі каго — Стрыйкоўскага ці Гізэля?) відаць і ў Ядры Расійскай Гісторыі (Хілкова-Манкевіча, 269), дзе Кій, які заснаваў горад у 430 г., меў ваяводу Радзіма.

Далей, ідучы за хранолёгіяй, трэба паставіць Тацішчава (225). Уважлівы гісторык і географ, які адзін з першых паказаў на неабходнасьць вывучэньня тапанімічнага матар'ялу, усё-ж ня здолеў парваць з традыцыямі польскай гісторыяграфіі і дапасаваў свае мэтоды да падшуканьня якой-небудзь прабацькаўшчыны радзімічаў на Захадзе:

„Радзімічы славяне да прыходу ў Малую Русь жылі блізка Віслы, дзе дагэтуль горад іх Радамль тое імя захоўвае". Прызнаючы пераход племені, ён дапускае, што частка яго засталася на бацькаўшчыне, у Чорнай Русі.

Яшчэ больш цікавым (зразумела, ня ў сэнсе ўясьненьня пытаньня, а толькі як маленькая ілюстрацыя гістарычнай мэтодыкі XVIII ст.) зьяўляецца разважаньне князя Міхайлы Шчарбатава (265): тут тыя-ж Кій, Шчэк і Харыў і тыя-ж васалы—Радзім, Вятка і Дулеб; новае тое, што, аказваецца, некаторыя імёны можна тлумачыць з пэрсідзкай мовы (Кій—Кеа—уладар, Хары—ухурэх — удзельнік). „Або, калі палічыць за лепшае гэта апошняе імя ад арабскай мовы вытварыць, дык на ёй хэрыф значыць супрацоўнік, што таксама ад ісьціны не адыходзіць". Радзім—рэгім на арабскай мове значыць „міласьлівы". Пэрсідзкай альтэрнатывы тут ня дадзена, так што прыходзіцца мірыцца з „арабскім" паходжаньнем. (Словы „павоз везуть" Шчарбатаў зразумеў, як відаць, па аналёгіі з дулебамі і обрамі, як выкананьне сваеасаблівай гужавой павіннасьці).

Гісторыяграфія XVIII—пач. XIX ст. яшчэ цалкам стаіць на пункце погляду паходжаньня радзімічаў ад ляхаў; такавы Naruszewicz Narbut, (які рабіў раскопкі на тэрыторыі радзімічаў у 1810 г.), Карамзін (94), які пераблытаў нават палякаў з палянамі кіеўскімі.

Гэтыя вывады прыняў і разьвіў у сваіх „Славянскіх старажытнасьцях" Шафарык (254). Ён лічыць, што перасяленьне адбылося да славянскай экспансыі на захад і на поўдзень (паводле яго хранолёгіі да II стагодзьдзя хрысьціянскай веры) і ў той-жа час даводзіць пэўнасьць летапіснага запісу тым, што ў часы Нестара прыход радзімічаў яшчэ ўсе памяталі (хаця гэтыя дзьве эпохі разьдзяляе тысячагодзьдзе). Лёкалізуе „прабацькаўшчыну" на ніжняй Віcьле.

У 1823 г. зьяўляецца першая прысьвечаная радзімічам праца Siarczyńskiego (196). Трэба сказаць, што аўтар аказаўся далёка не на вышыні становішча і ведаў свой прадмет значна горш сваіх сярэднявяковых папярэднікаў. Не гаворачы ўжо аб яго географічных ведах (так, напр., Ака ў яго цячэ з Калугі ў Арол), ён выявіў незнаёмства як з рускімі летапісамі, так нават і з польскімі гісторыкамі. Вынікам яго досьледаў зьяўляецца пацьвярджэньне Длугаша ў тым, што радзімічы сядзелі на Сане, дзе ёсьць наступныя бясспрэчныя доказы — с. Радзенішча, Радагонцы і Радымна. Прысутнасьць там-жа вяцічаў даводзіцца наяўнасьцю рэчкі Вяр (Wiar). Сярчынскі не сумляваецца ў тым, што радзімічы сядзелі на Сане і лічыць, што „grubym iest błędem, sądowie ich w Sandomirskiem około Radomia, хаця доказы ў яго опонэнтаў зусім такія-ж.

Зьяўляючыся мініятурным сколкам руска-польскай гісторыяграфіі, мозаіка домыслаў, раскіданых у работах XV—пач. XIX ст., нічога не высьвятляе ў пытаньні аб радзімічах.

Толькі з другой паловы XIX ст. вывучэньне становіцца на навуковы грунт; але каб скончыць з дзіцячым пэрыодам гісторыі вывучэньня пытаньня, я дазволю сабе забегчы ўперад і падаць два погляды, выказаныя, праўда, ня ў XV, а ў XX ст., што, між іншым, справы не зьмяняе.

Забелін у „Гісторыі рускага жыцьця" (79) піша: „Наўрад ці сустрэнуцца якія-небудзь падставы для абвяржэньня тэй ісьціны, што запісаная Герадотам падзея аб пераходзе Нураў (нэўраў—Νευροί) (на ўсходні бок Дняпра) па Сажы і Дзясьне на Аку ня ёсьць непасрэдная крыніца таго паданьня аб пераходзе радзімічаў і вяцічаў, якое 1500 год яшчэ памяталі ў Кіеве ў часы Нестара" (стар. 222).

М. Цебянькоў (227), рэвізуючы старажытна-рускую гісторыю пад сваім кутом погляду, бачыў у пляменьнях нішто іншае, як міжэтнічныя рэлігійныя корпорацыі. Адсюль крыўляне—літоўска-славянскае аб'яднаньне пасьлядоўнікаў культу Крывэ-Крывэйта, а вяцічы і радзімічы—прыхільнікі Сьвятавіта (вяцічы) і Радэгаста (радзімічы).

Паводле гэтай тэорыі, радзімічы на Сажы—гэта колёнія балтыцкіх славян і іменна—люцічаў, рэдаран, долінцаў. З прычыны міжусобных войнаў яны пакінулі балтыцкае помор'е і пайшлі на Сож, прыносячы з сабою топографічную номэнклятуру. Імя іх паводле Цебянькова — паходжаньня рэлігійнага.

Гісторыкі XIX ст. (Салаўёў) ставяць у сувязь з перасоўваньнем радзімічаў і вяцічаў знаходжаньне на Протве голядзі, тлумачачы гэта тым, што ляскія пляменьні, прабіваючыся праз літоўска-славянскія абласьці, пацягнулі за сабою частку галіндаў, якія і пасяліліся ў суседзтве вяцічаў на вадазборы Акі.

Археолёгічна пытаньне аб голядзі застаецца адчыненым (гл. Арцыхоўскі, 18), а адносна сувязі з паходам Радзіма і Вятко гл. у Пагодзіна (161), які лічыць паселішчы на Протве спрадвечна літоўскімі, якія зьяўляюцца ўцалелым астраўком вялікага літоўскага масыву ў Сярэдняй Расіі.

Больш позьнія дасьледчыкі пытаньня аб паходжаньні радзімічаў унесьлі цэлы рад новых доказаў, прыцягнулі новыя факты, новыя дысцыпліны. Вельмі часта гэтымі новымі матар'яламі толькі аздаджаліся старыя традыцыі кракаўскіх манахаў.

Так, Al. Bruckner (32) опэруе ўжо не з географічнымі назвамі, а з самым імем Радзіма, і паказвае, што гэта імя зьяўляецца ўлюбёным у славян (стар. 178) заходніх. Польская нацыяналістычная гісторыяграфія працягвае трымацца за паданьне аб ляскім паходжаньні радзімічаў. На парозе XX стагодзьдзя Karol Potkański (167) піша: „На далёкім усходзе мы маем два ляскія

племяньні — гэта радзімічы і вяцічы. Сьведчаньне Нестара настолькі яскравае, што мы ня маем ніякіх падстаў сумнявацца ў яго дакладнасьці. Яно зьяўляецца старым паданьнем, якое абапіраецца на жывую традыцыю. Такіх падрабязкаў, як. напр., тое, што Радзім і Вятко — два браты і, што абодвы вядуць свае племяньні, нельга выдумляць". Як відаць, нацыянальны гонар не дазваляе Патканьскаму зьмясьціць прабацькаўшчыну радзімічаў і вяцічаў недзе на Сане, у краі, заселеным русінамі, а не палякамі, і з дапамогаю тапонімікі ён адшуквае яе ў суседзтве з Варшавай, робячы такім чынам абодвы племяньні часткаю мазаўшан. Шлях, якім ішлі радзімічы і вяцічы з Віслы і Буга — гэта обласьць на поўнач ад Прыпяці. Перасяленьне пачалося ў VIII стагодзьдзі пад націскам з поўначы літоўскіх племяньняў.

Карта № 6.

Некаторымі вучонымі (Сабалеўскім) рабіліся спробы іначай падыйсьці да летапіснага тэксту і разумець словы „ляхі“, ад „ляхаў“ не літаральна, ня ў сэнсе прыналежнасьці да польскага народу, а ў сэнсе „полехи“, паляшукі, жыхары лесу. Думаю, што тут мае месца некаторая нацяжка—летапіс вельмі акрэсьлена гаворыць аб ляхах, як аб народзе („быша же радимичи отъ рода ляховъ“).

У XI-XII ст. тэрмін „лях“ прыстасаваўся іменна да паляка (летапіс, Пячэрскі Пацерык — „лях в луде“, які зьяўляўся манахам і г. д.).

Напісаньне слова „лес“ у тагочасным пісьменстве іншае, чым „в лясах“. Гаворачы аб драўлянах, якія пасяліліся ў лясах, летапіс кажа, што яны так названы „зане сѣдоша въ лѣсѣхъ“.

Прымірэнчыя тэндэнцыі ёсьць і ў нашых дасьледчыкаў. Радзімічаў ня лічаць палякамі этнічна, але гавораць аб доўгім іх геаграфічным суседзтве з Польшчай (Ключэўскі, 101, Карскі, 96, Нідэрле, 145). Выказваючы такі погляд, Карскі ўгрунтоўвае, уласна кажучы, тольні адну яго частку — тое, што радзімічы не палякі, што іх мова, якая мае некаторыя падобныя да польскіх рысы, усё-ж чыста руская. Але другое палажэньне, што радзімічы жылі некалі ў суседзтве з палякамі, на захад ад дрэгавічоў, гучыць ня зусім пераканаўча.

Археолёгічныя довады Карскага (курганы з спаленьнем у радзімічаў падобны да спаленьняў па Бугу, у Люблінскай і Седлецкай гг.) ня могуць быць прыняты, бо на пэўнай стадыі трупаспаленьні існавалі ў славян амаль усюды.

Яшчэ менш зразумелаю зьяўляецца прыведзеная Карскім прычына перасяленьня радзімічаў — іменна размнажэньне іх суседзяў: палякаў, літоўцаў, валынян і дрэгавічоў. Па-першае, у нас няма зусім ніякіх даных дапускаць, што ў VIII-IX ст. у раёне Нарава, Ясельды, Белавескай пушчы (дзе павінны былі-б разьмясьціцца паміж мазурамі і дрэгавічамі радзімічы) нават пры тагочасных экстэнсыўных формах гаспадаркі магло адбыцца такое перанасяленьне, якое прымусіла-б племя з тэрыторыяй каля 30.000 кв. км перасунуцца на ўсход. Па-другое, калі-б так размножыліся дрэгавічы, дык яны проста заткнулі-б белавескім радзімічам выйсьце да Дняпра, і, па-трэцяе, калі маглі размножыцца ўсе суседзі радзімічаў, дык чаму асталіся вольнымі і незанятымі севяранамі, крывічамі і тымі-ж дрэгавічамі, якія таксама размнажаліся, месцы больш позьніх паселішчаў радзімічаў, паміж Дняпром і Дзясной? Lubor Niederle (145) пры тлумачэньні летапіснага тэксту згаджаецца з Карскім, што нельга бачыць у радзімічах палякаў і выходзіць з уяўленьняў аб адасяродкаваным руху славян з „прарадзімы“. Радзімічы, вяцічы і дрэгавічы да расьсяленьня знаходзіліся ў шчыльнай культурнай сувязі з польскімі племяньнямі: „з пачаткам экспансіі на ўсход (VI—VIII ст) гэтыя племяньні неперарыўным поясам рушыліся ад З.-Буга і Нарава праз Бярозу, Сож, Дзясну да Акі, захаваўшы і надалей пэўную сваеасаблівасьць“. Такім чынам, летапіс адбіў-бы сапраўдны стан рэчаў з нязначнай папраўкай этнічнага разуменьня на геаграфічнае.

Больш своеасаблівасьці і менш праўдападобнасьці ў гіпотэзе Будэ (33), якая таксама хоча прымірыць адмаўленьне ляскага паходжаньня радзімічаў з данымі летапісу.

„Паляне, якія сядзелі на Сажы і яго працягу — на Дняпры, называліся ў сваіх суседзяў ляхаў палянамі і радзімічамі... частка радзімічаў называлася палякамі, а лясныя жыхары — радзімічамі" (стар. 294). Зразумела, у сьвеце археолёгічных даных, якія паказваюць, што палян ад радзімічаў аддзяляў севяранскі клін Любеч — Рэчыца, які змыкаўся на паўночным захадзе з паселішчамі дрэгавічоў, дапушчэньне Будэ аб монолітнасьці гэтых двух пляменьняў губляе грунт. Жыхары Сажа і Акі ў яго ня былі палякамі, але правадыры гэтых пляменьняў—Вятко і Радзім — палякі, пад кіраўніцтвам якіх праводзіўся колёнізацыйны рух.

Цяжка даць веры, каб крайнім на ўсходзе, абкружаным пушчамі вяцічам спатрэбілася „прызваньне князёў" з-за тысячы вёрст, якія аддзяляюць вадазбор Акі ад Польшчы, ды і для „палян-



Карта № 7.

радзімічаў" у гэтым патрэбы ня было, бо кіеўскія князі езьдзілі ў палюдзьдзе сямі і не дазволілі-б гаспадарыць на сваім Дняпры палячам.

Адзін час археолёгам здавалася, што знойдзена археолёгічнае пацьверджаньне ляскай тэорыі. В. А. Гарадцовым у часе раскопак вяціцкіх пахаваньняў у Аляканаве была знойдзена судзіна з загадачнымі знакамі. Ян Лецэўскі (119) спрабаваў падыйсьці да чытаньня надпісу з пункту погляду заходніх рун. Яму ўдалося падагнаць пад аляканаўскія знакі руны і іх лігатуры такім чынам, што надпіс чытаўся: „умершему малу ставих нужая". Гарадцоў (53) з гэтага факту рабіў вывад (зусім слушны, калі прызнаваць надпіс рунічным), што вяцічы прышлі аднекуль з захаду, дзе яны і маглі набыць веды ў рунапісаньні.

Але акадэмікам Ягічам (268) даволі ясна ўскрыта мэтодыка Лецэўскага; пры такім бесцэрамонным абыходжаньні з надпісамі можна было яшчэ і ня тое прачытаць. Надпіс, як рунічны, ня чытаецца, значыць адпадае довад за заходняе паходжаньне вяцічаў.

У 1925 г. профэсарам-лінгвістам Ільлінскім (91) быў прыцягнуты новы матар'ял для доказу польскага паходжаньня радзімічаў. Ён супастаўляе найменаваньне аднаго з славянскіх пляменьняў Канстантынам Багранародным Λενζανηνοι з коранем „лѧдъ" лічыць, што ў даным слове адбіты прыметнік „ляжанін" адпаведны слову „лях". Лічачы, што данае найменаваньне насілі два племені, ён адно лёканізуе на руска-польскім прымежжы, на тэрыторыі, якая ляжыць на захад ад лініі Валынь—Чэрвень—Броды, а другое на Дняпры. Вось гэтых днапроўскіх Λενζανηνοι ён і называе радзімічамі:

ляжанін—лях—радзіміч (заходняе племя ад польскага lędzionin). „Наша гіпотэза даводзіць, што ў X ст. іх (радзімічаў) нацыянальная самасьвядомасьць была яшчэ польскай".

У тэорыі Ільлінскага далёка ня ўсё зразумела. Недастаткова пераканальна супастаўленьне ляжанін—лях; не пераконвае і мэханічны падзел на два племені, выключна на падставе замены „а" ў другім складзе на „е", якую Ільлінскі тлумачыць розьніцай у вымаўленьні. Наўрад ці разьбіраўся візантыйскі імпэратар так добра ў дыялектолёгічных тонкасьцях кракаўскай і кіеўскай гутарак.

З усіх дасьледчыкаў найбольш упарта і з найбольшым захапленьнем абараняў ляскую тэорыю акадэмік Шахматаў. Яго навуковыя досьледы, заснаваныя на лінгвіністычных нагляданьнях і аналізах летапісных тэкстаў вызначаюцца значнай дасьціпнасьцю, сьмеласьцю пабудоў, і ў той-жа час амаль ніводная яго гіпотэза не заставалася доўга нязьмененай—заўсёдныя шуканьні і ўменьне прызнаваць памылкі часта прымушалі Шахматава зьмяняць свае погляды.

Падагульненьне сваіх работ, прысьвечаных ляскай тэорыі („Старажытныя ляскія паселішчы ў Расіі", „Да пытаньня аб польскім уплыве на старарускія гаворкі", „Паўднёвыя паселішчы вяцічаў" і інш.) акадэмік Шахматаў зрабіў у сваім унівэрсытэцкім курсе гісторыі рускай мовы—„Гістарычны процэс утварэньня рускіх пляменьняў і гаворак", 1916 г. (259).

Сутнасьць яго схэмы заключаецца ў наступным: пасьля пераходу славян з першай балтыцкай прарадзімы да берагоў Чорнага мора, к VIII-IX ст. на ўсходня-эўропейскай раўніне мы бачым дзейнымі наступныя сілы: на поўдзень ад Прыпяці разьмясьціліся паўднёва-русы; раён Сейму, Дзясны і Дняпра (ад Дзясны да Прыпяці) займалі паўночна-русы; у данскіх стэпах знаходзіліся ўсходня-русы (вяцічы); на Дняпры вышэй паўночна-русаў сядзелі ляхі, якія цягнуліся неперарыўнай паласою на захад паміж паўднёва-русамі і літоўцамі. Гэты польскі клін утварыўся ў VII-VIII ст. дзякуючы экспансіі на ўсход ляскіх пляменьняў радзімічаў і дрэгавічоў.

Усе гэтыя групоўкі зусім не статычныя—усходня-русы па Дону і Мэотыдзе спускаюцца да Кубані, паўднёва-русы рынуліся да вусьцяў Днястра, Буга, Дняпра, паўднёва-русы пасоўваюцца ўверх па Дняпры, уразаючыся ў тоўшчу ляскіх пляменьняў. Вынікам гэтага руху паўночна-русаў (будучых словен і крывічоў) адбыўся адкол ад польскага масыву радзімічаў і перасоўваньне іх з берагоў у межы б. Калускай і Разанскай губэрань.

У X-XI ст. на разьмяшчэньне пляменьняў уплывае новы фактар—рух з усходу вандроўнікаў. Пад іх націскам вяцічы з ніжняга і сярэдняга Падоньня адыходзяць у вадазбор Акі, выціскаючы адсюль радзімічаў. Радзімічы ідуць назад да Дняпра, дзе і застае іх летапіс.

У процэсе стыканьня вяцічы перанялі ад радзімічаў некаторыя полёнізмы ў мове. Паўднёва-русы (драўляне), якіх ціснулі ўцякаючыя ад вандроўнікаў улічы і ціверцы, пераходзяць на левы бераг Прыпяці, мяшаючыся тамака з ляхамі-дрэгавічамі, часткова зьмяняючы іх мову. У выніку ўзаемадзеяньняў польскіх (дрэгавічы і радзімічы) і рускіх (драўляне і вяцічы) пляменьняў нарадзілася беларуская народнасьць. Зваротны рух радзімічаў з берагоў Акі Шахматаў называе навалай, якая ахапіла ўсю Беларусь і частку тэрыторыі заходніх крывічоў аж да Пскова (ст. III).

Грандыёзны малюнак кіпучага катла, у якім з нязвычайнай хуткасьцю перасоўваюцца за сотні і тысячы вёрст цэлыя народнасьці і перамешваюцца мовы, сустрэў, аднак, цэлы рад пярэчаньняў. Сьлядоў пераходу драўлянамі Прыпяці ў археолёгічным матар'яле няма—дрэгавічы ўтрымліваюць за сабою ня толькі левы, але і частку правага, драўлянскага берагу.

Адносна паўднёвых паселішч вяцічаў Шахматаву грунтоўна пярэчылі і археолёгі (Гарадцоў, 53) гісторыкі (Грушэўскі, 61). Паўтараць іх довадаў ня буду.

Агульную концэпцыю крытыкаваў Анучын (116), паказваючы, па-першае, на некаторую нелёгічнасьць падзелу радзімічаў і вяцічаў на ляхаў і русаў, а галоўным чынам на пераўвялічэньне Шахматавым тэмпаў успрыйманьня моўных зьяў суседнімі народамі.

Анучын не згаджаўся таксама і з гіпотэзай аб фармаваньні беларускай народнасьці шляхам зьмешваньня амаль усіх лінгвістычных груповак Усходняй Эўропы і паказваў, што гэта фармаваньне пачыналася ў вадазборы Зах. Дзьвіны і Нёману і адтуль ужо пасоўвалася праз Дняпро да Дзясны.

Але, бязумоўна, лепшым пярэчаньнем на гэту суму гіпотэз зьяўляецца праца самаго-ж Шахматава, якая выйшла з друку праз тры гады пасьля „Уводзін" (260). Адмаўляючыся ад паўднёвых паселішч вяцічаў, ад хадні радзімічаў узад і ўперад па маршруту Дняпро—Ака і назад, Шахматаў зьвярнуўся да старой тэорыі прыходу радзімічаў на Сож з Польшчы, паднавіўшы толькі матывы іх перасяленьня.

У гэтым новым малюнку дзеяньне выходзіць за межы Ўсходняй Эўропы і падзеі па Аке аказваюцца шчыльна зьвязанымі з падзеямі ўнутры Рымскай Імпэрыі. Радзімічы і вяцічы да канца VIII стагодзьдзя жывуць недзе ў Польшчы, зьяўляючыся крайнімі польскімі пляменьнямі на ўсходзе ў канцы VIII стагодзьдзя і пачатку IX Карлам Вялікім вядуцца войны з аварамі, у выніку якіх авары былі пераможаны і адыходзяць перад імпэрскімі войскамі на ўсход, на паўночны ўсход. Гэты рух перадаецца славянскім пляменьням, дулебы займаюць тэрыторыю дрэгавічоў, ад польскіх пляменьняў адлучаюцца радзімічы і вяцічы і ідуць адны на Аку, другія на Сож.

Але гэта сьмелае дапушчэньне ўсё-ж пакідае цэлы рад неразуменьняў. Ці былі авары, якія бяз сьледу зьніклі з гісторыі („их же нѣсть племени, ни наслѣдника") колькасна значным этнічным масывам, ці яны, як потым балгары на Балканах, хутка зрабіліся толькі соцыяльным верхавінным пластом? Думаю, што апошняе бліжэй да праўды. Але шахматаўская гіпотэза мае патрэбу іменна ў процілежным, у пацьвярджэньні таго, што ад Карла Вялікага пабеглі агромныя масы авараў.

Калі гэту гіпотэзу паставіць у конкрэтныя ўмовы славянскага быту IX стагодзьдзя, дык мы адчуем, якім агромным павінен быць аварскі струмень, каб прымусіць два земляробчыя племені

зьняцца з месцаў іх паселішч, кінуць пахаці і, узяўшы з сабою ўвесь земляробчы інвэнтар і жывёлу, зрабіць тысячавёрстны пераход, які нічым не апраўдваецца. Ніякія паходы Аляксандра Македонскага ня могуць тады раўняцца з франка-аварскімі бойкамі, бо гісторыі невядомы выпадкі, каб перамога над фэўдальнымі вярхамі аднэй краіны прыводзіла ў рух усе суседнія народы на паўтары тысячы вёрст.

Прызнаўшы, што вынікам націску на вяцічаў (пакуль яны яшчэ былі ў Польшчы) было іх перасяленьне, мы павінны будзем дапусьціць перасяленьне фінаў з Окскага вадазбору, якіх ціснулі вяцічы. Разважаючы лёгічна, атрымаем, што канец гэтага раду пляменьняў, выведзеных з роўнавагі стратэ-



Карта № 8.

гічнымі талентамі Карла Вялікага, абапрэцца на Ціхі акіян. І дзіўна тое, што ніхто з аналістаў таго часу (хаця-б Эйнгард, які напісаў Vita Caroli Magni) або больш позьніх (Мартын Гал, Кузьма Праскі) не дае ніякіх вестак аб перасяленьні палякаў на ўсход.

Але калі нават дапусьціць правільнасьць гіпотэзы Шахматава, дык яна будзе супярэчыць хронолёгіі: радзімічы, якія толькі ў IX ст. выйшлі з Польшчы, у гэтым-жа IX стагодзьдзі апынуліся ўжо даньнікамі хазар. Калі пасьпелі хазары заваяваць іх? Наўрад ці ў IX ст., калі іх агрэсыўнасьць вышла на нуль (гл. Гоцье, 59)? Гэта здарылася, як відаць, раней і многа раней таго часу, які Шахматаў намячае для іх прыходу.

Падагульняючы ўсе довады за ляскую тэорыю, трэба адзначыць, што апрача лінгвістычных доказаў (якія, да рэчы, сучасныя лінгвісты адмаўляюць (44, 172), яна базуецца такім чынам на доказах топонімічных. Зусім не жадаючы ўмаляць значэньне топонімічных досьледаў, я хачу толькі сказаць супроць вульгарызацыі іх, выбачальнай для сярэднявяковых вучоных, але недапушчальнай для сучасных вучоных.

Вышэй, у разьдзеле аб географічных граніцах, даводзілася спыняцца на тым, у якой меры маюць у сабе корань „рад". Калі ісьці за імі, дык радзімічы акажуцца неабсяжным племенем, крайнія паселішчы якога будуць даходзіць да Эльбы, Ноўгараду і граніц Візантыйскай імпэрыі на Балканах. (З. Хадакоўскі (241) у пісьме да брата ад 8.IV.1822 г. піша аб тым, што ў яго падарожжы па Расіі кожныя пяць вёрст трапляюцца назвы ад Лады, Лелі, Радэгаста).

Самае багацьце „прарадзім" радзімічаў на захадзе і магчымасьць лёкалізацыі іх у розных месцах гаворыць супроць такога мэтоду. Нават калі-б дзе-небудзь на Захадзе знайшлося іншае племя радзімічаў, параўноўваць іх з радзімічамі на Дняпры трэба было-б з вялікай асьцярогай — маем-жа мы рад роўналежных назваў: паляне кіеўскія і польскія, дрэгавічы солунскія і тураўскія, севяране на Балканах і на Дзясьне. Такія назвы ўзьнікалі ня шляхам колёнізацыі з пераносам пляменнага імя, а зусім самастойна на мясцох.

На ўзьнікненьне імя радзімічаў праліваюць сьвет дасьледваньні акадэміка Мара (135). „З этрускага племеннага імя ў шляхох спачатку тотэмных, а далей і іншых, узьнікаюць ня толькі конь і дрозд, таксама арэх, але і радасьць, род і г. д." (стар. 18).

Магчыма, што ў сувязі з гэтым, стаяць і такія асабістыя і геаграфічныя назвы, як Радзім, Радзіл (тысяцкі, які ўспамінаецца ў летапісу пад 1169 годам), Радамль, Радзімін і г. д., якіх багата ёсьць на тэрыторыі ўсходняга славянства. Вялікая колькасьць геаграфічных назваў, што нагадваюць па гукавому складу слова „радзіміч", крыху бянтэжыла дасьледчыкаў і, каб як-небудзь прымірыць гэта з іх рухам з Польшчы, трэба было ўжываць нацяжкі накшталт таго, што радзімічы па дарозе на Сож нібы заходзілі ва ўсе тыя месцы, дзе ёсьць топонімікі з коранем „рад" (Турчыновіч, 232).

Карта № 9.

Дасьледчыкі, якія апэруюць помнікамі матар'яльнай культуры, у большасьці выпадкаў да тэорыі ляскага паходжаньня вяцічаў і радзімічаў адносяцца адмоўна. Арцыхоўскі (18) у сваёй монографіі аб вяцічах лічыць, што паданьне аб заходнім паходжаньні можа зьяўляцца водгульлем агульнага колёнізацыйнага руху на ўсход. Сьпіцын, вывучаючы старажытнасьці антаў, прыходзіць да вываду, што радзіміцкія сяміпраменныя вісочныя колцы паходзяць ад анцкага першаўзору. Вышэй я ўжо адзначаў, што прыняць гэта цалкам нельга, але сувязь радзіміцкага інвэнтару з анцкім бязумоўная. Падвескі тыпу гранкавых зьяўляюцца простымі насьледніцамі анцкіх рэчаў. Што-ж тычыцца сяміпраменных, дык я ўжо спрабаваў давесьці іх сувязь з усходнімі арабскімі цэнтрамі, а гэта паказвае на доўгае і даўняе знаходжэньне радзімічаў у сфэры арабскага ўплыву.

Аднаго курганнага матар'ялу мала для канчатковага зацьверджаньня аўтахтоннасьці радзімічаў каля Дняпра, але весткі аб гарадзішчах, якія ў мяне ёсьць, гавораць аб тым, што тэрыторыя радзімічаў ня была незанятай у дакурганны пэрыод, што насельніцтва тут жыло даўно і ніякіх заметных гвалтоўных урываньняў чужой культуры не назіраецца.

Курганы ў радзімічаў зьяўляюцца адначасова з зьяўленьнем іх у іншых славян і па курганнай культуры яны зьяўляюцца органічна зьвязанымі як з папярэднімі культурамі, так і з усім сынхронным усходня-славянскім матар'ялам.

Летапісец, які руплiва праводзіў лінгвістычныя і этнографічныя граніцы, не вылучае радзімічаў з асяродзішча ўсходніх славян, наадварот, ён падкрэсьлівае этнографічнае сваяцтва „хазарскай" (паводле тэрмінолёгіі Пархоменка, 154) групы славян-севяран, вяцічаў і радзімічаў. Ні заходніх рэчаў, ні польскага абраду пахаваньня мы на тэрыторыі радзімічаў ня бачым, калі іх курганы пачынаюцца з IX стагодзьдзя, дык да таго існаваў зноў-ткі ня ляскі абрад пахаваньня на слупох.

Адзіным довадам за прыход радзімічаў ад ляхаў застаецца сьведчаньне летапісу, і каб яго ня было, дык лічыць радзімічаў палякамі ня прышло-б у галаву нават такім дасьледчыкам, якія па падабенству орнамэнтыкі прымушаюць перасяляцца цэлыя народы.

Шмат для каго летапіс зьяўляўся зусім бясспрэчнай крыніцай, якая стаіць па-за ўсякім падазрэньнем; двохразовае ўспамінаньне аб ляскім паходжаньні радзімічаў (у інтродукцыйнай частцы летапісу і пад 984 годам) разглядалася як настойлівае сьцьвярджэньне іх полёнізму. Але бліскучыя аналізы летапіснага тэксту, зробленыя акадэмікам Шахматавым, паказваюць, што адзін запіс ад другога аддзелены прамежкам у 80 год.

Першакрыніцай вестак аб паходжаньні радзімічаў трэба лічыць апісаньне пешчаньскай бойкі, да якога ў відзе падрадковай заўвагі дадзены між іншым сказ: „Быша же радимичи отъ рода ляховъ". На гэтых нямногіх словах, якія абрасьлі такімі багатымі тлумачэньнямі, і трэба завастрыць увагу, трэба зусім конкрэтна ўявіць тыя ўмовы, пры якіх летапісец запісаў гэтыя радкі на свой пэргамэнт.

У эпоху напісаньня „Древнейшего Свода“ політычная сытуацыя была такая, што аб палякях можна было гаварыць у зычлівых тонах і нават рускім племяньням надавалася польскае паходжаньне—Дабранега Ярославаўна была жонкаю Казіміра Польскага. І паколькі радзімічы ня былі прымежным племенем, прызнаньне іх ляхамі не накладала на летапісца ніякай адказнасьці.

Калі параўнаць паведамленьне аб паходзе на радзімічаў з апісаньнем іншых паходаў (хаця-б на ятвягаў, на голядзь і рад іншых), дык у першым выпадку кідаецца ў вочы поўнасьць і насычанасьць дэталямі. Летапісец ведае ня толькі ваяводу, ня толькі невялікі ручай Пешчань, але і тое, што радзімічаў дражняць воўчым хвастом. Пералічэньне такіх падрабязкаў выклікае дапушчэньне, што летапісец чуў апавяданьне аб радзіміцкім паходзе ад навочнага сьведкі, магчыма, удзельніка паходу. Факты не супярэчаць гэтаму.

Карта № 10.

Да пачатку княжэньня Ярослава Воўчы Хвост быў яшчэ жывы на беразе Дняпра, зьдзекваўся над наўгародзкімі цесьлярамі. У 1015 г. ён быў прыхільнікам Сьвятаполка. Той факт, што прыдворны летапісец Ярослава піша аб Воўчым Хвасьце і падзеях 984 г. у спачувальным тоне, гаворыць за тое, што гэты пышлівы ваявода, як відаць, адышоў пасьля 1015 г. ад Сьвятаполка да Ярослава. Але нават і бяз гэтага можна ўжо дапускаць, што аўтар „Древнейшего Свода“ ведаў Воўчага Хваста ня толькі па чутках.

Сьведчаньне аб ляскім паходжаньні радзімічаў звычайна разглядалася ізолявана, але калі ўзяць яго ў контэксьце, мы атрымаем некалькі цікавых даных.

Паходу Ўладзіміра на радзімічаў папераджалі паходы на ятвягаў і ляхаў. Адзначым другое. У часе ляскага паходу Ўладзімірам былі заняты Чэрвень, Перамышль і інш. Па дарозе з Чэрвеня ў Перамышль (блізка апошняга) ёсьць гарадок Радзімін.

Падагуляючы ўсе гэтыя факты, можна так акрэсьліць падзеі—дружына Ўладзіміра, якая пабывала на Бугу і Сане, у Перамышлі і Радзіміне, у'адзін з наступных паходаў зьяўляецца ў краіне радзімічаў на Сажы. Удалы паход адчыняе для Кіева новы рэзэрвуар мёду, скуры і чэлядзі. Канец X стагодзьдзя — пачатак XI-га — эпоха зараджэньня фэўдальнага эпосу; магчыма што на пірах апавядаецца як аб перамогах над ляхамі, так і аб пешчаньскай бойцы. Падобныя назвы — Радзімін на Сане і радзімічы на Сажы выклікаюць выпадковыя асоцыяцыі. Кіеўскі летапісец ня мог ня ведаць гэтага, бо быў у курсе прыдворнага княжацкага жыцьця. (Для яго, як для манаха, да сугучча Радзімін-радзімічы магло дадацца і тое, што ў часе, калі рускія войскі былі ў Польшчы, гнезьненскім архіэпіскапам быў брат сьв. Войцэха — Радзім). Жывая сувязь паміж летапісцам, які скончыў свой твор у 1039 г. і ўдзельнікамі паходу на радзімічаў (хаця-б самым Воўчым Хвастом, які быў у 1015 г. вядомай для кіеўлян асобай) бясспрэчная.

Вось чаму, падрабязна гаворачы аб заваяваньні радзімічаў і аб эканомічных выніках яго, летапісец у выглядзе маленькай даведкі афармляе асоцыяцыі — „радимичи от рода ляхов“).

Да пачатку XII стагодзьдзя, калі шляхі ўзьніканьня гэтых асоцыяцый былі ўжо забыты, Нестар стаяў перад фактам запісанага ў летапісе паказаньня аб ляскім паходжаньні радзімічаў. Яго творчы разум ня спыніўся на простым коп'яваньні — ён з дапамогаю тагочасных гісторыяграфічных мэтодаў спрабаваў конкрэтызаваць даныя свайго папярэдніка. У радзімічаў зьяўляецца свой правадыр Радзім, які вядзе іх з Польшчы на Сож. Робячы гэтак, Нестар дзейнічаў адпаведна духу часу — XII-XIII ст. — эпоха стварэньня розных легенд аб пачынальніках роду (Русь, Лех і Чэх—прaайцы рускіх, палякаў і чэхаў, Крак—заснавальнік Кракаву, Мазур—пачынальнік роду мазураў, Кій—заснавальнік Кіева, Тур — Турава і так бясконца ва ўсіх краінах ад Ірляндыі да печанегаў).

Будучы ня толькі гісторыкам, але і этнографам, аўтар „Повести“ ведаў аб блізкім этнографічным падабенстве радзімічаў і вяцічаў і, маючы дзьве прадпасылкі:

1. вяцічы падобны да радзімічаў,
2. радзімічы — ляхі,

заключыў, што, значыць, вяцічы — ляхі. З такой-жа лёгкасьцю з вяцічаў быў сформаваны Вятко, а суседзтва і падабенства двух пляменьняў зрабіла ў вачох летапісца іх правадыроў братамі.

Калі-б не бясспрэчная географічнасьць імя севяран, мы, напэўна, мелі-б легенду прыблізна такога зьместу: „Бяста бо три брата въ лясѣхъ Радим, Вятко и Северъ...“ Асабліва строга судзіць Нестара за недастаткова крытычныя адносіны да старога тэксту нельга. Для XII стагодзьдзя гэта прабачальна.

Разьдзел VII

Гісторыя племені.

Гісторыя племені радзімічаў фактычнымі данымі вельмі бедна, і ў гэтым нарысе нельга будзе абмежавацца толькі выкладаньнем або тлумачэньнем нямногіх, занесеных у летапіс радкоў; у паняцьце гісторыі племені павінны быць уключаны і такія зьявы, як колёнізацыя, культурныя ўплывы і г. д.

Цэлы рад меркаваньняў, апрача фэўдальна-археолёгічных, прымушае ўмоўна падзяляць гісторыю радзімічаў на два пэрыоды, прыняўшы за грань зьяўленьне курганоў (факт паказальны і сам па сабе, але ён зьявіўся толькі вынікам іншых, больш істотных прычын). Калі другі пэрыод асьветлены археолёгічнымі і гістарычнымі крыніцамі больш ці менш добра, дык першы можна назваць не толькі дагістарычным, але часткова і „даархеолёгічным“, бо помнікаў дасьледвана вельмі мала і ўласна аб радзімічах яны не гавораць — граніцы археолёгічных культур дакурганнага пэрыоду значна шырэйшыя за будучыя пляменныя. Сёе-тое для асьвятленьня гэтага пэрыоду можна атрымаць і пры аналізаваньні больш позьняга матар'ялу (формы з традыцыяй, якая ўстанавілася раней і г. д.). Такім чынам, першы пэрыод можа быць акрэсьлены, галоўным чынам, рэтроспэкцыйна.

Высьветліць ступень пляменнай сформаванасьці ў гэты пэрыод нам ня ўдасца, бо гаспадарчая аснова была аднастайнай для вельмі вялікага раёну, які на многа перавышаў тэрыторыю нашага племені, а больш надзейных этнографічных адзнак мы пакуль ня маем. Але ўжо адна недаразьвітасьць пляменнай організацыі ў больш позьні час не дазваляе асабліва паглыбляць у часе момант формаваньня пляменных асаблівасьцяў. Напэўна, адрозьніць радзімічаў ад вяцічаў у VII-VIII ст. было амаль немагчыма. Пазьнейшае падабенства радзіміцкага і вяціцкага інвэнтару, падабенства зусім не выпадковага характару, якое ня тлумачыцца ні гандлем, ні ўплывамі ў той час (XI-XII ст.), уводзіць нас у сфэру ўзаемаадносін паміж імі ў даволі даўнія часы. Ёсьць даныя дапускаць, што ў VI-VIII ст. раёны, занятыя пазьней вяцічамі і радзімічамі, знаходзіліся ў аднолькавых умовах, аднолькава ўспрымалі адны і тыя-ж струмені гандлёвых і культурных уплываў.

Адказ на пытаньне аб тым, якія гэта былі ўплывы, быў дадзены пры разглядзе генэзісу сісочных колцаў — гэта арабскі ўсход транзытам праз хазар. Тавар хазарскіх карабейнікаў ішоў ня толькі да будучых радзімічаў і вяцічаў, — ён прасочваўся і далёка на поўнач, але насельніцтва радзіміцкай і вяціцкай тэрыторыі (унікаю называць іх пляменным іменем для гэтага часу), роўна як і фіны, якія жылі на ўсход ад іх, успрынялі найбольш яскравыя ўзоры. Гэта эпоха „хазарскага сьвету“, калі славянскія паселішчы ішлі далёка на поўдзень, на Чорнаморра, змыкаючыся з Тмутараканьню, узбагаціла славян такімі дробнымі (але істотнымі для археолёга) дэталямі, як своеасаблівыя жаночыя аздобы. Звычай насіць той або іншы тып аздоб вельмі часта замыкаўся ўнутры пляменных граніц, якія ў той час формаваліся. Аднароднасьць насельніцтва на Сажы і Аке не абмяжоўвалася знаходжаньнем у сфэры адных і тых-жа культурных уплываў, — існавала, як відаць, і некаторае дыялектолёгічнае падабенства, якое, аднак, пры слабай моўнай дыфэрэнцыяванасьці тагочаснага славянства не магло быць вельмі заметным.

Гаворачы аб сваяцтве радзімічаў і вяцічаў, вучоныя ўсьлед за летапісцам тлумачылі яго агульнасьцю паходжаньня з Польшчы, але акадэмік М. Грушэўскі (61) даў больш орыгінальнае тлумачэньне. Паводле яго гіпотэзы гэта нішто іншае, як колёнія радзімічаў на фінскім грунце. Зразумела, гэта бліжэй да праўды, чым тое цьверджаньне, якое лічыць і тых і другіх колёніяй мазаўчан, але ўсё-ж зусім згадзіцца з гэтай гіпотэзай нельга. Чаму іменна вяцічаў трэба лічыць колёніяй радзімічаў, а не наадварот? Пераўвялічэньне ролі колёнізацыі і перасоўваньня народаў дазволіла гаварыць аб такой колёніі.

Насельніцтва Пасожжа і Акі рысуецца як этнографічна аднародная маса, якая разарвалася на два племені не ў рэзультаце розных перасоўваньняў, а пад уплывам дзьвюх дацэнтравых сіл, вынікам дзейнасьці якіх было ўнясеньне палітычнага элемэнту і формаваньне пляменьняў радзімічаў і вяцічаў. Этнографічнае сваяцтва мела больш шырокія рамкі — „один обычай“ мелі і севяране, але тут падабенства крыху меншае.

Агульнасьць пахавальных звычаяў узьнікла, як відаць, даволі даўно і к гістарычнаму часу пачала ўжо распадацца ў сувязі з розным гаспадарчым і соцыяльным разыходжаньнем пляменьняў. У радзімічаў і севяран мы можам назіраць курганы з IX стагодзьдзя, і ўжо тады намячалася розьніца ў спосабах пахаваньня: радзімічы проста палілі труп, а севяране завяршалі трупаспаленьне зьбіраньнем касьцей у урну; вяцічы-ж практыкавалі старую (агульную) форму пахавальнага абраду аж да пачатку XII ст. Ранейшае этнографічнае адзінства так званай „хазарскай групы“ славянскіх пляменьняў пад уплывам раду прычын пачынала парушацца, пасьпеўшы ўсё-ж стварыць фундамант для іх палітычнага аб'яднаньня ў складзе Чарнігаўскага княства.

Тэрмін „хазарская група", уведзены ў абарот Пархоменкам (154), ахапляе наступныя плямеьні: палян, севяран, радзімічаў, вяцічаў (...„а козаре имяху (данину) на полянахъ, на сѣверехъ і на вятичех"). Здавалася-б, што радзімічаў, на падставе данага тэксту, нельга ўключыць у склад гэтай групы, але трэба памятаць, што аб падзеях сярэдзіны IX ст. (859 г.) пісалі ў пачатку XII ст. Гаворачы аб паходзе Алега, летапісец адзначае, што радзімічы раней давалі даніну хазарам. Такім чынам, калі, бязумоўна, пакладацца на летапіс, мы атрымаем, што радзімічы былі пераможаны ў прамежак паміж 859 і 883 гг., што зусім немагчыма фактычна, бо хазарская дзяржава ў сярэдзіне IX ст. была яшчэ далёкай ад думкі весьці заваёўчыя войны на поўначы ў радзіміцкіх балотах і лясох.

Падпарадкаваньне радзімічаў хазарам к часам Алега, якое бадай ці ня стала фікцыяй, пачалося значна раней. Не адважаючыся рабіць супастаўленьні паміж хазарамі і такімі радзіміцкімі сёламі, як Казарычы, успомню знахадку на поўдні радзіміцкай тэрыторыі скарбу хазарскіх монэт XI стагодзьдзя ў скураным мяшку, як яскравы доказ сувязі з хазарамі задоўга да 859 году. Нажаль, Е. Р. Раманаў (181), які апублікаваў весткі аб гэтым скарбе, не пералічае склад скарбу больш падрабязна і не паведамляе сваіх меркаваньняў, якія дазволілі яму лічыць гэтыя монэты хазарскімі.

Агляд старажытнага пэрыоду гісторыі радзімічаў быў-бы няпоўным, калі-б мы не закранулі пытаньня аб сувязях з анцкай культурай. Проблема антаў, пастаўленая ў археолёгічным разрэзе ўпяршыню А. А. Сьпіцыным (218), якая мае вялізарнае значэньне пры вывучэньні севяран, цікава таксама і ў адносінах да радзімічаў.

Хронолёгічныя рамкі — гэта VI-VII ст., а прасторава культура антаў ахапіла вельмі вялікую тэрыторыю ад нізавін Бугу, Дняпра і Днястра да Дзясны, Сэйму і Дону. Для нас зараз цікава тое, што Сьпіцын намячае пункты знахадак данай культуры на паўднёвым усходзе радзіміцкай зямлі — у Мглінскім пав. (скарб у Верхняй Злобінцы і гарадзішча ў Лопасьне).

Раней ужо адзначалася магчымая пераемнасьць анцкіх форм у выглядзе асобнага тыпу падвесак; цяпер-жа дадам некалькі даных, захаваных у пазьнейшым інвэнтары радзімічаў. Рад курганоў даюць у невялікай колькасьці сэрдолікавыя пацеркі, якія маюць форму простакутнай прызмы з зрэзанымі кутамі (Вялікія Шчарбінічы, кург. № 58, Корхаўка, 29, Лялічы, Казарычы, 43, Гочава—Самаквасаў, 34 і Лугавец, Мглінскага раёну). Даны тып пацерак у курганны час сустракаецца і ў іншых мясцох (напр., Прыладажжа), але ўсюды ў невялікіх колькасьцях і заўсёды носіць характар прывознага, процілеглага славянскай біпірамідальнай форме. Знахадкі ўчашчаюцца з прасоўваньнем на поўдзень, робячыся звычайнай зьявай у заходняй частцы севяранскай тэрыторыі.

У больш раньні час гэты тып пацерак знойдзены ў анцкай культуры (Харкаўская губ.) і затым у інвэнтары крымскіх готаў (Хэрсонэс, Керч). Традыцыя вырабу гэтых пацерак ад V-VII ст. дажыла да X-XI. Калі далёка на поўнач яны пранікалі па вялікіх водных магістралях, дык да радзімічаў яны ішлі, як відаць, не праз Дняпро, ня з боку пераяслаўскіх севяран, — раён іх пашыраньня (паўднёвы ўсход радзіміцкай тэрыторыі) якраз супадае з анцкімі элемэнтамі б. Мглінскага павету, якія намячае Сьпіцын.

Магчыма, што ў даным выпадку мы маем справу ня з прывозам гэтых пацерак, а з захаванай традыцыяй анцкіх майстроў. Калі гэта так, дык мы маем права гаварыць аб вельмі старых сувязях насельніцтва радзіміцкай тэрыторыі з ачагамі анцкай культуры: можа быць ня толькі будучыя севяране, але і будучыя радзімічы, або частка іх хаваліся ў этнічных масывах, пакрытых археолёгічнай культурай, названай Сьпіцыным анцкай.

Апрача адзначанага, аналіз пазьнейшага курганнага матар'ялу наводзіць яшчэ на меркаваньне, якое лепш за ўсё разглядаць іменна пры характарыстыцы першага пэрыоду — гэта няроўнасьць геаграфічнага разьмяшчэньня розных уплываў.

Выключыўшы скрупулёзныя долі візантыйскага ўплыву, мы будзем мець дзьве хвалі, якія ўліваліся ў ювэлірную прамысловасьць радзімічаў — арабскую і паўночную. Першая ахапіла ўсіх радзімічаў (і ўсіх вяцічаў); ва ўсякім разе, у X-XI стагодзьдзях культываваньне мясцовымі майстрамі арабскіх форм мы назіраем у радзімічаў усюды. Іншае намячаецца пры картаграфаваньні рэчаў, першаўзоры якіх могуць мець скандынаўскае ці прыбалтыцкае паходжаньне. Крыжыкі „скандынаўскага тыпу", знойдзеныя ў Кіеве з скандынаўскай фібулай, у радзімічаў знойдзены ў Краснай Слабадзе, Улазавічах, Казарычах. Зьмяінагаловыя бранзалеты, якія насычаюць амаль ня кожнае пахаваньне прыбалтыцкіх магільнікаў і вельмі рэдка сустракаюцца ў славян, гэтыя бранзалеты знойдзены ў Казарычах, Праскурні і ў раскопках Сізова ў Смаленскай губ. Біэліпсоідныя падвескі, паўночны провэнанс якіх быў абгрунтаваны вышэй, ёсьць у наступных курганных групах: Улазовічы, Дэрэбуж, Хізава, б. Смаленская губэрня і Колчына на Болве. Як бачым, усе гэтыя рэчы не заходзяць на поўдзень далей лініі Чачэрск—Сураж, якая падзяляе тэрыторыю радзімічаў напалам.

Яшчэ больш цікавы ў гэтых адносінах даныя, якія атрымліваюцца пры картаграфаваньні радзіміцкіх грыўняў: два асноўныя тыпы—кручаныя і пласткаватыя—маюць дзьве адасобленыя вобласьці пашырэньня. Грыўні кручаныя 1×3 сустракаюцца на поўдзень ад намечанай вышэй лініі, грыўні-ж пласткаватыя—на поўнач. Напомню, што пацеркі, якія зьвязваюцца з культурай антаў, знойдзены выключна ў паўднёвай палове.

Пры выдзяленьні пласткаватых грыўняў, а таксама і біэліпсоідных падвесак, у якасьці радзіміцкага спэцыфікуму, мелася на ўвазе тая абставіна, што суседнія славянскія плямені гэтых тыпаў амаль ня маюць, але цяпер высьвятляецца, што калі гэтыя рэчы і характэрны для радзімічаў, дык ня ўсюды, а толькі для паўночнай часткі радзіміцкай тэрыторыі. У гэтай-жа паўночнай палове тры

разы (Карма і Нісімкавічы) былі знойдзены на нябожчыцах іголкі з ніткай. Аналёгіі гэтаму звычаю дае не славеншчына, а этнографія эстаў.

Тлумачыць прысутнасьць у паўночнай палове радзіміцкай зямлі рэчаў, якія ўказваюць на Прыбалтыку, існаваньнем гандлёвых сувязяў паміж радзімічамі і, напр., Люцынам—нельга. Нельга не таму, што гэтыя сувязі былі зусім немагчымы, а таму, што яны нічога ня тлумачаць; указаныя тыпы абмежаваны ў сваім разьмяшчэньні на поўначы, захадзе і ўсходзе граніцай радзімічаў, а на поўдні паказанай лініяй ад Чачэрску да сярэдняй Іпуці і нідзе ў суседніх пляменьняў, апрача гэтага астраўка, ня знойдзены.

Калі-б пласткаватыя грыўні пранікалі праз гандаль, дык вельмі дзіўна, чаму балтыцкія гандляры так сваеасабліва абмежавалі свой рынак. Ні дрэгавічом, ні крывічом, паселішчы якіх непасрэдна суседзілі з балтыцкімі (літоўскімі) культурамі, яны пласткаватых грыўняў не прадавалі, а праз галаву гэтых пляменьняў вязьлі іх да радзімічаў.

Гаварыць аб пазьнейшай калёнізацыі данага раёну выхадцамі з Люцыну, зразумела, нельга: у IX-X ст. крывічы дастаткова шчыльнай сьцяной стаялі паміж Прыбалтыкай і радзімічамі, ды і наогул мала праўдападобнасьці ў такім масавым перасяленьні.

Акадэмікам Карскім (96) прароблена вялікая праца па этнізацыі гідраграфічных назваў Беларусі. Для вадазбору Сажа ён устанаўляе значны процант літоўскай номэнклятуры: Вільня, Вілія, Бася (літ. basia—басяк), Чачэра (čečkà—шышка), Удуга (udegr—хвост). Акшанка (aksenkit—хадземце сюды), Жадунка (žadas—гук), Палуж (palušis—шапавал), Учэча (čečka), Харопуць, Уць, Іпуць (ypatus—асобны), Ачэса, Туросна, Надва і г. д.

Літоўская номэнклятура пераходзіць праз Дзясну на ўсход (Жыздра, Угра, Уса, Рэса, Уна і г. д.), хаця ў верхнім цячэньні Дзясны з поўначы ўразаецца фінскі клін—Болва, Віцьма.

„Мова зямлі" вельмі пераканаўча даводзіць існаваньне на данай тэрыторыі літоўска-фінскіх паселішч, але аб суцэльных паселішчах літоўцаў і латышоў ад вусьцяў Дзьвіны і Нёману да вышнявіны Акі ня можа быць і гутаркі" (Карскі, 96).

Супастаўленьне археолёгічных даных з вынікамі лінгвістычных назіраньняў над слоўнікам радзіміцкіх рэчак дазваляе намаляваць карціну скрыжаваньня паўночнай часткі славянскага племені радзімічаў з адным з астраўкоў літоўска-латыскага паходжаньня.

З зьліяньня з літоўцамі, як відаць, утварылася паўночная частка пазьнейшых дрэгавічоў, на тэрыторыі вяцічаў славяне месцамі зьмяшаліся з літоўцамі, але месцамі апошнія ўтрымаліся да XII стагодзьдзя (голядзь на Протве). Літоўска-радзіміцкая амальгама была адрэзана ад асноўнай масы прыбалтыцкіх літоўцаў паселішчамі крывічоў. Літоўскі пласт пераняў пахавальныя звычаі, можа быць, мову, прыняў племеннае імя радзімічаў, але захаваў такія дробязі, як форма аздоб.

У больш далёкі час, задоўга да IX-X ст., калі зьліяньне яшчэ не адбылося, гэты астравок, як відаць, меў сувязі з разьмешчанымі на поўнач літоўска-фінскімі культурамі, у якіх былі так пашыраны тыя-ж пласткаватыя грыўні і інш. Мастацкая індустрыя Прыбалтыкі і літоўскага Пасожжа доўгі час магла ісьці па адных шляхох; як на прыклад, пакажу на аланскую культуру, разарваную вандроўнікамі так, што адна частка іх была адкінута далёка на поўнач у раён Данца, Асколу і Дону, а другая частка была адціснута на Каўказ. Дзіўнае падабенства паміж пячорамі Чмі і Салтава працягвалася доўгі час пасьля аланскай „дыяспоры".

Археолёгічна паміж інвэнтаром літоўскім (дакладней, латыскім) і фінскім часам бывае вельмі цяжка ўлавіць розьніцу. Вядома спрэчка аб этнізацыі Люцынскага магільніка (трэба думаць усё-ж латыскага). Падобныя спрэчкі зусім магчымы таму, што вельмі шмат якія тыпы зьяўляюцца агульнымі як для тых, так і для другіх. У крыватнасьці, такім тыпам зьяўляюцца пласткаватыя грыўні. З славянскіх-жа пляменьняў пласткаватыя грыўні мелі толькі радзімічы і вяцічы, прычым для апошніх ізноў-такі можна дапускаць частковае скрыжаваньне, але наўрад ці з літоўцамі, хутчэй з фінамі, якія, мяркуючы па разанскіх магільніках, даўно мелі наш варыянт грыўні (Ефіменка, 77).

Вызначыць удзельную вагу кожнага з складнікаў, з якіх сфармавалася паўночная частка радзімічаў, пакуль не зьяўляецца магчымым, але можна думаць, што сыстэма гаспадаркі літоўцаў была больш экстэнсыўнай (бо вялікі процант лясістасьці поўначы радзіміцкай тэрыторыі значна абцяжарваў земляробства) і з гэтай прычыны патрабавала большай разрэджанасьці паселішч.

Тое, што працэс акультурацыі ў асноўным скончыўся на карысьць радзімічаў, гаворыць за крыху больш высокую сыстэму гаспадаркі і соцыяльна-палітычную організацыю апошніх. Датаваць гэты працэс, які працякаў, трэба думаць, вельмі марудна, даволі цяжка. Можна думаць, што да VIII-IX ст. ён ужо скончыўся, радзімічы з сваімі сяміпраменнымі запоўнілі амаль увесь раён з пласткаватымі грыўнямі, біяліпсоіднымі падвескамі і г. д.

Вынікам гэтага працэсу магло стаць перарастаньне ўзаемаадносін паміж літоўцамі і радзімічамі з этнічных у соцыяльныя, што дало штуршок да большай маемаснай і соцыяльнай дыфэрэнцыяцыі радзімічаў.

Зьяўленьне каля IX ст. у радзімічаў новага пахавальнага абраду было, бясспрэчна, абумоўлена нейкімі глыбокімі зрухамі ў грамадстве. Толькі награмаджэньне цэлага шэрагу зьмен у гаспадарцы, грамадзкім быце (напр., выдзяленьне дружыннага пласта, хай зародкавага, але ўсё-ж ставіўшага сябе над асноўным насельніцтвам) змаглі зрабіць пералом у галіне ідэолёгіі. Чаму іменна гэта выразілася ў пераходзе ад слупоў на шляхох да курганоў і ад трупаспаленьняў да звычайных пахаваньняў—сказаць цяжка. Важна толькі тое, што, ужываючы тэрмін „курганны пэрыод", мы не застаемся толькі ў межах адцягненай і ўмоўнай археолёгічнай тэрмінолёгіі, а опэруем паняцьцямі, якія маюць больш глыбокі сэнс.

На рубяжы IX і X стагодзьдзяў мы можам зьвярнуць увагу на два здарэньні ў жыцьці радзімічаў—гэта колёнізацыя чарназёму і стыканьне з норманамі. Гаворачы аб колёнізацыі, мы маем на ўвазе вынікі раскопак Сьпяранскага (205) у Рыльскім пав. на Свапе і Самаквасава (191) і Рыкава (185) у Гочаве на Псьле. Воронеж б. Глухаўскага пав. можна таксама разглядаць як адзін з этапаў радзіміцкай колёнізацыі, але падрабязна гаварыць аб ім цяжка з прычыны няпоўнасьці апублікаваных даных (1).

Вынікаў раскопак Ераменкі ў б. Елецкім пав. Арлоўскай губ. мне ў архэолёгічнай літаратуры знайсьці не ўдалося—ёсьць толькі глухія весткі ў Сьпіцына (207), паўтораныя потым Рыкавым (185) і Гоцье (58). З асабістых гутарак з дасьледчыкамі, якія праводзілі архэолёгічныя працы ў Елецкім пав. (К. Я. Вінаградавым і Ткачэўскім) удалося высьветліць, што ім радзіміцкія старажытнасьці ў тых месцах невядомы і Елецкі музэй іх ня мае.

На падставе напоўмітычных елецкіх знахадак, Ю. В. Гоцье было выказана дапушчэньне аб далёкім прасоўваньні радзімічаў на ўсход, у вадазбор верхняга Дону. З прычыны няйменьня праверaных фактычных даных далучыцца да гэтага дапушчэньня нельга, хаця нічога непраўдападобнага ў ёй няма. Не адважваючыся датаваць варонескіх' радзімічаў, адносна Гочава і Студзёнак, можна намеціць наступны час колёнізацыі: IX-X ст. для першага і X-XI ст. для другога.

Калі ў пытаньні аб датаваньні вялікага разыходжаньня з іншымі дасьледчыкамі няма, дык яно назіраецца пры азначэньні напрамку колёнізацыі. У разьдзеле аб гаспадарцы ўжо адзначалася, што радзімічы ішлі з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Падам з гэтай прычыны думку П. С. Рыкава, які аб гочаўскім магільніку піша: „...можна думаць, што гэта племя (радзімічы) не замкнулася ў вызначаных для яго летапісам граніцах і займаючы ў больш даўнюю эпоху Калускую, Разанскую і Тульскую губ. (паўднёвыя іх часткі) магло пазьней захаваць свае паселішчы і на ўсход ад Іпуці—у напрамку да стэпу..." (185).

Такім чынам, радзімічы ў Гочава ніадкуль ня прыходзілі, гэта іх амаль ці не спрадвечнае месца жыхарства.

Ня маючы ніякіх даных аб старажытных паселішчах радзімічаў ні ў Разаншчыне, ні ў Тульшчыне, прымаць дапушчэньне Рыкава нельга. Наадварот, рад акалічнасьцяў гаворыць супроць гэтага дапушчэньня. І ў Гочаве і ў Студзёнках ёсьць пласткаватыя грыўні, характэрныя для паўночнага лясістага і малазямельнага раёну, што дазваляе дапускаць рух іменна з тых раёнаў, бо нідзе па суседзтву з Гочавым, або Студзёнкамі такога тыпу няма ні ў северан, ні ў радзімічаў.

Колёнізацыя ідзе па найбольш кароткай дарозе ў найбольш чарназёмныя ўрадлівыя раёны. Колёніі хутка губляюць сувязь з мэтраполіяй і жывуць сваім асобным жыцьцём. Гэты разрыў добра ілюструецца эволюцыяй сяміпраменных вісочных колцаў у Гочаве. У найбольш старых пахаваньнях з трупаспаленьнем (напр., курган № 260 па нумарацыі Самаквасава) тып вісочнага колца вельмі блізкі да таго, які нам знаёмы па шматлікіх знахадках на тэрыторыі радзімічаў (табл IV, 14 і 15).

Больш позьнія пахаваньні з звычайным трупапалажэньнем на горызонце (курганы №№ 55 і 56) даюць далейшую эволюцыю гэтага тыпу, якая значна аддаляецца ад арыгіналу: праменьні, што канчаюцца галачкамі, зьмяняюць свой выгляд на нязграбныя шырокія лопасьці, значна ўскладняецца орнамэнт.

Разьвіцьцё тыпу на асноўнай тэрыторыі і ў Гочаве ідзе па шляху дывэргенцыі, што можа быць вытлумачана стратай культурнай сувязі з мэтраполіяй хутка пасьля перасяленьня. Радзімічы ў Гочаве апынуліся ўкропленымі ў северанскія элемэнты (сьпіральныя, вісочныя колцы і інш.), але Рыкаў, аргумэнтуючы сваё дапушчэньне, лічыў насельніцтва Гочава аднародным. І нават больш таго, прылічваў да радзімічаў і шэраг суседніх северанскіх магільнікаў, лічачы ў беларускай групе (раскопкі Самаквасава, 188) 19 северанскіх і 66 іншых пахаваньняў, разумеючы пад іншымі радзіміцкія.

Калі-б гэта было так, дык гэтым у значнай меры абвяргалася-б як расьсяленьне радзімічаў, так і колёнізацыя ў тым выглядзе, як гэта пададзена мною. Крыніцай погляду Рыкава, напэўна, трэба лічыць работы Самаквасава (187) аб северанах, у якіх апошнім прыпісваліся ўсе курганы Пасэйма і Падзясеньня, апрача 66 беларускіх і падобных да іх. Але іменна гэтыя курганы з пахаваньнем на горызонце і даюць нам так званыя северанскія вісочныя колцы і іншы інвэнтар. Рэакцыяй супроць поглядаў Самаквасава было прызнаньне гэтых сьпіральных вісочных колцаў агульнымі для ўсіх северан, а розьніца ў пахавальных абрадах тлумачылася выключна эволюцыяй у часе. Пры такім агульным разглядзе мясцовыя індывідуальныя асаблівасьці ігнараваліся і не заўважаліся дасьледчыкамі, і атрымоўвалася ўяўленьне аб монолітным северанскім племені.

Тым часам аналізам архэолёгічнага матар'ялу з улікам і хронолёгічнай і географічнай розьніцы гэта монолітнасьць разбураецца. Для больш раньняга часу характэрна няроўнамернае пакіданьне абраду пахаваньня на слупох (раней за ўсіх ад урн на слупох да урн у кургане перайшло насельніцтва Сэйму і ніжняй Дзясны), а для эпохі X—XIII ст. даволі выразна намячаюцца тры раёны, якія ў асноўных рысах адпавядаюць граніцам княстваў Чарнігаўскага, Пераяслаўскага і Ноўгарад-Северскага.

Першы раён з пахаваньнем у глыбокіх і вузкіх ямах з вельмі небагатым інвэнтаром можа быць акрэсьлены лініяй: Любеч—Старадуб—Ноўгарад-Северскі—Канатоп—Рамны—Чарнігаў—Любеч. Для другога раёну характэрны няглыбокія (да $^1/_3$ мэтра) ямы, дробныя зярнёвыя пацеркі і вісочныя колцы з імі, сэрдолікавыя сфэрычныя пацеркі і інш. Яго межы: Пераяслаў—Рамны—Гадзяч—Ахтырка—Пераяслаў.

Нарэшце, трэці, найбольш усходні раён, ахапляе Рамны—Пуціўль—Варонеж—Рыльск—Суджа—Ахтырка—Гадзяч—Рамны. Для яго толькі і характэрны северанскія вісочныя колцы, пахаваньні

на горызонце і багаты інвэнтар. І Гочава і беларускі магільнік уключаны ў гэты раён. Калі прызнаць беларускую групу радзіміцкай, дык, захоўваючы лёгічную пасьлядоўнасьць, мы будзем прымушаны далучыць да радзімічаў і ўвесь гэты ўсходня-северанскі раён, для чаго ніякіх даных у нас няма. У Гочаве радзімічы і севяране рэзка адрозьніваюцца друг ад друга (хаця ёсьць і нэўтральныя пахаваньні), але ні ў беларускай, ні ў іншых групах гэтага раёну мы ніякіх уласна радзіміцкіх элемэнтаў ня бачым. Факты прымушаюць абмежаваць радзіміцкія паселішчы на тэрыторыі севяран вузкай палосаю, якая ідзе ад Варонежу да Рыльску і Гочава.

Умовы жыцьця на берагох Псла былі зусім іншымі, чым на Сажы або Бесядзі. Чарназём, блізкасьць стэпу з выцякаючымі адсюль вынікамі і суседзтва з неславянскімі культурамі (ад Гочава ўсяго толькі 80 вёрст да Салтава, 20), добрыя глебавыя і кліматычныя ўмовы, вялікая колькасьць жывёлы, якая ішла са стэпу, дазволілі пасяленцам атрымоўваць большую колькасьць дадатковага продукту, чым на паўночным захадзе. Неабходнасьць сталай абароны з боку стэпу ўзмацніла процэс вылучэньня воінаў. Калі Студзёнкі, далёкія ад граніцы, не даюць нам вайсковых элемэнтаў, дык Гочава вытрымае параўнаньне з Гнёздавым і магільнікамі Прыладажжа; сякеры, коп'і стрэлы, шаблі, якія ішлі, відавочна, ад суседніх аланаў, ёсьць там у вялікай колькасьці.

Пазьней, у XII-XIII ст., Гочава, як і рад іншых пагранічных славянскіх пунктаў (напр. Ніцаха), успрыймае рад стэпавых элемэнтаў, як біконічныя вісочныя колцы, якія ўмоўна называюцца „асецінскімі" і інш. У сувязі з паскарэньнем процэсу клясавай дыфэрэнцыяцыі; Гочава хутчэй падпала хрысьціянізацыі. Зусім магчыма, што такі прыгранічны пункт зрабіўся даволі рана об'ектам увагі чарнігаўскіх або северскіх князёў, якія імкнуліся абярнуць мясцовую дружынную праслойку ў сталыя гарнізоны.

Мяркуючы па жаночых пахаваньнях, радзімічы ў Гочаўскім вялізарным магільніку выступаюць шматлікай, але якасна роўнай групай. Хуткае выпаданьне паўднёва-ўсходніх колёній з агульна-пляменнага жыцьця не дазваляе спыняцца на іх даўжэй.

Вяртаючыся ад стэпавага рубяжа славянскага сьвету да асноўнай тэрыторыі радзімічаў, мы застаем там у канцы IX стагодзьдзя новыя дзейныя сілы. Пад 883 г. летапісцам занатавана наступнае апавяданьне: „Посла Олегъ къ радимичамъ рька: „Кому дань даете". Они же рѣша: „Казаромъ".— и рече имъ Олегъ: „Не дайте казаромъ, но мнѣ дайте". И въдаша Ольгови по щьлягу, якоже казаромъ даяху".

Пры аналізе гэтага адрыўку перш за ўсё кідаецца ў вочы нязвычайнае падабенства з апавяданьнем аб накладаньні даніны Сьвятаславам на вяцічаў. Уся конструкцыя абодвух адрыўкаў аднолькавая, за выключэньнем выпаданьня некаторых дробязяў (як адзінка абкладаньня) у першым. Ня гледзячы на тое, што вяціцкі адменьнік сьледуе „Повести временных лет" пасьля радзіміцкага, па часу складаньня ён зьяўляецца папярэднім, бо, паводле досьледаў акадэміка Шахматава, ён уваходзіць у склад кіеўскага збору 1039 году. Запазычаньне Нестарам формы апавяданьня аб заваяваньні вяцічаў для перадачы падначаленьня кроўных ім радзімічаў не падлягае сумненьню. Ня гледзячы на тое, што ўжо даўно адзначалася штучнасьць, з якой скампанаваны паведамленьні аб перамогах Алега (у кожны год па аднаму племені—драўляне, севяране, радзімічы), руская гісторыяграфія яшчэ доўга глядзела на яго, як на „зьбіральніка" рускай зямлі, недалёка адыходзячы пры гэтым ад поглядаў манаха летапісца, які запаўняў прагаліну ў гісторыі гэтымі паходамі, прыдаючы ім тэндэнцыйнае значэньне (...и бѣ обладая Олег...).

Зразумела чакаць у даным выпадку хронолёгічнай дакладнасьці нельга, ды і ня так ужо важна, ці была сустрэча радзімічаў з Алегам іменна ў 883 г.; важна тое, што летапісец мог адбіць (хай у скажоным выглядзе) рэальны факт—факт нападу нарманскай дружыны на радзімічаў у канцы IX стагодзьдзя.

Паступовае працяканьне процэсу росту мясцовай арыстократыі было ў значнай ступені парушана новымі падзеямі. Ператварэньне тэрыторыі радзімічаў у воласьць, з якой зьбіраюць палюдзьдзе кіеўскія князі, з аднаго боку, аслабіла пачынаўшае ўзьнікаць мясцовае магнацтва, перабіваючы ў яго эксплёатацыю земляробчага насельніцтва, а з другога боку, міжнародныя гандлёва-драпежныя паходы русаў адчынілі для радзіміцкіх ваякоў шырокую дарогу, у якасьці дружыньнікаў кіеўскага князя, удзельнічаць у іх опэрацыях. Доказы гэтаму мы бачым праз дваццаць год, у 907 г., калі радзімічы прымаюць удзел у паходзе Алега на Канстантынопаль, які даў удзельнікам яго вялікую здабычу ў выглядзе патрабаванай у грэкаў контрыбуцыі.

Зьяўленьне ворагаў на міжнароднай арэне зрабіла некаторую нівэліроўку ўнутры радзіміцкай зямлі, ці адцягваючы соцыяльныя вярхі ў Кіеў, ці спусташаючы яе палюдзьдзем.

Праўда, к X ст. для радзімічаў адчыніўся рынак для збыту ляснога тавару (коноксілы), але цяжка вырашыць, наколькі загатоўкі гэтых аднадрэвак былі для іх дабраахвотнымі, а не зьяўляліся адным з відаў натуральнага падатку.

Патрэбна было цэлае стагодзьдзе, каб радзімічы далі адпор настолькі значны, што апавяданьне аб ім трапіла на старонкі кіеўскага летапісу (больш дробныя былі, напэўна, і раней, але прыходзілі незаўважанымі).

Пад 984 г. мы чытаем у летапісе ўжо вядомае з папярэдняга разьдзелу апавяданьне аб паходзе Воўчага Хваста на радзімічаў.

Вельмі часта пешчанская бойка расцэньваецца як паўстаньне радзімічаў, а самы паход— як своеасаблівая карная экспэдыцыя, пасланая Уладзімірам для задушэньня рэволюцыі. Іменна такія словы, як „бунтаўшчыкі", „рэволюцыя" ўжываюцца гісторыкамі ў сувязі з пешчанскім выпадкам. Кастамараў (106) ідзе нават далей, ён лічыць, што калі-б Кіеў не даваў некаторага

самакіраваньня пляменьням, дык можна было-б чакаць паўстаньня цэлай фэдэрацыі пляменьняў (цьверцы, дулебы, радзімічы, вяцічы, драўляне). Але, зразумела, пераносіць у X ст. паняцьці, якія ўзьніклі ў 60-х гадох XIX ст., таксама неасьцярожна, як і наогул ужываць тэрмін рэволюцыя для пагранічнай сутычкі з зьбіральнікамі даніны.

Тыя, хто гавораць аб радзіміцкім паўстаньні, выходзяць з думкі, што ўся руская зямля была сабрана Алегам у нейкі компактны палітычны організм, упускаючы тое, што ў эпоху Алега ўся „дзяржаўнасьць" абмяжоўвалася толькі адбіраньнем у насельніцтва дадатковага продукту, няпрыкрытым ніякімі дадатковымі інстытутамі.

Часам спрабавалі падаць паход Воўчага Хваста як імкненьне, перамогшы радзімічаў, замацаваць за Кіевам шлях „з варагаў у грэкі" (154); адказ на гэта ўжо быў дадзены.

Паход кіеўскай дружыны ў зямлю радзімічаў малюецца не як сродак аднавіць парушаную палітычную раўнавагу, а як спосаб набраць чэлядзі, забраць мёд, воск і скуры.

Такія паходы, напэўна, утвараліся не адзін раз на працягу таго стагодзьдзя, якое падзяліла паходы Алега і Уладзіміра, і, магчыма, што гэтыя паходы і раней сустракалі адпор з боку радзімічаў, але хутчэй за ўсё пасыўны („затворишася в граде"), і толькі к канцу X ст. кіеўскім конвістадорам быў зроблены організаваны адпор, як відаць, больш актыўнага характару.

Той факт, што летапіс маўчаў аб папярэдніх паходах—палюдзьдзях і падрабязна апісаў толькі падзеі 984 г., часткова можа быць вытлумачаны і асабістым знаёмствам летапісца з удзельнікамі пешчанскай бойкі (доказы ў папярэднім разьдзеле).

Рэчка Пешчань (Пѣщань, Пищань—як відаць фонэтычны запіс слова Песчань) зьяўляецца правым прытокам Проні і ўпадае каля Прапойску. Такім чынам, ваенныя дзеяньні былі на самай граніцы радзіміцкіх паселішч.

Конкрэтызуючы ўмовы паходу, адзначым шлях кіеўскага войска. Хадакоўскі (250) дапускаў, што падначаленьне радзімічаў адбылося па рэчцы, але згадзіцца з ім нельга: маршрут па Сажы стратэгічна быў-бы нявыгодны, бо кіеўлянам давялося-б праплысьці скрозь усю тэрыторыю радзімічаў, каб дасягнуць Прапойску. Калі возьмем пад увагу, што на радзімічаў Уладзімір адправіўся пасьля паходу на ятвягаў, дык стане зусім зразумелым, што Воўчы Хвост пачаў наступ з паўночнага захаду, дзе яго і сустрэла каля самай граніцы радзіміцкае ратніцтва. Радзімічы пабеглі ад кіеўскага войска. Вынікам перамогі кіеўлян было тое, што цяпер радзімічы абавязаны былі везьці павоз.

Грушэўскі не згаджаўся бачыць у Воўчым Хвасьце ўласнае імя ваяводы, а прапанаваў лічыць, што гэта „...звичайний вовчій хвіст", якім дражнілі радзімічаў. Паўторнае ўспамінаньне імя гэтага начальніка войска ў 1015 г., калі ён, служачы Сьвятаполку, лаяў ваякоў Яраслава цесьлярамі, зусім не дапускае хістаньняў.

Цікавым матар'яльным помнікам пешчанскай бойкі зьяўляецца пахаваньне ваякі ў панцыры з ножыкам у хутарале і з сякерай у Карме-Пайцы (кург. № 20) (242). Радзіміцкі магільнік каля Кармы-Пайкі ляжыць у 15-ці км ад Пешчані ўглыб радзіміцкай тэрыторыі, што зусім згодна з іх уцёкамі з поля бойкі. Думаю, што забітага кіеўскага дружыньніка ня сталі-б хаваць на мясцовых могілках; такім чынам, у гэтым ваяку можна бачыць аднаго з супрацоўнікаў Воўчага Хваста. Дата курганоў—X-ст. не супярэчыць гэтаму.

Пасьля паведамленьня аб пешчанскай бойцы летапіс нічога ня кажа аб радзімічах. Толькі амаль праз два стагодзьдзі мільгане вестка аб радзімічах, але і то толькі ў географічным сэнсе (1169 г. „...бѣжа (Владимир Мстиславич) к Дорогобужю; ту же бѣ и жена его бѣжала перед ним. Андреевичѣ же перемета мостъ на Горинъ и не спусти его къ собе, а онъ уворотяся на Радимичѣ къ Андрееви Суждалю...") (121).

Паход 984 г. канчаткова, ня толькі дэ-факто, але і дэ-юрэ, абярнуў тэрыторыю радзімічаў у колёнію Кіева з больш ці менш рэглямэнтаванымі павіннасьцямі.

Далейшая палітычная гісторыя радзіміцкай тэрыторыі ёсьць толькі гісторыя зьмены ўладароў гэтай колёніі і не зьяўляецца цікавай. Падпарадкуючыся спачатку Кіеву, з абасабленьнем левабярэжжа, радзімічы пераходзяць у сталае падначальле чарнігаўскаму князю. Пачатак аўтономізацыі Чарнігава (калі ня браць у разьлік гіпотэтычных пабудоў аб князі Чорным) кладзе Мсьціслаў Тмутараканскі пачаткам свайго княжаньня ў 1024 г. і канчаткова замацоўвае дагаворам пасьля Ліственскай бойкі 1026 г.: „и раздѣлиста и по Днѣпръ Рускую землю: Ярославъ прия сію страну, а Мстиславъ ону" (121).

Пасьля сьмерці Мсьціслава Северская зямля ізноў пераходзіць да Кіева і толькі пасьля Яраслава Чарнігаў мае асобнага князя Сьвятаслава Яраслaвіча (1054—1076). На любецкім зьезьдзе абасабляецца Ноўгарад-Северскае княства (Алег), паўночна-заходняя граніца якога была, знаць, абумоўлена расьсяленьнем радзімічаў. З XI ст. радзімічы і вяцічы шчыльна зьвязаны з Чарнігаўскім князем адміністрацыйна, хаця, зразумела, апошні быў зацікаўлены ў іх, а не наадварот. (Параўнай у Грушэўскага: „Всі засоби чернигівської династії й чернигівського боярства були на півночі, в старій землі Родимичів і ще більше в землі Вятичів", 62, стар. 108). Абы-якія адносіны гэтых колёній да таго, хто будзе зьбіральнікам даніны, добра выразілі вяцічы ў сваім адказе Давідавічам у 1146 г.: „Вы нашы ўсе государы і нам роўныя; хто намі ўладае, таму мы і пакорныя" (Тацішчаў, П.; 225, стар. 298).

Аб узаемаадносінах радзімічаў з кіеўскімі і чарнігаўскімі князямі ў XI ст. гістарычныя помнікі захоўваюць поўнае маўчаньне. Сёе-тое можа даць толькі інтэрпрэтацыя археолёгічных фактаў, якія зьявіліся адзінымі крыніцамі нашых ведаў аб унутраным жыцьці радзімічаў гэтага пэрыоду.

Да XI ст. могуць быць аднесены тры археолёгічныя „колёніі“ радзімічаў, закінутыя далёка за межы пляменнай тэрыторыі—Няжылавічы, Ліплява і Палтава. У магільніку каля Няжылавіч (Радамысьльскага пав.) было раскапана некалькі курганоў з пахаваньнем на горызонце (14). Два курганы (№№ 3 і 4) далі, бязумоўна, радзіміцкія рэчы—сяміпраменныя вісочныя колцы (аўтар раўняе іх з „маскоўскім“, г. зн. вяціцкім тыпам, але дадае, што яны адрозьніваюцца лопасьцямі, якія звужаюцца і канчаюцца галачкамі). У адным выпадку сяміпраменныя былі надзеты на жанчыне і знаходзіліся ў абкружэньні іншых жаночых аздоб, а ў № 3 пахаваньне было мужчынскае, і вісочнае колца знаходзілася побач з сякерай.

Апошняя акалічнасьць гаворыць за тое, што радзіміцкія рэчы, трапіўшы ў гэты край, стра-цілі характар толькі жаночых аздоб, але і нейкім чынам насіліся і мужчынамі, напэўна, не радзімічамі. Мяркуючы паводле абраду пахаваньня, датаваць можна XI стагодзьдзем.

У сяле Ліпляве на беразе старарэчышча Дняпра ня раз знаходзілі (150, 151) такія бытавыя рэчы, як прасьліцы, пражкі, грабенчыкі і жаночыя аздобы—падвескі, пацеркі, бранзалеты курганныя



Карта № 11.

1 ╳ 3 вісочныя колцы. (Азнаямленьнем з характарам рэчаў я абавязан ласкавасьці А. А. Сьпіцына, які даў мне замалёўкі). Характар большасьці рэчаў паказвае на севяран, дакладней на паўднёва-заходні пераяслаўскі адменьнік іх. Але што асабліва цікава для нас, там ёсьць і радзіміцкія сяміпраменныя. Большасьць знахадак можа быць датавана XI-XII ст.

І, нарэшце, у Палтаве на Старой Плошчы ў 1905 г. былі знойдзены пры невядомых абставінах севяранска-радзіміцкія рэчы (132)—сьпіральныя вісочныя колцы (усходнія севяране), бранзалеты і сяміпраменныя радзіміцкія вісочныя колцы. Датаваць іх можна XI стагодзьдзем.

Такім чынам, мы атрымліваем радзіміцкі інвэнтар, выкінуты з асноўнай тэрыторыі пашырэньня на сотні вёрст—ад Няжылавіч да радзіміцкай зямлі па простай лініі 200 вёрст, ад Ліплявы 280 і ад Палтавы 320 (карта 13).

Ніякіх злучальных прамежкавых пунктаў (як напр., для Гочава: Студзёнкі і Варонеж) мы ня маем. Нявольна паўстае пытаньне аб прычынах, пад уплывам якіх радзімічы (дакладней, радзімічкі) апынуліся тут. Калі ісьці па лініі найменшага супраціўленьня, дык найбольш лёгкім будзе тлумачэньне пры дапамозе колёнізацыі, але цэлы рад меркаваньняў прымушае ад такога тлумачэньня адмовіцца. Дата рэчаў XI-XII ст., і нічога, што паказвала-б на больш старажытнае, няма; месцы знахадак ляжаць на граніцы славянскай тэрыторыі—вось асноўныя пярэчаньні. Могуць сказаць, што

ёсьць яскравы прыклад існаваньня радзімічаў на пагранічны ў XI і ў XII ст.—Гочава. Але справа ў тым, што ў Гочаве мы маем цэлы гарадок, які ўзьнік задоўга да XI стагодзьдзя і да гэтага часу значна ўзмацнеў.

XI стагодзьдзе ў гісторыі северанскай зямлі (на якой ляжаць Ліплява і Палтава), ды і ў гісторыі значнай часткі прыдняпроўскага славянства, зьяўляецца пачаткам доўгай барацьбы з новымі хвалямі вандроўнікаў — полаўцамі. Паступовая здача позыцый, адыход на поўнач, пэрыодычныя разгромы Пераяслаўскага княства характэрны для гэтага часу (49,126). Тэатр ваенных дзеяньняў ужо не абмяжоўваўся берагамі Сулы і Ворсклы—у 1068 г. полаўцы падыходзяць да Снові (у яе ніжняй частцы), а ў 1096 г. Боняк грабіць ваколіцы Кіева.

Дапускаць на фоне гэтых падзей мірную земляробчую колёнізацыю земляў, якія ўжо апынуліся за рубяжом, колёнізацыю, якая ішла з берагоў Сажа і Іпуці насустрач палавецкім войскам, зразумела, немажліва. Трэба шукаць іншых тлумачэньняў, з якіх найбольш праўдападобным мне здаецца гандаль нявольнікамі. (Больш падрабязна гэта пытаньне я разьбіраю ў артыкуле, зданым у друк у „Трудах ГАИС").

Даводзіць значаньне гандлю нявольнікамі, які ў дастатковай ступені дапамагаў бліскучаму разьвіцьцю такіх цэнтраў як Кіеў, ня прыходзіцца. Аўтары ўсіх твораў аб старажытнай Русі, ад візантыйцаў і арабаў да кіеўскіх манахаў, ня раз падкрэсьліваюць значаньне гандлю нявольнікамі.

Шырокі сусьветны рынак быў адчынены кіеўскімі князямі для збыту славянскіх нявольнікаў і, галоўным чынам, нявольніц. Жанчыны былі найбольш каштоўным вывозным таварам.

У IX-X ст. гандаль нявольнікамі насіў міжнародны характар; славянскімі нявольніцамі гандлявалі і ў Волскай Балгарыі і ў Ітылі, у Хэрсонэсе і Канстантынопалі, Празе, Александрыі і г. д.

У XI ст.—некаторы заняпад арабскага гандлю, рад прычын унутранага парадку, але галоўным чынам гаспадары стэпу полаўцы ў корані зьмянілі формы гандлю нявольнікамі. Ён пайшоў транзітам праз полаўцаў. Гандлёвыя экспэдыцыі саміх князёў патрабавалі цяпер супольнага выступленьня ледзь ня ўсіх прыдняпроўскіх князёў і былі справай вельмі грамоздкай.

Тымчасам аб штогодным гандлі з полаўцамі мы маем весткі. Размах гандлёвых экспэдыцый скарачаўся, але гэта зусім ня значыла скарачэньне вывазу нявольніц. Новым было толькі тое, што кіеўскім або чарнігаўскім князям даводзілася прадаваць свой тавар ня ў Корсуні і не ў Канстантынопалі, а на граніцы свайго-ж княства.

Вось гэтыя месцы пагранічных стаянак для гандлю нявольнікамі і адзначаны археолёгічнымі знахадкамі ў Ліпляве і Палтаве. У X стагодзьдзі кіеўскія князі мелі рэзэрвы жывога тавару на пэрыфэрыі; для эпохі Ўладзіміра такія рэзэрвы летапіс паказвае ў Вышгарадзе, Белгарадзе, Родні, Бяроставе (48). Вельмі цікава пераемная сувязь пунктаў хаваньня жывога тавару і пазьнейшых пагранічных торжышч: Няжылавічы ляжаць у раёне Белгараду, а Ліплява амаль супроць Княжай Гары, у якой, калі меркаваць паводле летапісу, можна бачыць Родню „... затворися (Ярополк) въ градѣ Роднѣ на устьи Рьси").

Канеў, паблізу якога знаходзіцца Родня, ня раз быў месцам зьбіраньня гандлёвых караванаў рускіх князёў (1168 г., 1170 г.) і месцам нарады з полаўцамі.

Могуць сказаць, што радзіміцкія нявольніцы былі прывезены ў гэтыя месцы не князямі, а полаўцамі. Адказам на гэта будзе паказаньне, па-першае, на значную лясістасьць радзіміцкай зямлі, якая абцяжарвала доступ вандроўнікам, а таксама на тое, што адзін раз полаўцы падыйшлі да граніцы радзімічаў пад Старадубам у 80-х гадох XI ст., ды і то былі разьбіты Манамахам. З другога боку, мы маем сьведчаньні, што насельніцтва пакутвала ад сваіх, славянскіх дружыньнікаў ня менш, чым ад стэпавікоў: „и тако бысть пагуба... ово отъ половець, аво же отъ своихъ пасадникъ" (1138 г.).

Аб тым, што князі зусім не саромеліся прадаваць „челядь свою в погань" кажа ня толькі навучальная літаратура, але і фразы саміх князёў, накшталт такой: „Оже ны ся не прѣдасте, д а м ы в ы п о л о в ц е м ъ н а п о л о н ъ", сказанай Сьвятаславам Усеваладавічам выраўцам у 1147 годзе (Іпацеўскі летапіс). Такім чынам, падагульняючы ўсе гэтыя факты, мы бачым, што чарнігаўскія князі XI стагодзьдзя, якія хадзілі ў палюдзьдзе, працягвалі вывозіць радзімічаў, перапрадаючы іх полаўцам, або ў Палтаве, або блізка Родні (пытаньне аб Няжылавічах канчаткова вырашана быць ня можа).

Аднак, найменаванымі пунктамі сьпіс археолёгічных „колёній" радзімічау не абмяжоўваецца: 2 сяміпраменныя XI ст. знойдзены пры раскопках Уварава ў магільніку каля сяла Кубаева, б. Юр'еўскага пав. (234). Мяркуючы па карце, дадаанай да працы Уварава, у гэтай курганнай групе былі знойдзены спаленыя касьцякі.

На жаль, знаходка стаіць вельмі адзінока, а адсутнасьць справаздач аб раскопках канчаткова аднімае мажлівасьць азначыць этнічны склад кубаеўскай групы.

У даным выпадку прыцягваць у якасьці тлумачэньня гандаль нявольнікамі няма ніякіх падстаў; самае большае, аб чым можна гаварыць, гэта аб паланеньні суздальскімі або растоўскімі князямі, але і для гэтага даных надта мала.

Адносна Растова-Суздальскай тэрыторыі можна вельмі ўпэўнена гаварыць аб колёнізацыі і іменна аб крывіцкай колёнізацыі. Сувязь міжрэчча Акі і Волгі з Смаленшчынай, якая ўстанаўліваецца гісторыкамі (Гоцье, 58) для X—XIII ст., бліскуча пацьвярджаецца археолёгічнымі матар'яламі.

Азначэньне часткі наўгародзкіх уліваў (можа быць больш раньніх, чым смаленскія) зьяўляецца задачай больш дэтальных аналізаў.

Крывіцкая „экспансія“ магла захапляць паўночныя прымежжы радзімічаў і вяцічаў, цягнучы іх на паўночны ўсход. Доказам могуць служыць знахадкі радзіміцкіх і вяціцкіх вісочных колцаў на тэрыторыі, колёнізаванай крывічамі.

Паміж тэрыторыямі крывічоў і радзімічаў мы маем права чакаць прымежкавых зьвеньняў; для вяцічаў такімі могуць быць знойдзеныя ў г. Кіржачы (як відаць, на месцы старажытнага гарадзішча) вяціцкія зігзагавыя пярсьцёнкі (захоўваюцца ў Кіржацкім музэі), а для радзімічаў знахадка сяміпраменнага вісочнага колца ў вадазборы р. Устры (весткі аб апошнім атрыманы ад К. Я. Вінаградава, які рабіў там раскопкі).

Той факт, што радзімічы (як відаць, з паўночнага пагранічча) прынялі невялікі ўдзел у колёнізацыі вадазбору Клязьмы, не павінен здавацца дзіўным, калі мы ўспомнім, што 150—200 год назад



Карта № 12.

гэтыя-ж раёны вылучалі колёністаў у Гочава, чаго нельга ўжо было зрабіць у XI-XII ст., калі гочаўская колёнія ўжо страціла сувязь з мэтрополіяй і шляхі на паўднёвы ўсход рабіліся ўсё больш небясьпечнымі.

Перш чым перайсьці да разгляду далейшай гісторыі радзіміцкай тэрыторыі, якая адводзіць нас да вывучэньня саміх радзімічаў у бок міжкняжацкіх адносін, лічу патрэбным адзначыць як узаемаадносіны радзімічаў з суседнімі пляменьнямі, так і культурныя ўплывы, якія ішлі да іх.

Кроўнасьць радзімічаў і вяцічаў у гістарычны час можа быць азначана толькі па спадчыне, вынесенай абодвума пляменьнямі з таго пэрыоду, калі яны знаходзіліся ў больш цесных адносінах паміж сабою і былі об'ектам адных і тых-жа культурных уплываў.

Сувязь паміж імі ў пэрыод X-XI ст. ні па гістарычнаму, ні па археолёгічнаму матар'ялу прасочана быць ня можа. Нават цеснага суседзтва мы не назіраем, што ў значнай меры тлумачыцца ляснымі масывамі па берагох Дзясны ад Бранску да Ноўгарад-Северскага (Болдыж-лес). І толькі на поўнач ад гэтых масываў, за межамі Брынскіх лясоў (на захад ад іх) у Рослаўскім раёне назіраецца нейкая гэбрыдзкая культура, дзе радзіміцкія біэліпсоідныя спалучаюцца з адменьнікам сямілопасных. Гэты раён (вышнявіны Дзясны і Болвы), адносна радзімічаў найбольш паўночнаўсходні, характарызуецца значным процантам насычанасьці крывіцкімі элемэнтамі.

Сьляды пагранічнага радзіміцкага ўплыву можна бачыць у напоўвяціцкай курганнай групе каля Колчына на Болве, але гэта пакуль адзінічны факт. Аднак, трэба зрабіць агаворку, што параўноўваць археолёгічны матар'ял радзімічаў і вяцічаў даволі цяжка, бо вяцічаў мы пачынаем ведаць

толькі з таго моманту, калі радзімічы ўжо не даюць нічога з XII стагодзьдзя; такім чынам, да пляменнай розьніцы дадаецца розьніца хронолёгічная.

Трохі больш жывыя зносіны мы назіраем на поўдні. Радзіміцка-севяранскія сувязі дагэтуль разглядаліся, галоўным чынам, у аспэкце социяльным, у сэнсе падпарадкаваньня радзімічаў севяранскім фэўдалам, але ня менш цікавы і іншыя ўзаемаадносіны. Ужо адзначалася тое, што адзінства радзімічаў з севяранамі, якое адзначаецца летапісцам згодна традыцыі, да X—XI ст. рабілася ўсё слабейшым. Гандлёвы ўплыў севяран можна бачыць у пацерках-бразгульках, якія знаходзяць у паўднёвай частцы радзіміцкай тэрыторыі, звычайных для паўднёва-ўсходніх севяран.

Для эпохі зьмены „слупоў на шляхох“ курганамі, калі славянскае насельніцтва заходзіла далёка ў стэп, характарным зьяўляецца рух радзімічаў углыб севяранскай тэрыторыі.

Пазьней, калі стэпавыя прасторы пад націскам вандроўнікаў эвакуавала славянскае насельніцтва, заўважаецца адваротная зьява—рух севяран на радзіміцкую тэрыторыю, доказам чаго зьяўляюцца севяранскія курганы ў Людкаве. Цікава тое, што курганы належаць не чарнігаўскім севяранам, географічна найбольш блізкім (ёсьць і шлях уверх па Снові), а паўднёва-славянскім. Зразумела, нельга пераўвялічваць значэньне севяранскай іміграцыі да радзімічаў і маляваць ледзь ня цэлае перасяленьне народаў, наадварот, адзінічнасьць знахадкі гаворыць супроць масавасьці такой зьявы.

Больш магутным быў севяранскі форпост у раёне Старадубу, дзе найбольш багатыя пахаваньні (Левінка) ёсьць падставы прыпісаць севяранам па аналёгіі з Седневым. Але крыху незразумелым здаецца сьцьвярджэньне Сьпіцына, што Гомель і Чачэрск былі гарадамі севяранскімі. Ніякіх гістарычных падстаў для гэтага няма, а ўсе даныя археолёгіі гавораць адваротнае.

У апошні час П. А. Растаргуевым (171) (гл. карту 12), на аснове дыялектычных досьледаў, пытаньне аб севяранска-радзіміцкіх адносінах было пастаўлена на новы грунт. Ён устанаўляе асаблівую „северска-беларускую“ гаворку, лічачы насельніцтва, якое на ёй гаворыць, патомкамі севяран. Не закранаючы пытаньня аб тым, наколькі дапушчальна зьвязваць старажытныя пляменьні з сучаснымі дыялектамі, я дазволю сабе не згадзіцца з граніцамі тэрыторыі, акрэсьленай для севяран проф. Растаргуевым: Трубчэўск—Мглін—Сураж—Навазыбкаў—сярэдняя Сноў—Ноўгарад-Северскі. Хочучы ўзгадніць даныя дыялектолёгічныя з археолёгічнымі, аўтар у апошнім даверыўся аўторытэту Самаквасава, згодна погляду якога Навазыбкаў ляжаў ужо па-за ўсходнімі граніцамі радзімічаў, а вяцічы спускаліся ніжэй Мгліна.

Вядомае значаньне Старадубу, як тэрыторыі даўно заселенай севяранамі, адмаўляць нельга, але нельга адцягваць на карысьць севяран такія тыпова-радзіміцкія раёны, як сярэдняя Іпуць.

Заходнія суседзі радзімічаў дрэгавічы мелі з імі даволі ўстойлівую граніцу, стрыжанем якой быў Дняпро, але часта радзіміцкія пасёлкі сустракаюцца на правым дрэгавіцкім беразе і наадварот. Ніякіх прычын колёнізаваць суседнюю зямлю ні ў таго, ні ў другога племені ня было, бо ўмовы жыцьця і там і тут былі амаль аднолькавымі.

Як ужо адзначалася, з дрэгавіцкімі ювэлірамі былі гандлёвыя зносіны, што можна бачыць з праніканьня буйназярністых пацерак „менскага“ тыпу ў заходнюю частку тэрыторыі радзімічаў.

Вельмі цікава спроба Сербава (193). Ён па агульных адзнаках дрэгавіцкай культуры устанаўляе наступныя граніцы для іх (прапускаю паўночную, заходнюю і паўднёвую) на ўсходзе—Проня, балота Чыстая Лужа, Ухлясьць і Дняпро да вусьця Прыпяці.

Усё гэта, як ня трэба лепш, узгадняецца з данымі археолёгіі, але Сербаў бачыць дрэгавічоў і ў іншых, крыху нечаканых месцах: „На ўсход ад Проні паселішчы дрэгавічоў сустракаюцца ўжо рэдка, спорадычна, але нават каля верхавін Іпуці паселішчы гэтыя ізноў зьяўляюцца вузкай суцэльнай паласою, якая і губляецца недзе ў Бранскіх лясох“.

Гэты перарыў ён тлумачыць або прасоўваньнем радзімічаў уверх па Сажы, або пазьнейшым пасяленьнем кантаністаў у Чэрыкаўскім, Клімавіцкім і Мсьціслаўскім паветах.

Археолёгічнага пацьвярджэньня Бранска-Іпуцкія паселішчы дрэгавічоў сабе не знаходзяць. Агульнасьць матар'яльнай культуры ў сучаснасьці яшчэ не дае права аб'яднаць розныя раёны пад адным пляменным імем і прытым пад імем, якое памерла ў сярэдзіне XII стагодзьдзя.

На захаванасьць бытавых рысаў усходня-славянскіх пляменьняў зрабіла ўплыў архаічная сыстэма гаспадаркі, якая захавалася ў значнай ступені ў гэтых глухіх кутках.

Пераходзячы да ўзаемаадносін з крывічамі, трэба ўлічыць значныя колёнізацыйныя імкненьні гэтага племені. Не гаворачы ўжо аб тым, што ў сваім руху на паўночны ўсход яны маглі захапляць паўночных радзімічаў, яны нібы ўкліньваліся паміж пляменьнямі. Шчыльна мяжуючыся з дрэгавічамі—у раёне Менску, паўднёвая граніца крывічоў ідзе на ўсход, спускаючыся іншы раз языкамі: 1) па Дняпры паміж дрэгавічамі і радзімічамі, 2) па Дзясьне, падзяляючы часткова радзімічаў і вяцічаў, і, нарэшце, 3) ахапляе вяцічаў з усходу, падыходзячы да Мураму.

Дняпроўскія паселішчы крывічоў нешматлікія, але характэрны социяльным складам колёнізатараў: Лучын ужо адзначаўся як пункт найбольшага накапленьня каштоўнасьцяў у суседніх з радзімічамі тэрыторыях; раён Рэчыцы (Гарыводы) таксама насычаны і монэтамі і зброяй. Не закранаючы тых раёнаў, дзе крывічы жылі на занятай імі тэрыторыі (вышнявіны Дзясны і Болвы), адзначу іх праніканьне на поўдзень—Казарычы, Мярынаўка і Ларынаўка.

Ва ўсіх трох выпадках мы маем справу з курганнымі групамі, якія або выдзяляюцца заможнасьцю пахаваных (Казарычы), або якія суседзтвуюць з удзельнымі гарадамі—Мярынаўка каля Старадубу і Ларынаўка пад Ноўгарад-Северскім.

Гэта дае права паставіць пытаньне аб тым, ці не зьяўляліся гэтыя эмігранты з Смаленшчыны ня звычайнымі земляробамі, а гандлярамі ці рамесьнікамі? Адзінічнасьць крывіцкіх знахадак у кожнай курганнай групе гаворыць хутчэй за, чым супроць.

Гаворачы аб крывічох, у якасьці гісторыяграфічнай дэталі ўспомню аб тэорыі Мілюкова (139), які, капаючы курганы Разанскай губ., знайшоў магчымым прыпісаць сямілопасныя вісочныя колцы вяцічаў крывічом і, ведаючы аб сяміпраменных з Мсьціслаўскага пав., супаставіў іх з першымі. Такім чынам, у яго атрымаўся трыкутнік „усходніх крывічоў": Мсьціслаў—Валакаламск—Разань.

Ня большую каштоўнасьць мае і дапушчэньне Фурсава аб драўлянскай колёніі на берагох верхняга Сажа (Мазыкі), якое адыграла ролю ў аргумэнтацыі Пархоменкі (154) на карысьць левабярэжных драўлянскіх паселішч, што існавалі тут да прыходу з берагоў Каспійскага мора палян, радзімічаў, вяцічаў і севяран.



Карта № 13.

Мелькам акрэсьліўшы ўзаемаадносіны з непасрэднымі суседзямі, пяройдзем да разгляду ўплыву на радзімічаў больш разьвітых культур.

Зносіны з халіфатам, якія працягваліся здаўна, ужо не далі новых тыпаў рэчаў; працаваўшыя па арабскіх узорах (спрашчаючы іх), мясцовыя майстры даволі поўна абслугоўвалі радзіміцкае сялянства. Сьляды сувязі відаць толькі ў монэтах, прыбыцьцё якіх працягвалася да пачатку XI стагодзьдзя. Адносіны да Прыбалтыкі, высьветленыя раней з дапамогай гіпотэзы аб напластаваньні радзімічаў на літоўскую аснову (галоўным чынам, паводле пласткаватых грыўняў), маглі набыць у X-XI ст. форму транзітнага абмену праз Смаленск. Праўда, гэты гандаль вельмі проблематычны і цяжка назваць прывозам з Прыбалтыкі (можа быць крыжыкі?).

З X стагодзьдзя на археолёгічным матар'яле ўсходняга славянства пачынае адчувацца некаторы налёт візантыйскай культуры, у чым, напэўна, адыгралі ролю чарнаморскія колёніі накшталт Хэрсонэсу. Зьяўляючыся эквівалентам за чэлядзь, мёд і скуру, продукцыя цараградзкіх і корсунскіх ювэліраў асядала ў гарадох, у асяродзішчы княжацка-дружыннага пласта. Толькі потым, з разьвіцьцём у буйных цэнтрах рамяства, запазычыўшага тэхнічныя звычкі візантыйцаў, невялікая частка пачынае прасочвацца за межы гарадзкіх сьцен. Разгледжаныя ў разьдзеле аб гандлі кіеўска-візантыйскія рэчы сваёй колькасьцю ўжо гавораць аб нязначнай ролі візантыйскага ўплыву на сялянскую пераважна тэрыторыю радзімічаў. Нават візантыйскія ўзоры ня выклікалі пераймяньня ў мясцовых майстроў.

Тут я хацеў-бы спыніцца на аднэй рэчы, якая хаця і была ўспамянута ў ліку прывозных рэчаў, але праніканьне яе да радзімічаў праз гандаль трэба ўзяць пад пытаньне. Гутарка ідзе аб знойдзеным Сізовым (199) у Туравічах (кург. № 1) пярсьцёнку з грэцкім надпісам. Надпіс быў ласкава прачытаны па маёй просьбе проф. Н. І. Навасадзкім „ἐρῶ αηια (скажу: αηιαι); αηιαι—магічная формула, якая складзена з адных толькі галосных. Такія формулы часта сустракаюцца ў магічных папірусах, дзе нярэдка даюцца парады выразаць такія формулы на пярсьцёнках.

У славянскім матар'яле пярсьцёнак з грэцкай магічнай формулай сустракаецца, калі не памыляюся, упяршыню. Дапускаць выраб такіх пярсьцёнкаў з мэтай вывазу іх да славянскіх барбараў цяжка, ня толькі па нелёгічнасьці такога дапушчэньня, але і з прычыны адзінічнасьці знахадкі. Калі-ж яны не вырабляліся на вываз, дык усёроўна, везьці да славян пярсьцёнак, які ня мае ніякіх іншых вартасьцяў, апрача незразумелага надпісу, было-б дзіўна з боку візантыйскага гандляра. Хутчэй за ўсё, што гэта рэч магла быць набыта недзе на месцы. Для аб'ясьненьня напрашваецца наступны факт: у 907 годзе радзіміцкія ваякі былі з войскам Алега ў Грэцыі. Ёсьць некаторая частка праўдападобнасьці ў тым, што ў гэты або ў адзін з падобных паходаў (напр., 944 г.) недзе ў Візантыі быў набыты (можа быць у якасьці здабычы з забітага) гэты пярсьцёнак з магічнай формулай, прывезены далей у ваколіцы Чачэрску.

У сярэдзіне XII стагодзьдзя кіеўскі летапіс, ідучы за паходамі князёў, называе рад гарадоў, разьмешчаных або на тэрыторыі радзімічаў, або ў непасрэдным суседзтве з ёю. Падзеі, якія разгортваліся каля гэтых гарадоў, называць гісторыяй радзімічаў, зразумела, нельга. Сутычкі фэўдалаў друг з другам і, як вынік гэтага, замена ўладара таго ці іншага гораду або воласьці, племені, як гэткага, не зачаплялі. Гарады ніякага сваёго твару ня маюць; яны не формуюць ратніцтва, не вы-

ступаюць на вечы (летапісец, напрыклад, аб гэтым нічога не паведамляе). У знак падзякі князі абяцаюць сваім саюзьнікам такія радзіміцкія гарады, як Чачэрск (1157 г.), распараджаючыся горадам, як рухомай маемасьцю.

У XII ст. апошні раз мільгае на старонках летапісу пляменнае імя радзімічаў, і з гэтага-ж стагодзьдзя абрываецца гісторыя племені і пачынаецца гісторыя міжфэўдальнай барацьбы за права эксплёатаваць радзімічаў.

У гэтых адносінах цікава „гісторыя" Гомелю: у 1142 г. на Гомель, які належыць Ігару Алегавічу, нападае смаленскі князь Расьціслаў Мсьціславіч. Затым ён пераходзіць ва ўладаньне Ізяслава Давыдавіча, які з Гомелю хадзіў на вяцічаў, узяўшы ў іх Облаў. Пасьля сьмерці Ізяслава (1161 г.) уладаром Гомелю робіцца Сьвятаслаў Ольгавіч, але ўжо ў 1165 г. яго захапляе Сьвятаслаў Усеваладавіч і затым у кароткі прамежак часу горад пераходзіць спачатку да Алега Сьвятаславіча, вядомага няўдалымі набегамі на полаўцаў, а затым да героя „Слова аб палку Ігараве" — Ігара Сьвятаславіча.

Мал. 3.

Перастаўшы існаваць, як палітычны організм, хаця палітычная сувязь была заўсёды нядоўга трывалай (паслужыўшы, аднак, асновай пры першапачатковым плянаваньні княстваў), племя радзімічаў і пры новай соцыяльна-палітычнай будове магло захаваць некаторыя характэрныя рысы, частка якіх магла дайсьці і да нас. На жаль, мы маем інвэнтар, разьяднаны некалькімі стагодзьдзямі, якія прамігнулі паміж эпохай курганоў і пачаткам фіксацыі этнографічных рысаў.

Прымаючы падзел сучаснага ўсходняга славянства на тры асноўныя групы — вялікарускую, украінскую і беларускую — радзімічаў, бязумоўна, трэба лічыць аднэй з састаўных частак беларускай народнасьці.

Гісторыкі Беларусі і беларускай мовы (96), пералічаючы пляменьні, якія склалі сучасных беларусаў, заўсёды побач з крывічамі і дрэгавічамі называюць радзімічаў.

Тэрыторыя былой радзіміцкай зямлі ўсімі сваімі часткамі ляжыць у межах сучасных беларусаў і, што асабліва цікава, мяжа беларусаў і украінцаў ідзе якраз там, дзе тысячу гадоў назад канчаліся радзіміцкія паселішчы і пачыналіся севяранскія (62). Але гэта прыватны выпадак супаданьня, наогул-жа сучасныя этнографічныя групоўкі формаваліся незалежна ад пляменных падзелаў.

Распад старых комплексаў намеціўся яшчэ ў X-XI ст., калі радзімічы, вяцічы і севяране ўжо перасталі „один абычай иметь", і завяршэньнем гэтага марудлага і цягучага процэсу было тое, што севяране (асабліва ў паўднёвых раёнах) абярнуліся ў украінцаў, вяцічы ў паўднёвых вялікарусаў, а радзімічы ў беларусаў. Гэты процэс часам разрываў нават адно племя; так, крывічы ў сваім калёнізацыйным руху падзяліліся на беларусаў і паўночных вялікарусаў.

Вывучэньне сучаснай дыялектолёгіі і матар'яльнай культуры, увязанае з данымі археолёгіі, бязумоўна дапаможа нам уразумець процэс формаваньня беларускай народнасьці, аднэй з частак якой зьявіліся патомкі старажытных радзімічаў.

г. Масква, сакавік, 1930 г.

ЛІТАРАТУРА.

1. *Абрамов Н.* Літописний Воронiж на Чернiгiвщинi (Збiрн. Багалiя к. 1928).
2. Альбом рисунков к „Отчетам Археологической Комиссии за 1882—98 г.г." СПБ. 1906.
3. *Аничков Е. В.* Язычество и древняя Русь. СПБ. 1914.
4. *Антонович В. Б.* Погребальный тип могил радимичей (Археологические Известия и Заметки 1893 г. вып. 1 і Труды IX Археологич. С'езда, том II).
5. *Антонович В. Б.* Дневник раскопок в Черниговской губернии в 1881 г. (Труды Предварит. Ком. по устр. XIV Археол. С'езда вып. I).
6. *Антонович В. Б.* О похоронных типах в курганах Юго-Западного края (Труды IV Археол. С'езда и отдельно Казань, 1884 г.).
7. *Антонович В. Б.* Раскопки в стране древлян (Материалы по археологии России № 11, 1893 г.).
8. *Анучин Д. Н.* О культуре Костромских курганов (Материалы по археологии Восточных губерний, том III).
9. „ О христианских крестах и образках в могилах Средней и Западной России (Труды X Археолог. С'езда, том III).
10. *Анучин, Д. Н.* К докладу Завитневича о классификации курганов. (Труды VIII Археол. С'езда, том IV).
11. „ Сани, ладья и кони, как принадлежности погребального обряда. (Древности. Труды Моск. Арх. О-ва, том XIV).
12. *Аристов.* Промышленность древней Руси. 1866.
13. *Arne T.* La Suède et l'Orient. (Archives d'études orientales) Uppsala 1914.
14. Археологическая Летопись Южной России. Т. II, Киев 1900. Раскопки М. К. Якимовича, стр. 201.

15. *Арцибашев.* Повествование о России. 1838.
16. *Арциховский А. В.* Сердоликовые бипирамидальные бусы. (Труды Секции Археологии РАНИОН, вып. I. 1928).
17. „ Раскопки 1929 г. в Новгородском округе. (Материалы и исследования. Издание Новг. Госмузея).
18. „ Курганы вятичей. М. 1930.
19. *Aspelin.* Antiquités du Nord finno-ougrien. Hels. 1877—80.
20. *Бабенко.* Розповсюждення стародовньої Сальтівської та схожих на неї культур. Харьків, 1926.
21. *Багалей Д. И.* История Северской земли. Киев. 1882.
22. „ К истории учений о быте древних славян.
23. *Баллод.* Материалы по истории латышского племени (Записки Моск. Археолог. Института, том IX).
24. *Барсов Н.* Географический словарь русской земли. Вильна. 1865.
25. „ Опыт исторической географии. Варшава. 1885.
26. *Богданов А. П.* Суджанское длинноголовое племя по р. Полу. (Изв. О-ва Люб. Ест. Антр. и Этн. т. XXXI, 1878-79).
27. *Богданович.* Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов. 1895.
28. *Болсуновский.* Писанки, как предмет языческого культа. 1909.
29. *Борисов В. Л.* Опыт первоначальной истории земледелия и отношение его к быту и языку русского народа. (Чтения в О-ве Истории и Древностей Российских 1861 г., кн. IV).
30. *Бранденбург Н. Е.* Курганы южного Приладожья (Матер. по археологии России № 18, 1895.
31. *Браун Ф.* Разыскания в области гото-славянских отношений.
32. *Brückner Al.* Początki kultury słowiańskiej (Encykl. Polska t. IV Kraków, 1912).
33. *Будде Е. Ф.* К диалектологии великорусских наречий. Исследование особенностей рязанского говора. Варшава, 1892.
34. *Будилович А.* Первобытные славяне в их быте и языке по данным лексикальным. 1879.
35. *Бузук П. А.* Спроба лінгвістычнае географіі Беларусі. Менск. 1928.
36. *Булычов Н. И.* Раскопки по водоразделу Днепра и Волги. М. 1899.
37. „ Раскопки по водоразделу Днепра и Волги. М. 1903.
38. „ Журнал раскопок по рекам Угре и Воре. (Записки Моск. Арх. Ин-та т. XXXI). М. 1913.
39. *Быковский С. Н.* К вопросу о трех древнейших центрах Руси. Вятка. 1928.
40. *Вершинский А. Н.* К истории путей сообщения Киевской Руси с Северо-Востоком. (Тверская Старина, 1911, № 6).
41. *Вильчинский О.* Начало Руси. СПБ 1898.
42. *Виноградов К. Я.* Древнейшие следы культуры славян и финнов в Воскресенском уезде. 1924.
43. *Виноградов Л.* Гомель, его прошлое и настоящее. 1142—1900 г. г. М. 1900.
44. *Волк-Левонович И.* Еще к вопросу о „ляшских" чертах в белорусской фонетике. (Slavia, 1930).
45. *Гаркави А. Я.* Сказания мусульманских писателей о славянах и русских. СПБ, 1870.
46. *Гатцук А. А.* О курганах Мглинского у. Черниговской г. (Известия Археол. Ком. № 29).
47. *Геддон.* Переселения народов. 1923.
48. *Голубинский Е.* История русской церкви. т. I, часть I. М. 1880.
49. *Голубовский П. В.* История Северской земли. Киев. 1880.
50. „ История Смоленской земли. Киев. 1895.
51. „ Печенеги, половцы и торки. 1884.
52. *Гольмстен В. В.* Лунницы Российского Исторического Музея. (Отчет Рос. Ист. Музея за 1913 г.).
53. *Городцов В. А.* Древнейшее население Рязанской области. (Изв. Отд. Русск. Яз. и Слов. Академии Наук, книга XIII, 1908 г.).
54. *Городцов В. А.* Бытовая археология. М. 1909.
55. „ Археологические исследования в Муромском у. в 1910 г. (Древности. Труды Моск. Археологич. О-ва том XXIV).
56. *Городцов В. А.* Дако-сарматские элементы в русском народном творчестве (Труды Гос. Ист. Музея, 1926 г., вып. I)
57. *Готтенрот.* История внешней культуры. Таблицы 59, 82, 85, 86. 1888.
58. *Готье Ю. В.* Заметки о ранней колонизации Ростово-Суздальского края. (Сборник Городцова). М. 1928.
59. „ Железный век в Восточной Европе. М. 1930.
60. *Грушевский М. С.* Киевская Русь. Киев. 1911.
61. „ До питання про розселення Вятичів. (Зап. Наук. Товар. им. Шевченка) том CXVIII, кн. VI.
62. „ Чернигів і Сіверщина в Українській історії (Сборник „Чернигів і півн. лівобережжя, Киев 1928).
63. *Гущин А. С.* К вопросу о славянском земледельческом искусстве. Лен. 1927.
64. *Dalton.* Byzantine art and archaeology. Oxford, 1911.
65. *Дембовецкий А. С.* Опыт описания Могилевской губ. Мог. 1882.
66. *Длугош.* Historia Polonica Ioannis Dlugossi. 1770. Лейпциг.
67. *Дмитрюков.* Городища и курганы в Суджанском и Рыльском у. у.
68. *Довнар-Запольский М. В.* Очерки по истории Белоруссии. М. 1890.
69. „ Исследования и статьи (этнография). Киев, 1909.
70. „ История русского хозяйства т. I. Киев, 1911.
71. *Draysen.* Historische Handatlas.
72. *Дубинский С.* (Исследование культур неометалла в Белоруссии). Запіскі Адд. Гум. Навук Інбелкульту. Працы Катэдры Арх. Менск. 1928.
73. *Дьяконов М.* Очерки общественного и государственного строя древней Руси. СПБ, 1914.
74. *Егоров Вяч.* Переселение народов Европейской России. 1923.
75. *Еременко П. М.* Радимичские курганы. (Зап. Русск. Археологич. О-ва т. VIII, вып. 1-2).
76. *Ефименко А. Я.* Архаические формы землевладения у германцев и славян.
77. *Ефименко П. П.* Рязанские могильники. (Материалы по этнографии. III-I).
78. *Жудро.* Город Гомель. Вильно. 1911.
79. *Забелин И. Е.* История русской жизни I-II. М. 1908.
80. *Завитневич В. З.* Формы погребального обряда в курганах Минской губ. (Труды IX Арх. С'езда том I).
81. „ „ Из археологической экскурсии в Припетское Полесье. (Чтения в О-ве Нестора Летописца). кн. IV. Киев 1890).
82. *Завитневич В. З.* Вторая археологическая экскурсия в Припетское Полесье (Чт. в О-ве Нестора, кн. VI, Киев 1891 г.).
83. „ „ О раскопках в Бобруйском у. (Археол. Известия и Зам. 1893).
84. „ „ К вопросу о выработке критерия для классификации курганов по типам (Киевск. Старина т. 29, Киев 1890).
85. *Завитневич В. З.* К вопросу о культурном влиянии Византии на быт русских славян курганного времени (Труды XII Арх. С'езда т. I).
86. *Загоскин Н. П.* Русские водные пути и судовое дело в допетровской Руси. Каз. 1909.
87. *Замысловский.* Атлас по русской истории. СПБ, 1869.
88. *Zelenin D.* Ostslawische Volkskunde 1928.
89. *Ивановский.* О совместимости погребения и сожжения. (Тр. VIII Арх. С'езда вып. 4).
90. *Износкоп.* Одинаковые названия населенных мест Европейской России и колонизация.
91. *Ильинский Г. И.* Кто были Λενζανῆνοι Константина Багрянородного. (Slavia 1925—вып. IV).

92. *Кагаров Е. Г.* Религия древних славян. М. 1918.
93. *Kadlec.* O politycznym ustroju slowian. 1912.
94. *Карамзин Н. М.* История Государства Российского. Т. I-III. 1818.
95. *Karlowicz Jan.* Imiona niektórych plemion i ziem dawnej Polski (Pamiętn. Fizyogr. II, 1882)
96. *Карский Е. Ф.* Белоруссы. 1904.
97. *Кельсиев А. И.* Направление курганных остовов по раскопкам в Тверской и Ярославской г.г. (Древности. Труды М.А.О. т. IX, вып. I).
98. *Киселев С. В.* Поселение. (Труды Секции Теории и Методологии. Р.А.Н.И.О.Н. М. 1928).
99. *Китицын К. А.* Общая карта Европейской России IX-XI вв. (Труды XI Арх. С'езда вып. 2).
100. *Клетнова.* Змеиный культ. (Труды Смоленского Музея 1924 г.).
101. *Ключевский В. О.* Курс русской истории. Т. I. М. 1904.
102. *Козловская.* Славянские городища и курганы, как исторический источник (Минерва, вып. IV. Киев, 1914).
103. *Козловська.* Таврований посуд слов'янської доби. (Наук. Збірн. за рік 1926).
104. *Кондаков Н. П.* Русские клады. 1898.
105. *Константин Багрянородный.* Об управлении империей. Перевод Ласкина. М. 1899.
106. *Костомаров.* Федеративное начало в древней Руси. (Собр. Соч. кн. I).
107. „ „ Предания о родоначальниках. (Собр. Соч., кн. V).
108. *Котляревский А. А.* Погребальные обычаи языческих славян. 1868.
109. „ „ Дополнения к исследованию о существовании надгробных памятников у языческих славян. (Древности т. II).
110. *Кочубинский А.* О следах распространения литовского племени на восток (Труды X Арх. С'езда).
111. *Коялович М. О.* О расселении племен Западной России. (Русский Инвалид, 1863, № 114).
112. *Красницкий.* О раскопках близ Ново- Быхова.
113. *Краснянский В. Г.* Город Мстиславль (Зап. С.-Зап. Отд И.Р.Г.О. кн. 3).
114. *Кудряшов.* Русский исторический атлас. М. 1929.
115. *Кузнецов С. К.* Русская историческая география. 1913.
116. Курс Белоруссоведения. (Статьи разных авторов). М. 1920.
117. *Лебедева Н. И.* Перстни рязанских курганов. Ряз. 1928.
118. „ „ Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. Москва, 1928.
119. *Leciejewski Jan.* Napisy runiczne na urnach z Alekanowa (Древности, том XIX, вып. 2).
120. Летопись по Лаврентьевскому списку.
121. Летопись по Ипатьевскому списку.
122. *Lindenschmit L.* Handbuch der Deutschen Alterthumskunde. Braunschw. 1886
123. *Линниченко И.* Взаимные отношения Руси и Польши. ч. I. Киев, 1884.
124. *Лонačевский.* Археологические находки в Гомельском у. (Киевская Старина 1885—III).
125. *Любавский М. К.* Русская историческая география в связи с колонизацией.
126. *Ляскоронский А. Л.* История Переяславской земли.
127. *Ляведанский А. Н.* Материалы для археологической карты Смоленской губ. (Труды Смол. Музея, ч. I, 1924 г.).
128. „ „ Некоторые данные о городищах Смоленской губ. (Научн. Изв. Смол. Ун-та т. III, в. 3 1926).
129. „ „ Археолёгічныя досьледы 1926-1928 г.г. у БССР; Смаленшчыне, Менск 1930.
130. „ „ Городища и курганы близ д. Деребуж. (Сборник Городцова М. 1928).
131. *Лященко.* История русского народного хозяйства М. 1930.
132. *Макаренко Н. Е.* Материалы по археологии Полтавской губ. (Труды. Полтавской Ученой Архивной Комиссии вып. V, Полт. 1908).
133. *Максимович.* Днепр. Киев, 1901.
134. *Марков.* Топография кладов восточных монет. 1910.
135. *Марр Н. Я.* Из переживаний доисторического населения Европы племенных или классовых в русской речи и топонимике. Чебоксары 1926.
136. Мглинские курганы (Отечеств. Записки 1852. № 2, стр. 154).
137. *Мельник Е. Н.* Раскопки в стране Лучан. (Труды XI Арх. С'езда том I).
138. *Милюков П. Н.* Очерки по истории русской культуры ч. I. 1904 г.
139. „ „ Рязанские курганы (Труды X Арх. С'езда вып. I) 1896 г.
140. *Морошкин.* Славянский именослов. СПБ 1867.
141. *Муромцев П.* (Заявление о могилевских курганах и находках монет). (Труды I Арх. С'езда т. I).
142. *Мышенков.* Курганы Бобруйского у. Минской губ. (Вестник Археологии и Истории вып. IX).
143. *Naruszewicz.* Historia narodu polskiego. Warsz. 1780.
144. *Нидерле Л. Г.* Быт и культура древних славян. Прага, 1924.
145. *Niederle L.* Slovanské Starožitnosti. Praha, 1905—1925.
146. *Никитский А. Н.* Взгляд на родовой быт в древней Руси. (Вестник Европы, 1870, № 8).
147. *Никольский Н. М.* Очерк первобытных верований приднепровских славян М. 1930.
148. *Оссовский Г. О.* Откуда привозился красный шифер в Киев. (Труды III Арх. С'езда том 2).
149. Отчет Археологической Комиссии за 1897 г., стр. 62, 67—82.
150. „ „ „ „ 1907 г., стр. 114.
151. „ „ „ „ 1908 г., стр. 176.
152. „ о деятельности Моск. Арх. о-ва за 1890-91 г.г. (Древности, т. XV, в. 2).
153. *Пархоменко В. А.* Три центра древней Руси. (Изв. Отд. Русск. Яз. и Слов. 1913 г.).
154. „ „ Истоки русской государственности. Л. 1924.
155. *Первольф.* Славяне, их взаимные отношения и связи. Варш. 1886.
156. *Пионтковский А. А.* Белоруссы Гомельского уезда. (Русск. Антроп. Журн. кн. 23-24 1905 г.).
157. *Пичета В.* История сельского хозяйства Белоруссии. Часть I до конца XVI в. Минск 1928).
158. *Пічэта.* Гісторыя Беларусі. 1924.
159. *Платонов С. Ф.* Курс русской истории.
160. *Плеханов Г. В.* История русской общественной мысли т. I. М. 1919.
161. *Погодин. А. Л.* Лекции по славянским древностям (литогр.). Харьк. 1910.
162. „ „ Из истории славянских передвижений. СПБ 1901.
163. *Покровский Н. М.* Русская история с древнейших времен. т. I. М. 1922.
164. „ „ История русской культуры ч. I-II М. 1918.
165. „ „ Отражение экономического быта в Русской Правде. М. 1898.
166. *Покровский Ф. В.* Из доисторического быта на славяно-литовской границе.
167. *Potkański.* Lachowie i Lechici (Rozprawy Akad. Um. Ser. II tom XII 1898. Krakow).
168. Працы 1-га зьезду дасл. белар. арх. Менск, 1926.
169. *Пресняков.* Взгляд Шахматова на древнейшие судьбы русского племени. (Русск. Ист. Журн. III, 1921).
170. Радзивилловский или Кенигсбергский список летописи. Фото-механич. воспроиз. СПБ, 1902.
171. *Расторгуев П. А.* Северско-белорусский говор. Л. 1927.

172. *Расторгуев П. А.* К вопросу о лишских чертах в белорусской фонетике. (Труды Комиссии по диалектологии русск. яз. вып. 9. Л. 1927).
173. *Ревякин П. И.* О столпах на межах (Древности т. I).
174. *Рерих Н. К.* К вопросу о типах погребения в петербургских курганах. 1898.
175. *Рожков Н. А.* Очерк истории труда в России. (Архив Ист. Труда, кн. V).
176. „ „ Русская история в сравнительно-историч. освещении. I-II. М. 1922.
177. *Романов Е. Р.* К археологии Северо-Западного края России. Вильно. 1911.
178. „ „ Археологические разведки в Могилевской г. Вильно. 1911.
179. „ „ Раскопки в Могилевской губ. в 1888 г. (Древности т. XIII, вып. I).
180. „ „ Раскопки в Могилевской губ. в 1905 г. (Отчет Арх. Ком. за 1905 г.).
181. „ „ Археологический очерк Гомельского уезда. (Зап. Сев.-Зап. отд. Росс. Геогр. О-ва кн. I. Вильно, 1910).
182. „ „ Раскопки в Могилевской губ. в 1889-90 г.г. (Древности том XV вып. 2).
183. *Ruxerówn M.* O późnohellenistycznych i wczesno-średniow. kolczikach półksiężycowych (Przegląd Arch. III).
184. *Рыков П. С.* Раскопки в Обоянском у. (Древности том. XXIV).
185. „ „ Юго-восточная граница радимичей, (Ученые Записки Саратовского Ун-та вып. 3, 1923 г.).
186. *Самоквасов Д. Я.* Могилы Русской земли М. 1908.
187. „ „ Северянская земля по городищам и курганам.
188. „ „ Могильные древности Северянской Черниговщины М. 1917.
189. „ „ Северянские курганы и их значение для истории (Труды III Арх. С'езда, т. I).
190. „ „ О происхождении русских и польских славян и о римских монетах в землях Ляхов и Руссов (Труды VIII Арх. С'езда, том III).
191. *Самоквасов Д. Я.* (Дневник раскопок в Гочеве).
192. *Святловский В. В.* Примитивно-торговое государство, как форма быта. СПБ 1914.
193. *Сербов И.* По дреговичской области в 1911 г. (Записки Сев. Зап. Отд. Росс. Геогр. О-ва, кн. 3).
194. *Середонин.* Историческая география. СПБ 1916.
195. *Сержпутовский.* Отчет о поездке в Гомельскую губ. Минск, 1926.
196. *Siarczyński Fr.* Badanie o dawnej siedzibie Radzimczanów i Wiatyczanów, niegdys nad rzeką Sanem w sąsiedstwie Lachów i Rusinów zamieszkałych (Czasopism Naukowy Księgozb. Im. Ossolińskich t. I 1828 Lwów).
197. *Сизов В. И.* Смоленские курганы (Матер. по Археол. России № 28. СПБ 1902).
198. „ „ О раскопках в Рославльском у. Смоленск. губ. (Древности т. XI, вып. 3).
199. „ „ Отчет о раскопках в Смоленской и Могилевской г. г. в 1890 г. (Древности т. XV, вып. 2).
200. „ „ О происхождении и характере курганных височных колец, преимущественно „московского" типа (Арх. Изв. и Зам. 1895 г., № 6.).
201. Синопсис *Гизеля.* (1674).
202. *Смирнов А. П.* Социально-экономический строй восточных финнов IX—XIII в.в. (Труды Секции Теории и Методологии РАНИОН М. 1928).
203. *Соболевский А. И.* Названия населенных мест в исторической этнографии (Труды XI Арх. С'езда, том II).
204. *Сосновский.* Атлас Гочевских Древностей).
205. *Сперанский М.* Раскопки в Рыльском у. (Арх. Изв. и Зам. 1894 г. № 8).
206. Специальная карта Европейской России. Масштаб 10 верст в 1 дюйме. Листы 29, 31, 44—46. Издание 1925 г.
207. *Спицын А. А.* Расселение древне-русских племен по археологическим данным. (Журн. Мин. Нар. Просв. 1899-VIII).
208. „ Радимичские курганы, (Зап. Русск. Арх. О-ва т. VIII).
209. „ Предполагаемые литовские курганы. (Зап. Русск. Арх. О-ва т. VIII).
210. „ Гдовские курганы в раскопках Глазова (Мат. по Арх. Россип № 29, 1903).
211. „ Петербургские курганы в раскопках Ивановского (Матер. по арх. России № 20).
212. „ Древности бассейнов Оки и Камы. (Мат. по арх. России № 25. СПБ, 1901).
213. „ Владимирские курганы (Изв. Арх. Ком. вып. 15).
214. „ Шаманизм в отношении к русской археологии (Зап. Русск. Арх. О-ва т. XI, вып. I).
215 „ Определение времени Люцинского и Лядинского могильников (Арх. Изв. и зап. 1894 г., № 2).
216. „ Обозрение губерний в археологическом отношении. (Зап. Русск. Арх. О-ва VIII—XI).
217. „ Торговые пути Киевской Руси. (Сборник Платонова. СПБ 1911).
218. „ Древности антов (Сборник Соболевского).
219. „ Раскопки Черепанова близ Жидова Рогачевского у. (Зап. Арх. О-ва XII вып. 1 и 2, 1901).
220. „ Русская историческая географія. ПТР. 1917.
221. *Стромилов Н.* Скотоводство древней Руси. (Сельское Хозяйство и Лесоводство 1871. Апрель).
222. *Stryjkowski.* Kronika Polska Litewska etc. Macieja Stryjkowskiego 1582 roku Warsz. 1846.
223. *Сычев Н. П.* Искусство Киевской Руси. 1929.
224. *Tallgren A. M.* Les provinces culturelles finnaises de l'age de fer dans la Russie du nord. Eurasia Sept. Ant. III Hels. 1928.
225. *Татищев В. Н.* История Российская т. I 1768, т. II 1773. СПБ.
226. *Талько-Гринцевич.* Опыт физической характеристики древне-восточных славян. СПБ 1909.
227. *Тебеньков М.* Происхождение Руси. Опыт введения к истории русского народа. Ч. I. Древние Россы. Тифлис 1894.
228. *Теплоухов.* Древности Камской Чуди. (Мат. по арх. России № 26).
229. Техника камня и металла. Предисловие. (Сборник статей. М. 1930.)
230. *Толстой И. И. и Кондаков Н. П.* Русские древности в памятниках искусства, вып. V. Клады и курганы. СПВ. 1897.
231. *Турбин.* Раскопки в Обидовичах (Древности т. VIII. Протоколы ст. 37, 39).
232. *Турчинович.* Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. СПБ. 1857.
233. *Тышкевич К.* О курганах и городищах в Западной Руси и Литве. Вильно. 1865.
234. *Уваров А. С.* Меряне и их быт по курганным раскопкам (с атласом) М. 1871.
235. „ Об изображениях на монетах из Могилевских курганов (Древности, том VIII).
236. Указатель Российского Исторического Музея. М. 1893 г.
237. *Усов С. А.* Соображения о древне-русских моноксилах и однодревках (Древности, том VII, вып. 2).
238. *Филевич.* История древней Руси. Варшава. 1896.
239. „ О разработке топографической номенклатуры (Труды X Арх. С'езда).
240. *Финдейзен Н.* Очерки по истории русской музыки до XVIII в., ч. 1. М. 1928.
241. *Францев В.* Польское славяноведение конца XVIII в. 1906.
242. *Фурсов М. В. и Чоловский.* Дневник курганных раскопок в пяти уездах Могилевской губ. Могилев. 1892.
243. „ Курганныя раскопки в пяти уездах Могилевской губ. (Арх. Изв. и Зап. 1893 г.).
244. *Фурсов М. В.* Курганные раскопки в пяти уездах Могилевской губ. (Труды IX Арх. С'езда).
245. *Hampel.* Alterthümer des frühen Mittelalters in Ungarn. Braunschw. 1905.
246. *Ханенко Б.* Древности Приднепровья. Вып. 5. Эпоха славянская. Киев. 1902.
247. *Харламповіч П. В.* Манетныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі ў зборах Бел. Дз. Музэю. (Гіст. Арх. Зб. № 1). Менск 1927.

248. *Хвойко В. В.* Городища среднего Приднепровья (Тр. XII Арх. С'езда).
249. " Древние обитатели Приднепровья.
250. *Ходаковский З. Д.* Пути сообщения в древней Руси. (Русск. Ист. Сб. М. 1837).
251. " Донесение о путешествии 1822 г. (Русск. Ист. Сб. том VII. 1844).
252. Хронограф 1512 г. (Полн. Собр. Русск. Летописей т. XXII. СПБ. 1911).
253. *Чуев С. А.* Раскопки в Пеклине Брянского у. в 1901 г. Оттиск.
254. *Шафарик П. И.* Славянские древности. М. 1848.
255. *Шахматов А. А.* Южные поселения вятичей. (Изв. Академии Наук. Серия 6. т. 1, 1907 г.).
256. " Разыскания в области древне-русского летописного свода. СПБ, 1908.
257. " О месте составления Радзивилловской летописи (Сборник Анучина).
258. " Повесть временных лет.
259. " Введение в курс истории русского языка. Часть I. Исторический процесс образования русских племен и наречий. Птр. 1916.
260. *Шахматов А. А.* Древнейшие судьбы русского племени. Птр. 1916.
261. *Шейн.* Белорусский сборник.
262. *Шеппинг Д. О.* Дохристианское воззрение на загробную жизнь. (Древности, том XIII, вып. 2).
263. *Шмидт.* Искусство Украины-Руси. 1919.
264. *Шчакаціхін М. М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Менск, 1928.
265. *Щербатов М.* История Российская т. I. 1770.
266. *Юшков С.* Феодальные отношения и Киевская Русь. 1926.
267. *Ющенко И. Х.* Археологические раскопки в Гомельщине (В помощь просвещенцу 1926. № 4 и Искры Ильича 1927 г. №№ 15—18).
268. *Ягич.* К вопросу о рунах у славян (Энциклопедия славянской филологии т. II).
269. Ядро Российской Истории. 1779 г.
270. *Янчук.* Этнографический очерк Белоруссии. (Курс белоруссоведения. М. 1920 г.).
271. *Ястребов В. Н.* Лядинский и Томниковский могильники Тамбовской г, 1893 г.